УСТАНОВА АДУКАЦЫІ “ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА”

Факультэт гістарычны

Кафедра гісторыі Беларусі

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
__________ А.М. Дулаў
29 05 2018 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
__________ В.А. Космач
29 05 2018 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

для спецыяльнасці

1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны

Складальнік: І.У. Мандрык

Разгледжаны і зацверджаны на пасяджэнні навукова-метадычнага савета 27.06.2018 г., пратакол № 6

Репозиторий ВГУ

УДК 94(476)(075.8)
ББК 63.3(4Беи)я73
Г51

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава". Пратакол № 3 ад 28.02.2018 г.

Складальнік: прафесар кафедры гісторыі Беларусі ВДУ імя П.М. Машэрава,
доктар гістарычных навук **І.У. Мандрык**

Р э ц э н з е н т ы :
кафедра сацыяльна-гуманітарных дысцыплін УА "БДАТУ";
прафесар кафедры ўсеагульнай гісторыі і сусветнай культуры
ВДУ імя П.М. Машэрава, доктар гістарычных навук *В.А. Космач*

**Г51** **Гісторыя Беларусі для спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны :** вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне / склад. І.У. Мандрык. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2018. – 183 с.

Вучэбна-метадычны комплекс па гісторыі Беларусі (перыяд навейшага часу) падрыхтаваны згодна з тыпавой вучэбнай праграмай па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны, якая зацверджана ў Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь (рэг. № ТД-А.465).

Змест комплекса раскрывае сутнасныя элементы і праявы эканамічных адносін, важнейшыя рысы гаспадарчага і сацыяльнага развіцця беларускага грамадства ў савецкі час. У дадатку змяшчаюцца планы семінарскіх заняткаў, рэкамендацыі студэнтам 3-га курса па арганізацыі самастойнай працы, пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэм, тэставыя заданні.

ВМК прызначаны для студэнтаў гістарычнага факультэта дзённай і завочнай форм навучання, магістрантаў, аспірантаў, выкладчыкаў і настаўнікаў.

**УДК 94(476)(075.8)**
**ББК 63.3(4Беи)я73**

© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2018

Репозиторий ВГУ

# І. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Распачынаючы падрыхтоўку вучэбна-метадычнага комплекса, аўтар меў на ўвазе, што ў мінулыя гады айчынная і замежная гісторыяграфія назапасіла велізарны стос прац аб сацыяльна – эканамічным, грамадска-палітычным і духоўным жыцці беларускага народа. Карысныя звесткі пра развіццё гістарычнага працэсу на Беларусі, вытоках беларускай дзяржаўнасці , звязаны з імёнамі Ф. Скарыны, М. Літвіна, С. Буднага, А. Волана, Л. Сапегі, М. Баброўскага, І. Даніловіча, М. Догеля, А. Каяловіча, Т. Нарбута, М. Без-Карніловіча, Я. Карскага і іншых мысліцеляў і асветнікаў. На працы гэтых аўтараў сучасныя гісторыкі робяць спасылкі пры вывучэнні перыядаў сярэдневякоўя і новага часу. Пры вывучэнні і раскрыцці падзей Навейшага часу аўтар ВМК пры неабходнасці таксама звяртаўся да іх, але ў большай меры карыстаўся творамі В. Ластоўскага "Кароткая гісторыя Беларусі", М. Доўнар-Запольскага " Гісторыі Беларусі", Ус. Ігнатоўскага "Кароткі нарыс гісторыі Беларусі", акадэміка І. М. Ігнаценкі "Кастрычніцкая рэвалюцыя і самавызначэнне Беларусі" , працамі іншых навукоўцаў, у якіх матэрыял аб першых гадах савецкай ўлады выкладзен з высокай ступенню дакладнасці. У гэтых і іншых глыбокіх па змесце гістарычных творах упершыню быў паказаны рэвалюцыйны працэс на Беларусі , супярэчнасці пры абвяшчэнні БНР і утварэнні БССР, канцэпцыі розных палітычных плыняў па пытаннях нацыянальнага будаўніцтва і сацыяльна эканамічнага ладу.

Шмат сведчанняў пра станаўленне беларускай дзяржаўнасці для раздзелаў ВМК было ўзята з аўтарскіх напрацовак Н.С. Сташкевіча "Почему не состоялась БНР. – Мн., 1980; На пути к истине (Из истории национально – освободительного движения в Белоруссии 1917 г.). – Мн., 1983, В.А. Круталевича "На путях национального самоопределения: БНР – БССР – РБ". – Мн., 1995; История Беларуси: становление национальной державности (1917–1922 гг.). – Мн., 2003.

Даволі частыя спасылкі ў адпаведных раздзелах тэмы аўтар ВМК робіць на каштоўныя звесткі аб прагрэсе, складанасцях і праблемах у жыцці насельніцтва савецкай Беларусі на этапе 1919–1945гг., якія выклалі ў сваіх працах прафесійныя гісторыкі М.П. Касцюк, П.Ц. Петрыкаў, Я.К. Новік, Л.М. Лыч, У.І. Навіцкі, В.П. Асмалоўскі, У.М. Міхнюк,

А.А. Каваленя, Э.М. Загарульскі, У.С. Кошалеў, І.Р. Іофэ, П.А. Лойка, В.М. Фамін, А.М. Мацко, П.І. Брыгадзін, Ю.М. Бохан.

У змесце ВМК улічана , што за апошнія дзесяцігоддзі гэтыя і іншыя аўтары правялі глыбокія навуковыя даследаванні, больш поўна і аб'ектыўна растлумачылі падзеі часоў савецкай дзяржаўнай і палітычнай сістэмы. Часам па адных і тых жа гістарычных падзеях навукоўцы выказваюць спрэчныя, а то і ўзаемавыключальныя погляды. Такая метадалогія зразумела, бо аб'ектыўнае адлюстраванне эканамічных,

Репозиторий ВГУ

палітычных і ідэалагічных абставін у краіне, патрабуе пастаяннага іх вывучэння з улікам шматграннасці і супярэчнасці і ва узаемасувязі з сусветнымі падзеямі.

Пры напісанні ВМК аўтар улічваў гэта, а таксама і тое, што асобныя падручнікі і дапаможнікі, падрыхтаваныя ў апошнія гады, яшчэ не пазбаўлены ад павярхоўных высноў, аднабаковасці ў паказе палітры складаных гістарычных падзей на Беларусі. У часы перабудовы і наступныя за імі гады, спрабуючы паглыбіцца ў сутнасць пераменаў, што адбываліся ў БССР, і наяўных праблем (што зусім слушна), у сваім жаданні паказаць дэфармацыі сацыялізма, якія мелі месца ў сапраўднасці, некаторыя аўтары канцэнтруюць увагу на негатыўных момантах у развіцці рэспублікі. Акцэнт у асвятленні перыяду савецкага часу зроблены на прымусовым характары ўсёй савецкай сістэмы і яе бесперспектыўнасці. Пра якасныя дасягненні ў сферы матэрыяльнай вытворчасці і духоўны уздым беларускага народа магчыма толькі ўзгадваць.

Пагадзіцца з такім зместам гістарычнага працэсу ў сваёй краіне – значыць парушыць прынцып аб’ектыўнасці аналізу і поўнай праўды аб нашым шляху. Такі метад не мае пад сабой навуковай асновы і не спрыяе ўсталяванню ісціны. Прафесійны гісторык пры напісанні і выкладанні гісторыі на больш чым 70-гадовым савецкім этапе жыцця беларусаў павінен абапірацца на канцэпцыю цэласнасці і непадзельнасці гістарычнага працэсу, праводзіць глыбокі аналіз падзей з улікам агульных заканамернасцяй, а таксама нацыянальных і мясцовых асаблівасцяў. Не забывацца на прынцыпы кананічнасці і патрыятычнасці айчыннай гісторыі. Ад няўмельства аб’ектыўна з патрыятычных пазіцый ацэньваць мінулае свайго народа здараецца шмат няшчасцяў. Кіруючыся такой устаноўкай, аўтар ВМК абапіраўся на сучасныя дасягненні гістарычнай навукі, выкарыстоўваючы сукупнасць агульных прынцыпаў і спосабаў пазнання, імкнуўся зрабіць вучэбна -метадычны комплекс пра савецкі вопыт мадэрнізацыі і цывілізацыйнае развіццё праўдзівым і дакладным, які можа стаць дапаможнікам нашаму сённяшняму паспяховаму развіццю.

Каб усебакова і ўважліва разгледзіць падзеі недалёкага мінулага, зразумець усю складанасць будаўніцтва новага ладу, каштоўнасці і дэфармацыі сацыялізма, мужнасць і высокую адказнасць працоўных краіны ў ходзе гэтага велізарнага сацыяльнага эксперымента, спатрэбілася знайсці і ўвесці ў навуковы зварот шмат новых дакументаў Нацыянальнага архіва рэспублікі, абласных дзяржаўных архіваў (гэта тычыцца больш за ўсё дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці), пракаментаваць версіі аб гістарычных працэсах на Беларусі, адзначаныя ў фундаментальных зборніках, выдадзеных у краіне і за мяжой.

Былі выкарастаны таксама звесткі з падрыхтаванага раней падручніка аўтара: “Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі)” / І.У. Мандрык. – Віцебск: УА ФПБ МІПСА, 2009. – 276 с., шматлікія артыкулы аўтара, якія маюць непасрэдныя адносіны да разглядаемых тэм.



Репозиторий ВГУ

Дакументальная база дазволіла высветліць прычынна – выніковыя сувязі і заканамернасці гістарычнага развіцця беларускага народа і паказаць праз увесь змест ВМК, што Савецкая Беларусь развівалася ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай цывілізацый. У савецкі перыяд тут, як і ў папярэднія стагоддзі, накапліваліся, выспявалі шматлікія супярэчнасці, узнікалі складаныя праблемы ў палітычным , матэрыяльным і духоўным жыцці, што аб'ектыўна прыводзіла да рознаварыянтнасці іх вырашэння. Афіцыйны курс, які існаваў і праводзіўся кіраўніцтвам дзяржавы на этапе 1917–1945 гг, безумоўна, не быў адзіна правільным. Гістарычны працэс у рэспубліцы, як паказана ў 11 і 12 раздзелах ВМК, насіў нераўнамерны, хвалепадобны і спіралепадобны характар. У беларускім грамадстве мелі месца і трагізм, і застой, і абмежаванасць нацыянальна-культурнага жыцця, іншыя хібы. Але разам з гэтым савецкі час характарызыецца героікай і прагрэсам, найкаштоўнейшымі матэрыяльнымі і духоўнымі здабыткамі. Нават у самыя змрочныя часы палітычнага рэжыму грамадская атмасфера ў краіне была прасякнута пафасам стваральнай працы. Мелі месца сапраўдны працоўны гераізм і добрасумленнае служэнне Айчыне. У працоўнае асяроддзе ўкараняліся каштоўнасці чалавечай дабрыні, салідарнасці і справядлівасці. Найбольш яркія і лепшыя якасці беларускага народа праявіліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Структура вучэбна-метадычнага комплекса грунтуецца на вызначэнні і адборы галоўных элементаў гістарычных паняццяў, ідэй, тэндэнцый і фактаў. У ім зроблены аўтарскія адзнакі і высновы аб прагрэсіўным развіцці беларускага грамадства на ўсім гістарычным шляху ва ўзаемасувязі з гістарычнымі працэсамі іншых краін, аб магчымасцях і межах прымянення назапашанага сацыялізмам гістарычнага вопыту ў сучаснай дзяржаўнай палітыцы і практычнай дзейнасці па фарміраванню рыначнай сацыяльна- арыентаванай дзяржавы. Такі падыход стасуецца з частымі выказваннямі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка аб тым, **што для дасягнення поспеху сёння нам неабходна больш дзейсна і эфектыўна выкарыстоўваць усё тое пазітыўнае і добрае, што было назапашана раней.** У гэтым выразе прасочваецца канцэптуальны кірунак пры асэнсаванні гісторыі краіны.

Вучэбна-метадычны комплекс адлюстроўвае спецыялізацыю студэнтаў, (ён можа быць карысным для магістрантаў і аспірантаў, выкладчыкаў грамадазнаўчых дысцыплін).

Аўтар спадзяецца, што дадзенае выданне аб гістарычных падзеях у жыцці і дзейнасці беларускага народа ў савецкі перыяд з акцэнтаваным паказам падзей, што адбываліся ў рэгіянальным маштабе (маецца на ўвазе месца размяшчэння ВНУ – Віцебская вобласць), будзе садзейнічаць фарміраванню ў моладзі цэласнага ўяўлення пра гістарычны шлях беларускага народа. Выкладзеныя ў выданні звесткі, у звязцы з працамі іншых аўтараў, дапамогуць яго карыстальнікам пры вырашэнні сучасных праблем у развіцці Беларусі.

Репозиторий ВГУ

# II. МЕТАДЫЧНЫЯ ЎКАЗАННІ ПА АВАЛОДАННІ ЗМЕСТАМ ВЫВУЧАЕМЫХ ТЭМ

## ТЭМА 1. Палітычныя передумовы стварэння на Беларусі савецкай дзяржаўнасці

1. Пазіцыі палітычных плыняў і партый адносна пытання аб нацыянальна дзяржаўным уладкаванні Беларусі
2. Абвяшчэнне БССР, яе першая Канстытуцыя (люты 1919г.)

**1. Пазіцыі палітычных плыняў і партый адносна пытання аб стварэнні беларускай дзяржаўнасці.**

Вывучаючы гэту праблему, неабходна звярнуцца да матэрыялаў, у якіх раскрываецца дзейнасць палітычных сіл на Беларусі да Кастрычніцкай рэвалюцыі (у студэнтаў гістарычнага факультэта такое праграмнае пытанне стаяла ў 8, 9 і 10 раздзелах). Вывучэнне гэтых раздзелаў дае магчымасць зразумець, што менавіта ў 90-я гады XIX ст. і ў пачатку XX ст. паўстае пытанне аб практычных захадах па стварэнні нацыянальна-дзяржаўнага ладу для беларусаў, якога яны не мелі ў складзе Расійскай Імперыі. Розныя класы, палітычныя плыні і партыі па-свойму ўяўлялі шляхі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага і нацыянальнага развіцця Беларусі. Асаблівасць беларускага нацыянальнага руху ў гэты час састаяла ў тым, што ён быў па характары сялянскім, народніцкім, развіваўся больш усяго пад уплывам Беларускай сацыялістычнай грамады, партыі, пазіцыя якой да Першай сусветнай вайны выражалася **ідэяй краявой аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі з сеймам у Вільні** [1, с. 241]. Гэтую ж ідэю падзялялі і ўплывовыя колы на чале зпамешчыкам Р.А. Скірмунтам.

З пачаткам Першай сусветнай вайны кіраўнікі беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху выказвалі ідэю **адраджэння Вялікага княства Літоўскага ў выглядзе канфедэрацыі Беларусі і Літвы.** Аднак гэта ідэя засталася таксама не рэалізаванай. І хаця ў далейшым кіраўніцтва нацыянальнага руху на Беларусі імкнулася заявіць пра беларусаў як аб самабытным, самастойным народзе, які жадае дзяржаўнага самавызначэння (дзеля гэтага прадстаўнікі руху прымалі ўдзел у міжнародных канферэнцыях у Стакгольме (май 1916 г.) і ў Лазане, дзе абмяркоўваліся пытанні аб калектыўнай абароне правоў нацый), атрымаць незалежнасць згодна з іх поглядам у гэты час не ўдалося.

Спрыяльныя ўмовы для развіцця беларускага нацыянальнага руху стварыліся ў 1917 г. пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Найбольш уплывовай палітычнай арганізацыяй дэмакратычнага лагеру была, як і раней, Беларуская сацыялістычная грамада, якая адрадзілася ў сакавіку 1917 г.,



Репозиторий ВГУ

і налічвала ў сваіх радах амаль 10 тыс. чалавек. У гэты ж час: у Маскве ўзнікла палітычная арганізацыя з назвай Беларуская народная грамада**,** а ў Адэсе – Беларуская народная рада. Па нацыянальна-дзяржаўнаму пытанню гэтыя партыі, як і Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), а таксама Беларуская партыя народных сацыялістаў (БПНС), у сваіх праграмах дэкларавалі прыкладна адну і тую ж мэту: **наданне Беларусі нацыянальнай аўтаноміі ў складзе Расіі.** Такая ж пазіцыя была выпрацавана на канферэнцыі (з'ездзе) беларускіх партый і арганізацый ў Мінску 25–27 сакавіка, дзе быў выбраны Беларускі нацыянальны камітэт **(**БНК) у складзе 18 чалавек начале з Р. Скірмантам (старшыня), П. Алексяюком і Ф. Фальскім (намеснікі), Л. Зайцам (скарбнік), Б. Тарашкевічам (пісар). У склад БНК увайшлі таксама А. Смоліч, А. Бурбіс, З. Жылуновіч, К. Кастравіцкі, Ф. Шантыр і інш. Пасля з'езда дэлегацыя БНК накіравалася ў Петраград для перамоў з Часовым урадам наконт аўтаноміі. Але ажыццявіць пастаўленую мэту не ўдалося і на гэты раз. Часовы ўрад, які складаўся пераважна з прадстаўнікоў партыі кадэтаў, стаяў на пазіцыях адзінай і непадзельнай Расіі.

8–12 ліпеня 1917 г. у Мінску адбыўся чарговы з'езд прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных партый і арганізацый, якія да гэтага часу аб'ядноўвалі каля 23 тыс. Чалавек [2**,** с. 21]. Пад уздзеяннем прадстаўнікоў БСГ з'езд перайменаваў БНК у Цэнтральную раду беларускіх арганізацый і партый. У яе выканкаме асноўныя пасады занялі прадстаўнікі БСГ: Ц. Гартны, Ф. Шантыр, Я. Дыла, А. Смоліч, Я. Лёсік.

У кастрычніку 1917 г., пасля перамогі ўзброенага паўстання ў Петраградзе, улада на неакупаванай частцы Беларусі перайшла да Мінскага Савета і, створанага Паўночна-Заходнім абласным камітэтам РСДРП(б), Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (старшыня Ландар) [3, с. 68].

Як вядома, тут сканцэнтравалі свае сілы бальшавікі. Ім, з дапамогай атрадаў рэвалюцыйных салдат, да 2 лістапада ўдалося перамагчы контррэвалюцыйны ўплыў і ўстанавіць савецкую ўладу ў Мінску, які стаў цэнтрам палітычнага жыцця Беларусі і Заходняга фронту. Усё гэта садзейнічала паскарэнню пераходу ўлады да Саветаў у іншых гарадах і паветах краю, на свабоднай ад немцаў тэрыторыі. Умацаванне савецкай улады адбывалася ў даволі жорсткай барацьбе як з варожымі, так і з апазіцыйнымі для бальшавікоў палітычнымі сіламі.

Важнае значэнне для стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці мелі тры з'езды, што адкрыліся 19–24 лістапада: (з'езд саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці, III зезд сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў, II з'езд армій Заходняга фронту). Усе яны ўхвалілі патрэбу савецкай улады на Беларусі.

Са змяненнем палітычных умоў на беларускіх землях у беларускім нацыянальным руху праходзіла пераарыентацыя адносін да кастрычніцкай рэвалюцыі. Выкарыстоўваючы абвешчанае бальшавікамі права нацый на



Репозиторий ВГУ

самавызначэнне, Вялікая беларуская і Цэнтральная беларуская вайсковая рады ў Мінску ўтварылі “чыстую беларускую плынь”, якая паставіла сваёй мэтай абвясціць Беларусь незалежнай рэспублікай. Для рэалізацыі ідэі нацыянальнага самавызначэння Вялікая беларуская рада правяла перамовы з выканаўчым камітэтам Беларускага абласнога камітэта (БАК). Нягледзячы на сур’ёзныя разыходжанні ў поглядах (на прызнанне савецкай улады на Беларусі і статус рэспублікі), у кіраўнікоў гэтых арганізацый была адзіная мэта – захапіць палітычнае кіраўніцтва на Беларусі. Падабенства палітычных праграм дазволіла ім прыйсці да згоды і дабіцца дазволу на правядзенне Першага Усебеларускага кангрэса (з’езда). І Усебеларускі з’езд праходзіў 15–17 снежня 1917 г., прысутнічалі дэлегаты ад большасці валасных, павятовых і губернскіх земстваў, зямельных камітэтаў, настаўніцкіх арганізацый, па палітычнай накіраванасці дэлегаты належылі галоўным чынам да эсэраў і БСГ. На кангрэсе выявіліся розныя падыходы да дзяржаўнасці Беларусі. 16 снежня на пленарным пасяджэнні разглядалася пытанне пра абвяшчэнне Беларускай народнай рэспублікі. Мелася дзве прапановы: аб’явіць поўную самастойнасць Беларусі (такую думку праводзілі ў асноўным дэлегаты ад міншчыны, віленшчыны, смаленшчыны, гродзеншчыны) або мець адзінства з Расіяй (дэлегаты ад магілёўшчыны і віцебшчыны). У першым пункце рэзалюцыі, якую ўдзельнікі з’зду паспелі прыняць, сфармулявана кампраміснае рашэнне: кангрэс прызнаваў цэнтральную ўладу Расіі, але не прызнанаў мясцовую, ужо усталяваную ўладу – Аблвыканкамзах, СНК Заходняй вобласці і фронту [4, с. 182–183 ].

Такое рашэнне з’езда СНК Заходняй вобласці і фронту расцаніў як контррэвалюцыйную спробу звяржэння ўстаноўленага Кастрычніцкай рэвалюцыяй грамадскага і дзяржаўнага ладу. З’езд быў разагнаны. Як адзначаюць сёння асобныя гісторыкі, а ў той час гэта прызнаваў А. Мяснікоў**,** удзельнікаў І Усебеларускага з’езда магчыма было павярнуць да прызнання ўлады Саветаў, сфарміраваных пасля Кастрычніка на Беларусі. Такая выснова заснавана на тым , што ў большасці беларускіх рабочых і сялян меўся намер на непарыўны союз з Савецкай Расіяй.

Тым часам мірныя перамовы паміж Савецкай Расіяй і Германіяй, што праходзілі са снежня 1917 г. у Брэст-Літоўску, зайшлі ў тупік. Савецкая дэлегацыя на чале з Л. Троцкім адмовілася прымаць прапанаваныя немцамі ўмовы міру і пакінула Брэст-Літоўск. 18 лютага 1918 г. германскае камандаванне дало загад сваім войскам пачаць наступленне. Гэта рэзка абвастрыла сітуацыю на Заходнім фронце. Пад пагрозай захопу Мінска нямецкімі войскамі кіраўніцтва Аблвыканкамзаха і СНК Заходняй вобласці, штаб Заходняга фронту ў ноч на 19 лютага вымушаны былі спешна эвакуіравацца ў Смаленск.

Зарыентаваўшыся ў дадзеных абставінах , Выканкам Усебеларускага з’езда зрабіў спробу ўзяць уладу ў свае рукі. 21 лютага 1918 г. ён звярнуўся

Репозиторий ВГУ

да беларускага народа з 1-й Устаўной граматай, у якой заявіў аб неад'емным праве беларусаў на поўнае самавызначэнне, а сябе абвясціў часовай уладай. У якасці часовага выканаўча-распараджальнага органа з прадстаўнікоў сацыялістычных партый быў сфарміраваны Народны сакратарыят Беларусі на чале з Язэпам Варонкам.

3 сакавіка 1918 г. паміж Савецкай Расіяй, з аднаго боку, Германіяй і яе саюзнікамі, з другога, быў падпісаны Брэсцкі мірны дагавор. Паводле ўмоў дагавора, землі, якія знаходзіліся на захад ад лініі Рыга–Дзвінск–Свянцяны–Ліда–Пружаны і належалі раней да Расійскай імперыі, былі перададзены Германіі і Аўстра-Венгрыі (звыш 150000 км²). На гэтай тэрыторыі быў устаноўлены жорсткі акупацыйны рэжым. У такіх умовах 9 сакавіка 1918 г. на пашыраным пасяджэнні выканкама Усебеларускага з'езда была прынята 2-я Устаўная грамата, у якой Беларусь была абвешчана Народнай Рэспублікай – (БНР). Выканкам быў перайменаваны ў Раду БНР, прэзідыум якой узначаліў прадстаўнік БСГ І. Серада. Устаўной граматай дэклараваліся дэмакратычныя правы і свабоды, пацвярджалася права прыватнай уласнасці на зямлю, якая бясплатна перадавалася тым, хто яе апрацоўваў, устанаўліваўся 8-гадзінны рабочы дзень.

25 сакавіка 1918 г. была прынята 3-я Устаўная грамата. Яна абвяшчала незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі і вызначала яе тэрыторыю. У склад БНР ўключаліся Магілёўская, Мінская, Віцебская губерні, а таксама беларускія часткі Віленскай, Гродзенскай, Смаленскай, Чарнігаўскай і іншых губерняў [5, с. 213].

У сучаснай гістарычнай літаратуры існуюць розныя адзнакі аб праграмных устаноўках і практычнай дзейнасці палітычных партый і грамадскіх рухаў Беларусі па ўтварэнню нацыянальнай беларускай дзяржавы. Канкртэна – гістарычнае асэнсаванне і ўзважаны падыход дае падставу казаць пра тое, што гэта – важная старонка беларускай гісторыі, значны крок у станаўленні дзяржаўнасці беларускага народа. Рада БНР і Народны сакратарыят ва ўмовах вострай палітычнай барацьбы ўтварылі пэўную палітычную структуру з зародкамі дзяржаўнай арганізацыі. Але ў прамым сэнсе дзяржавай БНР не стала. Не было сапраўднай сістэмы органаў заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады, сістэмы распрацоўкі і прыняцця законаў, забеспячэння іх выканання, аховы правоў і свабод грамадзян. Функцыі ўрада БНР абмяжоўваліся паўнамоцтвамі нацыянальнага прадстаўніцтва пры германскай акупацыйнай адміністрацыі [6, с. 60].

Паражэнне аўстра-германскага блока ў Першай сусветнай вайне і Лістападаўская (1918 г.) рэвалюцыя ў Германіі каардынальна змянілі палажэнне на фронце. 13 лістапада 1918 г. Савецкі ўрад дэнансаваў Брэсцкі дагавор, а Чырвоная Армія перайшла ў наступленне супраць германскіх войск па ўсім фронце. 10 снежня 1918 г. яе часткі занялі Мінск. Да канца лютага 1919 г. на ўсёй тэрыторыі Беларусі была адноўлена савецкая ўлада. Беларуская Народная Рэспубліка, хаця і існавала ў



Репозиторий ВГУ

большай ступені як ідэя, чым рэальна існуючае дзяржаўнае ўтварэнне, стала каталізатарам стварэння беларускай савецкай дзяржаўнасці.

Устойлівую пазіцыю аб нацыянальным лёсе Беларусі меў, утвораны 31 студзеня 1918 г. пры камісарыяце па справах нацыянальнасцей РСФСР, Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам). Ініцыятарам стварэння Белнацкама была Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (БСДРП), якая ўзнікла восенню 1917 г. на базе Петраградскай БСГ, а ў красавіку 1918 гператварылася ў звычайную секцыю РКП(б). Белнацкам узначаліваў адзін з рэвалюцыянераў і арганізатараў Беларускай секцыі РКП(б) **А.Г. Чарвякоў.** Кіраўнік Белнацкама А. Чарвякоў і сакратар Цэнтральнага Бюро беларускіх камуністычных секцый пры ЦК РКП(б) (арганізаваных з бежанцаў – беларусаў у розных гарадах Расіі–Маскве, Петраградзе, Смаленску, Віцебску, Саратаве, Тамбове, Казані і інш.). **З.Д. Жылуновіч,** мелі намер на ўстанаўленне цесных сувязей з РСФСР на прынцыпах аўтаноміі. Ведаючы настрой шырокіх народных мас, яны лічылі, што лозунгам буржуазнага самавызначэння трэба неадкладна супрацьпаставіць практычныя справы па стварэнню ў той ці іншай форме беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Такая пастаноўка пытання дыктавалася логікай барацьбы з буржуазнай Радай БНР, якая прэтэндавала на “агульнанацыянальнае прадстаўніцтва”.

Пасля V-га Усерасійскага з’езда Саветаў (ліпень 1918 г.), што прыняў Канстытуцыю РСФСР, Белнацкам і беларускія секцыі РКП(б) выступілі з прапановай аб перайменаванні Заходняй вобласці (Заходняя вобласць – гэта неакупіраваныя часткі Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай губерні, аб’яднаныя з такой назвай у красавіку 1918 г.) у Беларуска-Літоўскую камуну ці аўтаномную рэспубліку у складзе РСФСР. У верасні 1918 г. дэлегацыя Белнацкама на чале з І.В. Лагуном наведала Паўночна-Заходні абласны камітэт РКП(б) у Смаленску і прапанавала абмеркаваць праект “Аб перайменаванні Заходняй вобласці ў Беларуска-Літоўскую”. Гэтым актам Белнацкам меў на ўвазе зрабіць першы крок у зацвярджэнні, хаця б часткова самастойнасці Беларусі. Дадзеная пазіцыя не атрымала разумення ў кіраўнікоў Паўночна-Заходняга абкама партыі. Яны лічылі, што нацыянальнае пытанне ў Беларусі магчыма вырашыць у межах Заходняй вобласці, што ўваходзіць у РСФСР на правах звычайнай адміністратыўнай адзінкі. Аднак у верасні 1918 г. Заходняя вобласць была перайменавана ў Беларуска-Літоўскую камуну ці аўтаномную Рэспубліку ў складзе РСФСР.

Прадстаўнікі Белнацкама і далей прыводзілі шмат аргументаў на карысць самастойнасці Беларусі, але, заняты ў той час арганізацыяй барацьбы з акупантамі, Паўночна-Заходні абласны камітэт не звяртаў увагі на рост нацыянальнай самасвядомасці беларускай эліты. Афіцыйная пазіцыя Паўночна-Заходняга абласнога партыйнага камітэта асноўвалася на тым, што развядзенне народаў “па нацыянальных кватэрах” шкодна адаб’ецца на іх інтэрнацыянальным выхаванні. Такая пазіцыя не раз

Репозиторий ВГУ

выказвалася на старонках у друку. Так, 6 чэрвеня газета “Звязда” – орган Паўночна-Заходняга абкама РКП(б) – змясціла артыкул “Самаопределение народов и диктатура пролетариата”, дзе ўказывалася, што ўсялякае самавызначэнне народаў будзе “іграть только на руку буржуазіі”. У артыкулах сакратара камітэта В. Кнорына ў верасні–кастрычніку 1918 г (за два месяцы да ўтварэння ССРБ) у той жа газеце была распачата рэзкая крытыка на прапанову Белнацкама і беларускіх камуністычных секцый РКП(б). Пазіцыя Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП (б) і Аблвыканкамзаха цалкам супадала з поглядамі народнага камісара па нацыянальнасцях І.В. Сталіна, які лічыў “стварэнне незалежных рэспублік рашэннем чыста часовых палітычных задач”. Пасля лістападаўскай рэвалюцыі ў Германіі і дэнансацыі Брэсцкага дагавора германскія войскі пакінулі Мінск, які быў хутка заняты Чырвонай Арміяй. Але Савецкі ўрад і тады не спяшаўся абвяшчаць Беларускую рэспубліку. Адмоўныя адносіны да беларускай дзяржаўнасці ў гэты час былі характэрнымі як для ЦК РКП(б) , Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта РСФСР, так і для мясцовага бальшавіцкага кіраўніцтва [7, с. 60].

Такая пазіцыя выклікала недавер і занепакоенасць з боку Беларускіх секцый РКП(б)Б і Белнацкама. Канферэнцыя Беларускіх секцый РКП(б), якая прайшла ў Маскве, прызнала неабходным стварэнне Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі, выбрала Цэнтральнае бюро Беларускіх секцый РКП(б), прапанавала ідэю “стварэння Беларускай савецкай рэспублікі як фарпоста расійскай сацыяльнай рэвалюцыі”. Цэнтральнаму бюро было даручана пасля прызначанай на канец 1918 года VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б) склікаць Усебеларускі з’езд камуністаў і стварыць нацыянальны цэнтр, які б узяў пад свой кантроль не толькі секцыі, але і мясцовыя арганізацыі, у тым ліку тыя, што дзейнічалі раней у падполлі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

На гэтым жа этапе адбылося яшчэ некалькі знакавых падзей, якія паўплывалі на вырашэнне нацыянальнай дзяржаўнасці Беларусі. 12 снежня 1918 г. на павестку дня пасяджэння сялянскіх дэпутатаў Мінскай губерні было пастаўлена пытанне аб стварэнні беларускай савецкай дзяржавы. Сялянскія дэпутаты выказаліся за самавызначэнне беларускага і літоўскага народаў. Іх ініцыятыву падтрымалі Мінскі губернскі рэвалюцыйны камітэт і Мінскі Савет. Але, ў чарговы раз такі падыход не быў падтрыманы абласным партыйным камітэтам. 23 снежня 1918 г. Усерасійскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (УЦВК) згодна з рэкамендацыяй Паўночна-Заходняга АК РКП(б) і Аблвыканкамзаха прыняў пастанову аб абласных аб’яднаннях, у якім Заходняя вобласць, як тэрытарыяльна-адміністратыўная адзінка РСФСР, была зацверджана ў складзе Смаленскай, Магілеўскай, Віцебскай і Гродзенскай губерняў (часткі Віленскай і Ковенскай губерній у сувязі з абвяшчэннем Літоўскай ССР із склада вобласці былі выключаны). Такое рашэнне не магло задаволіць



Рэпазіторый ВДУ

кіраўніцтва Белнацкама і беларускіх камуністычных секцый. Яны настойліва выступалі за стварэнне беларускай савецкай рэспублікі.

**2. Абвяшчэнне БССР, яе першая Канстытуцыя (люты 1919 г.)** Прынятыя канферэнцыяй Беларускіх секцый РКП(б) пастановы, захады Белнацкама, асабісты погляд на нацыянальнае пытанне У.І. Леніна прынеслі станоўчыя вынікі. Рашэнне аб "неабходнасці аб'яўлення Беларусі як самастойнай ва ўсіх адносінах нацыі, незалежнай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі" было прынята ў Маскве і рэалізавана ў вельмі кароткі тэрмін. 24 снежня Пленум ЦК РКП(б) разгледзіў беларускае пытанне. У пастанове пленума Паўночна-Заходняму абкаму даручалася правесці партыйна-арганізацыйную работу па нацыянальна дзяржаўным будаўніцтве. Раніцай 25 снежня адбылася нарада І. Сталіна з прадстаўнікамі Белнацкама, членамі Цэнтральнага бюро беларускіх камуністычных секцый і камітэта Маскоўскай беларускай секцыі РКП(б). У гэты ж дзень Сталін у размове з старшынёй Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) А.Ф. Мясніковым паведаміў, што ЦК партыі вырашыў "по многим соображениям, о которых теперь говорить не приходится, согласиться с белорусскими товарищами на образование Белорусского советского правительства" [8, с. 164]. Сталін не раскрыў, якімі "многімі меркаваннямі" кіраваліся ў Маскве пры прыняцці такога рашэння. У размове Сталін толькі асоба падкрэсліў: "Кажу ўсё гэта па даручэнню ЦВК і партыі". Як высветлілася ў далейшым, логіка такога хуткаснага рашэння знаходзілася ў тым, каб у такіх складаных міжнародных абставінах (вайна з капіталістычнымі краінамі была відавочнай) аддзяліць Расію буферамі ад Еўропы. У дзень перамоў са Смаленскам Сталін перадаў змест рашэння ЦК РКП(б) кіраўніцтву Белнацкама і беларускіх камуністычных секцый. Паведамленне наркама стала прадметам экстраннага абмеркавання на нарадзе работнікаў Белнацкама, членаў Цэнтральнага бюро беларускіх камуністычных секцый і Маскоўскага камітэта беларускіх секцый РКП(б). Абмеркаванне пытання аб дзяржаўным уладкаванні Беларусі ішло пад старшынствам З.Ф. Жылуновіча. З. Жылуновіч, паведаміў прысутным аб перамовах І. Сталіна з супрацоўнікамі Белнацкама, што адбыліся раніцай таго ж дня. З пратакольных запісаў нарады бачна, што "Председатель осведомил собрание о том, что сегодня нарком па делам национальностей тов. Сталин, пригласив к себе по телефону ответственных сотрудников Белнацкома, поднял вопрос о государственном устройстве Белоруссии".

Па сведчанню З. Жылуновіча, у выніку гэтых перамоў было вызначана, што "з нагоды сучасных міжнародных адносін і ў мэтах умацавання і пашырэння заваёў сацыялістычнай рэвалюцыі ў сусветным масштабе, у сучасны момант зусім наспела неабходнасць абвяшчэння Беларусі, як самастойнай ва ўсіх адносінах нацыі, незалежнай

сацыялістычнай Савецкай Рэспублікай”. Тут жа былі абмеркаваны арганізацыйныя пытанні. Згодна з даручэннем І. Сталіна, быў вызначаны спіс кандыдатаў з 15 чалавек у склад Рабоча-Сялянскага Урада Беларусі.

30 снежня 1918 г. у Смаленску была склікана VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б). На ёй прысутнічалі дэлегаты ад усёй рэспублікі (усяго 206 чалавек) – яны прадстаўлялі прыкладна 18 тысяч членаў партыі. Дэлегаты аднагалосна выказаліся за абвяшчэнне ССРБ. Канферэнцыя вызначыла межы рэспублікі і па дакладзе камісіі, утворанай для вывучэння гэтага пытання, прыйшла да высновы, што ў склад рэспублікі павінны ўвайсці Мінская, Магілёўская, Гродзенская губерні поўнасцю, Віцебская губерня – без Дзвінскага, Рэжыцкага і Люцынскага паветаў, а таксама частка тэрыторыі Смаленскай губерні, населенай пераважна беларусамі [9, с. 114–115].

Прымаючы пад увагу, што на VI Паўночна-Заходняй канферэнцыі былі ў асноўным прадстаўлены ўсе камуністычныя арганізацыі, што знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі, канферэнцыя аб’явіла сябе I з’ездам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Тут жа было ўтворана Цэнтральнае Бюро КП (б)Б (у складзе 15 членаў) і яго Прэзідыум. Старшынёй ЦБ і адначасова камісарам ваенных спраў быў прызначаны **Мяснікоў Александр Фёдаравіч.** 31 снежня 1918 г. ЦБ КП(б)Б абмеркавала пытанне аб складзе Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада ССРБ. Было вырашана, што ва ўрад увойдуць прадстаўнікі ад Белнацкама, Паўночна-Заходняга камітэта РКП(б) і Аблвыканкамзаха. Старшынёй урада быў абраны **Ц. Жылуновіч.** 1 студзеня 1919 года Часовы ўрад Беларусі абнародаваў Маніфест у сувязі з утварэннем ССРБ. Уся ўлада ў Беларусі, адзначалася ў Маніфесце, належыць Саветам рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. Зямля з жывым і мёртвым інвентаром, лясы, воды і нетры зямлі, чыгункі, фабрыкі і заводы, банкі становяцца ўласнасцю народа. Маніфест абвясціў раўнапраўе працоўных усіх нацыянальнасцей на тэрыторыі Беларусі, адмяніў усе загады і распараджэнні акупацыйных улад [10, с. 219–220].

Звернем увагу, што рашэнне аб стварэнні ССРБ дэлегаты I з’езда РКП(б) Б прынялі аднагалосна, што сведчыць аб высокай цэнтралізацыі РКП (б) і дысцыплінаванасці яе членаў. Рашэнне ЦК РКП(Б) аб статусе – **як самастойнай ва ўсіх адносінах нацыі, незалежнай сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі,** прызнана адзіна верным для Беларусі. Такое рашэнне было больш глыбокім па змесце, чым прапановы Белнацкама і беларускіх камуністычных секцый, якія прытрымліваліся прызнання за Беларуссю толькі аўтаномнага статуса ў складзе Расіі. Цалкам былі задаволеныя такім рашэннем і кіраўнікі Паўночна-Заходняга – абласнога камітэта партыі: іх паўнамоцтвы сталі і шырэй, і глыбей. У сувязі з абвяшчэннем ССРБ выканаўчы камітэт Заходняй вобласці склаў свае паўнамоцтвы, вышэйшая ўлада на тэрыторыі рэспублікі (акрамя Віцебскай

Рэпазіторый ВДУ

і Магілёўскай губерняў) перайшла да Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада. Такое нечаканае рашэнне ЦК РКП(б) можа мець наступнае тлумачэнне: маладой беларускай дзяржаве была наканавана роля буфера пры аддзяленні Савецкай Расіі ад капіталістычнага свету, якую магла выканаць толькі незалежная рэспубліка (ССРБ). 5 студзеня 1919 г. Часовы рэвалюцыйна-сялянскі ўрад ССРБ, ЦБ КП(б) Б пераехалі ў Мінск, які з гэтага часу стаў сталіцай Савецкай Беларусі. Аднак ужо ў першыя дні пасля з'езда кіраўніцтва ўсходніх губерняў выказала незадаволенасць сваім новым становішчам. Яны выступілі з пратэстам супраць уключэння тэрыторый Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскіх губерняў у склад ССРБ. Так, 9 студзеня 1919 г. Віцебскі губернскі партыйны камітэт дэлегіраваў у Маскву свайго прадстаўніка для пастаноўкі пытання аб выключэнні губерні са складу ССРБ і далучэнні да РСФСР. Такая пазіцыя абгрунтоўвалася тым, што губерня эканамічна не звязана з Беларуссю; насельніцтва «совершенно обрусело», не ведае беларускай мовы; тут наогул "няма беларускай культуры" [11, с. 7]. Такія ж захады зрабілі партыйныя і савецкія ўлады Магілёўскай і Смаленскай губерняў. Асобныя гісторыкі сцвярджаюць (сцвярджэнне гэта мае рацыю), што пазіцыя мясцовых кіраўнікоў супала з тым рашэннем, якое было прынята 16 студзеня 1919 г. ЦК РКП(б). Без папярэдняга абмеркавання з кіраўніцтвам рэспублікі было разгледжана пытанне аб тэрыторыі Беларускай ССР і прызнана неабходным у дадзены момант акрэсліць яе Мінскай і Гродзенскай губернямі. Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні пакінуць у складзе РСФСР. 22 студзеня 1919 г. спецыяльна прысланы ў Мінск эмісар ЦК РКП(б) А. Іофэ аб'явіў аб гэтым рашэнні. З пастановай ЦК РКП(б) ад 16 студзеня не пагадзілася большая частка ўрада ССРБ. З. Жылуновіч і яго аднадумцы лічылі, што падзел рэспублікі немэтазгодны. Яны неаднаразова звярталіся ў ЦК РКП(б) з прапановай адмяніць гэта рашэнне, але безвынікова. У канцы студзеня ў знак пратэсту ўрад ССРБ пакінулі тры наркамы – Ф. Шантыр, У. Фальскі і Я. Дыла. Нягледзячы на пратэсты групы Мяснікова і прыхільнікаў З. Жылуновіча, рашэнне ўсё ж было даведзена да выканання. Памеры Беларускай рэспублікі абмяжоўваліся "геаграфічна неабходнымі граніцамі" Мінскай і Гродзенскай губерняў.

Праз некалькі дзён Масква данесла кіраўніцтву тэрытарыяльна ўрэзанай рэспублікі яшчэ аб адным рашэнні ЦК РКП(б): аб аб'яднанні Беларускай і Літоўскай савецкіх рэспублік у адну дзяржаву. Кіраўніцтва БССР вымушана было выканаць і гэту пастанову вышэйстаячага партыйнага органа. І-ы Усебеларускі з'езд Саветаў (адбыўся 2–3-га лютага 1919 г. у Мінску, прысутнічала 230 дэлегатаў, з іх 213 камуністаў і 17 спачуваючых), прыняў першую Канстытуцыю ССРБ, зацвердзіў герб і сцяг рэспублікі. На гэтым з'ездзе прысутнічаў старшыня УЦВК Я.М. Свярдлоў. Ён аб'явіў пастанову УЦВК аб прызнанні незалежнасці



Репозиторий ВГУ

БССР. У адпаведнасці з канстытуцыяй найвышэйшая ўлада ў рэспубліцы належыла з'езду Саветаў. У перыяд паміж з'ездамі яе ажыццяўляў Цэнтральны выканаўчы камітэт (ЦВК). У склад Цэнтральнага выканаўчага камітэта абранага на I Усебеларускім з'ездзе Саветаў, увайшло 50 чалавек (старшыня А. Мяснікоў). Першая сесія ЦВК БССР (5 лютага) выбрала Малы і Вялікі прэзідыум ЦВК для агульнага кіраўніцтва асобнымі галінамі народнай гаспадаркі. Малы прэзідыум ЦВК складаўся са старшыні, двух членаў (камісары па замежных і ўнутраных справах) і сакратара. Функцыі пастаяннага ўрада ССРБ павінен быў выконваць Вялікі Прэзідыум ЦВК у складзе 15 народных камісараў. Удзельнікі з'езду прынялі Зварот да народаў і ўрадаў усіх краін, у якім заявілі аб волі рабочых і сялян Савецкай Беларусі жыць у згодзе з усімі народамі свету. З'езд пагадзіўся з выключэннем Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай губерняў са складу БССР, прызнаў мэтазгодным аб'яднанне Беларускай і Літоўскай рэспублік. Адпаведныя рашэнні былі пасля прыняты на канферэнцыі КП ЛіБ і на I з'ездзе саветаў Літвы. У склад ЛітБел увайшлі тэрыторыі Мінскай, Гродзенскай, Віленскай, Ковенскай і частка Сувалкаўскай губерняў з больш як чатырохмільённым насельніцтвам. Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні па рашэнні I Усебеларускага з'езда адышлі да РСФСР. 27 лютага 1919 года ў Вільні адбылося аб'яднанае пасяджэнне ЦВК Літоўскай і Беларускай Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, якое прыняло рашэнне аб стварэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Літвы і Беларусі (ЛітБел). Старшынёй ЦВК створанай Літоўска-Беларускай Савецкай Сацыялістычнай рэспублікі (ЛітБел) быў выбраны **К.Г. Ціхоўскі.** СНК ЛітБел узначаліў вядомы літоўскі рэвалюцыянер **В.С. Міцкявічус-Капсукас.** Сталіцай новага дзяржаўнага ўтварэння стаў горад Вільня. А. Мяснікоў быў адкліканы з Беларусі, другія члены Цэнтральнага Бюро КП(б) Б атрымалі другарадныя пасады ва ўрадзе Літоўска-Беларускай Рэспублікі.

Кіруючыя органы ЛітБел правялі шэраг мерапрыемстваў у галіне партыйнага і дзяржаўнага будаўніцтва. Былі зацверджаны інструкцыі аб валасных, гарадскіх і павятовых Саветах, дэкрэты аб арганізацыі савецкай міліцыі і суда, раўнапраўі ўсіх мясцовых моў, ураўнаванні жанчын у правах з мужчынамі, скасаванні саслоўяў і тытулаў. У пачатку сакавіка 1919 г. адбыўся аб'яднаны з'езд Кампартый Літвы і Беларусі, які пастанавіў арганізаваць Камуністычную партыю Беларусі і Камуністычную партыю Літвы ў адзіную Камуністычную партыю Літвы і Беларусі. Гэты з'езд увайшоў у гісторыю як II з'езд КП(б)Б. Галоўным матывам рашэння аб стварэнні Літоўска-Беларускай дзяржавы (аб якім адкрыта не гаварылася) было міжнароднае становішча. ЛітБел павінен быў стаць буферам паміж Расіяй і Польшчай. 28 лютага 1919 года ЦВК ЛітБел прыняў Дэкларацыю аб знешняй палітыцы, у якой прапанаваў усім народам і іх урадам прызнаць Літоўска-Беларускую ССР і ўступіць з ёй у зносіны, дэклараваў гатоўнасць "вырашыць усе спрэчныя пытанні

палюбоўна і міралюбіва". Але аб'яднанне дзвюх рэспублік не пазбавіла краіну ад вайны. Польшча і вядучыя дзяржавы Захаду не прызналі Літоўска-Беларускую ССР як суб'ект міжнароднага права. Сур'езная праблема паўстала ва ўстанаўленні эканамічных і культурных сувязей з іншымі дзяржавамі.

У далейшым (пасля лютага 1919 г.) для беларускага народа наступілі не менш жорсткія выпрабаванні. Польшча сканцэнтравала свае войскі ля савецкай граніцы, а затым арганізавала наступленне ў напрамку Вільня–Ліда–Маладзечна. Вялікая частка тэрыторыі ЛітБел была акупавана, у тым ліку Вільня і Мінск.

Як бачна, працэс падрыхтоўкі і абвяшчэння Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі (ССРБ) ішоў складана і супярэчліва. Значную ролю ў ім адыгралі прадстаўнікі Белнацкама і Беларускіх секцый РКП(б). Як сведчаць факты, менавіта прыхільнікі Белнацкама і Беларускіх секцый РКП(б) былі ініцыятарамі абвяшчэння ССРБ і яе першымі будаўнікамі. Яны распрацавалі ўласную канцэпцыю вырашэння нацыянальнага пытання, яе сутнасць заключалася ў прызнанні Беларусі як састаўной часткі савецкай федэрацыі. Беларуская кіраўніцтва шчыра верыла, што з дапамогай Савецкай Расіі і на аснове камуністычнай дактрыны можна будзе адрадзіць беларускую дзяржаўнасць хутчэй і лепш, чым на аснове іншых палітычных канцэпцый. ССРБ стваралася на падставе агульнага рашэння ЦК РКП (б). Важным матывам такога рашэння былі міжнародныя абставіны. Маладой беларускай дзяржаве была наканавана роля буфера паміж Расіяй і капіталістычнымі краінамі, якую магла выканаць толькі незалежная рэспубліка.

Спасылкі

1. Ігнатоўскі, У.М. Гісторыя Беларусі ў XIX і ў пачатку XX сталецьця / У.М. Ігнатоўскі // Лекцыі, чытаныя студэнтам Беларус. дзярж. ун-ту // Выданне трэцяе,стэрэотыпнае. Беларускае Дзяржаўнае выдавецтва, Менск, 1928. – 251 с.

2. Сташкевич, Н.С. Приговор революции : крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917–1925) / Н.С. Сташкевіч. – Мн., 1985.

3. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Т.2. – Мн., 1972.

4. Макар Краўцоў пра Ўсебеларускі з'езд // Спадчына. – 1997. – № 1.

5. Вішнеўскі, А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах / А.Ф. Вішнеўскі, А.Я. Юхо. – Мн., 1998.

6. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапаможнік: у 2 ч. Ч. 2 Люты 1917 г. – 2000 г. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.А. Забродскі [і інш.]; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. – 464 с.

7. Страницы истории Компартии Белоруссии (суждения, аргументы, факты). – Минск: "Университетское", 1990.

8. Круталевіч, В.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі (1017–1945 гг.) / В.А. Круталевіч, І.А. Юхо. – Мн., 1998.

9. Игнатенко, И.М. Октябрьская рнволюция и самоопределение Белоруссии / И.М. Игнатенко. – Мн., 1992.

10. Образование СССР 1917–1924 гг.: сб. док. – М., 1949.

11. Государственный архив Витебской области (дальше ГАВО). – Фонд 390. – Оп. 1. – Д. 23.



Репозиторий ВГУ

**ТЭМА 2. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні на савецкай частцы тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг.**

1. Нацыяналізацыя прамысловасці, надзяленне сялян зямлей ва ўмовах “ваеннага камунізма”.

2. Матэрыяльнае становішча народа.

**1. Нацыяналізацыя прамысловасці, надзяленне сялян зямлёй ва ўмовах “ваеннага камунізма”.**

Разглядаючы гэта пытанне, неабходна адзначыць такую асаблівасць: з улікам дастаткова нізкага дакастрычніцкага узроўню развіцця рэгіёна, інтэрвенцыі і жорсткага супраціўлення адхіленых ад улады пластоў насельніцтва, іншых абставін, сацыяльна – эканамічныя пераўтварэнні на савецкай частцы тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг. адбываліся ў складаных умовах. Пачынаючы з лета 1918 г. і да вясны 1919 г. у краіне склалася палітыка, якая увайшла ў гісторыю пад назвай “ваенны камунізм”. Рашэнне аб увядзенні палітыкі “ваеннага камунізму” звязана з неабходнасцю падпарадкаваць абмежаваныя рэсурсы прамысловасці і сельскай гаспадаркі выкананню асноўнай на гэты момант задачы-абараніць савецкую ўладу ад інтэрвентаў і белагвардзейцаў. Дзяржаўныя органы засяродзілі поўную цэнтралізацыю ў кіраванні ўсімі галінамі вытворчасці і размеркавання. Прыняты ў кастрычніку 1918 г. закон аб харчовым падатку, які даваў магчымасць сялянам прадаваць (свабодна) лішкі сваёй вытворчасці), правесці ў жыццё ва ўмовах “ваеннага камунізма” не ўдалося. Уведзена харчовая развёрстка – абавязковая здача сялянствам дзяржаве па вызначаным кошце сельскагаспадарчай прадукцыі. Пры гэтым быў забаронены свабодны гандаль, уведзена абавязковая працоўная павіннасць.

У савецкай гістарыяграфіі склалася канцэпцыя, што “ваенны камунізм” не з’яўляўся абавязковым этапам сацыялістычнай рэвалюцыі. Можна прызнаць, што ў тых умовах, каб выжыць, у дзяржавы іншага выхаду не было. “Ваенны камунізм” - надзвычайная сістэма мер, вызваная выключна цяжкімі ўмовамі, у якія трапіла краіна. Яна ў гэтыя часы магла адстаяць сябе толькі крайнім напружаннем сіл і рэсурсаў. Са снежня 1918 г. у Беларусі быў уведзены рабочы кантроль. На пачатку 1919 г. ён дзейнічаў на 126 прадпрыемствах, што складала каля 66% працуючых у той час фабрык і заводаў. Адначасова праводзілася нацыяналізацыя капіталістычнай уласнасці. За 1918 г. на тэрыторыі, што ўваходзіла ў Паўночна-Заходнюю вобласць, было нацыяналізіравана каля 40 фабрык і заводаў і ўсе 115 спірта-гарэлачных заводаў. У 1919 г. дзяржаўнай стала не толькі буйная, але сярэдняя і нават дробная прамысловасць [1, с. 100]. Да восені 1918 г. у Віцебску ў дзяржаўную форму ўласнасці, у ліку першых, былі пераведзены дзве шчацінныя фабрыкі, кардонная фабрыка «Пудоть», папяровая і абойная

фабрыка, тытунёва-махорачная фабрыка Калбаноўскага. Устудзені 1919 г. у Віцебску па рашэнню Бюро Савета народнай гаспадаркі Заходняй Камуны было нацыяналізавана адно з буйнейшых прадпрыемстваў Беларусі – ільнопрадзільная фабрыка “Дзвіна”. Тут выбрана пастаяннае праўленне, дырэктарам фабрыкі прызначаны М.А. Яўсцігнееў.

У Полоцку за 1918 г. нацыяналізіравана 25 прадпрыемстваў, у тым ліку, 2 скураныя заводы і махорочная фабрыка [2, с. 30]. 16 лютага 1919 года СНК прыняў пастанову аб нацыяналізацыі прамысловых прадпрыемстваў, згодна з ім на працягу гэтага года былі нацыяналізаваны ўсе прадпрыемствы, уласнікі якіх пасля ўсталявання савецкай ўлады выехалі за мяжу. Усяго ў Беларусі да канца 1920 г. нацыяналізавана 338 буйных і 392 дробныя прадпрыемствы. Адначасова ў Магілёве, Віцебску, Гомелі будаваліся новыя прадпрыемствы. У Віцебскай губерні, нягледзячы на ваенныя абставіны, створана 15 майстэрняў для вырабу ваеннай прадукцыі. У канцы 1920 г. на дзяржаўных прамысловых прадпрыемствах працавала 80,1% рабочых, на кааператыўных – 0,9%, а на прыватных – 19% рабочых. Пры пераходзе да мірнага часу прадукцыя буйнай прамысловасці складала толькі 21% да ўзроўню 1913 г. Вельмі слабай была энэргетычная база. Ва ўмовах ”ваеннага камунізму” цэнтралізаванае кіраўніцтва прамысловасцю праяўляецца ў поўнай меры. У Віцебскай, Магілеўскай, Мінскай губернях былі арганізаваны саветы народнай гаспадаркі. Паявіліся глаўкі – адміністратыўныя ўстановы, што ажыццяўлялі тавараабмен. Пераводзіць нацыяналізаваныя прадпрыемствы у дзяржаўную ўласнасць прыходзілася ў складаных умовах: меўся недахоп фінансавых сродкаў, кваліфікаваных кіраўнікоў і рабочых. Адбываецца працэс дэкласіравання рабочага класа. У масавым парадку рабочыя выходзілі ў вёску. Да 1920 г. колькасць рабочых адносна 1913 г. скарацілася на 23,9%. III з’езд КП(б) Беларусі, што адбыўся ў лістападзе 1920 г., прызнаў неабходным увесці прымусовую мабілізацыю рабочых на прадпрыемствы. У практыку ўвайшлі такія формы мабілізацыі рабочых па пераадоленню цяжкасцей, як “тыдні працоўнага фронту”, “тыдні барацьбы з разрухай на транспарце”, “тыдні на нарыхтоўку паліва” і інш. На асобных тэрыторыях была ўведзена працоўная павіннасць. Гэтыя захады дазволілі толькі за два месяцы 1920 г. (ліпень, жнівень) прыцягнуць да працы на прадпрыемствах амаль 38 тыс. рабочых. Аднак задаволіць патрэбу прамысловасці ў рабочай сіле не ўдалося [3, с. 155]. Мерапрыемствы савецкай ўлады сустрэліся з жорсткім супраціўленнем прадстаўнікоў звергнутых класаў. Назіралася дэзерцірства з працоўнага фронту і часткі рабочых. Умацаванне працоўнай дысцыпліны вялося праз выхаванне свядомасці працоўных, павышэнне іх адукацыйнага ўзроўню, а таксама і праз адміністратыўныя меры. На прадпрыемствах ствараліся дысцыплінарныя суды.

Улічваючы масавую непісьменнасць рабочых (у 1920 г. у Беларусі звыш 400 тыс. былі непісьменнымі) у гарадах і мястэчках ствараецца сетка курсавой падрыхтоўкі рабочых. У 1919 г. трохгадовыя палітэхнічныя курсы былі адкрыты ў Магілёве, двухгадовыя – у Гомелі, у мястэчках Цяцерына, Грэбнева, Палынкавічы Гомельскай губерні пачалі працаваць прафтэхшколы з трох- і чатырохмесячным тэрмінам навучання. І усё ж, нягледзячы на тое, што працягвалася грамадзянская вайна, цяжкімі былі абставіны на фронце, закон аб ўвядзенні 8-мі гадзіннага рабочага дня выконваўся строга. Паўсюдна наладжвалася праца грамадскіх пунктаў харчавання, дзе рабочыя маглі атрымаць бясплатны абед.

Перыяд 1918–1920 гг. быў надзвычай цяжкім і для сялянства. Значна скараціліся зямельныя плошчы, пагалоўе жывелы, панавалі разруха, голад і галеча. Валасныя і павятовыя саветы канцэнтравалі сваю работу на ажыццяўленні дэкрэта аб зямлі. Практычна работа па выкананні дэкрэта пачалася ў лістападзе–снежні 1917 г. Адбываліся перавыбары зямельных камітэтаў. У іх склад уключаліся прадстаўнікі бяднейшых сялян. Для вырашэння "хлебнай праблемы" і ўмацавання ўлады ў весцы на Беларусі ствараліся камітэты беднаты (камбеды). Камбеды праводзілі пераразмеркаванне зямлі паміж сялянамі, канфіскацыю хлеба і прылад працы ў заможных гаспадароў (кулакоў), арганізоўвалі камуны і арцелі. Нарыхтоўка сельскагаспадарчых прадуктаў праводзілася спецыяльнымі харчатрадамі метадам харчразвёрсткі, сутнасць якой заключалася ў абавязковай здачы сялянамі лішкаў, а часцей неабходных ім самім прадуктаў харчавання ў фонд дзяржавы фактычна бясплатна. Віцебскі губернскі з'езд камбедаў (лістапад 1918 г.) заклікаў усю беднату да барацьбы за наладжванне "агульнага заворвання зямель і арганізацыю калектыўных і камуністычных гаспадарак". Батрацкім камітэтам перадаваліся для гаспадарчага выкарыстання канфіскаваныя маёнткі памешчыкаў. Да 16 снежня былі канфіскаваны ўсе маёнткі ў Аршанскім павеце, да канца снежня – у Мсціслаўскім і Барысаўскім паветах. Да сярэдзіны лютага 1918 г. у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях канфіскацыя памешчыцкай маёмасці была завершана. Да працоўнага сялянства перайшлі пабудовы, сельскагаспадарчы інвентар, жывёла, насенне памешчыкаў і зажытачных прыватнаўласнікаў. Сяляне былі вызвалены ад плацяжоў Сялянскаму пазямельнаму банку за купленую зямлю і штогадовай арэнднай платы за зямлю памешчыкам, што складала на той час суму каля 50 млн руб. золатам. Для стварэння дзяржгасаў выдзяляліся высокакультурныя гаспадаркі (сады, агароды, плантацыі хмелю, пчолапасекі), для арганізацыі сельскагаспадарчых арцелей – землі сярэдняй і нізкай культурнасці.

Усе гады "ваеннага камунізму" эканамічная палітыка бальшавікоў была сканцэнтравана на ліквідацыі капіталістычных форм уласнасці, перадачы галоўных сродкаў вытворчасці дзяржаўным структурам. Тэзісы

Рэпазіторый ВГУ

ЦК КП(б) Б (студзень1919 г.) арыентавалі мясцовыя ўлады да пераходу ад аднаасобных гаспадарак да калектыўных. Рэкамендацыі ўказвалі Саветам на неабходнасць стварэння на сваіх тэрыторыях ў першую чаргу камун, затым – сельскагаспадарчых арцелей і таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі (ТОЗ). Для аднаасобных гаспадарак магла адводзіцца толькі тая зямля, якая застанецца пасля арганізацыі калектыўных гаспадарак. Першы з'езд саветаў БССР, які адбыўся 4 лютага 1919 г., абвясціў усю зямлю адзіным дзяржаўным фондам, незалежна ад таго, хто ёй карыстаўся да гэтага. Пасля утварэння ЛітБел, яе ўрад і партыйнае кіраўніцтва выказвалася супраць падзелу памешчыцкіх маёнткаў паміж сялянамі і перадачы сялянам канфіскаваных зямляў. Кірунак быў узяты на тое, каб ствараць на базе былых памешчыцкіх маёнткаў саўгасы, камуны і сельгасарцелі. Спачатку ў чэрвені, а затым у ліпені 1919 г., пры абмеркаванні сялянскага пытання, кіраўнікі ЛітБел узялі курс на арганізацыю саўгасаў і аб'яднанне сельскагаспадарчых рабочых у вытворчыя аб'яднанні [4, с. 79]. У тэзісах ліпеньскай нарады "аб уцягненні сялянства ў барацьбу за сацыялізм"былі вызначаны формы эканамічнай падтрымкі бедных пластоў сялян і ў чарговы раз пацверджан курс на фарсіраваную арганізацыю саўгасаў і калгасаў. Рэкамендавалася ўпарадкаваць сялянскае землекарыстанне, забяспечыць сялянскія гаспадаркі гатунковым насеннем, угнаеннямі, палепшыць пароднасць жывёлы, распаўсюдзіць агратэхнічныя веды, дапамагчы ў рамонце інвентару. Менавіта таму масавыя патрабаванні сялян аб надзяленні іх зямлёй з боку ўладных структур адбывалася з моцным тармажэннем. Такое становішча мела месца да сакавіка 1920 г. 2 сакавіка гэтага года ЦК КП(б)ЛіБ пераглядзеў аграрную палітыку. Было вырашана "нацыяналізаваць толькі тыя маёнткі, у якіх ёсць магчымасць весці сапраўды савецкую гаспадарку. Тут жа вырашана "надзяляць зямлей тых, хто мае ў ёй асобую патрэбу, малазямельных і беззямельных сялян за кошт ненацыяналізаваных маёнткаў і кулацкіх сядзіб" [5, с. 283].

Як бачна, аграрная палітыка кіруючай партыі заключалася ў тым каб, даць зямлю значнай часткі беззямельнага і малазямельнага сялянства і ў той жа час захаваць і развіваць вышэйшыя сацыялістычныя формы сельскагаспадарчай вытворчасці, якія разглядаліся як крыніцы дзяржаўнага забеспячэння працоўных і дапамога савецкай улады сялянству ў павышэнні прадуктыўнасці гаспадаркі. На II з'ездзе Саветаў БССР (13–17 снежня 1920 г.) было вырашана адвесці для стварэння саўгасаў не больш за 25% былых непрацоўных гаспадарак з агульнай колькасці тых, што яшчэ не знаходзіліся ў карыстанні сялян [6, с. 50]. Работа па ажыццяўленню дэкрэта аб зямлі ў БССР была завершана да 1921 г. У выніку працоўнае сялянства Беларусі атрымала ў карыстанне дадаткова 1645,8 тыс. дзесяцін зямлі, тым самым яго землекарыстанне павялічылася на 37,7%. Аднак, нягледзячы на ўсе намаганні, стан сельскай гаспадаркі ў

Рэпазіторый ВДУ

1919–1920 гг. заставаўся надзвычай складаным. Абставіны, якія склаліся на беларускай вёсцы з вытворчасцю сельскагаспадарчай прадукцыі, не задавальнялі патрабаванні насельніцтва. Харчовыя тавары размяркоўваліся па картачнай сістэме. Прыватны гандаль хлебам і хлебапрадуктамі забараняўся. Заможныя сяляне абавязаны былі здаваць лішкі прадукцыі дзяржаве. Збор прадуктаў ажыццяўляўся шляхам прымусовай харчразвёрсткі. Нярэдка харчатрады адбіралі ў сялян насенны фонд і прадукты, неабходныя для харчавання. Несумненна, што ў такі няўстойлівы час сярод насельніцтва была пэўная колькасць незадаволеных рэвалюцыяй людзей.

Харчразвёрстка, іншыя нягоды часоў палітыкі "ваеннага камунізма" станавіліся прычынай антысавецкіх выступленняў. Так, 24–29 сакавіка 1919 г. у Гомелі і Рэчыцы адбылося выступленне пад кіраўніцтвам былога афіцэра царскай арміі, эсэра М. Стракапытава. У гэтай акцыі ўдзельнічалі салдаты двух палкоў дывізіі, сфарміраванай у Тульскай губерні, і група жыхароў Гомеля і Рэчыцы. 24 сакавіка паўстанцы ўступілі ў Гомель, дзе Стракапытаў устанавіў асабістую ўладу, якая суправаджалася тэрорам і дэспатызмам. Стракапытаўцы грамілі дзяржаўныя ўстановы, растралялі 25 кіраўнікоў партыйнага і савецкага апарата. У ходзе баявых дзеянняў чырвонаармейцы і рабочыя атрады ўжо 29 сакавіка разграмілі стракапытаўцаў. Сам Стракапытаў і яго акружэнне ўцяклі ў Польшчу, але сталі адной з важнейшых прычын антысавецкіх выступленняў у Слуцкім, Мазырскім, Нясвіжскім і іншых паветах.

Такім чынам, сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні на вызваленай ад нямецкіх акупантаў беларускай зямлі прыходзілася ажыццяўляць у цяжкіх палітычных, эканамічных і знешнепалітычных абставінах. Сацыяльна-эканамічныя мерапрыемствы, якія праводзіліся на Беларусі дзяржаўнымі і партыйнымі органамі Заходняй вобласці, ССРБ, ЛітБел, рэвалюцыйнымі камітэтамі ў 1918–1920 гг., з'яўляліся сістэмай надзвычайных мер, якія павінны былі ўсталяваць дыктатуру пралетарыяту. Эканамічная палітыка Савецкай дзяржавы, якая грунтавалася на харчразвёрстцы, забароне прыватнага гандлю, увядзенні ўсеагульнай працоўнай павіннасці, называлася палітыкай "ваеннага камунізму". Асаблівасці гэтай палітыкі на Беларусі вызначаліся тым, што яе тэрыторыя з'яўлялася тэатрам ваенных дзеянняў і прыфрантавой зонай.

**2. Матэрыяльнае становішча народа, змены ў быце.** Як адзначалася ў папярэднім пытанні, Першая сусветная вайна і замежная інтэрвенцыя адмоўна ўплывалі на жыццё беларускага народа. Гібель на фронце, масавае недаяданне і голад, бежанства прывялі да значнага скарачэння насельніцтва Беларусі. Паводле няпоўных дадзеных, толькі ва ўнутраныя раёны Расіі з Беларусі налічвалася каля 1,3 млн бежанцаў. Калі на пачатку 1914 г. на ўсёй тэрыторыі Беларусі пражывала 7,5 млн чалавек , то на пачатку 1921 г. – 6,7 млн чалавек. Была разбурана за час ваенных дзеянняў і сельская



Рэпазіторый ВДУ

гаспадарка. Змяніўся сацыяльны склад насельніцтва. Не стала памешчыкаў, буйной і сярэдняй буржуазіі, сур'ёзна пацярпела заможнае сялянства. Гэтыя класы страцілі ўласнасць і сродкі вытворчасці. Гэты час абяскровіў гаспадарку БССР. Валавы збор збожжавых культур у параўнанні з даваенным быў меншым у два разы. З восені 1918 г. на Беларусі пачынаецца перыяд абвастрэння харчовага крызісу. Нарміраванае размеркаванне тавараў і прадуктаў харчавання савецкай уладзе дасталася як спадчына. Моцны харчовы крызіс намеціўся яшчэ ў канцы 1915 – пачатку 1916 г. У Віцебску ў 1916 г. была ўведзена картачная сістэма на сахар і пшанічную муку [7, с. 50]. Не змог саўладаць з такой з'явай і Часовы ўрада Расіі.

Працягам гэтага ва ўмовах ваеннага камунізму стала ўвядзенне сутачнай нормы атрымання прадуктаў на пакупніка па фіксаваных цэнах. Так, у Оршы ў канцы сакавіка 1918 г. сутачныя нормы атрымання прадуктаў на аднаго пакупніка былі вызначаны ў памеры: 1 гарнец кіслай капусты па цане 2 руб., 2 фунты прасоленай рыбы па цане 95 кап. за фунт, 1 фунт селядцоў па цане 80 кап. за фунт, 1,5 фунты солі па цане 10 кап., хлеб адпускаўся па цане 40 кап. за фунт беднаце і 80 кап. за фунт усім іншым [8, с. 49–50]. У наступныя месяцы 1918 г. адбылося абвастрэнне харчовага крызісу, што выклікала стыхійны пераход да размеркавання прадуктаў па пайках. У прыватнасці, у Віцебскай губерні такі пераход адбыўся ў маі–чэрвені 1918 г. Праз сістэму нарміраванага пайковага забеспячэння спажыўцы атрымлівалі, у залежнасці ад рэгіёна, ад 20 да 50% прадуктаў харчавання і спажывецкіх тавараў. Канкрэтныя нормы атрымання тавараў і прадуктаў вызначалі мясцовыя органы ўлады ў адпаведнасці з наяўнымі рэсурсамі. Так, у Гарадку ў жніўні 1918 г. спажыўцы першай катэгорыі атрымалі: рабочыя завода "Труд" – па 1 фунту аўсянай мукі, усе астатнія – па 0,5 фунта аржаной і 0,5 фунта аўсянай мукі на едака. Яшчэ больш цяжкім было становішча гарадскіх сярэдніх пластоў насельніцтва, мяшчан, служачых, рамеснікаў і саматужнікаў, дробных прадпрымальнікаў, а таксама ранейшых "эксплуатататараў". Многія з іх жылі ў больш дрэнных умовах, чым рабочыя. Калі яны не састаялі на дзяржаўнай службе, на іх не распаўсюджвалася правіла харчовага пайка і дзяржаўнага фінансавання. У некаторых паветах захоўвалася сістэма ўраўняльнага размеркавання па фіксаваных цэнах. У Лепелі ў 1918 г. хлеб адпускаўся па 2 руб. за фунт , бульба – па 20 руб. за пуд. Рэаліяй паўсядзеннага жыцця, якое пачалося на Беларусі восенню 1918 г і працягвалася да 1921 г уключна, быў голад. Ратавала насельніцтва ў пэўнай меры сістэма нарміраванага забеспячэння. Нормы атрымання прадуктаў і спажывецкіх тавараў вызначалі мясцовыя органы ўлады ў адпаведнасці з наяўнымі рэсурсамі. Напрыклад, у канцы 1920 г. харчовы паёк рабочага ў ССРБ складаўся з 15 фунтаў мукі, 50 грамаў дражджэй, 200 грамаў цукру; служачых – 8 фунтаў мукі, 50 грамаў дражджэй і 200 грамаў цукру ў месяц. Высокакаларыйныя прадукты магчыма было набыць толькі па спекулятыўным цэнам. Выключэнне састаўлялі дзеці,

Рэпазіторый ВДУ

цяжарныя жанчыны: ім мясцовыя ўлады выдзялялі дадатковыя прадукты, адкрывалі сетку бясплатных сталовых. У кастрычніку 1920 г. для завадскіх і фабрычных рабочых і служачых была адменена плата за прадукты, якія яны атрымлівалі праз органы рабочага забеспячэння. У Віцебскай губерні ў кастрычніку 1920 г. грамадскім харчаваннем забяспечвалася 93,3 тыс. чалавек, у Гомельскай – каля 100 тыс.

Асноўны кантынгент, хто карыстаўся бясплатнымі прафсаюзнымі сталовымі, былі інваліды працы, грамадзянскай вайны, беспрытульныя дзеці і беспрацоўныя. У 1921 г. у Віцебскай губерні было зарэгістравана 7560 інвалідаў працы, 6389 – імперыялістычнай вайны, 1633 інваліды грамадзянскай вайны, тысячы беспрытульных дзяцей. Мясцовыя ўлады прымалі ўсе магчымыя меры, каб задаволіць хоць бы мінімальныя патрэбы гэтых катэгорый насельніцтва. Для інвалідаў у Віцебску ў 1922 г. існавала 6 інвалідных дамоў на 284 чал., для іх адкрыты кравецкія і шавецкія майстэрні. Даволі значная работа была праведена па ўладкаванні беспрытульных дзяцей. Дзяржаўныя арганізацыі ў 1920 г. адкрылі ў Віцебску 21 дзіцячую камуну, а ў 1923 г. у горадзе было створана таварыства "Сябры дзяцей", якое ў гэтым жа годзе адкрыла размеркавальнік для беспрытульных дзяцей [7, с. 258]. Акрамя сваіх праблем улады, Віцебшчыны імкнуліся аказваць дапамогу галадаючаму насельніцтву Паволжа. У студзені 1922 г. з Паволжа ў Віцебск прыбыў эшалон, у якім знаходзілася больш за 500 дзяцей, на жаль, 28 з іх ад голаду і тыфу памерлі яшчэ ў дарозе [7, с. 284].

Надавалася ў гэты час увага і сем'ям чырвонаармейцаў, Так, у першай палове 1919 г. дзяжаўную грашовую дапамогу ў Віцебскай губерні атрымала 9601, у Гомельскай 34353 чырвонаармейскія сем'і. Значную матэрыяльную дапамогу Беларусь атрымлівала ад РСФСР. У лістападзе 1920 г. са сваіх фондаў Расія выдзеліла Беларусі 1 млрд рублёў. З цэнтральных і ўсходніх раёнаў РСФСР у Мінск было пастаўлена некалькі вагонаў жыта і пшаніцы, вагон солі, 28 бочак масла. У жніўні таго ж года з Уфы ў Віцебск прыбыло 17 вагонаў хлеба. Але, нягледзячы на ўсе захады, вырашыць праблему харчавання і беспрацоўя ў беларускіх губернях не ўдалося. На біржах працы ў Віцебскай губерні летам 1920 г. было зарэгістравана 12079 беспрацоўных. Галеча гнала рабочых у вёску, яны кідалі працу на прамысловых прадпрыемствах, дэкласіраваліся. Асаблівы размах уцёку рабочых назіраўся ў час пераходу ад вайны да мірнага жыцця на завяршэнні 1920 г.

Змена грамадскага ладу ў краіне пацягнула за сабой змены ў побытавай і працоўнай абраднасці. У паўсядзённае жыццё ўваходзілі мітынгі, сходы, дэманстрацыі. Выбары ў саветы рабочых, сялян і чырвонаармейцаў, што праходзілі паўсюдна, рабочыя і сялянскія канферэнцыі, дзе прымаліся рашэнні па надзённых пытаннях, зрабіліся формай удзелу працоўных у самакіраванні. Новыя грамадскія адносіны

Репозиторий ВГУ

знайшлі праяву ў партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай рабоце. Згодна з партыйным Уставам і Палажэннем аб грамадскіх арганізацыях праходзілі сходы, пасяджэнні калектыўных органаў, на іх абмяркоўваліся праблемы ўнутранай і знешняй палітыкі дзяржавы. Гэта ўспрымалася як удзел простых людзей у кіраванні дзяржаўнымі справамі. У побыт беларусаў уваходзілі камсамольскія вяселлі, чырвоныя хрэсьбіны (акцябрыны), чырвоны Вялікдзень і інш. Першамайскія дні прапагандаваліся як свята працы. Фарміравалася сістэма новых дзяржаўных святаў: Дзень абароны сацыялістычнай Айчыны (23 лютага), Дзень звяржэння самадзяржаўя (12 сакавіка), Дзень парыжскай камуны (18 сакавіка), Дзень пралетарскай рэвалюцыі (7 лістапада). Новыя дзяржаўныя святы мелі падрымку сярод насельніцтва, асабліва моладзі, вызначаліся размахам і масавасцю. Актыўна вялася прапаганда працоўных дасягненняў, ушанаванне перадавікоў працы. Адметнай з'явай гэтага часу стала правядзенне дней грамадскай ініцыятывы па выкананні работ па добраўпарадкаванню гарадоў, паселішчаў , заводаў, чыгункі. Па прыкладзе рабочых чыгуначнай станцыі Масква–Сарціровачная Маскоўска-Казанская сталі праводзіцца суботнікі. Першы суботнік на Беларусі прайшоў 28 чэрвеня 1919 г. у Гомельскіх чыгуначных майстэрнях. У другой палове 1919 г. у Віцебску адбылося 28 суботнікаў, у іх удзельнічала звыш 5000 чалавек. 1 мая 1920 г. на Усерасійскі суботнік у Гомельскай губерні выйшлі 35687 чал. Большасць суботнікаў у гэтыя гады прысвячалася нарыхтоўцы паліва, добраўпарадкаванню чыгункі.

Такім чынам, добра бачна, што дзейнасць савецкай улады ў 1918–1920 гг. праходзіла ў складаных умовах: новае кіраўніцтва сустрэлася з жорсткім супраціўленнем прадстаўнікоў звергнутых класаў, працягвалася грамадзянская вайна. Многія прадпрыемствы былі разбураны, расло беспрацоўе, назіралася масавае дэкласіраванне рабочых.

Надзвычай цяжкім быў гэты перыяд і для сялянства. Значна скараціліся зямельныя плошчы, пагалоўе жывёлы, панавалі разруха, голад і галеча. Такія абставіны прыводзілі да увядзення цэнтралізаванага кіраўніцтва ўсімі сферамі жыцця чалавека.

Спасылкі

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. Дапаможнік: у 2 ч. Ч. 2 Люты 1917 г.– 2000 г. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.А. Забродскі і інш.; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. – 464 с.

2. ДАВВ. – Фонд 2264. – Оп. 1. – Д. 239.

3. История рабочага класа Беларускай ССР. – Мн., 1985. – Т. 2.

4. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (далей РДАСПГ), Фонд.17. – воп 4. – спр. Д. 18.

5. Фіх Б.М. Аграрная рэволюция в Белоруссии (1917–1920 гг.).

6. НАРБ. – Фонд 48. – Оп. – Д. 84.

7. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1 / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст.Э.Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2002. – 648 с.: іл.

8. Комитеты бедноты Белоруссии: сб. документов и материалов. – Мн. 1958.



Репозиторий ВГУ

## ТЭМА 3. Акупацыя польскімі войскамі тэрыторыі Беларусі

1. Інтэрвенцыя з боку Польшчы.
2. Раскол у беларускім грамадска-палітычным руху па пытаннях рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці

**1. Інтэрвенцыя збоку Польшчы.** Перад тым як разглядаць пытанне пра інтэрвенцыю Польшчы супраць Расіі, неабходна высветліць паводзіны краін- удзельніц у Першай сусветнай вайне. Пры разглядзе будзе заўважана, што ўрады як Траістага саюза, так і Антанты імкнуліся прыцягнуць на свой бок актыўных польскіх нацыяналістаў, якія марылі аб аднаўленні гістарычнай Рэчы Паспалітай у межах 1772 г. Аўстра-германскія акупанты 5 лістапада 1916 г. аб'явілі аб стварэнні пад сваім кантролем польскай дзяржавы. Яе ўзначаліў Часовы дзяржаўны савет, а з верасня 1917 г. – Рэгенскі савет на чале з Ю. Пілсудскім. У далейшы час міжнародныя абставіны склаліся так, што ў лістападзе 1918 г. адрадзілася Польская дзяржава. Яе кіраўнік Юзэф Пілсудскі аб'явіў аб сваёй асноўнай мэце – аднавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г. Такі знешнепалітычны курс польскай дзяржавы фарміраваўся пад уплывам вялікадзяржаўнага шавінізму яе кіруючых колаў, а таксама і інтарэсаў краін Антанты. Урадавыя колы Польшчы разлічвалі, што ваенная інтэрвенцыя на тэрыторыю савецкай Расіі і пашырэнне сваіх межаў будзе не толькі рэалізацыяй асноўнай мэты, але і знізіць рэвалюцыйны настрой палякаў.

Інтарэсы краін Антанты заключаліся ў неабходнасці ўключэння Польшчы ў арганізаваны імі антысавецкі фронт, а ў перспектыве – стварэння санітарнага кардона на ўсходняй мяжы. Інтэрвенцыя Польшчы прыкрывалася быццам рыхтуемай савецкай агрэсіяй, па словах прэм'ер міністра І. Падзярэўскага "крывавай хваляй расійскага бальшавізму". У пачатку 1919г., пры ўдзеле заходніх краін, Польшча пачала ўзмоцненую падрыхтоўку да вайны з Савецкай Расіяй. 29 жніўня 1918 г. савецкі урад, "прызнавая права польскага народа на самавызначэнне", заявіў пра адмову ад дагавораў па раздзелу Польшчы і прапанаваў дамовіцца аб добрасуседстве дзвюх дзяржаў з улікам законных правоў і інтарэсаў усіх, хто пражывае ў памежным рэгіёне. Аднак, нягледзячы на запэўніванне савецкага урада аб зацікаўленасці ў міры, гатоўнасці вырашаць з Польскай дзяржавай усе спрэчныя пытанні "палюбоўна" і захоўваць добрасуседскія адносіны з польскім народам, Польшча вяла лінію на абвастрэнне адносін з усходнімі суседзямі. Польскія кіраўнікі зрабілі контрпрапанову, у якой заявілі аб неабходнасці вываду Чырвонай Арміі за Днепр, за Смаленск для правядзення на гэтых землях "плебісцытаў" з мэтай выяўлення волі насельніцтва: належуць гэтыя землі Савецкай Расіі ці Польшчы. Кіраўніцтва РСФСР такую прапанову прыняць не магло [1, с. 24]. Польскія легіёны пры падтрымцы нямецкіх войскаў,якія ў гэты час адступалі, сталі планамерна займаць і замацоўвацца на частцы заходнебеларускіх земель.



Репозиторий ВГУ

У выніку, да лютага 1919 г. склалася часовая польска-савецкая мяжа па лініі Вільня–Ліда–Слонім–Агінскі канал. Аднак такая сітуацыя не задавальняла абодва бакі. Польскія ўлады лічылі неабходным прасунуць мяжу на ўсход і адмовіліся прызнаць ЛітБел ССР. Улады Савецкай Расіі разлічвалі на "экспарт рэвалюцыі" ў Польшчу. У канцы лютага 1919 г. Польшча пачала спланаваную і добра падрыхтаваную інтэрвенцыю. Польскія войскі захапілі значную частку Гродзенскай губерні, затым ім удалося заняць Брэст, Ваўкавыск, Слонім, Шчучын, Пінск, Баранавічы. Чырвоная Армія ў гэты час не змагла аказаць ім значнага супраціўлення. Вясной 1919 г. польскія акупанты занялі Ліду, Вільню, Мінск, Слуцк, Барысаў, Бабруйск, Жлобін, Рагачоў, Рэчыцу. На лініі ракі Бярэзіна фронт стабілізаваўся і заставаўся на гэтай пазіцыі аж да вясны 1920 года. На занятых польскімі войскамі тэрыторыях ліквідаваліся створаныя бальшавікамі органы ўлады, распускаліся прабальшавіцкія арганізацыі. У органы грамадзянскай адміністрацыі ўваходзілі толькі тыя, хто лічыў сябе палякам. Дзяржаўнай мовай абвяшчалася польская. Аднаўлялася памешчыцкае землеўладанне. Польскае войска ў шырокіх памерах праводзіла рэквізіцыі сельскагаспадарчай прадукцыі.

Пасля таго, як на польскі фронт былі перакінуты значныя сілы Чырвонай арміі, у ліпені 1920 г. пад камандаваннем М. Тухачэўскага ажыццяўляецца яе буйны наступ. Да пачатку жніўня ўся тэрыторыя Беларусі знаходзілася пад кантролем бальшавікоў. У сярэдзіне жніўня Чырвоная армія падыйшла да Варшавы і Львова [2, с. 184, 187, 192]. У гэты час Савецкая Расія імкнулася забяспечыць нейтралітэт з боку Літоўскай рэспублікі. 12 ліпеня 1920 года Савецкая Расія і Літва падпісалі дагавор, згодна з якім РСФСР прызнавала незалежнасць Літоўскай рэспублікі з уключэннем у яе склад Віленскай і часткі Гродзенскай губерняў з гарадамі Вільня, Гродна, Ліда, Вілейка, Ашмяны, Смаргонь, Браслаў. Названы дагавор азначаў фармальную ліквідацыю ЛітБел ССР. У дадзеных умовах было прынята рашэнне аб аднаўленні беларускай савецкай дзяржавы. 31 ліпеня 1920 г. у Мінску была прынята Дэкларацыя аб незалежнасці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Часовая ўлада перадавалася Ваеннарэвалюцыйнаму камітэту (старшыня – А. Чарвякоў), які павінен быў дзейнічаць да ІІ з'езда Саветаў Беларусі. Аднаўленне БССР акрамя бальшавікоў падтрымалі Бунд і Беларуская камуністычная арганізацыя, якая неўзабаве далучылася да бальшавіцкай партыі.

Беларуская партыя сацыялістаў рэвалюцыянераў (БПСР) патрабавала стварэння ўрада з прадстаўнікоў усіх сацыялістычных партый, арганізацыі самастойнага беларускага войска і абвяшчэння поўнай незалежнасці Беларусі. Гэта выклікала разрыў саюза паміж БПСР і бальшавікамі. У снежні 1920 г. адбыўся ІІ Усебеларускі з'езд Саветаў у Мінску. На ім у Канстытуцыю БССР былі ўнесены змены, згодна з якімі ЦВК станавіўся распараджальным органам з'езда, выканаўчая ўлада надавалася СНК БССР. Старшынёй ЦВК і СНК БССР стаў А. Чарвякоў. З'езд ратыфікаваў

Рэпазіторый ВДУ

умовы савецка-польскага пагаднення ад перамір'і і надаў ураду Савецкай Расіі права заключаць любыя міжнародныя пагадненні ад імя БССР. У гэты час беларускае і польскае кіраўніцтва было зацікаўлена ў хуткім спыненні вайны. На гэта ўплывала складаная эканамічная і ваенна-палітычная сітуацыя ў абедзвюх дзяржавах. На тэрыторыі Беларусі, занятай як польскімі, так і савецкімі войскамі, адбываліся частыя хваляванні, дзейнічалі шматлікія паўстанцкія атрады. Пры падтрымцы польскага боку, у лістападзе 1920 г. на тэрыторыю Палесся ўвайшлі атрады (каля 20 тыс. чал.) пад кіраўніцтвам С. Булак-Балаховіча, які абвясціў сябе начальнікам Беларускай дзяржавы. Яны занялі Пінск, Мазыр, Калінкавічы, але ў снежні 1920 г. былі разбітыя Чырвонай арміяй. З 27 лістапада па 28 снежня 1920 г. адбылося Слуцкае ўзброенае паўстанне, якое ўзначальвалі прыхільнікі незалежнай БНР. У паўстанні ўдзельнічала каля 4 тыс.чал. Пры адыходзе польскіх частак паўстанцы вымушаны былі скласці зброю. Спачатку ўдзельнікі паўстання былі інтэрніраваны і зняволены, але затым вызвалены [3, с. 7–8]. Так закончыліся падзеі, звязаныя са Слуцкім паўстаннем, а таксама і з антыбальшавіцкімі паўстаннямі, якія адбыліся ў Гомелі, Койданаве, Аршанскім, Бабруйскім, Барысаўскім і Ігуменскіх паветах.

**2. Раскол у беларускім грамадска- палітычным руху па пытаннях рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці.** Польскія ўлады імкнуліся стварыць пэўную сацыяльную базу сярод беларускага насельніцтва. 28 красавіка 1919 г. Ю. Пілсудскі, пад час выступлення ў Вільні са зваротам да насельніцтва былога ВКЛ, абвясціў права народаў на самавызначэнне ў межах федэрацыі з Польшчай, паабяцаў, што дасць магчымасць ім самім вырашаць і ажыццяўляць свае нацыянальныя ідэі і рэлігійныя справы. Дадзеная заява, а таксама дазвол на аднаўленне дзейнасці Рады БНР (у кастрычніку 1919 г,), на ўжыванне беларускай мовы ў грамадскім жыцці ў Мінскай акрузе, дзе польскія пазіцыі былі дастаткова слабымі, аднаўленне дзейнасці Беларускага педагагічнага інстытута ў Мінску, іншыя фактары абумовілі супрацоўніцтва з польскім уладамі некаторых дзеячаў беларускага нацыянальнага руху. Частка яго прадстаўнікоў (Я. Лёсік, А. Смоліч, І. Серада, В. Іваноўскі, К. Цярэшчанка, С. Рак-Міхайлоўскі, А. Уласаў і інш.) ў першыя гады пасля грамадзянскай вайны не адмовіліся ад ілюзій, звязанных са стварэннем беларускай тэрытарыяльнай дзяржаўнасці на федэрацыйных пачатках з Польшчай. Прадстаўнікі Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі і правацэнтрысцкіх беларускіх арганізацый, якія мелі надзеі на нацыянальнае адраджэнне і разлічвалі на стварэнне федэрацыі Беларусі з Польшчай у складзе абноўленай Рэчы Паспалітай, узялі курс на супрацоўніцтва з польскімі ўладамі. У верасні 1919 г. у Варшаву па запрашэнні выехаў старшыня Народнага сакратарыята БНР А. Луцкевіч. Ён згадзіўся на прапановы польскага боку аб утварэнні федэрацыі пры прызнанні незалежнасці БНР. Прызнанне БНР палякі паставілі ў



Репозиторий ВГУ

залежнасць ад вынікаў вайны з Літвой і Расіяй. У той жа час у беларускім грамадска-палітычным руху па пытаннях рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці наглядаецца размежаванне. Супраць планаў збліжэння з Варшавай выступіла партыя беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў (БПСР), кіраўніцтва якой знаходзілася ў буржуазнай Літве. БПСР і палітычныя цэнтры, што знаходзіліся пад яе кантролем, рабілі стаўку на падрыхтоўку ўзброенага паўстання, якое на іх думку павінна было ахапіць як тэрыторыю БССР, так і рэгіён Заходняй беларусі з мэтай аб'яднання пад эгідай так названай БНР абедзвюх яе частак. У якасці палітычнага прынцыпа яны вылучылі лозунг "У барацьбе за нацыянальную дзяржаўнасць і свабоду – ні з Масквой, ні з Варшавай!" Гэта было паўторам раней вылучанай эсэрамі ідэі аб "трэцім шляху", пошукі якога вяліся ў часы грамадзянскай вайны і завяршыліся тады поўным крахам. У дадзеных умовах такая ідэя выглядала яшчэ больш бесперспектыўнай. Планы эсэраў, звязанные з паўстаннем, праваліліся нават у тых раёнах Заходняй Беларусі, дзе яны разлічвалі на падтрымку. У снежні з партыі беларускіх эсэраў вылучылася група "Маладая Беларусь", у складзе **В. Ігнатоўскага, І. Каранеўскага, В. Сташэўскага, М. Кудзелькі (Чарота)** і інш. Яна стварыла Беларускую камуністычную арганізацыю (БКА).

У кастрычніку 1919 г. Ю. Пілсудскі даў дазвол на аднаўленне дзейнасці Рады БНР, маючы надзею на перавагу ў ёй прыхільнікаў прапольскай арыентацыі і прыняцце рашэнняў пра далучэнне БНР да Польшчы. Аднак да гэтага часу ў самой Радзе БНР нарастае супраціўленне збліжэнню з Польшчай. Калі раней у якасці легальнай апазіцыі польскім уладам выступала нязначная частка беларускага нацыянальнага руху на чале з Беларускай партыяй сацыялістаў-рэвалюцыянераў, то ў снежні 1919 года на сесіі Рады БНР адбыўся яе раскол на антыпольскую і прапольскую групы. Антыпольская група (50 чалавек) утварыла Народную раду БНР на чале з сацыялістам-федэралістам П. Крачэўскім і кабінет міністраў на чале з беларускім эсэрам В. Ластоўскім. Яны заявілі аб вернасці Трэцяй Устаўной грамаце БНР і выказалі пратэст супраць акупацыі Беларусі польскай арміяй. Прапольская фракцыя (37 чалавек) утварыла Найвышэйшую раду БНР на чале з сацыял-дэмакратам Я. Лёсікам і пацвердзіла паўнамоцтвы ўрада Антона Луцкевіча. У хуткім часе Народная рада БНР была забаронена польскімі уладамі, а многія яе лідары арыштаваны. Прэзідыум і ўрад Народнай рады БНР з лістапада 1920 г. знаходзіліся ў сталіцы Літвы Коўне. Адмова польскіх улад разглядаць пытанне аб фарміраванні беларускай дзяржаўнасці прывяла да крызісу і распаду ў 1920 г. Найвышэйшай рады БНР і яе ўрада.

Спасылкі


1. Волаціч, М. Лінія Керзона на фоне падзеяў і тэрытарыяльных зьменаў у Усходняй Эўропе / М. Волаціч //Спадчына. – 1993. – № 6.

2. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Т 2. – Мн., – 1972.

3. Окулевіч, Г. 50 лет Белорусской Республики / Г. Окулевич // Вестник. – Торонто. – 1968.




Репозиторий ВГУ

## ТЭМА 4. Супраціўленне беларускага народа польскім акупантам

1. Барацьба супраць польскіх акупантаў.
2. Няўдачы Чырвонай Арміі на завяршальным этапе вайны. Рыжскі мірны дагавор.

**1. Барацьба супраць польскіх акупантаў.** На акупіраванай тэрыторыі наводзіліся польскія парадкі: аднаўлялася памешчыцкае землеўладанне, на фабрыках і заводах – капіталістычныя адносіны, багацці Беларусі перапраўляліся ў Польшчу. Былі ліквідаваны органы мясцовага самакіравання, створаныя бальшавікамі і Радай БНР, забаронены прафсаюзы і іншыя рабочыя арганізацыі. Палітычныя апаненты, яўныя і патэнцыйныя, падвергліся жорсткім рэпрэсіям. У культурным жыцці праводзілася паланізацыя – дзяржаўнай мовай аб'яўлена польская. Вырасла беспрацоўе, пагоршылася матэрыяльнае становішча працоўных. Палітыка польскіх уладаў выклікала незадаволенасць значнай часткі насельніцтва, нарастае супрацьстаянне захопнікам. Узброеную барацьбу супраць польскіх улад узначальвалі бальшавікі, беларускія эсэры, Беларуская камуністычная арганізацыя (узнікла на аснове левага крыла БПСР), яўрэйскія сацыялістычныя партыі (Бунд, Паалей-Цыён). У снежні 1919 г. паміж гэтымі партыямі было заключана пагадненне аб сумесных дзеяннях. Напрыканцы 1919 – пачатку 1920 гг. БПСР становіцца масавай беларускай партыяй (да 20 тыс. чалавек). У сакавіку 1920 г. сілы антыпольскага фронту стварылі Беларускі паўстанцкі камітэт. Партызанскі рух у першай палове 1920 г. набыў шырокі размах. Вясной 1920 г. польскія ўлады вымушаны былі спыніць ваенныя перавозкі амаль на ўсіх чыгуначных магістралях Беларусі. Арганізатарам і кіраўніком барацьбы за правы беларусаў была камуністычная партыя. ЦК КП(б) Літвы і Беларусі ў сакавіку 1919 г. прыняў рашэнне аб стварэнні на акупіраванай тэрыторыі камуністычнага падполля і партызанскіх атрадаў. Былі створаны два краевыя партыйныя цэнтры – у Мінску і Гродна і дапаможныя – у Віцебску і Гомелі. Да кастрычніка 1919 г. фарміраванне камуністычнага падполля завяршылася стварэннем Цэнтральнага бюро камуністычных арганізацый. Беларускія эсэры, Саюз беларускай моладзі, РКП(б) Беларусі дабіваюцца пагаднення і ствараюць партызанскі рух, адзіны антыпольскі фронт. Адным з вядомых кіраўнікоў партызанскага руху, які узначальваў Мінскую падпольную арганізацыю, быў упаўнаважаны ЦК КП(б)Л і Б **В.Ф. Шаранговіч**, будучы сакратар ЦК КПБ. Барацьба супраць польскіх акупантаў ахапіла ўсю тэрыторыю Беларусі. Сацыяльнай базай нарастаўшай барацьбы быў рабочы клас. Пад уплывам рабочых сталі больш частымі выступленні сялян. Партызанскі рух ахапіў Мінскі, Бабруйскі, Пінскі, Слуцкі і іншыя паветы. Вялікія страты наносілі акупантам партызанскія атрады **М. Арбузава, В. Аляшкевіча, А. Блажко, І. Бачко, А. Крывашчокава,**

Рэпазіторый ВДУ

**І. Маслыка, С. Плашчынскага, В. Пагірэйчыка, І. Жынко і інш.** Партызаны разбуралі камунікацыі польскіх войскаў, рабілі раптоўны налет на іх гарнізоны, праводзілі разведку па заданні камандавання Чырвонай Арміі, здабываючы звесткі аб дыслакацыі і перасоўванні.

У сакавіку 1920 г., пры дапамозе краін Антанты, Польшча стварае на фронце значную перавагу сіл (пяціразовую), але прасунуцца далёка на Усход ёй не ўдалося. Перакідванне сіл з Усходняга фронту дало магчымасць Чырвонай Арміі прыпыніць наступленне палякаў, а затым 14 мая 1920 г. перайсці ў контрнаступленне, але з-за ўзнікшых цяжкасцей прыйшлося вярнуцца на свае ранейшыя пазіцыі. Новае наступленне Чырвонай Арміі ў ліпені 1920 г. прыносіць поспех: 7 ліпеня ад палякаў вызвалены Мінск; 1 жніўня – Брэст. Масавая ўзброеная барацьба рабочых і сялян Беларусі супраць акупантаў і актыўная дапамога Чырвонай Арміі дазволілі летам 1920 г. паставіць на парадак дня пытанне аб паўторным абвяшчэнні Беларускай савецкай рэспублікі. Вызваленне Мінска дало магчымасць прыступіць да практычнага вырашэння гэтага пытання. 30 ліпеня 1920 г. быў створаны Ваенна-рэвалюцыйны камітэт рэспублікі. У яго ўвайшлі прадстаўнікі кампартыі, БКА, Бунда і Цэнтральнага Бюро прафсаюзаў Мінска. 31 ліпеня 1920 г. Ваенрэўкам выдаў **"Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь** [1, с. 194]. Так, у другі раз была абвешчана ССРБ, але ў памеры толькі шасці паветаў Мінскай губерні. Насельніцтва Беларусі складала 1,5 млн чалавек. 11 жніўня 1920 г. РСФСР, у адпаведнасці з латвійска-расійскім дагаворам, перадала Латвіі тры беларускія паветы (Дзвінскі, Рэжыцкі, Люцынскі) [2, с. 32–33].

**2. Няўдачы Чырвонай Арміі на завяршальным этапе вайны. Рыжскі мірны дагавор.** У сваім руху на Захад у бальшавікоў была надзея, што рабочы клас і сялянства Польшчы, падымецца на барацьбу з уласнымі прыгнятальнікамі, дапаможа Чырвонай Арміі. Гэтага не адбылося. 16 жніўня 1920 г. польскае войска перайшло ў контрнаступленне, і здолела разбіць пад Варшавай Чырвоную Армію. На працягу жніўня–кастрычніка 1920 г. палякі занялі заходнюю частку Беларусі. Адарваўшыся ад сваіх тылоў, Чырвоная Армія вымушана была адступаць. Польскія часткі пры ваеннай дапамозе Антанты пачалі хутка займаць тэрыторыі, якія раней (у ліпені–жніўні) былі адваяваны Чырвонай Арміяй. 17 жніўня 1920 г. у Мінску пачаліся перамовы паміж РСФСР і УССР з аднаго боку і Польшчай з другога. Але ў час перамоў урад Польшчы працягваў наступальную ваенную агрэсію на беларускія землі. 9 кастрычніка 1920 г. палякі захапілі Вільню і абвясцілі аб утварэнні дзяржавы Сярэдняя Літва на тэрыторыі Віленскага, Трокскага, Свянцянскага, Лідскага, Ашмянскага і Браслаўскага паветаў, якая была ўключана ў склад ІІ Рэчы Паспалітай у якасці Віленскага ваяводства. Гэта выклікала палітычны канфлікт

Рэпазіторый ВДУ

Польшчы з Літвой. На 12 кастрычніка 1920 г. войскі Заходняга фронту адышлі на лінію возера Нарач–Койданава–Слуцк–Князь-возера. 15 кастрычніка польскія часткі занялі Мінск, але праз два дні пакінулі яго, бо па ўмовах перамір'я горад павінен быў заставацца за савецкім бокам [3, с. 32–33]. 12 кастрычніка 1920 г., перамовы перанесеныя яшчэ ў верасні ў Рыгу, прадоўжыліся. Тут былі вызначаны папярэднія ўмовы падпісання мірнага дагавора. Польская дэлегацыя канкрэтызавала іх наступным чынам: хуткае заключэнне міру і ўстанаўленне добрых узаемаадносінаў; адмаўленне Польшчы ад прэтэнзій на мяжу 1772 г і згода на мяжу 1793 г; неўмяшанне ва ўнутраныя справы абодвух бакоў і інш.) [4, с. 37]. Савецкі бок у асноўным з прапановай пагаджаўся. 12 кастрычніка 1920 г. у Рызе паміж Савецкай Расіяй і Польшчай было падпісана перамір'е і пачаліся мірныя перамовы. Але, як і раней, кіраўніцтва Польшчы не адмаўлялася ад сваіх планаў у адносінах да беларускай зямлі. Польшча аказвала падтрымку антысавецкім сілам у Беларусі. З Прыбалтыкі ў Беларусь былі перакінуты антысавецкія фарміраванні С. Булак-Булаховіча, перад якім была пастаўлена задача прабіцца ў глыб тэрыторыі, захапіць Мінск і аб'явіць сябе дыктатарам, пасля чаго сфарміраваць грамадзянскае кіраўніцтва з удзелам беларускіх нацыянальных дзеячаў. Падрыхтоўка да нападу не прыпынілася і ў час правядзення савецка-польскіх перамоў. Польскі ўрад рабіў выгляд, што не мае да гэтага ніякага дачынення. Армія Булак-Булаховіча налічвала 7860 штыкоў і 3500 шабляў. 25 кастрычніка 1920 г. штаб С. Булак-Булаховіча і Беларускі палітычны камітэт прыбылі ў Тураў, дзе былі сканцэнтраваны асноўныя сілы гэтай арміі. 6 лістапада 1920 г., згодна з загадам Булак-Булаховіча, пачалося наступленне; 8 лістапада асноўныя сілы падышлі да Петрыкава, а 10 лістапада змаглі авалодаць гэтым населенным пунктам, а таксама узяць і горад Мазыр. Першапачатковы поспех арміі Булак-Булаховіча быў абумоўлены тым, што часткі савецкай арміі ў гэтым рэгіёне былі аслаблены папярднімі баямі з польскімі легіёнамі. У захопленых булахоўцамі раёнах вышэйшым органам улады аб'явіў сябе Беларускі палітычны камітэт, Булак-Булаховіч асабіста прысвоіў сабе тытул галоўнакамандуючага ўсімі ўзброенымі сіламі на тэрыторыі Беларусі, аб'явіў аб утварэнні "Беларускай Народнай Рэспублікі". Сабраўшы сілы, Чырвоная Армія 16–19 лістапада нанесла паражэнне арміі Булак-Булаховіча. Каб выратавацца ад непазбежнага акружэння, рэшткі арміі кідалі абозы,узбраенне і маёмасць спасаліся бегствам. Практычна адначасова з выступленнем Булак-Булаховіча ўспыхнула Слуцкае паўстанне. Аднак усе намаганні Польшчы пашырыць свае межы за кошт савецкай Беларусі былі дарэмны. Да канца снежня 1920 г. часткі Чырвонай Арміі ўзялі пад свой кантроль тэрыторыю Слуцкага павета на ўсход ад дэмаркацыйнай лініі. Слуцкая брыгада стралкоў БНР адышла за р. Морач, дзе была раззброена і інтэрніравана польскімі войскамі.

18 сакавіка 1921 г. паміж Савецкай Расіяй і Польшчай быў падпісаны Рыжскі мірны дагавор, згодна з якім да Польшчы адыходзіла заходняя частка Беларусі (Віленская, Гродзенская, частка Мінскай губерняў: 108 тыс. км. кв., дзе пражывала больш за 4 млн. чалавек), усходняя частка беларускай тэрыторыі (Віцебшчына, Магілёўшчына, Гомельшчына) адыходзілі да Савецкай Расіі. У выніку Рыжскай мірнай дамовы тэрыторыя Беларусі аказалася невялікай. За БССР прызнаваўся суверэнітэт на тэрыторыі толькі шасці паветаў Мінскай губерні (Мінскі, Ігуменскі, Барысаўскі, Бабруйскі, Слуцкі, Мозырскі), з тэрыторыяй 52 тыс. кв. км і насельніцтвам каля 1,5 млн чалавек.У такім выглядзе яна існавала амаль 3 гады.

Такім чынам, бачна, што у выніку рэвалюцый у Германіі і Аўстра-Венгрыі стала магчымым абвяшчэнне незалежнай Польскай рэспублікі. Ад самага пачатку свайго існавання яе ўлады праводзілі палітыку захопу тэрыторый для аднаўлення той дзяржавы, якая існавала да 1772 г. Першай ахвярай на шляху польскіх войскаў была Беларусь. У выніку агрэсіўнай палітыкі польскага кіраўніцтва да 1920 года акупіраванай аказалася значная частка тэрыторыі Беларусі, тут наводзіліся польскія парадкі, аднаўлялася памешчыцкае землеўладанне, пад забаронай знаходзіліся грамадскія арганізацыі. На захопленай тэрыторыі нарастала супрацьстаянне польскай экспансіі, прымаліся захады па ўмацаванні Чырвонай Арміі. Але цяжкае эканамічнае становішча савецкай краіны, не зусім удалыя дзеянні частак і злучэнняў, у тым ліку і з-за дрэннай матэрыяльнай забяспечанасці, прымусілі Савецкі Урад пайсці на заключэнне цяжкага для беларусаў Рыжскага мірнага дагавора, згодна з якім вялікая тэрыторыя з беларускім насельніцтвам адышла да Польшчы. У выніку вайны распалася Літоўска-Беларуская дзяржава, якая стала падмуркам развіцця беларускай дзяржаўнасці ў далейшым.

Спасылкі


1. Гісторыя Беларускай ССР: у 5т.Т.3.Мн., 1973.
2. Казлоў Л, ЦітоўА. Беларусь на сямі рубяжах. Мн. 1993..
3. Круталевіч,В. Рыжскі мірны дагавор/ В. Круталевіч // Спадчына. -1990. №1
4. Волаціч М. Лінія Кэрзона на фоне падзеяў і тэрытарыяльных зьменаў у Усходняй Эўропе// Спадчына. 1994.№1.


Репозиторий ВГУ

## Тэма 5. Пошукі шляхоў выхаду з крызісу ў мірных абставінах

1. Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі на пачатку 20-х гадоў.
2. Удзел БССР у стварэнні СССР/
3. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел БССР.

**1. Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі на пачатку 20-х гг.** Усе аўтары, якія маюць адносіны да асвятлення гэтага пытання,

адзначаюць катастрафічны стан эканомікі Савецкай Расіі і Беларусі на пачатку 20-х гг. Аказаўшыся ў складаным становішчы, маладая савецкая рэспубліка вясной 1918 г. , вымушана была прыняць надзвычайныя меры ў галіне эканомікі, якія ў далейшым атрымалі назву палітыкі "ваеннага камунізму". Непрыкрытыя рэквізіцыі ў час правядзення харчовай развёрсткі і манаполіі хлебнага гандлю, нацыяналізацыя ўсёй прамысловасці, жорсткае размеркаванне харчовых і прамысловых тавараў, прывялі краіну ў моцны крызісны стан. У 1920 г. ў Расіі выпускалася ў параўнанні з даваенным часам толькі 16% прамысловай прадукцыі. Велізарныя страты былі нанесены транспарту: каля 60% паравозаў і вагонаў выйшлі са строя. Назіраўся паліўны крызіс, дэкласіраванне рабочага класа. У буйной прамысловасці Расіі колькасць працаўнікоў знізілася ад 1913 г. больш чым удвая (з 2,5 млн да 1,2 млн). У стане заняпаду знаходзілася сельская гаспадарка: яе прадукцыя складала меншчым дзве траці ад даваеннай.

Гаспадарчыя цяжкасці і гаротнае становішча насельніцтва ў час сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў у 1918–1920 гг., калі прымянялася палітыка "ваеннага камунізму" (аб чым падрабязна апавядалася ў папярэднім раздзеле) спрыялі антысавецкім узрушэнням – нежаданню сялян, рабочых і вайскоўцаў мірыцца з практычнымі дзеяннямі мясцовай савецкай ўлады.

Зімой 1921 г. савецкая дзяржава знаходзілася па сутнасці ў фазе выспявання новай грамадзянскай вайны. Кульмінацыяй яе стала Кранштацкае паўстанне, антыўрадавыя выступленні ў тамбоўскай губерні, на Доне, у Заходняй Сібіры. Для таго, каб яшчэ паўней разгледзіць пытанне аб крызісным стане, неабходна звярнуць увагу на міжнародныя абставіны. Цяжкае ўнутранае становішча савецкай Расіі дапаўняў моцны сусветны эканамічны крызіс. Краіны, якія былі ўцягнуты ў І сусветную вайну, заняты ў гэты час вырашэннем сваіх эканамічных і сацыяльных праблем. У адносінах да Савецкай Расіі ў іх кіраўніцтва існуюць два погляды. Першы – імкненне да развіцця эканамічых адносін і вяртанне Расіі на рэйкі капіталізму. Другі – аднаўленне супраць Саветаў узброенага паходу. Аднак, па словах Леніна, хоць ад усялякага нападу мы на валаску, Расія ў міжнародных адносінах мае новае становішча, калі наша асноўнае міжнароднае існаванне сярод капіталістычных дзяржаў адваявана. На Міжнароднай эканамічнай канферэнцыі ў Генуі (адкрылася 10 красавіка 1922 г.) капіталістычныя краіны настойліва патрабавалі ад Расіі захаваць права прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці, свабодны гандаль, прызнанне ўсіх узятых на сябе даўгавых абавязкаў.У ходзе перамоў савецкія прадстаўнікі адверглі патрабаванні заходніх краін аб звароце нацыяналізаванай уласнасці іншаземцам, прызнанні ўсіх фінансавых абавязкаў дарэвалюцыйнага ўрада. Дэлегацыя Расіі патрабавала ад краін Захаду пакрыць ёй страты, нанесеныя вайнамі і блакадай. У прадмесці

Рэпазіторый ВДУ

Генуі – Раппале з Германіяй быў заключаны дагавор, які прадугледжваў неадкладнае ўстанаўленне дыпламатычных адносін, узаемны адказ ад пакрыцця ваенных расходаў і страт, нанесеных вайной, развіццё эканамічных адносін на аснове прынцыпу найбольшага спрыяння.Тут жа шукаюцца шляхі па дасягненню згоды з краінамі Антанты. Савецкі ўрад пагаджаўся прызнаць і прыняць да ўплаты праз 15–10 год некаторыя даваенныя даўгі пры прадастауленні крэдытаў маладой краіне. Канферэнцыі ў Генуі, затым – у Гаазе (з 15 чэрвеня па 20 ліпеня 1922 г.) мелі важнае палітычнае значэнне: удзел Савецкай Расіі ў дзвюх буйнейшых канферэнцыях у якасці паўнавартаснага члена азначаў яе фактычнае прызнанне асноўнымі капіталістычнымі дзяржавамі.

Як бачна, у выніку сукупнасці падзей, звязаных з экстрымальнымі ўмовамі ваеннага часу, эканоміка Савецкай дзяржавы апынулася ў глыбокім крызісе. У стане заняпаду знаходзілася і прамысловасць, і сельская гаспадарка.

Беларусь, з’яўляючыся на працягу сямі гадоў арэнай ваенных дзеянняў, панесла яшчэ большыя страты, чым рэгіёны цэнтральнай Расіі. Тут пасяўныя плошчы скараціліся, ў параўнанні з даваенным часам, на 1/3, валавыя зборы зерня – напалову, рэзка знізіліся ўраджайнасць і пагалоўе жывёлы. Прадукцыя сельскай гаспадаркі складала менш за дзве трэці ад даваеннай. Сацыялістычныя формы гаспадарання – саўгасы, калгасы і камуны – не карысталіся папулярнасцю ў сялян, былі ўбытковымі, або проста слабымі.

У заняпад прыйшла прамысловасць, транспарт, гандаль. Да канца 1920 г. у савецкай частцы Беларусі працавалі з перабоямі толькі 40% буйных прадпрыемстваў, на якіх было занята каля 70% усіх рабочых даваеннага часу. З-за недахопу паліва амаль цалкам быў паралізаваны чыгуначны і водны транспарт. Адбывалася хуткая інфляцыя, рост цэн. Усё гэта прывяло да значнага пагаршэння матэрыяльнага становішча насельніцтва. Заработная плата рабочых у прамысловасці БССР складала каля 10–20% даваеннага ўзроўню, яна насіла пераважна натуральны характар. Рэзка ўзрасло беспрацоўе, якое ў некаторых раёнах дасягала 75%. Надзвычай цяжка было з харчаваннем, асабліва ў гарадах. З паведамлення Гомельскага губкама і губвыканкама 5 мая 1919 г. ў Маскву бачна, што ўжо цэлы месяц насельніцтву горада не выдаваліся прадукты харчавання, і горад знаходзіцца напярэдадні бунта. Многія рабочыя, каб знайсці сродкі да існавання, ўцякалі ў навакольныя вёскі, дзе наймаліся на працу. Вялікія памеры набыла міграцыя насельніцтва, эвакуацыя і рээвакуацыя. Цэнтральнымі, і па ліку найбольшымі, фігурантамі ў весцы засталіся збяднелыя сярэднякі. Не хапала цяглавай сілы, тысячы сялян засталіся без жылля. У вёсцы расло незадавальненне, выклікане палітыкай прадразвёрсткі.

Репозиторий ВГУ

Цяжкасці ў аднаўленні народнай гаспадаркі на Беларусі ўскладняліся яе памежным становішчам. У памежных раёнах рэспублікі прыходзілася весці барацьбу з бандытызмам і кантрабандай. Бандытызм як сацыяльная з'ява ўзнік у надзвычайных палітычных і эканамічных абставінах грамадзянскай вайны. Яго базу склалі дызерціры, крымінальныя і па антысавецку настроеныя элементы. З-за памылак, парушэнняў законаў, норм у паводзінах і дзеяннях асобных прадстаўнікоў Савецкай улады ў яго была ўцягнута частка сярэдняга сялянства і беднаты. Вясной 1921 г. палітычны бандытызм на тэрыторыі Беларусі прыняў пагражальны характар: дзейнічалі 36 буйных атрадаў, больш за 5 тысяч чалавек. Каля 6 тысяч узброеных людзей знаходзілася ў памежных з БССР раёнах Польшчы [1, с. 188]. Антысавецкія выступленні мелі месца ў Мінскім, Мазырскім, Слуцкім, Ігуменскім ды інш. паветах. Буйным сялянскім мяцяжом стала Слуцкае паўстанне, якое працягвалася з 27 лістапада да 28 снежня 1920 г. Для яго падаўлення былі прыцягнуты рэгулярные часткі Чырвонай Арміі.

Вясной 1921 г. адбылося 89 сялянскіх выступленняў з ярка акрэсленай палітычнай афарбоўкай. З-за гэтага летам 1921 г. прыйшлося ўвесці нават ваеннае становішча. Да жніўня 1921 г. сітуацыя ўскладнілася яшчэ больш: у сувязі з запланаваным на верасень пачаткам збору першага харчпадатку ўзмацніліся ваенныя акцыі "зялёных" банд. Толькі ў 1922 годзе шляхам ваенных, адміністратыўных і іншых мер удалося ліквідаваць палітычны бандытызм.

Немалаважным фактарам, які перашкаджаў стабілізацыі становішча ў рэспубліцы, было адносна шырокае распаўсюджанне нелегальных (кантрабандных) гандлёвых адносін з замежжам: Польшчай, Латвіяй, Літвой. Вялікі дэфіцыт прадукцыі лёгкай і харчовай прамысловасці ў краіне вызываў неабходнасць іх імпарту. Шырокае распаўсюджанне атрымалі парушэнні, звязаные з кантрабандным вывазам і ўвозам.

Экспрапрыяцыя экспрапрыятараў – такі лозунг стаў пасля Кастрычніка вядучым, з яго дапамогай стараліся зламаць эканамічную моц палітычных супернікаў і палепшыць становішча рабочага класа. Часцей за ўсё гэта прыводзіла да адмоўных вынікаў. Фабрычна-заводскія камітэты, якія бралі ўладу ў свае рукі, былі няздольныя справіцца з кіраўнічымі функцыямі. У іх кіруючым асярдоку было мало людзей, якія валодалі тэхнічнымі ведамі і ведамі бухгалтарскага ўліку. Да таго ж, амаль усе прадпрыемствы пераключыліся на вытворчасць прадукцыі для арміі. У Віцебскай губерні каля 70% прадпрыемстваў працавалі на задавальненне ваенных патрэб.

У парушаным стане аказаліся і фінансы. На 1 студзеня 1920 г. пакупная здольнасць рубля знізілася, у параўнанні з 1913 г., у 2420 разоў [1, с. 148 ]. Гэта выклікала спад вытворчасці і закрыццё прадпрыемстваў. У краіне нарастала сацыяльная напружанасць.

Зразумела, што негатыўныя з’явы былі непасрэдна звязаны з сусветнай і грамадзянскай вайной, палітыкай “ваеннага камунізму”, з парушанымі эканамічнымі адносінамі паміж горадам і вёскай. Стала бачна, што палітыка “ваеннага камунізму”, якая дзейнічала ў гады вайны, і дапушчаныя памылкі пры экспрапрыяцыі экпрапрыятараў, з чым студэнты падрабязна пазнаёміліся пры вывучэнні папярэдніх тэм , прывялі краіну да эканамічнага і палітычнага крызісу. Складаныя ваенна-палітычныя абставіны, якія ўзнікалі ў гады Грамадзянскай вайны, патрабавалі аб’яднання намаганняў у абароне рэвалюцыйных заваёў.

**2. Удзел БССР у стварэнні СССР.** Вывучаючы непасрэдна пытанне аб удзеле БССР ва ўтварэнні СССР, трэба акцэнтаваць увагу на тое, што праца па ўтварэнню адзінай савецкай дзяржавы, якая распачалася яшчэ ў час Грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі замежных краін, была абумоўлена шэрагам аб’ектыўных прычын. У свой час тэрыторыі савецкіх рэспублік, што ўвайшлі ў СССР, знаходзіліся ў межах Расійскай імперыі: уся тэрыторыя Беларусі ў складзе Расіі знаходзілася з 1795 г. Паміж насельніцтвам цэльнай вялікай краіны склаліся цесныя эканамічныя і культурныя сувязі.

Пасля звяржэння самадзяржаўя ў Расіі было задэкларавана поўнае раўнапраўе грамадзян, незалежна ад веравызнання і нацыянальнасці, скасавана мяжа яўрэйскай аседласці, абяцалася свабода развіцця моў (сакавік 1917 г.). Але, абвясціўшы Расію рэспублікай (верасень 1917), Часовы ўрад не збіраўся ажыццяўляць права народаў на самавызначэнне. Гэта выклікала незадаволенасць нацыянал-дэмакратычных рухаў. У верасні 1917 г. ў Кіеве адбыўся з’езд “народаў Расіі”, які быў скліканы Цэнтральнай украінскай радай, у якім разам з прадстаўнікамі расійскіх і ўкраінскіх эсэраў, грузінскіх, армянскіх сацыялістаў, ад Беларусі прынялі ўдзел кіраўнікі БСГ. Удзельнікі з’езду прагаласавалі за дзяржаўнае ўладкаванне Расіі ў выглядзе федэрацыі аўтаномных абласцей і нацый, палічыў асноўным дэфектам «празмерную цэнтралізацыю заканадаўчай і выканаўчай улады». З’езд пастанавіў: склікаць мясцовыя нацыянальныя ўстаноўчыя сеймы, якія павінны вызначыць канкрэтныя формы сваіх адносін з цэнтральнымі органамі федэрацыі, а таксама ўнутраную арганізацыю аўтаномных установаў канкрэтнага народа або вобласці. Часовы ўрад не прыслухаўся да патрабаванняў нацыянальных дзеячаў. У яго складзе не знайшлося людзей, якія ўяўлялі Расію “разведзеную па нацыянальных кватэрах”.

У выніку перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. і пераходу ўлады да Саветаў нацыянальная самасвядомасць вялікіх і малых народаў была ўлічана. Бальшавікі ў першыя дні прыходу да ўлады прапанавалі гібкую і дынамічную форму вырашэння праблемы. 11 лістапада 1917 г. СНК прыняў **“Дэкларацыю правоў народаў Расіі”,** якая абвясціла роўнасць і

суверэннасць усіх народаў краіны, права на свабоднае самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў, адмену ўсіх нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў, свабоднае развіццё нацыянальных меншасцей і этнаграфічных груп.Такое права было пацверджана ўжо 18 снежня таго ж года у Дэкрэце СНК аб прызнанні незалежнасці Фінляндыі і 29 снежня 1917 г. – аб свабодным самавызначэнні Турэцкай Арменіі. Крыху пазней (10.01.1918 г.) III Усерасійскі з’езд Саветаў прыняў “**Дэкларацыю правоў працоўнага і эксплуатуемага народа”,** якая аб’явіла Расію рэспублікай Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў, заснаванай на добраахвотным саюзе свабодных нацый. Дадзеная Дэкларацыя была цалкам уключана ў першы раздзел першай савецкай Канстытуцыі, якую 10 ліпеня 1918 г. прыняў V з’езд Саветаў . Такім чынам, бальшавіцкая партыя, пасля прыходу да ўлады пацвердзіла сваю ўстаноўку, сфармуляваную яшчэ ў 1903 г. у праграме РСДРП(б), дзе дэкларавалася права на самавызначэнне за ўсімі нацыямі, што ўваходзлі ў склад дзяржавы, “нават да аддзялення і ўтварэння нацыянальных дзяржаў”.

У першыя пасля рэвалюцыі гады РСФСР будавала ўзаемаадносіны з іншымі савецкімі рэспублікамі на аснове дагавораў аб супрацоўніцтве. У дакладнасці з дэкрэтам “аб аб’яднанні Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік: Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Беларусі для барацьбы з сусветным імперыялізмам” з 1 чэрвеня 1919 г. ураду РСФСР перадаваліся шэраг паўнамоцтваў бальшавіцскіх урадаў савецкіх рэспублік. На працягу 1919–1920 гг. у Беларусі дзейнічалі ўсе нарматыўные акты РСФСР. Першапачаткова рэспублікі пайшлі на заключэнне дагавораў аб ваенным і фінансава-эканамічным саюзе. Характар іх быў прыкладна аднолькавы: ва ўсіх дакументах прадугледжвалася аб’яднанне эканамічнай і фінансавай дзейнасці з мэтай абароны краіны ва умовах капіталістычнага асяроддзя і захавання гістарычна ўсталяваўшагася падзелу працы і культурных сувязей паміж народамі. Прататыпам гэтых адносін стаў пакет дагавораў, заключаных 30.09.1920 г., паміж РСФСР і Азербайджанам. Затым 02.12.1920 г. – з Арменіяй, 28.121920 г. – з Украінай, 16.01.1921 г. – з ССРБ, 04.03.1921 г. – з Бухарой і 21.05.1921 – з Грузіяй. “Саюзный рабоче-крестьянский договор между РСФСР и Социалистической Советской Республикой Белоруссии», які быў падпісаны 16 студзеня 1921 г., прадугледжваў палажэнне аб стварэнні аб’яднаных наркаматаў (ваенных і марскіх спраў, ВСНГ, знешняга гандлю , фінансаў, працы, шляхоў зносін, пошты і тэлеграфа), што ўваходзілі ў склад СНК РСФСР [2, с. 265–266].

Адначасова было створана Паўнамоцнае прадстаўніцтва БССР пры ўрадзе РСФСР. Праз яго ажыццяўлялася каардынацыя дзейнасці ў галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Неабходна падкрэсліць,што дагаворы аб ваенна-палітычным саюзе дапамаглі савецкім рэспублікам выстаяць у грамадзянскай вайне і ваеннай інтэрвенцыі 1918–1920 гг., умацаваць савецкую уладу. Яны ж сталі і



Репозиторий ВГУ

канстытуцыйнай асновай для далейшага паглыблення гаспадарчага і палітычнага супрацоўніцтва. Аднак дагаворная федэрацыя як форма дзяржаўнага ўладкавання не магла задаволіць ЦК РКП(б) і савецкі ўрад, паколькі ўскладняла палітычнае і гаспадарчае кіраванне краінай. Такія дагаворы не забяспечвалі рэальнага гаспадарчага адзінства. Адчувалася неўпарадкаванасць у планаванні і фінансавай сферы. У БССР, як і ў іншых рэспубліках, дзейнічалі свае грашовыя адзінкі.

**З** пераходам да мірнага будаўніцтва тэндэнцыя аб’яднання ўзмацнілася. Нявызначанасць адносін былых расійскіх рэгіёнаў у пытаннях забеспячэння знешняй бяспекі, скаардынаванай дзейнасці ў гаспадарчым будаўніцтве прывялі да ідэі аб’яднання. Кіруючая роля ў стварэнні цеснага саюза народаў былой Расійскай імперыі належыла Камуністычнай партыі. Узаемаадносіны паміж рэспублікамі пастаянна разглядаліся як у Маскве, так і ў саміх рэспубліках. У сакавіку 1921 г. на X з’ездзе РКП(б) было адзначана, што знешняя і ўнутраная абстаноўка “дыктуе дзяржаўны саюз асобных савецкіх рэспублік, як адзіны магчымы шлях выратавання ад імперыялістычнай кабалы і нацыянальнага гнёта”. Кіраўнікі партыйных і дзяржаўных арганізацый рэспублікі (у большасці члены партыі) удзельнічалі ў працы X з’езда і іншых мерапрыемствах, на якіх ішло абмеркаванне пытанняў аб формах аб’яднання і распрацоўкі праекта саюзнага дагавора.

Праца па падрыхтоўцы і абмеркаванне прынцыпаў, на якіх павінны былі грунтавацца ўзаемаадносіны паміж савецкімі рэспублікамі ў адзінай дзяржаве, ішлі на працягу 1922 г. У сакавіку 1922 г. паміж Азербайджанам, Арменіяй, Грузіяй быў заключаны дагавор аб стварэнні Закаўказскай Савецкай Федэрацыі. 13 снежня 1922 г. Першы з’езд Саветаў гэтых рэспублік абвясціў стварэнне Закаўказскай Сацыялістычнай Федэратыўнай Савецкай Рэспублікі (ЗСФСР). З’езд падтрымаў ідэю стварэння СССР. Тым самым закладвалася аснова для практычнага супрацоўніцтва з захаваннем сваёй незалежнасці, роўнасці моў, нацыянальных культур.

У ходзе спрэчак пра тое, якім быць новаму Саюзу, на працягу доўгага часу назіралася два пункты погляду. Першы – прапанова І. Сталіна ажыццявіць **“аўтанамізацыю”** савецкіх рэспублік, г.зн. уключыць іх у склад РСФСР [3, с. 199]. Другая прапанова належыла У. (Ульянаву) Леніну: утварыць новае дзяржаўнае федэратыўнае аб’яднанне – Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, у які б уваходзілі на роўных правах усе савецкія рэспублікі [4, с. 211].

Пры заснаванні СССР кіраўніцтва БССР непасрэдна прымала ўдзел у яго стварэнні. Да гэтага часу ў членаў ЦБ КП(б)Б адбыліся змены тых поглядаў, якія меліся раней. На пасяджэннях, прысвечаных абмеркаванню гэтага пытання, пераважная большасць кіраўнікоў партыйных органаў і савецкай улады рэспублікі выступала супраць праекта аўтанамізацыі, падтрымала ленінскі план і канцэпцыю нацыянальнай самастойнасці

Рэпазіторый ВГУ

Беларусі. Адначасова ЦБ КП(б)Б цесна звязвала статус рэспублікі ў саюзнай дзяржаве з вырашэннем беларускага тэрытарыяльнага пытання (ставілася пытанне аб пашырэнні тэрыторыі рэспублікі).

У верасні 1922 г. меркаванні ЦБ КП(б)Б былі выкладзены на пасяджэнні камісіі ЦК РКП(б), якая займалася распрацоўкай палажэнняў саюзнага дагавора. Туды ж была накіравана запіска "Аб неабходнасці ўрэгулявання пытання аб усходніх межах Беларускай рэспублікі". Выказваючы заклапочанасць тым, што вырашэнне тэрытарыяльнага пытання не было прадугледжана ніводным пагадненнем паміж РСФСР і БССР, кіраўніцтва знешнепалітычнага ведамства савецкай Беларусі прапанавала паставіць яго на абмеркаванне, а рашэнне замацаваць у форме міжнароднага дагавора. На думку кіраўніцтва НКЗС БССР, вяртанне Віцебскай, Гомельскай і часткі Смаленскай губерняў дыктавалася гаспадарчымі (эканамічнае адзінства гэтых губерняў з БССР), культурна-асветніцкімі (цяга большасці насельніцтва да беларускай культуры), унутрыпалітычнымі (улік асаблівасцяў нацыянальнага і сацыяльнага складу жыхароў Беларусі) і знешнепалітычнымі (узмацненне міжнароднага становішча БССР) фактарамі**.** Аднак прапановы рэспубліканскіх улад камісія канчаткова вырашыць не змагла. Як было заяўлена, вырашэнне дадзенага пытання выходзіла за межы кампетэнцыі камісіі ЦК РКП(б) і Наркамата замежных спраў РСФСР, таму беларускаму боку было прапанавана перадаць яго непасрэдна ў ЦК РКП(б). Падпарадкоўваючыся нормам дэмакратычнага цэнтралізму, партыйныя арганізацыі БССР пагадзіліся з такім рашэннем.

Тым часам працэс утварэння СССР прасоўваўся да яго станоўчага вырашэння. Кастрычніцкі (1922) пленум ЦК РКП (б) прыняў пастанову аб стварэнні федэратыўнай дзяржавы на базе добраахвотнага саюза раўнапраўных і суверэнных савецкіх рэспублік. У кастрычніку–снежні 1922 г. пленумы ЦК кампартый Беларусі, Украіны, Азербайджана, Грузіі, Арменіі выказаліся за аб'яднанне савецкіх рэспублік у Саюз ССР. Канчатковае рашэнне аб удзеле БССР у стварэнні СССР прыняў IV Усебеларускі з'езд Саветаў (14–18.12.1922 г.). У дакуменце было заяўлена, што такое рашэнне "отвечает жизненным интересам Советской Белоруссии и потому должно получить скорейшее осуществление на предстоящем съезде всех советских республик [5, с. 390]. На з'ездзе была выбрана паўнамоцная дэлегацыя для падпісання дагавора. Яе ўдзельнікам было даручана "ажыццявіць фармальныя акты, замацоўваючыя братэрскі Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік". Прыкладна такое ж па змесце рашэнне прынялі з'езды ЗСФСР і УССР, а таксама X Усерасійскі з'езд Саветаў (снежань 1922). Было прызнана, што аб'яднанне савецкіх рэспублік у адзінай дзяржаве з'яўляецца своечасовай падзеяй.

30 снежня 1922 г. у Маскве адбыўся I з'езд Саветаў СССР, у ім удзельнічалі дэлегацыі РСФСР (1727 дэлегатаў, з іх з рашаючым голасам –



Репозиторий ВГУ

1217), УССР (адпаведна 364 і 354, ЗСФР (91 і 73). Ад імя БССР у з’ездзе прынялі ўдзел 33 дэлегаты, дакументы падпісалі 25 чалавек (асобныя крыніцы называюць 23 падпісантаў) [6, с. 410]. Дэлегаты ад Беларусі былі прадстаўнікамі 7 нацыянальнасцей (беларусы, рускія, яўрэі, латышы, палякі, украінцы, літоўцы). З’езд прыняў Дэкларацыю аб утварэнні СССР і Саюзны дагавор. У СССР увайшлі РСФСР (афіцыйна абвешчана ў студзені 1918 г.), УССР (абвешчана ў снежні 1917 г.), БССР (абвешчана 1 студзеня 1919 г.) і ЗСФСР (абвешчана ў снежні 1922 г.) у складзе Азербайджанскай ССР (абвешчана ў красавіку 1920 г.), Армянскай ССР (абвешчана ў лістападзе 1920 г.) і Грузінскай ССР (абвешчана ў лютым 1921 г.). У дэкларацыі аб утварэнні СССР былі сфармуляваны асноўныя прынцыпы аб’яднання рэспублік: **раўнапраўе і добраахвотнасць іх уваходжання ў Саюз ССР, права свабоднага выхаду з Саюза і доступ у яго новым савецкім сацыялістычным рэспублікам** [7].

Дагавор аб утварэнні СССР прадугледжваў арганізацыю 10 саюзных наркаматаў, Вярхоўнага суда і Аб’яднанага дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення, вызначыў асновы ўзаемаадносін паміж вышэйшымі органамі ўлады СССР і саюзных рэспублік. Быў абраны вярхоўны орган улады Саюза ССР – Цэнтральны Выканаўчы Камітэт (ЦВК) 371 член і 138 кандыдатаў ад усіх саюзных рэспублік. Старшынямі вярхоўнага заканадаўчага органа дзяржавы – ЦВК СССР – былі выбраны М. Калінін, Г. Пятроўскі, А. Чарвякоў, Н. Нарыманаў. Так БССР стала заснавальнікам новага дзяржаўнага аб’яднання. На ІІ-й сесіі ЦВК быў сфарміраваны ўрад СССР – Савет Народных Камісараў (СНК) на чале з У. Леніным [8, с. 25].

Пазней у склад СССР увайшлі Узбекская, Туркменская ССР (1924), Таджыкская (1929), Казахская, Кіргізская ССР (1936), Літоўская, Латвійская, Эстонская, Малдаўская ССР, Карэлафінская АССР (1940).

Такім чынам, утварыўся Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР) – шматнацыянальная сацыялістычная дзяржава, якая існавала з канца 1922 г. да 8 снежня 1991 г. Пад канец свайго існавання ў СССР уваходзіла 15 саюзных рэспублік, якія паводле канстытуцыі з’яўляліся суверэннымі дзяржавамі. Плошча СССР – 22,4 млн км. кв. Па ліку насельніцтва (290 млн чал.) СССР займаў 3 месца ў свеце, пасля Кітая і Індыі.

Першая Канстытуцыя СССР (зацверджана 31 студзеня 1924 на II з’ездзе Саветаў СССР). Яна дэкларавала працоўным краіны шырокія дэмакратычныя правы і свабоды, актыўны ўдзел у кіраўніцтве дзяржавай. Савет Народных Камісараў СССР з першых дзён свайго існавання праводзіў значную работу па ўстанаўленню дыпламатычных адносін з краінамі свету. Да пачатку 1923 г. Савецкі Саюз меў сваіх прадстаўнікоў у 12 дзяржавах. 1924 год стаў годам дыпламатычнага прызнання СССР Англіяй; у лютым–сакавіку СССР прызналі Італія, Нарвегія, Аўстрыя, Грэцыя, Швецыя; у маі – Кітай; у чэрвені – Данія. Такім чынам, у студзені 1925 г. СССР меў дыпламатычныя адносіны з 21-ой дзяржавай капіталістычнага свету.



Рэпазіторый ВДУ

**3. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел БССР.** У папярэдняй тэме ўжо гаварылася, што пасля савецка-польскай вайны Беларуская ССР складалася толькі з шасці паветаў Мінскай губерні (тэрыторыя – 52398 кв. км., насельніцтва – 1,5 млн), якія ў сваю чаргу дзяліліся на воласці. На беларускіх землях , якія знаходзіліся ў складзе РСФСР , захаваўся падзел на губерні: Віцебская, Смаленская, Магілёўская з 1919 г. (да гэтага Гомельская). Гэтыя губерні падзяляліся на паветы і воласці.

У сакавіку 1924 г. адбылося першае ўзбуйненне Беларусі. Са складу РСФСР Беларусі было перададзена 8 паветаў Віцебскай губерні агульнай плошчай 24 836,7 кв. вёрст з насельніцтвам 1 093 426 чалавек. Згодна з падлікам камісіі Савета Народных камісараў БССР, у час прыняцця Віцебскай губерні на яе тэрыторыі ў гарадах пражывала больш за 197 тыс. чал. Тут мелася 2719 заводаў і фабрык, 1235 школ, 26 бальніц на 1008 ложкаў. Акт камісіі аб перадачы Віцебскай губерні ад РСФСР да БССР падпісалі 4 сакавіка 1924 г. старшыня Віцебскага губвыканкама Дз.Прышчэпаў і старшыня паўнамоцнага камітэта СНК БССР па прыёме Я.А. Адамовіч [9, с. 276].

Віцебск, як і раней, застаўся адміністрацыным цэнтрам далучанай тэрыторыі. 17 ліпеня 1924 г., згодна з існаваўшым у БССР адміністратыўна-тэрытарыяльным падзелам, дадзеная тэрыторыя атрымлівае новую назву – Віцебская акруга [10, с. 255].

Беларускімі сталі яшчэ шэраг паветаў Гомельскай, Смаленскай губерняў з пераважна беларускім насельніцтвам. Тэрыторыя БССР узрасла да 110584 кв. км., насельніцтва таксама ўзрасло да 4,2 млн чалавек.

У лістападзе 1926 г. у склад БССР былі ўключаны Гомельскі і Рэчыцкі паветы. У выніку другога ўзбуйнення тэрыторыя БССР павялічылася на 15727 кв. км., насельніцтва – на 649 тыс. У пачатку 1927 г. тэрыторыя Беларусі складала 125950 кв. км., на якой пражывала каля 5 млн чалавек. Пасля другога ўзбуйнення ў адміністратыўна-тэрытарыяльным падзеле БССР адбылося перайменаванне паветаў у акругі, а воласці – ў раёны. БССР мела ў сваім складзе 8 акруг (Аршанскі, Бабруйскі, Віцебскі, Гомельскі, Магілёўскі, Мазырскі, Мінскі, Полацкі), якія дзяліліся на раёны і сельсаветы. Налічвалася 101 раённы, 1470 сельскіх, 52 мястэчковыя і 29 гарадскіх Саветаў. У 1929 г. БССР дзялілася на 10 акруг (Бабруйская, Віцебская, Гомельская, Калінінская з цэнтрам у Клімавічах, Мінская, Магілёўская, Мазырская, Аршанская, Полацкая, Слуцкая). У БССР налічвалася 100 раенаў і 1446 сельсаветаў.

Знайшлося месца ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле БССР і нацыянальным саветам. У 1924 г. у рэспубліцы налічвалася 9 нацыянальных саветаў, у далейшым лік нацыянальных саветаў памнажаўся. У 1928 г. у БССР налічвалася 23 яўрэйскія, 19 польскіх, 16 рускіх, 5 латышскіх, 2 украінскія і 2 нямецкія саветы. У 1932 г. быў утвораны нацыянальны польскі раён з цэнтрам у Дзяржынску. У 1930 г. акругі былі ліквідаваны, засталіся

Рэпазіторый ВДУ

толькі раёны і сельсаветы. Віцебская акруга была скасавана 26 ліпеня 1930 г., горад Віцебск на нейкі час стаў адным з 90 раённых цэнтраў БССР.

З 1938 г. у адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел былі ўнесены істотныя змены: у складзе Беларусі з'явілася новае звяно – вобласць. 15 студзеня 1938 г. Віцебск, дзе пражывала на той час 167424 чал., стаў цэнтрам новаўтворанай Віцебскай вобласці. 27 верасня 1938 г. Віцебск атрымаў статус горада абласнога падпарадкавання. З гэтага часу склаўся і да сёняшніх дзён замацаваўся адміністрацыйна-тэрытарыяльны трохзвённы падзел: вобласць, раён, сельсавет.

Падводзячы вынікі адносна нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на гэтым этапе, неабходна адзначыць, што працэс гэты насіў супярэчлівы характар. З аднаго боку, адбыліся адміністратыўна-тэрытарыяльныя рэформы, фарміраваліся асноўныя нацыянальныя дзяржаўныя структуры, станоўча вырашалася беларускае тэрытарыяльнае пытанне, у аснову новаўтварэнняў быў пакладзены нацыянальны прынцып, з другога – усё большае значэнне набывалі рысы звышцэнтралізму – падпарадкаванне інстытутаў беларускай дзяржавы, як і іншых рэспублік, цэнтральным маскоўскім органам улады.

Спасылкі

1. Мандрык, І.У. Гісторы Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.У. Мандрык. – Віцебск: УА ФПБ "МІПСА", 2009. – 276 с.
2. Эканамічная гісторыя Беларусі: курс лекцый / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.В. Шапавал і інш. / пад агул. рэд. В.І. Галубовіча. – Мн.: Экаперспектыва, 1993. – 288 с.
3. История Советской Конституции. – 1917–1956 гг. – М., 1957.
4. Известия ЦК КПСС. – 1989. – № 9.
5. Ленин В.И. Полное собрание сочинений. Т. 45.
6. История Советской Конституции. 1917–1956 гг. – М., 1957.
7. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя: у 12 т. Т. 8. – Мн., 1993.
8. Съезды Советов Союза СССР, союзных и автономных советских социалистических республик. 1917–1936; Сб. док.: в 3т. Т. 3. – М.,1960.
9. Государственный архив Витебской области (в дальнейшем ГАВО). Фонд 123. – Оп. 1. – Д. 1116.
10. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1 / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст.Э.Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2002. – 648 с.: іл.

## ТЭМА 6. Аднаўленчы перыяд у прамысловасці, яго вынікі

1. Стан прамысловасці БССР пасля пераходу да мірных умоў развіцця.
2. Аднаўленчы перыяд ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі.

**1. Стан прамысловасці БССР пасля пераходу да мірных умоў развіцця.** У часы грамадзянскай вайны, замежнай ваеннай інтэрвенцыі прамысловасць рэспублікі прыйшла ў поўны заняпад. Аб гэтым сказана ў папярэдняй тэме, дзе акцэнт, у асноўным, быў зроблены на міжнароднае і палітычнае становішча Беларусі на пачатку 20-х гадоў. Што тычыцца

Рэпазіторый ВДУ

непасрэдна стану прамысловасці, тут неабходна дапоўніць, што ад тэрору, грабяжоў і гвалту акупантаў Беларусь страціла звыш 158 тыс. мірных жыхароў. Большасць фабрык і заводаў не працавала. З 815 прадпрыемстваў цэнзавай прамысловасці (буйныя і сярэднія прадпрыемствы з механічнымі рухавікамі, з лікам рабочых больш 15 і без механічных рухавікоў – больш 30) з перабоямі працавала 345 (42,2%). Прамысловая вытворчасць скарацілася ў 1920 г. (да 1913 г.) амаль у сем разоў, прадукцыйнасць працы была не больш чым 30% ад вынікаў 1913 г. Дробная прамысловасць, на долю якой прыпадала каля 50% усей прамысловасці, (іх было 11,7 тысяч) практычна трымалася на саміх гаспадарах. Татальны эканамічны крызіс наглядаўся ў Віцебскай губерні. Са 180 прамысловых прадпрыемстваў тут працавала толькі палова. Створаныя ў гады вайны швейныя і абутковыя прадпрыемствы, якія абслугоўвалі армію, былі ліквідаваны. На пачатку 1922 г. у губерні (яна знаходзілася ў складзе Расіі) зарэгістравана 8 тыс. беспрацоўных, у Віцебску – 6 тыс. [1, с. 286–289]. У цяжкім становішчы апынуўся чыгуначны транспарт Беларусі: каля 30% паравозаў і вагонаў былі няспраўнымі, даўжыня чыгункі скарацілася на дзве трэці. Спусташоным і абяскроўленым аказаўся рабочы клас. У параўнанні з тым жа 1913 г., рабочых налічвалася толькі 15%. Ратуючыся ад голаду, рабочыя ў масавым парадку кідалі работу і выязжалі ў вёску або займаліся саматужніцтвам, г.зн. дэкласіраваліся. У асобных рэгіёнах у 1920–1921 гг. адзначаліся забастоўкі рабочых і чырвонаармейцаў, накіраваныя на абарону сваіх эканамічных і палітычных інтарэсаў. У Віцебску адбыліся хваляванні рабочых фабрыкі “Дзвіна” і воднага транспарту. У выніку ўсіх падзей, звязаных з экстрымальнымі ўмовамі ваеннага часу, эканоміка Савецкай дзяржавы апынулася ў глыбокім крызісе. Голад і іншыя цяжкасці адмоўна ўплывалі на настрой рабочых, параджалі песімізм і маркоту.

**2. Аднаўленчы перыяд ва ўмовах новай эканамічнай палітыкі.** Пасля наступлення мірнага часу перад кіраўніцтвам Савецкай Расіі паўстала задача ўзнавіць разбураную гаспадарку і падрыхтаваць умовы для будауніцтва новага грамадства. Было прапанавана часова адступіць. Як падкрэслівалася ў дакументах тых часоў, пры камандных вышынях дзяржавы ў эканоміцы, магчыма дапусціць капіталізм да вядомых памераў і трымаць яго пад кантролем. Было прапанавана стварыць эканамічны саюз паміж рабочымі і сялянамі. 8 лютага 1921 г. Ленін прапанаваў праект, які быў прыняты і носіць у гісторыі назву “новай эканамічнай палітыкі” (НЭП). Новая эканамічная палітыка Савецкай дзяржавы была распрацавана да пачатку 1921 года. Яна ўяўляла сабой сістэму гаспадарання, заснаваную на выкарыстанні рынкавых, таварна-грашовых адносін праз часовае дапушчэнне капіталістычных элементаў у эканоміцы, гаспадарчага разліку, асабістай матэрыяльнай зацікаўленасці. У ей прадугледжвалася ажыццявіць цэлую сістэму мер, якая уключала ў сябе: у галіне сельскай гаспадаркі – за-



Рэпазіторый ВДУ

мену харчразверсткі харчпадаткам (на гэты конт 21.03.1921 г. выдадзены асобны дэкрэт); свабоду выбару землекарыстання, дазвол арэнды зямлі і карыстанне наемнай рабочай сілай (пры ўмове, што члены сям'і заняты працай); паступовы пераход ад натуральнага падаткаабкладання да грашовага. У галіне гандлю магчымасць продажу прадукцыі пасля ўнясення падатку; свабода гандлю праз прыватную, кааператыўную ці дзяржаўную форму. У галіне фінансаў – правядзенне грашовай рэформы; стварэнне кааператыўных банкаў, таварыстваў узаемнага крэдыту; адкрыцце ашчадных кас, адмена абмежаванняў на назапашванні праз уклады. У сферы прамысловасці-правядзенне яе дэцэнтралізацыі, адмена пагалоўнай нацыяналізацыі дробнай і саматужнай вытворчасці; наданне шырокай аўтаноміі прадпрыемствам; перавод іх на гаспадарчы разлік; ліквідацыя главкаў, стварэнне трэстаў, сіндыкатаў (аб'яднанне трэстаў), стварэнне ўмоў якаснай працы праз зацікаўленасць.

Як бачна, у планах укаранення НЭП прадугледжвалася ўмацаванне саюза рабочых і сялян на эканамічнай аснове, выкарыстанне таварна-грашовых адносін, паўсюднае ўкараненне дзяржразліку, асабістай зацікаўленасці, удасканаленне дзяржаўнага планавання і кіраўніцтва, развіццё прамысловасці на базе электрыфікацыі, кааперыраванне насельніцтва, уздым культуры ва ўсіх галінах дзейнасці чалавека. НЭП стаў своеасаблівай мірнай рэвалюцыяй у эканамічным мысленні партыйнага кіраўніцтва, якая адкрывала перспектыву паступовага самарэфармавання грамадства. Ленін здолеў прыйсці да разумення сацыялістычнай эканомікі як свядома кіруемай сістэмы ўзаемазвязаных укладаў. НЭП, па словах У. Леніна, ёсць “карэнная перамена ўсяго пункту гледжання ... на сацыялізм” [2, с. 434].

Новая эканамічная палітыка стала рашуча ўводзіцца па ўсёй краіне, у тым ліку і на Беларусі. Галоўнай асаблівасцю НЭПа ў Беларусі з'яўлялася неабходнасць ліквідацыі прамысловай адсталасці і выраўноўванне яе эканамічнага становішча ў адносінах да цэнтральных рэгіёнаў. На аснове дэкрэта аб дэнацыяналізацыі дробнай маёмасці ў прамысловасці і сярэдніх прадпрыемствах, такія прадпрыемствы былі вернуты іх ранейшым уладальнікам. З 1921 г. была дазволена арэнда сродкаў вытворчасці (памяшканняў, цэлых прадпрыемстваў у гандлі і прамысловасці, зямлі, тэхнікі).

Пераход да нэпа на Віцебшчыне быў успрыняты рабочымі і нават радавымі камуністамі не адназначна. На беспартыйнай рабочай канферэнцыі (21.04.1921 г.), дзе абмяркоўваўся даклад старшыні губвыканкама І. Варэйкіса, палітыка бальшавікоў па сацыяльна-эканамічным развіцці ў бягучым моманце, была адхілена, прынята меньшавіцкая праграма. Рэзалюцыю канферэнцыі падтрымалі рабочыя сходы акулярнай і іголкавай фабрык [3, с. 255]. У той жа час большасць працоўных ухваліла пераход да жыццяздольных метадаў кіраўніцтва



Репозиторий ВГУ

эканамічным жыццём. Прыступілі да іх ўвядзення на ільнопрадзільнай фабрыцы "Дзвіна", на гарбарным заводзе № 1, абутковай фабрыцы імя Лекарта і інш. Пры ўкараненні НЭПа у эканоміку Віцебскай акругі прыцягваецца знешні капітал,утвараюцца канцэсіі і сумесныя з замежнымі ўладальнікамі прадпрыемствы. Завод імя Камінтэрна ў 1922 г., разам з вытворчасцю турбін для мельніц, наладзіў выпуск настольна свідравальных станкоў [4, с. 304].

У 1922 г. на Беларусі ўжо дзейнічала 277 прамысловых прадпрыемстваў, у тым ліку 17 аб'ектаў металаапрацоўкі, 55 – дрэваапрацоўкі, 87 – харчовай галіны. Дзяржава ў адпаведнасці з дэкрэтам СНК РСФСР ад 17 мая 1921 г. падтрымлівала прыватніка. І ў горадзе, і на вёсцы мела месца станаўленне кааператыўных форм дзейнасці, у жыццё праводзіўся прынцып матэрыяльнай зацікаўленасці (па колькасці і якасці). У выніку ўстанаўлення рэгістрацыйнай сістэмы на адкрыццё сваёй справы кожным грамадзянінам без абмежаванняў, у БССР паявілася мноства швейных, слясарных, дрэваапрацоўчых майстэрняў, пякарняў, лавак.

Пераход да новай эканамічнай палітыкі дазволіў БССР у кароткія тэрміны, ужо напрыканцы 1925 г., у асноўным, завяршыць аднаўленне народнай гаспадаркі. Тэмпы развіцця прамысловасці Беларусі былі значна вышэй за тэмпы па РСФСР. Прырост нацыянальнага даходу ў перыяд з 1922 па 1925 гг. складаў каля 19,5% у год. Найбольш хутка развівалася дробная і саматужная прамысловасць. У 1923 г. на долю валавой прадукцыі гэтага сектара прыпадала амаль 60% вытворчасці ўсёй прамысловасці. Шмат зроблена па механізацыі і электрыфікацыі вытворчасці. Вытворчасць металаапрацоўчай прамысловасці з 1923 да 1925 гг. павялічылася больш чым у 5 разоў.

Шмат увагі ў рэспубліцы надавалася яе электрыфікацыі. Калі ў 1913 г. электрастанцыі меліся толькі ў Мінску, Віцебску, Магілёве, Полацку, Клімавічах, то да 1925 г. яны былі ва ўсіх акруговых цэнтрах. У 1924 г. было выпрацавана 2925 млн кілават-гадзін электраэнергіі, супраць 1945 млн кілават-гадзін у перадваенным 1913 г. Усяго ў 1925–1926 гг. у БССР дзенічала 40 электрастанцый. Для больш кардынальнага вырашэння праблемы электрыфікацыі рэспублікі ў маі 1927 г. непадалеку ад Оршы, у Арэхаўску пачалося будаўніцтва найбуйнейшай электрастанцыі – БелДРЭС.

Ішло папаўненне станочнага парку металаапрацоўчых прадпрыемстваў. У сярэдзіне 20-х гг. у лік дзеючых уведзены скураны завод "Бальшавік" і галантарэйная фабрыка "Беларуска" ў Мінску, завод па вытворчасці фанеры ў Віцебску, швейная фабрыка імя Дзяржынскага ў Гомелі, запалкавая фабрыка і льночасальны камбінат у Рэчыцы. Значныя поспехі праявіліся таксама ў гандлі, лёгкай прамысловасці. Пашыралася і абнаўлялася матэрыяльна-тэхнічная база прамысловасці.

Найбольш развітай прамысловасцю, сярод усіх акруг Беларусі, у 1925–1927 гг. лічылася Віцебская акруга. Валавая прадукцыя цэнзавай



Репозиторий ВГУ

прамысловасці акругі складала ад рэспубліканскай у 1927 г. 26,9% (Беларусь у гэты час падзялялася на 10 акругоў). Высокімі тэмпамі тут развівалася дрэваперапрацоўчая, металаапрацоўчая і скураная прамысловасць. На базе дробных майстэрань у 1925 г. у Віцебску створаны завод сельскагаспадарчых машын “Чырвоны металіст”. Віцебская акруга займала першае месца ў БССР і па ліку рабочых: у снежні 1925 г. на прадпрыемствах цэнзавай прамысловасці працавала больш за 7200 чалавек, чакалі працауладкавання (значыліся беспрацоўнымі на біржы працы) 5295 чалавек) [5, с. 19]. Пачынаючы з 1924 г. рост прадуктыўнасці працы ў прамысловасці Віцебскай акругі, як і ўвогуле па БССР, апярэджваў павялічэнне заработнай платы.

Прыходзіў у рабочы стан асноўны від зносін і перамяшчэння грузаў – чыгуначны транспарт, які за 7 папярэдніх гадоў панёс велізарныя страты. Вялікімі намаганнямі ўдалося правесці рэканструкцыю чыгуначных дэпо, аднавіць амаль 2,5 тыс. км. чыгуначнага палатна, шмат мастоў, адрамантаваць, каля 40% паравозаў і звыш 80% вагонаў,якія знаходзіліся ў нерабочым стане. Пасля гэтага чыгунка Беларусі выконвала (1928 г.) да 4/5 грузавых і пасажырскіх перавозак. Да 1924 г. поўнасцю адноўлена гаспадарка Віцебскага чыгуначнага вузла, у эксплуатацыю прыняты новыя айчынныя паравозы. Гэта дазволіла павялічыць хуткасць і вагу грузавых цягнікоў.

Другое месца ў транспартнай галіне (да 10–15%) БССР належыла рачному транспарту. Нараджаўся аўтамабільны транспарт – у 1928 г. у рэспубліцы мелася 200 аўтамабіляў, у тым ліку 50 – грузавых. У Віцебску з 1925 г. пачаўся рэгулярны аўтобусны рух.

Час дзеяння НЭПа, як прызнаюць амаль усе гісторыкі і палітыкі, запомніўся даволі хуткім павышэннем прадукцыйнасці працы і ўзроўнем жыцця простых людзей. З 1923 да 1926 г. прадуктыўнасць працы павялічылася на 50%, пры росце зарплаты на 40%. На прадпрыемствах гарбарнай, паліграфічнай, шчацінна шчотачнай прамысловасці Віцебскага губсаўнаргаса даваенны ўзровень прадуктыўнасці працы быў дасягнуты ўжо да канца 1923 г. Да канца 1925 г. большасць прадпрыемстваў Віцебска па выпуску асноўных відаў прадукцыі пераўзышлі даваенны ўзровень, многія былі рэканструіраваны , перайшлі на дзвюхзменны рэжым працы) [3, с. 256].

Статыстыка сведчыць: у 1927 г. насельніцтва СССР па ўзроўню спажывання харчовых прадуктаў пераўзышло вышэйшыя рубяжы дарэвалюцыйнай Расіі. Гараджане, напрыклад, спажывалі ў сярэднім больш за 41 кг мяса, забяспечанасць хлебам была каля 180 кг у горадзе і 220 на весцы на аднаго чалавека. Прыкладна такія ж нормы спажывання былі на Беларусі. Больш перспектыўныя вынікі НЭПа праявіліся ў тым, што гаспадарчы механізм гэтай эканамічнай палітыкі нараджаў у чалавека імкненне да добрасумленнай, больш прадуктыўнай працы, да павышэння якасці прадукцыі. НЭП фарміраваў тып працаўніка, які будаваў сваю работу не толькі на адным энтузіязме, а праз матэрыяльныя стымулы [6, с. 189].

Репозиторий ВГУ

Палепшыліся жыллёвыя ўмовы працоўных, павялічылася колькасць устаноў аховы здароўя, пашырылася сетка дзіцячых устаноў, вырасла нараджальнасць, зменшылася смяротнасць. Гэта стварала добрыя ўмовы для здзяйснення новых, больш важных крокаў у развіцці прамысловасці, ажыццяўленні індустрыялізацыі рэспублікі.

Станоўчыя вынікі НЭПа адзначылі ўсе вядучыя вучоныя свету. Так, амерыканскі палітолаг З. Бжэзінскі пісаў: "Для многіх людзей 20-я гг. былі лепшымі гадамі той эры, пачатак якой абвясціла рэвалюцыя 1917 г., а палітыка НЭПа стала па гэтай прычыне лаканічным тэрмінам для абазначэння перыяду эксперыментавання, гібкасці і памяркоўнасці". Я. Еўтушэнка ў паэме "Братская ГЭС" словамі старога бальшавіка інжынера Карцева, кажа аб НЭПе: "Я, к подвигам стремясь, не сразу понял, что НЭП и есть не отступленье – подвиг. И ленинец, мой мальчик, только тот, кто, если хлеба нет, коровы дохнут, идет на все, ломает к черту догмы, что б накормить, чтобы спасти народ".

За гады ўвядзення новай эканамічнай палітыкі ў БССР былі дасягнуты значныя поспехі ў пабудове сацыялістычнай гаспадаркі. Поспехам садзейнічала працоўная ініцыятыва рабочых, творчы рух рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Грамадская актыўнасць насельніцтва знайшла сваё адлюстраванне ў дзейнасці Саветаў, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацыях. Але ў далейшым, з боку цэнтральнага кіраўніцтва дзяржавай, наглядаецца палітыка згортвання, а затым і злому амаль усіх кампанентаў НЭПа. Нягледзячы на дасягненні ў справе аднаўлення прамысловасці, Беларусь заставалася слабаразвітай рэспублікай. Беларуская эканоміка за часы НЭПа не змяніла істотна сваёй дарэвалюцыйнай структуры. Яе ўзровень не мог задаволіць патрэбы дзяржавы. Тут і праз 10 гадоў пасля Кастрычніка пераважала (у значных памерах) сельская гаспадарка і легкая прамысловасць. У 1926 г. у кустарна-рамеснай прамысловасці рэспублікі было занята 72% рабочых (па СССР – 60%). Толькі на 30 прадпрыемствах Беларусі налічвалася больш за 300 рабочых, а больш за тысячу рабочых – толькі на 6 прадпрыемствах. Назіралася адсталасць рэспублікі ў развіцці электрыфікацыі, металаапрацоўкі. У 1926 г. на тэрыторыі БССР працавала 160 дробных электрастанцый агульнай магутнасцю 11,6 тыс. кВт. Востра стаяла праблема наяўнасці інжынерна-тэхнічных кадраў, кваліфікацыі рабочых. У 1927 г. удзельны вес інжынераў і тэхнікаў складаў каля 2% ад агульнай колькасці занятых у прамысловасці. Асабліва нездавальняюча ішла справа з якасным складам спецыялістаў: з вышэйшай адукацый сярод іх было 82 чалавекі, ці 17,3%, з сярэднім – 111, ці 23,4%. Да таго ж і культурны узровень асноўнай масы насельніцтва заставаўся яшчэ нізкім. Адукаванасць насельніцтва Беларусі, згодна перапісу 1926 г, складала 40,7%. Займаючы 0,6% тэрыторыі, 3,4% насельніцтва краіны, яна давала ўсяго 1,6% прамысловай прадукцыі. Пры гэтым доля прамысловай

Рэпазіторый ВДУ

прадукцыі ва усёй народнай гаспадарцы рэспублікі складала толькі 23,5% (па СССР – 39,1%) [7, с. 44–46].

І ўсе ж, трэба прызнаць, што хаця ў першыя гады НЭПа меліся значныя эканамічныя праблемы, якія звязаны з крызісам збыту прамысловай прадукцыі, абвастрэннем фінансавага складніка, іншых момантаў, што ўзнікалі з-за недахопу вопыту ў эканамістаў і менеджараў, правядзенне ў жыццё новай эканамічнай палітыкі дазволіла БССР у кароткі тэрмін аднавіць сваю прамысловасць, стабілізаваць эканоміку, узняць матэрыяльны дабрабыт насельніцтва. Адыход ад НЭПа, а затым яго поўны злом, з'яўляўся ў той час адной з гістарычных памылак у справе адраджэння і далейшага развіцця краіны.

Спасылкі

1. Государственный архив Витебской области (ГАВО). – Фонд 41. – Оп. 1. – Д. 94.
2. Ленін У.І. Творы. – Мн., 1989. – Т. 33.
3. Памяць: гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2-х кн. Кн. 1 / рэд.кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст.Э.Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2002. – 648с.: іл.
4. Мандрик, И.В. Очерки истории профсоюзов Витебщины / И.В. Мандрик. – Витебск: Витебская областная типография, 2015. – 504 с. : ил.
5. Гельберг, Я.Л., Дахия, С.Ф., Лойко В.М. Партийные организации Витебщины в период строительства социализма (1921–1937 гг.) // Тезисы докладов научно-теоретической конференции на тему: "История Витебской областной партийной организации:традиции и преемственность".– Витебск, 16 окт. 1987 г. – 65 с.
6. Мандрык, І.У. Гісторы Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.У. Мандрык. – Віцебск: УА ФПБ "МІПСА". 2009. – 276 с.
7. Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты / сост.: Ю.П. Смирнов, Н.С. Сташкевич; под ред. Р.П. Платонова. – Мн.: Университетское, 1990. – 446 с.

## ТЭМА 7. Прамысловасць БССР у гады першых савецкіх пяцігодак

1. Курс на індустрыялізацыю, першы пяцігадовы план у прамысловасці БССР, яго вынікі.
2. Развіцце прамыловасці Беларусі ў перыяд 1933–1941 гг.

**1. Курс на індустрыялізацыю, першы пяцігадовы план у прамысловасці БССР, яго вынікі.** У сучаснай гістарычнай літаратуры ўказваецца на тое, што часу дзеяння НЭПа характэрны і негатыўныя з'явы: рост беспрацоўя і маёмаснай няроўнасці, незадаволенасць і супраціўленне насельніцтва (асабліва той яго часткі, якая складала сацыяльную базу савецкай ўлады), нэпаўскай ідэалогіяй і ўвасабленнем яе ў практычнае жыццё. Пагэтаму ў другой палове 1920-х гг. у поўнай адпаведнасці з палітыка-ідэалагічнай дактрынай Камуністычнай партыі, кіраўніцтва дзяржавы зрабіла выснову, што ў краіне Саветаў ёсць усеё неабходнае для пабудовы поўнага сацыялістычнага грамадства, дзе вырашальная роля

Репозиторий ВГУ

належыць сацыялістычнай індустрыялізацыі, калектывізацыі сельскай гаспадаркі краіны і культурнай рэвалюцыі ў грамадстве.

Першым дакументам, у якім індустрыялізацыя пастаўлена ў шэраг бліжэйшых і бягучых задач, была рэзалюцыя XIV з'езда УКП(б) (1925 г.). Каб пераламіць супярэчнасць паміж самай передавой у свеце палітычнай уладай і адсталай тэхніка-эканамічнай базай неабходна, як дэкларавалася ў дакументах з'езда, стварыць матэрыяльна-тэхнічную базу сацыялізма. Гэта база – ёсць планамерна арганізаваная, буйная машынная вытворчасць ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі ў горадзе і ў вёсцы, заснаваная на передавой тэхніцы і працы работнікаў, свабодных ад эксплуатацыі.

Глыбокі аналіз дакументаў XIV з'езда партыі сведчыць пра тое, што першапачаткова вылучаная і абаснаваная ў іх стратэгія на індустрыялізацыю краіны прадугледжвала развіццё эканомікі краіны як працяг НЭПа. У аснову стратэгіі пакладзены тры ўзаемна абумоўленыя мэты: першая – індустрыяльная рэканструкцыя эканомікі, забяспячэнне расшыранай вытворчасці народнай гаспадаркі за кошт развіцця вытворчасці сродкаў вытворчасці, якія змаглі б падняць эканамічную моц і абароназдольнасць СССР; другая – абавязковае і сістэматычнае павышэнне ўдзельнай вагі сацыялістычнага сектара эканомікі, павялічэння ролі сацыялістычнай прамысловасці і сацыялістычнага гандлю ў народнай гаспадарцы, з аднаго боку, сацыялістычнай кааперацыяй сялянскай вытворчасці – з другога; трэцяя – адначасовае з народнагаспадарчым ростам павышэнне жжццёвага ўзроўню і культуры народа, дасягненне "расширенного потребления материальных благ рабочими и крестьянскими массами". У рэзалюцыі мелася ўказанне аб выключэнні адміністратыўных метадаў пры правядзенні індустрыялізацыі. Тут запісана: трэба "**разгортваць нашу сацыялістычную прамысловасць на аснове павышанага тэхнічнага ўзроўню, аднак у строгай адпаведнасці як з ёмкасцю рынку, так і з фінансавымі магчымасцямі дзяржавы"** [1, с. 35]. Гэта указвала на тое, што ўсе пераўтварэнні будуць праводзіцца паступова на аснове новай эканамічнай палітыкі і без, прапанаванага "Новай апазіцыяй" і Л. Троцкім, "вялікага скачку". Рэзалюцыя адмаўляла прапанову тых людзей, якія да XIV з'езда і на самім з'ездзе , выступалі за правядзенне паскоранай індустрыялізацыі праз наступленне на "заможныя элементы" на весцы, за кошт павелічэння падаткаабкладання сялян, расшырэнне вывазу зерня за мяжу. Супраць дадатковых крыніц на паскораную індустрыялізацыю за кошт вёскі выступіла большасць эканамістаў, кіраўнікоў і савецкіх служачых. У канцы 1926 г. XV партыйная канферэнцыя УКП(б) прыняла рэзалюцыю "Аб гаспадарчым становішчы краіны і задачах партыі", дзе гаварылася, што канферэнцыя асуджае погляды апазіцыі аб неабходнасці правядзення індустрыялізацыі шляхам такога абкладання падаткамі вёскі і такой палітыкі цэн, якія непазбежна прывялі б да спынення развіцця сельскай

Рэпазіторый ВГУ

гаспадаркі, скарацілі б крыніцы сыравіны для прамысловасці і рынак збыту яе прадукцыі, што непазбежна прывяло б да рэзкага падзення тэмпаў індустрыялізацыі.

Паколькі эканоміка Савецкай Беларусі была неад’емнай часткай эканомікі СССР, то тут, згодна з прынятымі ў Маскве рэзалюцыямі, асноўныя задачы і шляхі індустрыялізацыі, з улікам мясцовых асаблівасцей, былі вызначаны на партыйных форумах: на X з’ездзе КП(б)Б у снежні 1925 г. і красавіцкім пленуме ЦК у 1926 г. Індустрыялізацыя ў БССР пачалася аднначасова з іншымі рэгіёнаміі СССР, адбывалася па тых жа агульных прынцыпах. Пры правядзенні індустрыялізацыі кіраўніцтва БССР арыентавалася на хуткае развіццё ўсіх галін вытворчасці на аснове дасканалай тэхнікі, але з улікам рэгіянальных асблівасцей. Асаблівасцю індустрыялізацыі Беларусі з’яўлялася тое, што з 1926 г. і да канца I пяцігодкі тут асноўная ўвага надавалася хуткаму развіццю тых галін, што склаліся гістарычна: ільнопрадзільнай, керамічнай, шкляной, запалкавай, дрэваапрацоўчай, харчовай прамысловасці. Гэта было абумоўлена багаццем мясцовай сыравіны, наяўнасцю кадраў, існуючымі традыцыямі. Пабудова і абсталяванне прадпрыемстваў гэтых галін патрабавала значна меншых затрат і выконвалася ў больш кароткія тэрміны.

У рэспубліцы пастаянна павялічваліся аб’емы сродкаў на новае будаўніцтва і рэканструкцыю дзеючых прамысловых прадпрыемстваў. У 1925/26 гаспадарчым годзе на ўзвядзенне фабрык і заводаў выдаткавана 12,1% усёй сумы капіталаўкладанняў у прамысловасць, у 1927/28 – гаспадарчым годзе – 50%. За тры гады на Беларусі пабудавана 150 прамысловых прадпрыемстваў, у асноўным тэкстыльнай, дрэваапрацоўчай і швейнай прамысловасці. У той жа час, значная частка сродкаў вылучалася на развіццё прамысловасці будматэрыялаў, лесаапрацоўкі, энергетычнай і машынабудаўнічай галіны. Пры развіцці металаапрацоўчай і машынабудаўнічай галіны БССР апіралася на дапамогу РСФСР. Урад гэтай рэспублікі ў дапамозе БССР не адмаўляў: Каломенскі машынабудаўнічы і Тульскі чыгуналіцейны заводы прыслалі абсталяванне і спецыялістаў, што дазволіла адкрыць завод “Энергія” ў Мінску (станкабудаўнічы завод імя Кастрычніцкай рэвалюцыі), запалкаваю фабрыку “Бярэзіна” ў Барысаве. Пачатак станкабудаванню ў Беларусі паклаў завод “Энергія”. У 1928 г. тут выпушчана 200 свідравальных і 15 такарных станкоў [2, с. 191].

З саюзнага бюджэту на індустрыялізацыію народнай гаспадаркі БССР выдзяляліся значныя асігнаванні. Толькі за тры гады (1926–1928) яны склалі больш за 19 млн руб. Разам з будаўніцтвам новых прадпрыемстваў вялася рэканструкцыя і удасканальванне тэхналагічнага працэсу на дзеючых прадпрыемствах , што дазваляла павысіць выпуск прадукцыі. Так, на Віцебскай панчошна –трыкатажнай фабрыцы імя Клары Цэткін (існавала ў Віцебску да 1941 г., створана на базе арцелі 8 марта, у 1928 г. прысвоена імя



Репозиторий ВГУ

К. Цэткін) за 1925–1928 гг. устаноўлена 128 высокапрадукцыйных вязальных машын.

Хуткаму аднаўленню і пашырэнню прамысловасці рэспублікі ў гэты час садзейнічала творчая ініцыятыва рабочых, укараненне прагрэсіўных метадаў працы. Працоўная актыўнасць насельніцтва знайшла сваё адлюстраванне ў рацыяналізатарскім руху, сацыялістычным спаборніцтве за эканомію матэрыялаў і сыравіны, за выпуск большых аб'емаў якаснай прамысловай прадукцыі. Дзякуючы ініцыятыве работнікаў энергетычнай галіны, да пачатку першай пяцігодкі выпрацоўка электраэнергіі ў БССР вырасла ў 1,7 раза. За дасягнутыя вынікі рабочыя і служачыя заахвочваліся матэрыяльна і маральна. Адпаведна дэкрэту ЦВК РСФСР (сакавік 1921 г.) перадавікам вытворчасці прысвойвалася ганаровае званне "Герой працы", іх імёны заносіліся на дошкі пашаны, ім уручаліся ганаровыя граматы, аб іх вопыце пісалі сродкі масавай інфармацыі.

Правядзенне ў жыцце індустрыялізацыі на аснове новай эканамічнай палітыкі дазволіла ў кароткі тэрмін аднавіць прамысловасць, стабілізаваць эканоміку, узняць матэрыяльнае становішча насельніцтва. Гэта стварыла добрыя ўмовы для здзяйснення новых, больш важных крокаў у сацыяльна-эканамічным развіцці рэспублікі на наступных этапах.

Індустрыялізацыя краіны, як і развіццё сацыяльнай сферы, з першых гадоў савецкай улады вялася на планавай аснове. Планаванне расцэньвалася як важны сродак паспяховага стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыялізма. У лютым 1921 г. была створана камісія для складання, магчыма, больш якаснага плана рэарганізацыі прамысловасці і пад'ему эканомікі пад кіраўніцтвам Г.М. Кржыжаноўскага. Члены камісіі, у якую былі ўключаны вядучыя спецыялісты, стварылі план ГОЭРЛО, які У. Ленін называў другой праграмай партыі. План ГОЭРЛО прадстаўляў сабой праграму развіцця цяжкай прамысловасці і энергетыкі, рацыянальнае размяшчэнне прадукцыйных сіл тэрмінам на 10–15 гадоў. Да 1928 г. план ГОЭРЛО дапаўняўся планаваннем з канкрэтнымі паказчыкамі на адзін год.

XV з'езд ВКП(б), які працаваў у снежні 1927 г. (на ім заяўлена аб курсе на калектывізацыю), прыняў дырэктыву па складанні пяцігадавога плана развіцця народнай гаспадаркі. Уся каардынацыя па планаванні і выдзяленні сродкаў на ажыццяўленне плануемых аб'ектаў была ўскладзена на створаны для гэтых мэт Дзяржплан СССР. Пры пераходзе да пяцігадовага планавання Дзяржплан прапанаваў саюзнаму саўнаркому два варыянты пяцігодкі. Адзін з іх быў названы аптымальным, другі – адпраўным. Розніца планаў састаяла ў ступені напружанасці: аптымальны пераўзыходзіў адпраўны на 20% [3, с. 10].

На Беларусі, як і ва ўсёй краіне, пераход ад гадавых планаў да пяцігадовых, згодна з указаннямі Дзяржплана СССР, зроблены ў 1928 г. Першы пяцігадовы план развіцця народнай гаспадаркі і культуры БССР на 1928/1929–1930/1932 гг. (такія тэрміны звязаны з тым, што

народнагаспадарчы год пачынаўся з 1-га кастрычніка) быў зацверджаны IX з'ездам Саветаў рэспублікі ў маі 1929 г. У плане прадугледжвалася вырашыць за пяцігодку такія галоўныя задачы, як ліквідаванне эканамічнай і культурнай адсталасці рэспублікі, павышэнне ўдзельнай вагі прамысловасці ў народнай гаспадарцы, рэканструяванне сельскай гаспадаркі, выцясненне капіталістычных элементаў у горадзе і вёсцы. Характэрнай асаблівасцю зацверджанага пяцігадовага плана сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі з'яўлялася збалансаванасць і выразнае абаснаванне мэт і задач пяцігодкі. У ім ўсебакова распрацаваны праблемы эфектыўнасці вытворчасці, з улікам суадносін спажывання і назапашвання, развіцця прамысловасці і сельскай гаспадаркі, вытворчасці сродкаў вытворчасці і вытворчасці прадметаў спажывання. У плане былі захаваны ўсе асноўныя народнагаспадарчыя прапорцыі, не дапушчана парушэнняў раўнавагі.

Першыя два гады пяцігодкі адміністратыўныя метады кіравання ў спалучэнні з рыначнымі (якія паступова выцясняліся), давалі высокія вынікі: прамысловасць рэспублікі ўпэўнена рухалася ўверх. Карэнныя змены адбываліся ў структуры прамысловасці і канцэнтрацыі рабочага класа. У 1929–1930 гг. прамысловай прадукцыі атрымана на 187 млн руб. больш, чым у 1927–1928 гг. У 1931 г. пабудаваны і пачалі працаваць буйныя прадпрыемствы: фабрыка “Сцяг індустрыялізацыі”, панчошна-трыкатажная фабрыка імя КІМ у Віцебску (афіцыйнай датай увядзення фабрыкі лічыцца 7 верасня 1931 г.), ільнокамбінат у Оршы, шэраг прадпрыемстваў па выпуску цэглы, вапны, перапрацоўкі сельскагаспадарчай прадукцыі. Створаны новыя галіны – паліўная, машынабудаўнічая, хімічная. У 1932 г. выпушчана 1500 металаапрацоўчых станкоў і больш за 13 тыс. розных сельскагаспадарчых машын. Калі ў пачатку пяцігодкі на адно буйное прамысловае прадпрыемства прыходзілася каля 250 рабочых, то праз два гады – ужо 870. На буйных прадпрыемствах было занята больш за палову прамысловых рабочых, выраблялася 57,3% прамысловай прадукцыі. У 1931 г. аб'ём валавай прадукцыі прамысловасці дасягнуў 67%. Беларусь стала індустрыяльна-аграрнай рэспублікай. Удзельная вага рабочага класа за першую пяцігодку ў складзе насельніцтва павысілася з 11,3 да 20%.

За гады першай пяцігодкі па эканамічных паказчыках прамысловасць рэспублікі зрабіла вялікі крок наперад. Пабудавана 78 буйных і 480 дробных і сярэдніх новых прамысловых прадпрыемстваў. Выйшлі на выпуск прадукцыі фабрыка штучнага валакна і трубаліцейны завод у Магілёве, Бабруйскі, Барысаўскі і Гомельскі дрэваапрацоўчыя камбінаты, прыведзена ў рабочы стан буйнейшая Беларуская ГРЭС і інш. Адначасова з новым будаўніцтвам вялася рэканструкцыя, механізацыя і ўдасканаленне тэхналогіі вырабу на дзеючых прадпрыемствах. На канец 1932 г. на 52 буйных прадпрыемствах Віцебска працавала каля 20 тыс. чалавек. Выпуск прамысловай прадукцыі за гады пяцігодкі ўзрос больш чым у 5 разоў [4, с. 62–63]. Новыя будоўлі і



Репозиторий ВГУ

рэканструкцыя прадпрыемстваў паўсюдна праводзіліся пры дапамозе спецыялістаў з прамыслова развітых рэгіёнаў СССР, а таксама спецыялістаў, падрыхтаваных ва ўстановах рэспублікі. Калі ў 1927/28 навучальным годзе ў БССР мелася 5 індустрыяльных тэхнікумаў, то на канец пяцігодкі іх колькасць павялічылася да 30. Штогод яны выпускалі каля 1000 спецыялістаў сярэдняга звяна. Капіталаўкладанні ў прамысловасць за пяцігодку склалі 243 млн руб. (у 5,3 разы болей за папярэдніх 10 гадоў). Перавагі ў развіцці атрымалі дрэваапрацоўчая, запалкавая, папяровая, харчовая, льняная і швейная галіны прамысловасці. Узніклі новыя галіны прамысловасці: сельскагаспадарчае машынабудаванне, станкабудаванне, хімічная і хіміка-фармацэўтычная вытворчасць. Быў наладжаны выпуск штучнага валакна, вытворчасць маргарына, малочнай кіслаты і інш. Больш хуткімі тэмпамі развіваліся галіны лёгкай прамысловасці: прадукцыя металаапрацоўчай прамысловасці павялічылася на 377,2%, харчасмакавай на 473,8%, гарбарна-абутковай на 601,6% і швейнай на 1270,4%. Важным сацыяльным вынікам індустрыялізацыі з'яўлялася ліквідацыя беспрацоўя: у 1928 г. у БССР налічвалася 50 тыс. беспрацоўных. У пачатку 1931 г. разам з біржамі працы зніклі і беспрацоўныя.

У мэтах забяспячэння плануемых тэмпаў індустрыялізацыі выкарыстоўвалася прыкладна палова нацыянальнага даходу рэспублікі. Вялікія сродкі на правядзенне індустрыялізацыі давала сама прамысловасць. Прадпрыемствы імкнуліся да зніжэння сабекошту, выпускаемай прадукцыі, павышэння рэнтабельнасці за кошт эканоміі матэрыялаў і сыравіны. У 1926 г толькі на 4 прадпрыемствах Віцебскай акругі было сэканомлена 560 тыс. руб. Значныя сродкі на індустрыялізацыю давала вёска.

Экспарт сельскагаспадарчай прадукцыі ў 1926/27 гаспадарчым годзе дазволіў набыць за мяжой станкі і абсталяванне на суму 5,5 млн руб. Выкарыстоўваліся таксама на індустрыялізацыю сродкі, атрыманыя па пазыках працоўных. За гады першай пяцігодкі працоўныя ўнеслі па пазыках для патрэб індустрыялізацыі 139 млн руб. Канешне, для ажыццяўлення такой буйнамаштабнай праграмы індустрыялізацыі, якая разгарнулася ў рэспубліцы, сваіх эканамічных рэсурсаў не хапала. Таму прыкладна палова (100 млн рублёў, без уліку чыгуначнага транспарту) была выдаткавана з саюзнага бюджэту. У 1928–1932 гг. з усіх укладзеных у прамысловасць БССР сродкаў, трэццю частку яна атрымлівала з саюзнага фонда.

Аднак, у гэты перыяд усё больш і больш бярэ верх камандна-адміністратыўны стыль кіраўніцтва эканомікай. З 1927 г. для трэстаў ўвялі вытворчыя планы, з 1928 г. сіндыкатскі гандаль быў заменены размеркавальнымі фондамі і нарадамі, у 1929 г. сіндыкаты ператварылі ў галіновыя прамысловыя аб'яднанні – пасрэдніцкае звяно ў сістэме кіравання прамысловасцю праз наркаматы. З гэтага часу максімальна

Репозиторий ВГУ

ўзмацняецца ўціск на прыватны сектар. Да пачатку 30-х гг. з цэнтральных органаў краіны рэгламентаваліся ўсе асноўныя паказчыкі работы рэспубліканскай прамысловасці. Такі стыль задавальняў Сталіна і яго групу (Куйбышаў, Молатаў, Андрэеў, Кагановіч, Кіраў, Мікаян). Іх погляды і дзейнасць тыпу: “выкананне планаў любым коштам” і эканамічная рамантыка накшталт таго, што “воля партыі вытварае дзіва” нанеслі вялікую шкоду працоўным усіх рэспублік. Механізмы сістэмы новай эканамічнай палітыкі (арэндныя адносіны, развіцце дробнай прамысловасці, прыватных прадпрыемстваў і інш.) у сувязі з адзяржаўлеваннем сродкаў вытворчасці і выцясненнем прыватніка амаль што затухлі.

Да канца першай пяцігодкі 1930–1932 гг. адбыўся поўны злом нэпаўскіх рыначных падыходаў. У 1932 г. Беларускі саўнаргас быў пераўтвораны ў наркамат лёгкай прамысловасці БССР, а прадпрыемствы цяжкай і лясной прамысловасці рэспублікі, якія яму падпарадкоўваліся, перададзены адпаведным саюзным наркаматам. Альтэрнатыўны шлях развіцця, за якім стаяла група Бухарына, заснаваны на строгім уліку аб'ектыўнай эканамічнай заканамернасці, быў закрыты. Удзельная вага прыватнага сектара ў агульнай прамысловай прадукцыі на працягу 1925/26–1927/28 гаспадарчых гадоў знізілася ў БССР з 49,2% да 28,6% [5, с. 88]. Эканамічныя стымулы і дзяжразліковыя метады ў сфарміраваных планах як першай, так і іншых пяцігодак, у час іх рэалізацыі знікалі. На практыцы вядучымі станавіліся метады каманднай эканомікі. Лозунг “Пяцігодку – за чатыры гады”, а затым частая змена (ці гонка) паказчыкаў у бок павышэння, адмоўна адбіваліся на канчатковых выніках. Абвастрылася праблема назапашвання, фарміраваўся затратны механізм. Усталяванне цэнтралізму і валюнтарысцкіх метадаў, адыход ад НЭПа, дзе дзейсна прымяняліся эканамічныя стымулы і гаспадарчы разлік, прывялі да падзення тэмпаў развіцця прамысловасці. Рост прадукцыйнасці працы адставаў ад зададзеных тэмпаў, высокім заставаўся сабекошт прадукцыі. Аб’ём прамысловай вытворчасці за пяцігоддзе ў рэспубліцы павялічыўся ў 2,7 раза, тады як планам намячалася павысіць яго ў 3,7 раза. Напрыклад, прамысловыя прадпрыемствы Віцебска, даведзеныя да іх планавыя заданні на 1932 г., выканалі толькі на 77,8% [6, с. 256].

План капітальнага будаўніцтва ў БССР выкананы толькі на 68,1%. Не выкананымі засталіся планы I пяцігодкі па многіх натуральных паказчыках у такіх галінах, як энергетыка, план (ад абвешчанага) быў выкананы толькі на 69% (намячалася давесці вытворчасць электраэнергіі да 260 млн кВт г – выпрацавана 177 млн кВт г), у тарфяной прамысловасці – на 85%, цаглянай – на 90%. За першую пяцігодку прамысловасць не выпусціла запланаванай прадукцыі на суму 192,5 млн рублёў [6, с. 194]. На падставе невыканання планаў праводзілася чыстка сярод мясцовых партыйных, дзяржаўных і гаспадарчых кадраў, абвінавачванні іх у нацыянал-ухілізме і шкодніцтве.

Репозиторий ВГУ

**2. Развіцце прамысловасці Беларусі ў перыяд 1933–1941 гг.** На завяршэнні, папярэдняга пытання было заўважана, што гаспадарчы механізм сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны з канца 20-х гг. будаваўся з парушэннем эканамічных законаў. Вялікая залежнасць эканомікі ад палітыкі, дырэктыўнае планаванне заставаліся вядучымі рысамі і ў гады другой (1933–1937 гг.) і няпоўнай – трэцяй (1938–1941) пяцігодках. Тэмпы роста прамысловай прадукцыі пры планаванні на гэтым этапе закладваліся даволі высокія, што прыводзіла да ўзмацнення дыспрапорцый і цяжкасцяў. Перавага пры гэтым ў развіцці рэспублікі надавалася галінам цяжкай прамысловасці.

У гады другой пяцігодкі ў БССР уведзены ў эксплуатацыю шэраг найбуйнейшых прадпрыемстваў: Гомельскі шклозавод, Магілёўскі трубаліцейны завод, другая чарга БелДРЭС, Мінская ТЭЦ-2, Полацкая, Мазырская, Барысаўская, Слуцкая электрастанцыя. Усяго за пяцігодку пабудавана 1700 прадпрыемстваў, каля 100 прадпрыемстваў карэнным чынам рэканструявана. Значныя перамены адбыліся за гэтыя гады і на Віцебшчыне. У канцы 30-х гадоў тут мелася 493 буйныя прадпрыемствы, на іх працавала 51,5 тыс. рабочых. У народнай гаспадарцы было занята каля 4 тыс. спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй [7, с. 192]. У гады другой пяцігодкі праведзена рэканструкцыя ільнопрадзільнай фабрыкі “Дзвіна”, а таксама акулярнай, панчошна-трыкатажнай імя КІМ, заводаў – станкабудаўнічага імя Кірава, ігольнага, гарбарнага, чыгуначнага дэпо, панчошна-трыкатажнай фабрыкі імя К. Цэткін і інш [6, с. 257]. Трыкатажны цэх фабрыкі К. Цэткін у 1937 г. з’яўляўся самым буйным у СССР. Тут працавала звыш 2 тыс. рабочых, 13 інжынераў і 40 тэхнікаў [7а, с. 2].

Зрухі ў развіцці эканомікі Беларусі (у параўнанні з дарэвалюцыйнымі) сапраўды былі грандыёзныя. У правядзенні індустрыялізацыі прымалі ўдзел усе сацыяльныя пласты грамадства. Асноўныя крыніцы для яе правядзення, як і раней, знаходзіліся ў вёсцы. Таварная сельскагаспадарчая прадукцыя давала значныя паступленні ў дзяржаўны фонд. Экспарт хлеба на працягу ўсіх гадоў павялічваўся. У тым ліку і за кошт БССР. Напрыклад, у 1932 г. у саюзны дзяржаўны фонд з рэспублікі паступіла 134 тыс. тон зерня, у 1933 г. – 264 тыс. тон, у 1934 г. 367 тыс. тон. Павялічвалася ўдзельная вага нарыхтаванага і здадзенага ў выглядзе нарыхтовак дзяржаве хлеба да сабранага (1932 г. – 8,5%, 1936 – каля 19%). Акрамя гэтага, вёска выплочвала значныя падаткі ў выглядзе грошай. Істотнай крыніцай у фінансаванні індустрыялізацыі з’яўляўся прыбытак, які прыносілі новыя і рэканструіраваныя прамысловыя прадпрыемствы. Матэрыяльныя сродкі канцэнтраваліся ў саюзным бюджэце, затым размяркоўваліся па рэспубліках.

З мэтай паскарэння тэмпаў эканамічнага развіцця ў рэспубліцы разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, якое набыло масавы характар. Усе формы спаборніцтва былі скіраваны на развіццё

Рэпазіторый ВГУ

вытворчай актыўнасці і рост кваліфікацыі працоўных, укараненне эфектыўных прыёмаў і метадаў працы, новай больш дасканалай тэхнікі. З усіх прадпрыемстваў рэспублікі ішлі рапарты аб перавыкананні планаў і рэкордных галіновых паказчыках. На Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыцы “КІМ” шмат увагі надавалася павышэнню тэхнічнага ўзроўню рабочых. Гэта дабратворна адбівалася на росце прадуктыўнасці працы і якасці выпушчанай прадукцыі. Напружаны план 1934 г. калектыў фабрыкі. выканаў на 106%, выпуск прадукцыі першага гатунку за год узрос з 53,5% да 75% [8, с. 201]. Назапашаны вопыт трыкатажнікаў па павышэнні тэхнічнай пісьменнасці працоўнага калектыву быў вынесен на разгляд рэспубліканскай канферэнцыі рабочых-выдатнікаў тэхнічнай вучобы лёгкай прамысловасці БССР (май 1934 г.). Адзначыўшы яго карыснасць, удзельнікі канферэнцыі звярнуліся да кіраўнікоў прадпрыемстваў Беларусі, інжынераў і тэхнікаў з заклікам забяспечыць, як гэта зроблена на фабрыцы “КІМ”, сістэмную тэхнічную вучобу рабочых.

У 1935 г. у прамысловасці рэспублікі разгарнуўся стаханаўскі рух. У шэрагу гарадоў (Мінску, Магілёве, Віцебску, Оршы, Полацку) у кастрычніку–лістападзе 1936 г. адбыліся раённыя і гарадскія злёты стаханаўцаў. Да верасня 1936 г. на прадпрыемствах БССР у сацыялістычным спаборніцтве ўдзельнічалі 73,9% працуючых, а 34,8% рабочых былі прызнаны стаханаўцамі. Большасць стаханаўцаў мелі высокія дасягненні ў працы. У снежні 1935 г. лепшыя стаханаўцы Віцебскага лесазавода інфармавалі гарадскі партыйны камітэт аб устанаўленні сусветнага рэкорду па распілоўцы драўніны. У студзені 1937 г. чвэрць рабочых прадпрыемстваў Віцебска (7316 чал.) працавалі па метаду Стаханава. Лепшыя паказчыкі мелі А. Семенідава, Я. Дабравольская, Д. Майораў, Т. Падскочая [9, с. 239 ].

Развіваўся ў гэтай пяцігодцы рух наватараў вытворчасці, звязаны з засваеннем дзвюх і больш аперацый, сумяшчэннем прафесій. Напрыклад, на Віцебскай панчошна-трыкатажнай фабрыцы “КІМ” многія працоўныя сталі абслугоўваць па 48 верацён замест 24, на тэкстыльнай фабрыцы “Дзвіна” большасць работніц перайшло на абслугоўванне трох і больш станкоў.

Адбываўся ў гэтыя гады ў БССР колькасны рост рабочага класа: калі ў 1926 г. рабочы клас у агульнай колькасці насельніцтва рэспублікі складаў толькі 4,05%, то ў 1939 г. – 21,9%. Большасць рабочых было занята ў металаапрацоўчай прамысловасці – 41,5 тыс. чал., дрэваапрацоўчай – 15 тыс., тэкстыльнай 11,7 тыс., каля 20 тыс. – на транспарце. Але, нягледзячы на рост гарадскога насельніцтва (яно складала каля 25% ад усяго насельніцтва), распрацаваную сістэму падрыхтоўкі кадраў, прамысловыя прадпрыемствы не мелі магчымасці камплектавацца кваліфікаванай рабочай сілай. Індустрыялізацыя патрабавала вялікай колькасці рабочых рук. На працу часта прымаліся не падрыхтаваныя да індустрыяльнай працы жыхары весак. Да таго ж, назіралася вялікая цякучасць кадраў: рабочыя часта менялі месца працы. Індустрыялізацыя

вяла да павышэння колькасці жанчын, занятых на вытворчасці. У галіне лёгкай прамысловасці жанчыны складалі дзве трэці работнікаў.

Напрыканцы другой пяцігодкі па шчыльнасці БССР была адной з найбольш населеных рэгіёнаў (41 чал. на кв. км.). У той жа час рэспубліка заставалася яшчэ маланаселенай: тут пражывала крыху больш за 5,5 млн чалавек (3,2% насельніцтва СССР). За гады другой пяцігодкі (1933–1937 гг.) валавая прадукцыя ў БССР павялічылася ў 1,9 раза, а прадукцыя металаапрацоўчай прамысловасці – на 287,5%. Вынікі маглі быць і лепшымі, але палітыка вялікага скачка ў эканоміцы ў спалучэнні з рэпрэсіўнымі дзеяннямі нанеслі краіне непапраўныя матэрыяльныя і маральныя страты. Як у першай, так і ў гэтай пяцігодцы нацыянальны даход павялічыўся толькі на 3–4%, гэта значыць знізіўся ў параўнанні з перыядам нэпа ў 5–6 разоў. Сярэднегадавыя тэмпы прыросту прамысловай вытворчасці ў 1929–1938 гг. склалі 9% супраць 26%, што назіраліся ў 1920–1929 гг. [10, с. 174].

У сакавіку 1939 г. на XVIII з’ездзе УКП(б) быў разгледжаны і зацверджаны трэці пяцігадовы план развіцця СССР на 1938–1942 гг. Краіна, як дэкларавалася ў дакументах з’езда, уступіла ў завяршальны перыяд будаўніцтва сацыялістычнага грамадства і паступовага пераходу да камунізму. Прызнавалася, што і надалей сутнасцю індустрыялізацыі застанецца развіццё ўсіх галін вытворчасці, але першачарговае развіццё на гэтым этапе атрымаюць тыя галіны, якія прызваны забяспечыць навукова тэхнічны прагрэс. Сюды ўваходзяць энергетыка, машынабудаванне, станкабудаванне, паліўная і хімічная прамысловасць.

У адпаведнасці з дадзенымі рашэннямі ў БССР складзены, на гэты ж самы тэрмін, план развіцця народнай гаспадаркі. У галіне прамысловасці пастаўлена задача абсалявання ўсіх галін народнай гаспадаркі навейшай тэхнікай, далейшае развіццё энергетыкі, машынабудавання, прадпрыемстваў абароннага значэння, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, лёгкай і харчовай прамысловасці. Агульны аб’ем валавой прадукцыі прамысловасці павінен быў павялічыцца ў 1,5 раза.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і праблемы, у 1938 г. у БССР было выпушчана 2,2% усёй валавай прадукцыі прамысловасці СССР, 1,2% – металаапрацоўчых станкоў, 28,7% – фанеры, каля 7% – паперы, 16% – ільновалакна. Поспехі ў развіцці прамысловасці БССР меліся і ў наступныя гады. Шырокае індустрыяльнае будаўніцтва, развіццё творчай актыўнасці працоўных, змянілі аблічча ўсіх беларускіх гарадоў. У буйныя прамысловыя цэнтры пераўтварыліся Бабруйск, Барысаў, Орша, Рэчыца. Шпарка развівалася машынабудаванне, станкабудаванне, энергетыка, лёгкая, харчовая і ваенная прамысловасць.

Буйным прамысловым і транспартным вузлом да гэтага часу стаў абласны цэнтр Віцебшчыны. У 1940 г. у Віцебску дзейнічала 209 прадпрыемстваў, якія выпусцілі прамысловай прадукцыі больш чым на 410 млн руб. Працаўнікі фабрыкі «КІМ» і «Сцяг індустрыялізацыі» ужо

Репозиторий ВГУ

ў 1937 г. выпусцілі ў 1,5 разы больш прадукцыі, чым давала ўся буйная прамысловасць Беларусі ў 1913 годзе. Тры станкабудаўнічыя заводы горада выраблялі ў 1940 г. прадукцыі на 16 млн руб. Акулярная фабрыка, на якой працавалі 842 чалавекі , была адзіным у СССР прадпрыемствам па вырабе аптычных акуляраў і ахоўных акуляраў і прылад. Харчовую прамысловасць у Віцебску прадстаўлялі 2 хлебзаводы, маслабойны, малочны, дражджавы і піваварны заводы, мясакамбінат, птушкакамбінат, махорачная фабрыка. Побач з магутнай дзяржаўнай прамысловасцю існавала разгалінаваная сетка прадпрыемстваў прамысловай кааперацыі, на якія ў 1941 г. прыйшлося 85% вытворчасці тавараў народнага спажывання. Сучасным прадпрыемствам горада з'яўлялася, пабудаваная ў 1938 г., абласная друкарня імя Камінтэрна [6, с. 257].

Віцебская вобласць напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны па аб'ёме выпускаемай прамысловай прадукцыі ў 12 разоў перасягнула ўзровень 1913 г., а металаапрацоўчай – у 40 разоў. У вобласці выпускалася прыкладна 80% усёй ільняной пражы, тканін і трыкатажу, якія выпрацоўваліся ў рэспубліцы.

Дзейнасць працоўных дазволіла стабілізаваць сітуацыю ў краіне, але не вырашала абвастрыўшыхся праблем. Не высокай заставалася эфектыўнасць эканомікі і якасць прадукцыі. Індустрыялізацыя не вырашала галоўнай задачы краіны па забяспячэнню вышэйшай, ў параўнанні з капіталізмам, прадукцыйнасці працы. Увага, у асноўным, звярталася на рост аб'ёмаў, на колькасныя паказчыкі, якасныя паказчыкі былі на другім плане. Такое гаспадаранне абапіралася на шырокае выкарыстанне экстэнсіўных фактараў: у вытворчасць уцягваліся ўсё новыя дадатковыя матэрыяльныя і працоўныя рэсурсы.

У Беларусі толькі за 1935 год каля 40% прадукцыі было атрымана за кошт прыцягвання новых рабочых рук. 2/3 новага папаўнення рабочага класа давала сяло. Многія з сялян не ўмелі яшчэ ні чытаць, ні пісаць. Усё гэта ўскладняла асвойванне новай тэхнікі і тэхналогіі і не садзейнічала павышэнню прадукцыйнасці працы. Тым не менш беларускі народ меў настрой і гатоўнасць працаваць не толькі за грошы, але і за ідэю. Заахвочаныя кіраўніцтвам прадпрыемстваў, рабочыя імкнуліся абслужыць больш станкоў, чым патрабавалась па норме, перавыканаць планавыя заданні. Агульнымі намаганнямі яны здзейснілі індустрыялізацыю краіны. Да 1941 г. рэспубліка змяняла свой воблік.

У 1939 г. у склад БССР была далучана Заходняя Беларусь. З гэтага часу 3-ці пяцігадовы план стаў распаўсюджвацца і на эканоміку заходняга рэгіёна. У Гродна, Лідзе, Баранавічах, Ваўкавыску, Слоніме, Пінску былі пабудаваны дзясяткі новых прадпрыемстваў. Толькі за 1940 г. капіталаўкладанні ў будаўніцтва ў заходніх абласцях склалі звыш 100 млн рублей. У выніку у 1940 г. прамысловасць Заходняй Беларусі стала выпрацоўваць прадукцыі ў два з лішнім разы больш, чым у 1938 г.



Рэпазіторый ВГУ

Насельніцтва атрымала сацыяльную абарону , бясплатнае медыцынскае абслугоўванне, адукацыю, павышэнне жыццёвага ўзроўню. Адкрываліся новыя ўстановы адукацыі. Да 1941 г. тут цалкам ліквідавана беспрацоўе.

За гады даваенных савецкіх пяцігодак БССР ператварылася ў індустрыяльную рэспубліку. Важным паказчыкам яе індустрыяльнага развіцця з'яўлялася павялічэнне асноўных вытворчых фондаў буйной прамысловасці. З 1928 г. да 1940 г. яны ўзраслі амаль у чатыры разы (з 112 млн руб. да 392,5 млн руб.) [11, с. 105 ]. У 1940 г. 80% усёй прадукцыі народнай гаспадаркі прыходзілася на долю прамысловасці.

Аднак асноўная задача – дагнаць і перагнаць у эканамічных адносінах развітыя краіны – заставалася пакуль толькі прапагандысцкім лозунгам. Сістэма кіравання, заснаваная на сталінскім валюнтарызме, якая склалася ў 30-я гады, не дазволіла дасягнуць плануемых вынікаў.

Невыкананне планаў рэспублікай наверсе атаясамлівалася з "падкопамі" "контррэвалюцыянераў, шкоднікаў і іншых ворагаў народа". Вінаватых у эканамічных праліках, што сядзелі "наверсе", не бачылі, затое адразу знаходзілі іх на месцах. Органы НКУС рэспублікі па прыкладзе Масквы, дзе раскрылі да гэтага часу "Прампартыю" і "Шахцінскую справу", выявілі шмат "ворагаў народа" на Беларусі. Так, яны "разаблачылі" групу "трацкісцкіх контррэвалюцыйных шкоднікаў" у Віцебскім чыгуначным дэпо, а таксама на фабрыцы "Сцяг індустрыялізацыі". Мясцовыя кіруючыя кадры абвінавачваліся ў нацыянал-ухланізме. Таму ўлічваць нацыянальныя спецыфічныя інтарэсы рэспублікі апошнія не маглі. Яны паддаліся бюракратызму цэнтра, рабілі ўсё па яго ўказаннях, ініцыятыву асабліва не праяўлялі.

Утрымлівала элементы бюракратызму ў 30-я гг. і сацыяльная палітыка. У прымітыўнай форме як быццам бы прымаліся захады, каб змяніць становішча рабочага класа. Але гэта рабілася ў асноўным за кошт сяла. Пагэтаму ўваход у горад станавіўся імкненнем міліёнаў людзей. Індустрыялізацыя з яе магутнымі маштабамі і нізкай вытворчасцю працы патрабавала ўсё новых работнікаў. Расла роля жанчын у грамадскай вытворчасці.

Новай рысай ў жыцці рэспублікі стала маральнае стымуляванне працы. Для людзей таго часу падзяка за працу – урадавыя ўзнагароды, ганаровыя і пахвальныя лісты, фота на дошцы гонару – мелі важную ролю. Паколькі раней нічога падобнага ў такіх памерах не было, людзі ганарыліся грамадскай увагай да іх працы. Палітыка бясплатнай адукацыі (у І пяцігодцы – пачатковае навучанне, у ІІ пяцігодцы – абавязковая 7-класная адукацыя), медыцынскае абслугоўванне, 7-гадзінны працоўны дзень, абавязковы (аплочваемы) адпачынак і г.д. – усё гэта, канешне, успрымалася ў масавай свядомасці як вынік індустрыялізацыі. Разам з тым вялікая колькасць людзей гэтых прывілеяў (водпускаў, пенсій) не мела. Больш за ўсё гэта тычыцца сялян. Крайне невысокім заставаўся ўзровень

Рэпазіторый ВДУ

матэрыяльнага дабрабыту. Стратэгія фарсіраванага, паскоранага індустрыяльнага развіцця, згодна сталінскім указанням, патрабавала ад савецкіх людзей “сур’езных ахвяр” і прызывала працоўных, рабочы клас, у першую чаргу, свядома пайсці на іх [12, с. 176]. У 1929 г. уведзена картачная сістэма. Але яна распаўсюджвалася не на ўсё насельніцтва. У 1930 г. хлебныя карткі мела толькі чацвёртая частка насельніцтва. Яшчэ менш людзей мела картку на мяса, масла і іншыя каларыйныя харчовыя прадукты. Толькі з 1935 г. пачынаецца паступовае паляпшэнне: адмяняюцца карткі на хлеб, потым – на астатнія харчовыя і прамысловыя тавары. Да 1940 г. узровень жыцця вярнуўся да зыходняга 1928 года. Але расходы на харчаванне заставаліся даволі высокімі.

Такім чынам бачна, што індустрыялізацыя намячалася як працяг палітыкі НЭПа. Канчатковым вынікам палітыкі індустрыялізацыі была мэта – не парушаючы аб’ектыўных эканамічных законаў, ператварыць СССР з дзяржавы, якая прывозіць машыны і абсталяванне з-за мяжы, у краіну, якая сама займаецца вытворчасцю машын і абсталявання, і такім чынам прадстаўляе сабой не дадатак, а самастойную эканамічную адзінку. Такі варыянт стратэгі індустрыялізацыі і будаўніцтва сацыялізма ў краіне быў выразна выкладзен у партыйных дакументах, прынятых у 1927–1928 гг. Ён меў на ўвазе захаванне таварна-грашовых асноў нэпаўскай эканомікі і правядзенне параўнальна плаўнай, арганічнай індустрыялізацыіі, у якой тэмпы задаюцца спалучэннем прамысловага роста з ростам дабрабыту і паступовым добраахвотным кааперыраваннем сялянства. У дакументах 1929–1934 гг. такі варыянт індустрыялізацыі стаў прызнавацца не рэальным. Дзеля падтрымання высокіх тэмпаў цяжкай прамысловасці прапаноўвалася ўсялякае пашырэнне капіталаўкладанняў у прамысловасць, у тым ліку за кошт скарачэння фондаў спажывання і жорсткай эканоміі сродкаў, якія вызначалі жыццёвы ўзровень народных мас.

На жаль, сталінскі варыянт стратэгіі сацыялістычнай індустрыялізацыі будаваўся не толькі ў разліку на добраахвотныя і свядомыя намаганні народа, але і на элементах прымушэння і рэпрэсіўных сродках праз каманднa-адміністратыўную сістэму.

Спасылкі

1. КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций, пленумов ЦК. – М., 1970. – Т.4.

2. Мандрык, І.У. Гісторы Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.У. Мандрык. – Віцебск: УА ФПБ “МІПСА”. 2009. – 276 с.

3. Лацис, О. Перелом / Уроки горькие, но необходимые // сост.: В.С. Молдаван, А.Г. Гридчина. – М.: Мысль, 1988. – 346 с.

4. Мандрик, И.В. Очерки истории профсоюзов Витебщины. – Витебск: Витебская областная типография, 2015. – 504 с.: ил.

5. Нарысы гісторыі Беларусі. – Мн., 1995. – Ч. 2.

6. Памяць: гіст.-дакум.хроніка Віцебска: у 2 кн. Кн. 1 / рэд.кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш..; маст.Э.Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2002. – 648 с.: іл.

7. Мандрык, І.У. Гісторы Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.У. Мандрык. – Віцебск: УА ФПБ “МІПСА”, 2009. – 276 с.



Репозиторий ВГУ

7а. Советская Белоруссия, 1938. – 18 дек.
8. Нацыянальный архив Рэспублики Беларусь (в далейшем НАРБ). Фонд 4. – Опісь1. – Дело 4238
9. Мандрик, И.В. Очерки истории профсоюзов Витебщины. – Витебск: Витебская областная типография, 2015. – 504 с.: ил.
10. Эканамічная гісторыя Беларусі: курс лекцый / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.В. Шапавал і інш./ пад агул. рэд. В.І. Галубовіча. – Мн.: Экаперспектыва, 1993. – 288 с.
11. Развитие экономики Белоруссии в 1928–1941 гг. – Мн.: Беларусь, 1950.
12. Сталин И.В. Соч., т. 13. – С. 176.

## ТЭМА 8. Палітыка дзяржавы па сялянскім пытанні

1. Становішча ў сельскай гаспадарцы на пачатку 20-х гадоў.
2. Станоўчыя змены на весцы ў час нэпа.
3. Суцэльная калектывізацыя і яе асноўныя вынікі.

**1. Становішча ў сельскай гаспадарцы на пачатку 20-х гадоў.** Матэрыял дадзенага пытання мае непасрэднае дачыненне да праблемы развіцця сельскай гаспадаркі пасля ўвядзення НЭПа. Тут паказана барацьба вакол гэтага пытання ў кіруючым стане, а таксама выбраныя і практычныя шляхі па пераўтварэнні вясковага жыцця ў 20–30-я гг. Але перад тым, як непасрэдна перайсці да асноўнага зместу, неабходна зразумець, што пытанне, звязанае, з палітыкай савецкай улады па ўладкаванню сялянскай гаспадаркі, празмерна шырокае. Пры яго вывучэнні неабходна асэнсаваць устаноўкі праграмы бальшавікоў па вырашэнні аграрнага пытання да заваявання ўлады ў краіне. Азнаямленне з дакументамі пацвердзіць, што вырашэнне бальшавікамі аграрнага пытання закладзена ўжо ў іх першай праграме, прынятай у 1903 г. Праграма РСДРП(б) патрабавала ліквідацыі рэшткаў прыгонніцтва, адмену выкупных і аброчных выплат, адмену ўсіх законаў, абмяжоўваючых селяніна ў распараджэнні яго зямлёй, вяртання сялянам тых зямель, якія былі адрэзаны ў іх пры адмене прыгоннага права, заснавання сялянскіх камітэтаў. У красавіцкіх тэзісах 1917 г. ставілася пытанне аб канфіскацыі памешчыцкіх і нацыяналізацыі ўсіх зямель.

Першы савецкі Дэкрэт аб зямлі, які быў прыняты 26 кастрычніка 1917 г., улічваў патрабаванні эсэраўскай партыйнай праграмы з сялянскім наказам аб зямлі на аснове 242 мясцовых сялянскіх наказаў. У дэкрэце прадугледжвалася нацыяналізацыя зямлі, ліквідацыя памешчыцкай гаспадаркі, а таксама скасаванне царкоўнага, манастырскага, удзельнага землеўладання, прадастаўленне сялянам права апрацоўваць зямлю сваёй працай на аснове ўраўняльнага землекарыстання (сутнасць ураўняльнага землекарыстання – ніхто не мог патрабаваць зямлі больш, чым у стане апрацаваць яе сам, ці працай сваёй сям’і).



Репозиторий ВГУ

Згодна з дэкрэтам аб зямлі і рашэннем з’езда саветаў Заходняй вобласці, валасныя саветы ў лістападзе–снежні 1917 г. пачалі актыўную работу па канфіскацыі памешчыцкіх маёнткаў і перадачы іх батрацкім камітэтам для гаспадарчага выкарыстання. Да сярэдзіны лютага 1918 г. было канфіскавана каля 13 тыс. прыватнаўласніцкіх гаспадарак, сялянам перадана 164800 дзесяцін зямл [1, с. 452 ]. У сярэдзіне 1918 года III з’езд саветаў Заходняй вобласці прыняў рашэнне аб перадачы высокакультурных гаспадарак дзяржаўнаму фонду для арганізацыі дзяржгасаў, а землі сярэдняй і нізкай культурнасці – для стварэння сельскагаспадарчых арцелей. У студзені 1919 г., у прынятых ЦБ КП(б)Б тэзісах яскрава праглядваецца накірунак на пераход ад аднаасобных гаспадарак да калектыўных, у форме камун, затым – сельскагаспадарчых арцелей і таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі (ТОЗ), а зямлю , якая застанецца пасля гэтага адвесці для аднаасобных гаспадарак. Пазней, 4 лютага 1919 г. накірунак на перавод сельскай гаспадаркі на сацыялістычныя рэйкі праз стварэнне саўгасаў, камун, грамадскія запашкі пацвердзіў першы з’езд Саветаў БССР. Уся зямля, незалежна ад таго, хто ёю карыстаўся, абвешчана адзіным дзяржаўным фондам [2, с. 163].

Кіраўнікі Наркамзема, відавочна, стаялі на ілюзорных пазіцыях: ім здавалася, што абагульненне дробных сялянскіх гаспадарак у калектыўныя дасць магчымасць хутчэй уступіць у сацыялізм. Калектыўныя гаспадаркі на Беларусі, як і рэкамендавалася, утвараліся ў трох асноўных формах: камуны (адбывалася поўнае абагульненне маёмасці); арцелі (абагульнялася зямля, працоўная жывёла, сельскагаспадарчы інвентар і гаспадарчыя пабудовы, пры захаванні ў асабістым карыстанні прысядзібных надзелаў, дробных прылад працы, хатняй жывёлы); таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі (ТОЗы, абагульнялася толькі зямля). У пачатку 1919 г. на Беларусі налічвалася 286 калектыўных гаспадарак: 175 камун, 36 арцелей, 75 таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі [3, с. 195].

Селянін-працаўнік на гэтым этапе не падтрымліваў ідэі бальшавікоў па стварэнні калектыўных гаспадарак з-за іх палітыкі сацыялізацыі зямлі і абагульнення, хай і невялікіх, сродкаў вытворчасці. Гэта, на думку селяніна, пагражала яму стратай усяго таго, чым ён валодаў. Атрымаўшы зямлю, селянін жадаў рэалізаваць сябе як яе ўласнік. Пакуль ён не вычарпаў свой патэнцыял удасканалення аднаасобнай гаспадаркі, аб другіх формах ён думаць не жадаў. Наспех створаныя камуны і арцелі часцей за ўсе распадаліся. Мала дапамагалі стварэнню і ўмацаванню калектыўных гаспадарак на гэтым этапе як каманднa-адміністратыўны ўціск, так і рэпрэсіўныя меры супраць сялян.

Мясцовае партыйнае кіраўніцтва, у тым ліку і на Беларусі, слепа, на свой погляд, выконвала выказванні У.І. Ленін, аб тым, што пабудова сацыялізму несумяшчальна з захаваннем раздробленай сялянскай гаспадаркі. Яны не ўлічылі яго ўказанняў, што сялянамі нельга

Рэпазіторый ВДУ

камандаваць, яны самі здольны выбраць найлепшы від гаспадарання: "Дзейнічаць тут насіллем, як ён піша, значыць загубіць усю справу" [4, с. 200]. Патрабуецца, як ён сцвярджаў, пераход да буйной калектыўнай сацыялістычнай гаспадаркі праз укараненне кааперацыі. Пачынаць, трэба з прасцейшых форм кааперацыі – збытавой, забяспячэння, крэдытнай і адначасова наладжваць вытворчую кааперацыю. Такую думку падзяляла большасць сялян. Як прыклад, на 4 Віцебскай губернскай канферэнцыі РКП(б)Б, якая адбылася 5 сакавіка 1919 г., разглядалася пытанне аб рабоце партыі ў вёсцы. Дакладчык (Грабенік) сцвярджаў, што ідэя неабходнасці калектывізацыі глыбока пранікла ў сялянскі асяродак. Але шэраг выступоўцаў не падзялялі гэтай думкі. Адзін з іх (прозвішча Касавін) кажа аб шкодніцкіх адносінах сялян да існуючай практыкі абагульнення ў камуны. Кіраўнікі губернскага партыйнага камітэта хібы сялянскіх адносін да камун тлумачаць адсутнасцю на месцах, належным чынам, пастаўленай, агітацыі. Як бачна з пратаколу канферэнцыі, прамоўцы з уездаў не супраць агітацыйнай дзейнасці, але яны схіляюцца да таго, што пасля слоў павінна быць справа, адбыцца паляпшэнне, а пры стварэнні камун гэтага не наглядаецца. Такі падыход дае падставу зрабіць наступную выснову: лепшы агітатар на вёсцы ў гэты час – кулак, які ў супрацьлегласць камунару, зацікаўлена і ўмела вядзе сваю гаспадарку [5, с. 24].

Да 1921 г. працоўнае сялянства Беларусі атрымала дадаткова ў сваё карыстанне 1646 тыс. дзесяцін зямлі і павялічыла тым самым сваё землекарыстанне на 33%, але становішча ў сельскай гаспадарцы ад гэтага не палепшылася [6, с. 52]. У сувязі з забаронай свабоды гандлю, празмернай цэнтралізацыяй і дробязнай рэгламентацыяй гаспадарчай дзейнасці ў перыяд правядзення харчразвёрсткі, сялянская гаспадарка страчвала сувязі з рынкам і мела амаль выключна натуральны характар. Прадукцыя сельскай гаспадаркі ў гэты час складала менш за палову ад даваеннай. Такія абставіны выклікалі незадаволенасць сярод шырокіх колаў насельніцтва.

Сітуацыя ўскладнялася яшчэ больш пасля правядзення дэмабілізацыі салдатаў з Чырвонай арміі ў сувязі з завяршэннем савецка-польскай і Грамадзянскай вайны. Былыя салдаты папаўнялі шэрагі беспрацоўных і маргіналізаваных элементаў. Усё гэта спрыяла ўзрастанню грамадскай незадаволенасці, якая набыла палітычны характар. У лютым 1921 г. прайшлі забастоўкі і палітычныя дэманстрацыі ў Петраградзе. У канцы лютага – сакавіку 1921 г. адбываецца паўстанне маракоў у Кранштаце. У Беларусі, дзе 4/5 насельніцтва складала сялянства, а сялянская гаспадарка мела важнейшае значэнне ў эканоміцы края , таксама выспяваў эканамічны і палітычны крызіс. Сама рэчаіснасць і дзейнасць прадстаўнікоў палітычных сіл, якія арыентаваліся на Польшчу (прыхільнікі С. Булак-Балаховіча і партыя "Зялёны дуб"), з аднаго боку, а таксама прыхільнікаў незалежнасці БНР (найперш БПСР), з другога,



Рэпазіторый ВДУ

прыводзіла да сялянскіх выступленняў і стварала істотную небяспеку для існуючай улады. Апазіцыйныя настроі пранікалі нават у шэрагі бальшавіцкай партыі. Такія ўмовы існавання сялян пераканаўча сведчылі аб аб'ектыўнай неабходнасці карэннага пераўладкавання сельскай гаспадаркі, уздыма агульнай культуры вёскі. Дадатковыя звесткі аб развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці ў першыя гады савецкай ўлады на Беларусі можна ўзяць з лекцыі № 2, дзе разглядалася нацыяналізацыя прамысловасці і надзяленне сялян зямлёй у першыя паслякастрычніцкія дні і ва ўмовах "ваеннага камунізму".

**2. Станоўчыя змены на вёсцы ў час нэпа.** З увядзеннем у краіне новай эканамічнай палітыкі быў пакладзены пачатак новым (мэтанакіраваным) адносінам дзяржавы да вёскі. Замест адміністратыўна-эканамічнага прымусу сялянства, канфрантацыі з ім, Савецкая дзяржава дабівалася эканамічнай згоды з сялянствам на аснове адраджэння нармальных таварна-грашовых адносін. На тэрыторыі, якая ўваходзіла ў склад БССР, прынцыпы НЭПа, якія тычыліся свабоднага абмену прадуктаў земляробства, жывёлагадоўлі, былі закладзены ў шэрагу актаў вышэйшых заканадаўчых і выканаўчых органаў і прыняты на працягу сакавіка–кастрычніка 1921 г. Асаблівасцю Беларусі было тое, што ўвядзенне нэпа тут супадала з перадачай зямлі сялянам. Прыняты II з'ездам Саветаў Дэкрэт аб зямлі, паводле якога ўся зямля перадавалася бязвыплатна сялянам у карыстанне, на Беларусі быў здзейснены толькі ў 1921 г. У выніку сялянства ўсходніх абласцей павялічыла аб'ем землекарыстання да 5,4 млн дзесяцін. Гэта перавысіла даваенны ўзровень (на 1,3 млн дзесяцін), але забяспячэнне сялян зямлёй тут было на 41% менш, чым у сярэднім па краіне (патрэбна улічваць, штоў Беларусі пад балотамі знаходзілася 16% усёй зямлі, пад лясамі – 25%) [7, с. 129].

У першыя гады НЭПа некаторыя мясцовыя органы дзяржаўнай улады і грамадскія арганізацыі Беларусі рабілі шчырыя захады, каб перавесці сялянскую гаспадарку на кааператыўны шлях. У маі 1921 г. урад Беларускай рэспублікі дазволіў свабодную куплю і продаж сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама вырабаў саматужнай прамысловасці. Замена харчразвёрсткі на харчпадатак станоўча адбілася на прадукцыйнасці працы на зямлі. Нарматыўнымі актамі вызначалася, што падатак быў прыкладна ў 2 разы менш харчразвёрсткі. Падатак вызначаўся да пачатку веснавой сяўбы. Пасля выканання харчпадатку селянін мог сам распараджацца вынікамі сваёй працы. У жніўні 1921 г. СНК БССР прыняў пастанову "Аб правядзенні гандлю", якая дазваляла ўсім грамадзянам з 16 гадоў свабодна гандляваць прадуктамі сельскай гаспадаркі, рамяства і фабрычных вырабаў, за выключэннем прадметаў дзяржаўнай манаполіі.

Дапамагалі ў падняцці сельскагаспадарчай вытворчасці беларусам суседзі. У 1921 г. у БССР з Расійскай Федэрацыі было адпраўлена вялікая

колькасць сельскагаспадарчай тэхнікі, матэрыялаў, 7 тыс. тон збожжа. У справе развіцця сельскай гаспадаркі дзяржаўныя ўлады рабілі стаўку на развіццё сялянскай гаспадарчай ініцыятывы. Значную дапамогу сялянам у набыцці сельскагаспадарчых машын, мінеральных угнаенняў, керасіну, іншых неабходных для іх прылад працы і побыту аказваў утвораны ў 1921 г. саюз сельскагаспадарчых кааператываў. Ад гэтага меліся нядрэнныя вынікі: узрасла колькасць гаспадарак, якія набылі прадукцыйную па тым часе сельскагаспадарчую тэхніку, коней, кароў. Адбылося павелічэнне пасяўных плошчаў, былі значна пашыраны плошчы пад пасевы тэхнічных культур. Менавіта кааператыўны рух дапамог пераадолець голад і разруху, садзейнічаў аздараўленню фінансавай і грашовай сістэмы. У перыяд нэпа адбываецца пашырэнне сельскагаспадарчай кааперацыі, якая развівалася галоўным чынам у крэдытнай сферы, забеспячэнні і збыце вытворчай прадукцыі. Да кастрычніка 1927 г. ступень кааперыравання дасягнула 37% сялянскіх гаспадарак.

Сельскагаспадарчая палітыка, якая праводзілася ў БССР у 1925–1928 гг. у нашай гістарычнай літаратуре па праву абазначаецца тэрмінам “прышчэпаўшчына”. Д.Ф. Прышчэпаў, народны камісар земляробства БССР, быў прыхільнікам стварэння хутароў і невялікіх пасёлкаў. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам складзены “Пяцігадовы перспектыўны план развіцця лясной і сельскай гаспадаркі БССР на 1925–1929 гады”. У адпаведнасці з планам было праведзена землеўпарадкаванне, якое спалучалася з арганізацыяй матэрыяльна-фінансавай і аграномічнай дапамогі сялянскім гападаркам. Гаспадаркі атрымлівалі крэдыты, ім пастаўляліся сродкі вытворчасці, арганізаваны пракатныя пункты сельгасінвентару. Бедным сялянскім гаспадаркам дапамога аказвалася на льготных умовах, а то і бясплатна. У 1928–1929 гаспадарчым годзе дапамогу ў развіцці вёскі, без дадатковай аплаты, атрымалі 52,4% гаспадарак. Вялікія сродкі асігнаваліся дзяржавай на асушэнне балот. Як вынік, на 1 студзеня 1925 г. у БССР налічвалася 133177 хутарскіх (20,3% усёй колькасці сялянскіх двароў) і 26254 адрубных (4%) гаспадарак. Асабліва бурна гэты працэс працякаў у Віцебскай і Гомельскай губернях. У шэрагу паветаў Віцебскай губерні вага хутароў і водрубаў сярод сялянскіх двароў дасягала 70– 80% [8, с. 48].

Трэба адзначыць, што калектывізацыя сельскай гаспадаркі да канца 1929 г. у БССР праводзілася ў асноўным на добраахвотных пачатках. Так , на Віцебшчыне да кастрычніка 1928 г. удзельная вага калектыўных гаспадарак складала 1,1%, а ў кастрычніку 1929 г. – 2,9% [9, с. 261]. Адпаведна з планам Наркамзема (аб праве выбару форм) за 1924–1929 гг. на хутары і ў дробныя пасёлкі пераселена амаль 130 тыс. сялянскіх гаспадарак. У 1928 г. каля 25% сялян Беларусі пражывала на хутарах і водрубах.

Рэпазіторый ВДУ

У канцы 20-х гадоў сельскагаспадарчая вытворчасць у Беларусі займала сярод іншых галін вядучае месца. Яе прадукцыя ва ўсёй валавай прадукцыі рэспублікі ў 1928–1929 гг. складала 51%. У гэты час значна палепшылася матэрыяльнае становішча насельніцтва, у тым ліку саміх сялян.

**3. Суцэльная калектывізацыя і яе асноўныя вынікі.** Аднак развіццё сельскай гаспадаркі на больш-менш абгрунтаванай і добраахвотнай кааператыўнай аснове было нетрывалым і нядоўгім. Імкненне да адміністрацыйнага ўплыву на сельскагаспадарчую галіну праяўлялася і ў часы дзеяння НЭПа. Класавы падыход да ўзымання харчпадатку, прыняцця законаў, ускладняючых развіццё адносін, найму рабочай сілы і здачы сродкаў вытворчасці ў арэнду, абавязковыя хлебанарыхтоўкі, іншыя абмежаванні сялянскай гаспадаркі, стрымлівалі яе развіццё. Ужо ў 1926/27 гаспадарчым годзе падаткі прыватных гаспадарак складалі 45% ад іх даходаў, а з улікам падатку на звышпрыбытак і іншых плацяжоў – 65–70% (у 1924/25 г. доля максімальнага падаткаабкладання не перавышала 25% [10, с. 87–88].

У 1929 г. дзяржаўная ўлада рэзка змяняе свае адносіны да прыватнага сектара. Індывідуальныя гаспадаркі сталі называцца рассаднікамі кулацтва, якія насаджаны “правымі ўхілістамі” на чале з наркомам земляробства Зм. Прышчэпавым і “кандрацьеўцамі – кіслякоўцамі” (М. Кандрацьеў – вучоны аграрнік, І. Кіслякоў – прафесар Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі).

Пасля паездкі Сталіна (студзень 1928 г.) у Сібір, ён разам са сваімі паплечнікамі бярэ курс на адміністратыўныя меры па абагульненні сельскагаспадарчай вытворчасці. “Каб паставіць збожжанарыхтоўкі на больш-менш пасрэдную аснову, патрэбна, – піша Сталін, –разгортванне будаўніцтва калгасаў і саўгасаў”. Глыбокі сацыяльны паварот, на які патрабуецца, згодна з ленінскім указаннем, цэлая эпоха (ды і не у такіх формах), у Сталіна ператварыўся ў аператыўную кампанію. Сталін лічыў магчымым ставіць тэрміны гэтага буйнога грамадскага пераўтварэння не прыблізныя, а выразныя і вельмі абмежаваныя: “Трэба дабіцца таго, каб на працягу трох-чатырох гадоў калгасы і саўгасы як здатчыкі хлеба змаглі даць дзяржаве хоць бы трэцюю частку патрэбнага хлеба”.

У сваіх высновах Сталін, як быццам, грунтуецца на прамовах і працах У.І. Леніна, дзе ён указвае, што пабудова сацыялізму несумяшчальна з захаваннем раздробленай сялянскай гаспадаркі. Патрабуецца пераход да буйной калектыўнай сацыялістычнай гаспадаркі, укараненне кааперацыі. Але Сталін не ўспамінае пра указанні Леніна, што пачынаць, як той піша, трэба з прасцейшых форм кааперацыі: збытавой, забеспячэння, крэдытнай і толькі затым наладжваць вытворчую кааперацыю. Да таго ж ніякага камандавання, сяляне павінны самі вызначыць для сябе найлепшы від гаспадарання.

У 1928 г. з пераходам да сістэмы хлебанарыхтовак “надзвычайнымі”, г.зн. гвалтоўнымі метадамі, пачаўся адказ ад НЭПа ў вёсцы. Рабілася гэта, як быццам бы, у інтарэсах беднякоў і маламоцных серадднякоў. У 1929 г. быў забаронены наём рабочай сілы і арэнда зямлі , што зрабіла немагчымай далейшую эвалюцыю заможных сялянскіх гаспадарак у бок фермерскага шляху. У Беларусі, як і паўсюдна, пачалося разгортванне будаўніцтва калгасаў і саўгасаў, абагульненне пасяўных плошчаў і сялянскіх гаспадарак. У перыяд вясенняй пасяўной кампаніі 1929 г. было створана 357 калгасаў.

5 студзеня 1930 г. ЦК КП(б) прыняў пастанову “Аб тэмпах калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву”. Згодна пастановы калектывіацыя ў БССР павінна была завяршыцца да канца першай пяцігодкі (1933 г.). Знайшліся кіраўнікі, якім хацелася выслужыцца. Напрыклад, сакратар ЦК КП(б)Б В.Гей у студзені 1930 г. патрабаваў завяршыць суцэльную калектывізацыю да 1931 г.

30 студзеня 1930 г. выйшла яшчэ адна пастанова ЦК ВКП(б) “Аб мерапрыемствах па ліквідацыі кулацкіх гаспадарак у раёнах суцэльнай калектывізацыі”. Паскорыць тэмпы калектывізацыі было вырашана з дапамогай судовых і пракурорскіх работнікаў, з прымяненнім артыкула 107 угалоўнага кодэксу. Меркавалася накіраваць у канцлагеры 60 тыс. сямей, у тым ліку па Беларусі – 4–5 тыс.

Пад прэсам адміністрацыйнага ўціску Беларусь у сакавіку 1930 г. па тэмпах калектывізацыі пераўзышла ўсе рэгіёны СССР. Тут з’ядналі 63% сялянскіх гаспадарак. (Для параўнання: на Украіне – 58 %, Закаўказзі – 50%) [3, с. 196]. Абагульненне вялося ў прымітыўныя формы гаспадарання. У адным толькі Гарадоцкім раёне ў пачатку 1930 г. налічвалася 46 камун. Ідзе раскулачванне: ужо да мая 1930 г. у Беларусі было раскулачана 15,5 тыс. гаспадарак (прыкладна 2%). Канфіскуецца маёмасць тых, хто не хоча добраахвотна ўступаць у калгас. Націск на аднаасобніка выклікалі рэзкае незадавальненне ў сялян: яны не маглі зразумець дзеля абагульняць скот, у чым віна тых, хто шмат працаваў і меў невялікі дастатак. З пачатку студзеня да сярэдзіны красавіка 1930 г. у БССР зарэгістравана 520 сялянскіх выступленнняў.Трагізм дапушчаных памылак хутка стаў настолькі відавочны, што патрабаваліся імклівыя меры па іх выпраўленні. У сродках масавай інфармацыі выйшаў артыкул Сталіна “Галавакружэнне ад поспеху”, затым прынята пастанова ЦК “Аб скрыўленні партлініі ў калгасным руху”. У згаданых артыкуле і пастанове ва ўсіх скрыўленнях і злоўжываннях супраць сялянства абвінавачваліся мясцовыя органы ўлады. Было сказана, што гэтыя “перагібы з’яўляюцца вынікам прамога парушэння палітыкі партыі, прамога парушэння пастаноў кіруючых органаў партыі”. Пасля чаго пачаўся адток сялян з калгасаў. У чэрвені 1930 г. Беларусь з лідараў перайшла ў адстаючыя (у абагуленых гаспадарках засталося толькі 12% сялян).

Репозиторий ВГУ

Але і ў далейшым кіраўніцтвам краіны адбывалася ігнараванне бухарынскай канцэпцыі аб тым, што надзвычайныя меры не могуць быць метадам уплыву на грамадскія працэсы. Як і раней, прымусова абагульняліся жылыя памяшканні, жывёла. Аплата працы ў калгасах вялася па астатковым прынцыпе (пасля выканання дзяржпаставак). У выніку чаго часцей за ўсё на аплату не заставалася нічога.

Вясной 1932 г. у Беларусі назіраўся чарговы адток сялян з калгасаў. Толькі за 2–3 месяцы распалася больш за тысячу калгасаў. З іх выйшла 55 тыс. сялянскіх гаспадарак. Вяскоўцы пакідалі калгасы, планы па выпуску сельскагаспадарчай прадукцыі большасць калгасаў не выконвала. Каб стварыць калгас і ўтрымаць яго ад распаду, улады прымалі паграждальна-рэпрэсіўныя метады. У сувязі з гэтым, напрыканцы 1932 г. была ўведзена сістэма пашпартоў і прапіска. Сялянам пашпарты не выдаваліся.

Асабліва ўзмацніліся рэпрэсіі супраць сялян у студзені 1933 г. праз палітаддзелы МТС. Іх стварылі на падставе рашэння студзеньскага (1933 г.) аб’яднанага пленума ЦК і ЦКК ВКП(б). У Беларусі да канца 1933 г. налічвалася 57, а ў 1934 – 72 палітаддзелы. За год сваёй працы палітаддзелы “разаблачылі” у Беларусі 2700 “кулакоў-шкоднікаў”, знялі з работы за “варожую” дзейнасць 1544 кіруючых работнікаў.

У канцы ІІ пяцігодкі калектывізацыя ў Беларусі завяршылася. Аднак і надалей тут папулярнымі былі такія метады “выхавання”, як штрафы, выключэнне з членаў калгаса, высяленне з мясцовасці, парушэнне дэмакратычных норм у адносінах да тых, хто меў асабістае меркаванне па дадзенай праблеме [4, с. 197].

У Заходняй Беларусі пасля ўз’яднання калектывізацыя праводзілася, адносна усходняй часткі, павольна. Да канца 1940 г. тут утворана 646, а да чэрвеня 1941 г. – 1115 калгасных гаспадарак. Лік аднаасобных гаспадарак скараціўся на 7%. У красавіку 1941 г. ЦК ВКП(б) вызначыў максімальныя нормы плошчы сялянскіх гаспадарак (залежна ад класа зямлі) у памеры 10,12,18 га. Вынік пераўтварэнняў на заходнебеларускай вёсцы не быў станоўчым: адбылося скарачэнне пагалоўя буйной рагатай жывёлы больш чым на 6%, свіней – на 26%, авечак – на 10%, коней – на 8,5%.

Нізкай заставалася у БССР ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур: у 1940 г. з аднаго гектара атрымана толькі 7 ц зерня, удой на адну карову складаў крыху больш за 800 л малака ў год**,** сярэднямесячная заработная плата калгаснікаў складала ў калгасах 12 руб, у саўгасах 22 руб. [10, с. 177–178].

Несумненна, што ў Беларусі было дастаткова высокаадукаваных людзей з ліку партыйных работнікаў, інтэлігенцыі, гаспадарнікаў, якія мелі намер развіваць сельскую гаспадарку па заходняму тыпу. Супраць валюнтарысцкіх, сілавых метадаў выступілі сакратар ЦК КП(б)Б В.Г. Кнорын, нарком земляробства Прышчэпаў і інш. Але дэмакратычны шлях уздзеяння на выбар прымаемых рашэнняў тады ўжо быў зачынены.

Рэпазіторый ВДУ

Супраціўленне курсу Сталіна ў той час станавілася важным аргументам для абвінавачванняў нязгодных з гэтым курсам людзей у варожых дзеяннях. Так, галоўнае абвінавачванне Прышчэпава і яго прыхільнікаў зводзілася да насаджэння хутарызацыі ці ўтварэння кулацкіх гаспадарак у Беларусі. Такое абвінавачванне негрунтоўна ўжо толькі таму, што хутары не былі новым гаспадарчым утварэннем у нашым краі. Яшчэ ў час сталыпінскай аграрнай рэформы тут было створана 55–60 тыс. хутароў і водрубаў. Таму, зыходзячы з сітуацыі, што мелася, пасля ўвядзення НЭПа, як ужо указвалася вышэй, у рэзалюцыях пленумаў ЦККП(б) Б (верасень 1924 г. і красавік 1925 г.) рэкамендавалася дазволіць свабоду выбару сялянамі форм землеўладання. З улікам гэтых патрабаванняў Наркамзем БССР распрацаваў перспектыўны план развіцця сельскай і лясной гаспадаркі БССР на 1925/26–1929/30 гг., у якім прадугледжваў далейшае стварэнне хутароў і дробных пасёлкаў. Тут мы маем якраз выключэнне з правіл таго часу, партыйны камітэт самага высокага ўзроўню рэспублікі займаў самастойную пазіцыю, без уліку ўказанняў ЦК УКП(б) і нават уразрэз яго лініі. Аб тым, што гэта была не ўласная толькі думка і дзеянні Прышчэпава, кажа і тое, што на гэтыя мэты было выдзелена з дзяржаўнай казны 4,8 млн рублёў, а таксама прыкладна 6 млн. рублёў крэдыту.

Як бачна, у першыя гады савецкай улады і ў часы НЭПа палітыка Камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы была накіравана на стварэнне буйной сельскагаспадарчай вытворчасці праз вытворчае кааперыраванне, механізацыю, выкарыстанне тэхнікі і сучасных тэхналогій. Што нельга не прызнаць заканамерным працэсам. Аднак з прычыны нізкага ўзроўню агульнай і палітычнай культуры кіраўнікоў цэнтральных і мясцовых органаў улады пры каперыраванні сялянскіх гаспадарак меліся сур’езныя памылкі і перагібы. Асабліва заўважнымі яны сталі ў 30-х гг. Недастатковы ўлік эканамічных законаў, фінансавых магчымасцяў дзяржавы, канфрантацыі дзяржаўных органаў з сялянствам, адказ прадставіць гаспадарам добраахвотнасць у выбары форм пры вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, парушэнне прынцыпаў суадносін грамадскіх і асабістых інтарэсаў, прывялі калгасы і саўгасы ў даволі цяжкае становішча. Сельская гаспадарка пераўтварылася ў арганічную частку сацыялістычнай эканомікі і была падпарадкавана дырэктыўнаму кіраванню. Адзін са складаных фактараў калектывізацыі заключаўся ў тым, што сярод народжаных інстынктаў у чалавеку маецца адно з самых моцных пачуццяў-пачуццё ўласнасці. Як аказалася выкараніць зусім гэтую чалавечую рысу не ўдалося. Метады і формы пры правядзенні суцэльнай калектывізацыі разбурылі звычайны уклад жыцця і стэрэатыпы паводзін людзей, прымусілі селяніна прыстасоўвацца да новых умоў працы ў калгасах і саўгасах. Селянін з дробнага ўласніка ператварыўся ў залежнага ад дзяржавы работніка. Ён быў адарваны ад сродкаў вытворчасці і пазбаўлены права распараджацца вынікамі сваёй працы. Калгаснікі былі

Рэпазіторый ВДУ

самай нізкааплатнай катэгорыяй насельніцтва. У такім становішчы сяляне, за рэдкім выключэннем, не мелі матывацыі да высокай эфектыўнасці ў паўсядзённай працы.


Спасылкі

1. Победа Советской власти в Белоруссии. – Мн., 1967.
2. Коммунист Белоруссии. – 1958. – № 3.
3. Мандрык, І.У. Гісторы Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.У. Мандрык. – Віцебск: УА ФПБ "МІПСА", 2009. – 276 с.
4. Ленин В.И. Полн. собр. Соч. Т. 38.
5. ГАВО. – Ф. 10050. – Оп. 1. – Д. 22.
6. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 5.Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч. [і інш]. рэдкал М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Экоперспектіва, 2007. – 613 с.; іл.
7. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапаможнік. У 2 ч. Ч. 2 Люты 1917 г. – 2000 г. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.А. Забродскі і інш.; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. – 464 с.
8. Материалы к докладу Совета Народных Комиссаров БССР Совету Народных Комиссаров СССР. – Мн., 1928.
9. Мандрик, И.В. Очерки истории профсоюзов Витебщины. – Витебск: Витебская областная типография, 2015. – 504 с. : ил.
10. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 2 / М.П. Касцюк, І.М.І гнаценка, У.І. Вышынскі і інш.; Інстытут гісторыі АНБ. – Мн.: Беларусь, 1995. – 560 с.: іл.


## ТЭМА 9. Асноўныя тэндэнцыі ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі

1. Сістэма савецкай улады на Беларусі
2. Нацыянальная палітыка: супярэчнасці і цяжкасці ў яе правядзенні.
3. Карэнныя змены грамадска-палітычнага жыцця ў канцы 20-х гг. арміраванне культу асобы І. Сталіна.

**1. Сістэма савецкай улады на Беларусі.** Наступленне мірнага часу, увядзенне новай эканамічнай палітыкі, а з ей і дапушчэнне розных форм уласнасці патрабавалі змен ў грамадска-палітычным жыцці ў накірунку яго дэмакратызацыі. Паколькі афіцыйна аснову грамадска-палітычнай сістэмы ў краіне складалі Саветы, паўстала неабходнасць ажывіць іх дзейнасць, дазволіць ім цалкам выконваць уласныя для іх кампетэнцыі. У дакладнасці з новымі абставінамі і задачамі вялася перабудова галіновых аддзелаў уездных і губернскіх Саветаў. Узяты накірунак на камплектаванне выканаўчых камітэтаў кампетэнтнымі кадрамі, адначасова са скарачэннем іх апарату. Ад дзяржаўных служачых патрабавалася выконваць свае абавязкі ў строгай адпаведнасці з савецкім заканадаўствам і ветлівымі адносінамі з насельніцтвам.

Для таго каб наблізіць савецкі дзяржаўны апарат да насельніцтва было вырашана пытанне аб раянаванні рэспублікі і стварэнні местачковых Саветаў. 7 кастрычніка 1922 г. урад БССР прыняў палажэнне аб сельскіх

Репозиторий ВГУ

Саветах рэспублікі, у якім ім даручалася прыцягваць найбольшую колькасць працоўных да кіравання справай аднаўлення мясцовага гаспадарчага і культурнага жыцця. Мясцовым Саветам надаюцца функцыі фарміравання і размеркавання мясцовага бюджэту, развіцця гаспадаркі і культуры, умацавання правапарадку і законнасці. Але, як адзначана на сесіі ЦВК БССР у ліпені 1923 г., дадзеных ім паўнамоцтваў, каб справіцца з пастаўленай задачай, пакуль не хапала [1, с. 111]. Таму ў 1924 г. і ў 1925 г. функцыі сельскіх і местачковых Саветаў былі пашыраны. Яны атрымалі права абмяркоўваць і вырашаць фактычна ўсе пытанні, якія датычыліся мясцовага жыцця. У ліпені 1926 г. III сесія ЦВК БССР прыняла палажэнне аб удасканаленні працы гарадскіх Саветаў. З гэтага часу рабочымі органамі мясцовых Саветаў станавіліся секцыі, якія ствараліся па галінах народнай гаспадаркі, уключаючы не толькі дэпутатаў, але і мясцовае насельніцтва.

Вяртанне БССР у 1924 і 1926 гг. тэрыторый з беларускім насельніцтвам садзейнічала кансалідацыі беларускай нацыі, узмацніла эканамічную базу, стварыла больш спрыяльныя ўмовы для далейшага гаспадарчага і сацыяльна-культурнага развіцця рэспублікі. Змены, што адбываліся ў нацыянальна-дзяржаўным будаўніцтве з часу прыняцця першай канстытуцыі (1919 г.), запатрабавалі распрацоўкі яе новай рэдакцыі. Другая канстытуцыя БССР была прынята 11.04.1927 г. на VIII-м Усебеларускім з’ездзе Саветаў. Канстытуцыя замацавала становішча БССР у складзе СССР, яе правы і абавязкі. У параўнанні з першай канстытуцыяй, дзе гаварылася пра Беларусь як дзяржаву дыктатуры пралетарыята і бяднейшай часткі сялянства, тут гэта ўжо не ўзгадвалася. Устанаўлівалася магчымасць непасрэднага выбрання раённымі з’ездамі дэлегатаў усебеларускіх з’ездаў Саветаў, калі ім не папярэднічалі акруговыя з’езды. Новая Канстытуцыя не абмяжоўвала колькасць членаў ЦВК, што мела прынцыповае значэнне ў справе развіцця дэмакратыі. На падставе гэтай Канстытуцыі ў снежні 1927 г. Прэзідыум ЦВК і СНК БССР пастановай “Аб арганізацыі і скарачэнні савецкага апарату і аб пашырэнні правоў мясцовай улады” перадалі некаторыя паўнамоцтвы цэнтральнага апарату аддзелам і інспекцыям акруговых выканаўчых камітэтаў. У сваю чаргу, ад акруговых выканкамаў асобныя функцыі кіравання перайшлі ў кампетэнцыю сельскіх, местачковых, раённых і гарадскіх Саветаў, г.зн. да тых органаў улады, якія мелі непасрэдныя сувязі з насельніцтвам.

У адрозненні ад папярэдняй канстытуцыі, Канстытуцыя БССР 1927 г. замацавала правы і свабоды грамадзян: права на стварэнне арганізацый, правядзенне мітынгаў, шэсцяў, выражэнне думак, сумленнасці, роўнасці правоў грамадзян, незалежна ад расавай, нацыянальнай прыналежнасці. У канстытуцыі замацавана трохзвенная сістэма вышэйшых дзяржаўных органаў улады рэспублікі: з’езд Саветаў, ЦВК, прэзідыум ЦВК. Вышэйшым органам заканадаўчай улады ў Беларусі да 1937 г. быў



Рэпазіторый ВДУ

Усебеларускі з’езд Саветаў (Канстытуцыя БССР 1937 г. надзяліла гэтымі паўнамоцтвамі Вярхоўны Савет БССР). ЦВК з’яўляўся вышэйшым заканадаўчым, кантралюючым органам улады рэспублікі.

Другая Канстытуцыя БССР яшчэ не давала грамадзянам поўнага выбарчага права. Выбары заставаліся шматступеньчатымі, галасаванне – адкрытым. Па за ўдзелам у выбарах заставаліся асобы, якія звярталіся да працы з мэтай атрымання прыбытку, асобы, што пражывалі на нетрудавыя даходы, прыватныя гандляры, гандлёвыя, камерцыйныя пасрэднікі , манахі і духоўныя служыцелі рэлігійных культаў усіх іспаведанняў і толкаў, служачыя і агенты былой паліцыі, асобага корпуса жандармаў і ахоўных аддзяленняў, члены царскага дома Расіі і інш.

Дэпутатамі мясцовых Саветаў БССР у гэты час выбіраліся больш за 30 тыс. чалавек. Кампартыя хоць і аказвала значны ўплыў на дзейнасць Саветаў, але не лічыла, што дэпутатамі могуць быць толькі камуністы. У 1925 г. у сельскіх Саветах камуністы разам з камсамольцамі складалі толькі 12,7%, у 1926 г. 18,4, у 1927 г. – 21,4%. У складзе гарадскіх Саветаў гэтыя суадносіны былі ўжо іншымі: камуністаў і камсамольцаў тут у 1926 г. было 47,2%, у 1927 г. – 58,7% [2, с. 141]. Акрамя гэтага праз грамадскія камісіі Саветаў, упершыню ў гісторыі Беларусі, адбываўся шырокі ўдзел насельніцтва ў вырашэнні першачарговых задач краіны: паводле афіцыйных звестак актыў Саветаў Беларусі ў 1926 г. налічваў 150 тыс. чал.

Значнай палітычнай падзеяй, якую можна аднесці да ўсталявання дэмакратычных нормаў у грамадска – палітычным жыцці Беларусі ў 20-х гг., з’явілася, аб’яўленая ў 1923 г. амністыя ўсім членам беларускіх нацыянальных арганізацый, палітычным і культурным дзеячам, удзельнікам антысавецкіх беларускіх фарміраванняў, членам партыі беларускіх эсэраў, беларускім сялянам і выхадцам з працоўнага асяроддзя, якія ў свой час далучыліся да контррэвалюцыйных арганізацый, а затым абвясцілі аб лаяльных адносінах да савецкай улады. Амністыя аказала станоўчы ўплыў на аздараўленне грамадска-палітычнага жыцця, спрыяла росту аўтарытэту Кампартыі Беларусі і даверу да яе палітыкі. Гэтым самым кіраўніцтва КП(б)Б прадэманстравала пэўнае імкненне да кампрамісу з іншымі палітычнымі плынямі. Асобныя партыі (БПС – Р. Бунд) заявілі аб самароспуску і заклікалі сваіх членаў да спынення ўсякай варожай дзейнасці супраць савецкай улады.

Як бачна, больш, чым да сярэдзіны 20-х гг. у беларускім грамадстве назіралася барацьба дзвюх тэндэнцый. З аднаго боку, адбывалася пэўная палітычная дэмакратызацыя ў адносінах да перыяду “ваеннага камунізму”, пашыраўся ўдзел насельніцтва ў кіраванні прадпрыемствамі і ўстановамі, што адпавядала мэтам і ўмовам НЭПа, а з другога – імкненне да манапалізацыі ўлады. Найвышэйшым органам выканаўчай улады з’яўляўся Савет Народных Камісараў БССР, а ў абласцях, гарадах, раёнах і сельсаветах- выканаўчыя камітэты адпаведных Саветаў.

Репозиторий ВГУ

Вертыкаль судовай улады была прадстаўлена ў гэтыя часы структурай, якая адпавядала адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу рэспублікі: Вярхоўны суд БССР, абласныя, гарадскія і раённыя суды. Меліся і пазасудовыя органы–асобыя нарады і “тройкі”, якія з’яўляліся неканстытуцыйнымі ўстановамі. Канстытуцыя 1927 г. абвяшчала роўнасць чатырох моў: беларускай, расійскай, польскай і ідыш, **але беларская мова прызначалася як мова “пераважная для ўзаемаадносін паміж дзяржаўнымі, прафесіянальнымі і грамадскімі ўстановамі і арганізацыямі”.**

Акрамя Саветаў, у палітычную сістэму краіны ўваходзілі прафсаюзы, камсамол, і ўсе іншыя існуючыя грамадскія арганізацыі. Самымі шматлікімі на той час, былі арганізацыі ў прафсаюзаў. Яны ствараліся ў асяроддзі рабочых і служачых (сялянству такога права да 1964 г. не давалася). Датай стварэння прафсаюзаў у Беларусі лічыцца 1904 г. Фактычнае афармленне савецкіх прафсаюзаў тут завяршылася на першым з’ездзе, які праходзіў у Мінску з 7 па 13 мая 1921г. Новая эканамічная палітыка, з яе рыначнымі адносінамі, патрабавала ад прафсаюзаў выканання такой функцыі, як абарона працоўных, ажыццяўленне кантролю за вытворчасцю і размеркаваннем, правядзенне культурна – асветнай дзейнасці сярод насельніцтва. Да канца 1920-х гг. прафсаюзныя арганізацыі аказвалі значны ўплыў на вытворчую і сацыяльную сферы. Наглядаўся пастаянны рост пярвічных прафсаюзных арганізацый і іх сяброў. У 1925 г. у прафсаюзах састаяла каля 140 тыс. чалавек, у 1926 г. – 150 тыс, у 1928–237 тыс. [3, с. 449]. У 1937 г. прафсаюзныя арганізацыі аб’ядноўвалі больш чым паўмільёна рабочых і служачых (84,1% усіх працоўных). Яны ўзначальвалі рух за павышэнне прадукцыйнасці працы, эканомію сродкаў і матэрыялаў, удзельнічалі ў разгортванні масавага сацыялістычнага спаборніцтва.

У Заходняй Беларусі прафсаюзы з 1920 па 1939 гг. павінны былі прыстасоўвацца да польскіх парадкаў. Спачатку польскія ўлады разагналі прафсаюзныя арганізацыі на дадзенай тэрыторыі, затым дазволілі іх дзейнасць. Легалізацыя прафсаюзаў прывяла да рэпрэсій многіх іх кіраўнікоў. Пасля ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР адбылося аднаўленне прафсаюзаў па савецкаму тыпу. У наступны час іх дзейнасць цалкам узгаднялася з патрабаваннямі прафсаюзных органаў БССР. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны прафсаюзы прынялі ў свае рады 85% працоўных прадпрыемстваў і ўстаноў гэтай тэрыторыі.

З узмацненнем у краіне аўтарытарных метадаў кіравання ініцыятыва прафсаюзаў абмяжоўвалася, мяняліся іх функцыянальныя абавязкі. Часам прафсаюзы выконвалі нехарактэрныя для іх дзяржаўныя функцыі (кіраўніцтва сацыяльным страхаваннем, арганізацыяй адпачынку працоўных), парушаліся прынцыпы прафсаюзнай дэмакратыі: мелі месца назначэнства і кааптацыя кадраў у іх кіруючыя органы.

Рэпазіторый ВДУ

У час акупацыі тэрыторыі Беларусі, акупацыйныя ўлады спрабавалі стварыць прафашысцкія прафсаюзы. У жніўні 1942 г. па загаду генеральнага камісара В. Кубэ было створана цэнтральнае бюро прафсаюзаў Беларусі. Акупанты патрабавалі ад прафсаюзных актывістаў рашучых мер супраць тых, хто "зрывае мерапрыемствы па павелічэнні прадукцыйнасці працы", не выключаючы прымушэнне і сілу зброі. Але вынікі аказаліся зусім нязначныя [4, с. 10].

Масавай грамадска-палітычнай арганізацыяй у савецкай краіне быў камсамол, які створаны 29 кастрычніка – 4 лістапада 1918 г. Днём нараджэння РКСМ лічыцца 29 кастрычніка. Камсамол Беларусі (арганізацыйна аформіўся 25 снежня 1918 г.) у 1925 г. налічваў 37,7 тыс. членаў. Віцебская гарадская арганізацыя КСМ Беларусі створана ў гэты ж час. У лістападзе 1918 г. яна налічвала ў сваіх радах 100 чалавек. У далейшым усе камсамольскія арганізацыі рэспублікі раслі хуткімі тэмпамі. У 1937 г. віцебская гарадская арганізацыя аб'ядноўвала 111 тыс. членаў ЛКСМБ [5, с. 36].

Камсамольцы Беларусі зрабілі значны ўклад у аднаўленне народнай гаспадаркі, выступалі ініцыятарамі за датэрміновае выкананне пяцігадовых планаў. Актыўны ўдзел камсамольцаў Віцебска пры ўзвядзенні прамысловых аб'ектаў першай пяцігодкі быў адзначаны ўрадам: найбуйнейшаму прадпрыемству горада – панчошна-трыкатажнай фабрыцы прысвоена імя Камуністычнага Інтэрнацыянала Моладзі (КІМ).

Вялікую ўвагу ў міжваенны перыяд камсамольскія арганізацыі надавалі ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі. Апрабаванымі формамі ў гэты час былі спартакіяды моладзі, паходы па месцах працоўнай і баявой славы. Тысячы камсамольцаў здалі нормы на значок БГПА і ГПА, авалодалі лётнай і парашутнай справай. Віцебскі аэраклуб падрыхтаваў у даваенны час 120 лётчыкаў, звыш 240 планерыстаў, якія мужна абаранялі Радзіму ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У лютым 1939 г. група студэнтаў Віцебскага педагагічнага інстытута ажыццявіла лыжны паход па месцам баявой славы 27-й Омскай Чырванасцяжнай дывізіі па маршруце Віцебск–Орша–Магілёў–Мінск. Усе ўдзельнікі пахода – камсамольцы, выдатнікі, сярод іх П.М. Машэраў [5, с. 36].

Кіруючая роля ў будаўніцтве сацыялізма адводзілася палітычнай арганізацыі – КП(б)Б. Пасля завяршэння грамадзянскай вайны адбываўся пастаянны рост радоў кіруючай партыі. Значнае папаўненне ішло за кошт уступлення ў яе рады рабочых і сялян, а таксама і распаўшыхся іншых палітычных арганізацый. Калі ў сакавіку 1919 г. у Кампартыі Беларусі налічвалася 1700 членаў (тады БССР аб'яднала толькі 6 паветаў Мінскай губерні), дык у 1933 г. у радах рэспубліканскай партарганізацыі налічвалася больш за 65 тыс. камуністаў. На 1 студзеня 1941 г. у яе радах было 72177 членаў і кандыдатаў, па сацыяльным палажэнні – 67% рабочых, 23,4 сялян (калгаснікаў) і 9,6% служачых [6, с. 283, 284].

Рэпазіторый ВДУ

Праз пералічаныя вышэй і іншыя грамадскія арганізацыі, якія складалі палітычную сістэму краіны, КП(б)Б імкнулася ўцягнуць як мага больш насельніцтва пад свой уплыў. Рабілася гэта за кошт увядзення камуністаў у склад іх кіруючых органаў. У 1928 г. больш за 77% сакратароў фабрычна-заводскіх ячэек ЛКСМБ былі членамі партыі. Прыкладна такая ж сітуацыя наглядалася ў прафсаюзах і іншых грамадскіх арганізацыях. Для забеспячэння ўстойлівасці палітычнага рэжыму ў краіне перад Саветамі і грамадскімі арганізацыямі стаяла задача – выхаванне працоўных мас і навучэнскай моладзі ў духу камуністычнай ідэалогіі.

**2. Нацыянальная палітыка: супярэчнасці і цяжкасці ў яе правядзенні.** Аб’ектыўны падыход да гістарычнага працэсу, дае падставу казаць, што традыцыі нацыянальнага адраджэнскага руху, ход падзей, логіка развіцця сітуацыі, рост нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, ініцыятывы інтэлігенцыі, якія выспявалі на папярэдніх этапах, з наступленнем савецкага часу, выводзілі праблему вырашэння нацыянальнага пытання на новы этапны рубеж.

Хаця доля беларусаў на тэрыторыі рэспублікі была даволі значнай (у 1926 г. каля 80%), гісторыя паклапацілася аб тым, што тут у 20-х гг. пражывала таксама вялікая колькасць яўрэяў (8,2%), рускіх(7,7%), 2% палякаў. Была тут невялікая частка ўкраінцаў, латышоў, літоўцаў, немцаў, татар і народаў іншых нацыянальнасцей. Нельга не адзначыць, што ўсе нацыянальнасці тут навучыліся ладзіць паміж сабой, вызначаліся высокім узроўнем цярпімасці адна да другой [7, с. 204]. Але толькі нязначная частка насельніцтва ў разглядаемы час свядома адстойвала імкненне да адраджэння беларускай нацыянальнай культуры. Праблемай заставалася здольнасць творчай інтэлігенцыі, выкладчыцкага складу ўстаноў асветы. развіваць адукацыю на роднай мове. Так, у першы год беларусізацыі з агульнай колькасці 395 прафесараў, выкладчыкаў, асістэнтаў, ардынатараў і навуковых супрацоўнікаў ВНУ БССР, уключаючы і рабфакі, беларусаў было 104, рускіх – 153, яўрэяў – 103. Беларускай мовай валодала толькі 15% работнікаў вышэйшай школы [8, с. 224].

Штуршком да нацыянальнага адраджэння Беларусі стаў VII з’езд КП(б)Б (сакавік 1923 г.). Удзельнікі з’езда выказалі намер развіваць і ўмацоўваць у БССР савецкую дзяржаўнасць у формах, якія адпавядалі нацыянальна-бытавым умовам большасці насельніцтва; развіваць і ўмацоўваць у сябе дзеючыя на роднай мове суд, адміністрацыю, органы гаспадаркі, органы ўлады, у склад якіхуваходзілімясцовая жыхары, што ведалі быт і псіхалогію мясцовага насельніцтва; развіваць у сябе прэсу, школы, тэатр, клубную справу і ўвогуле культурна-асветніцкія ўстановы на роднай мове. Пасля з’езда 9–12 чэрвеня 1923 г. ЦК РКП(б) правёў нараду з адказнымі работнікамі, дзе былі зацверджаны “Практычныя мерапрыемствы па правядзенні ў жыццё рэзалюцый XII з’езда партыі па

Рэпазіторый ВГУ

нацыянальным пытанні", палітыка беларусізацыі станавілася афіцыйнай палітыкай КП(б)Б, афіцыйнай дзяржаўнай палітыкай. Кіраўнічыя структуры БССР пачалі ініцыятыўна праводзіць палітыку беларусізацыі. ЦК КП(б)Б распрацаваў свае мерапрыемствы з назвай "Канкрэтызацыя платформы па нацыянальным пытанні, прынятым за аснову Палітбюро ЦК РКП(б) ва ўмовах БСС Рэспублікі" (1924 г.). У праграме змяшчалася поўная праграма дзеянняў, каб канчаткова павярнуць беларускі народ да яго мовы, культуры, нацыянальных традыцый, стварыць усе магчымасці для дынамічнага сацыяльна-эканамічнага жыцця, прыцягнуць да работы рэвалюцыйна-дэмакратычныя кадры. З улікам значнай перавагі ў БССР беларускай нацыянальнасці, ўдакладняліся тэрміны пераходу на беларускую мову дзяржаўных і грамадскіх арганізацый [9, с. 1]. Да сярэдзіны 1924 г. праводзілася палітычная і ідэалагічная падрыхтоўка, распрацаваны погляды на змест палітыкі нацыянальнага адраджэння, была разгорнута інфармацыйная работа сярод насельніцтва.

Пытанням нацыянальнай палітыкі ў рэспубліцы прысвечаны шэраг фундаментальных пастаноў. У чэрвені 1924 г. на сесіі ЦВК БССР было прынята рашэнне аб стварэнні спецыяльнай камісіі для яе ажыццяўлення, на чале з дзяржаўным дзеячам А.І. Хацкевічам. Такія ж камісіі былі арганізаваны пры акруговых выканаўчых камітэтах. Улады аказвалі падтрымку развіццю беларускай культуры і ўсебаковаму навуковаму вывучэнню Беларусі, яе гісторыі, эканомікі і г.д.

Выконваючы дзяржаўныя, партыйныя рашэнні, Наркамасветы, Інстытут беларускай культуры, некаторыя кафедры Белдзяржуніверсітэта заняліся навуковай распрацоўкай беларускай мовы, яе гісторыі, лексікі, граматычных норм, яе тэрміналогіі. Не парушаючы прынцыпу добраахвотнасці выбару мовы пры навучанні дзяцей, школы, прафесійна-тэхнічныя вучылішчы і тэхнікумы паступова пераводзіліся на беларускую мову выкладання. Было ўведзена абавязковае вывучэнне на роднай мове гісторыі Беларусі, яе эканомікі і геаграфіі ў вышэйшых навучальных установах.

Асноўныя этапы правядзення беларусізацыі на Віцебшчыне былі разгледжаны і замацаваны ў пастанове Віцебскага акруговага камітэта КП(б)Б 17 лістапада 1924 г. Тут адразу памяняліся падыходы да моўнай палітыкі ў сродках масавай інфармацыі. Друкаваны орган Віцебскага акруговага камітэта КП(б)Б газета "Заря Запада" з ліпеня 1924 г. стала выходзіць на беларускай, рускай і яўрэйскай мовах. У верасні 1925 г. на беларускую мову перайшла "Витебская крестьянская газета». Ва ўсіх сямігодках, ФЗВ, прафтэхшколах, вячэрніх школах рабочай моладзі было ўведзена выкладанне беларускай мовы, а ў тэхнікумах (педагагічным, настаўніцкім і кааператыўным) пачалося выкладанне гісторыі і гісторыяграфіі Беларусі на беларускай мове. Нягледзячы на тое, што ў акрузе не хапала настаўнікаў , якія валодалі беларускай мовай (у Віцебску

іх налічвалася не больш за 30 чал.), у 1924/1925 навучальным годзе ў школьнай сетцы Віцебска мелася 127 класаў беларускіх, 88 рускіх, 39 яўрэйскіх, 12 польскіх, 4 латышскіх. Да канца 1925 г.беларускія класы ў школьнай сетцы Віцебска складалі 47%. Паказальным з'яўляецца такі факт – адукацыю на беларускай мове атрымлівалі на 216 чалавек больш за агульную колькасць вучняў беларускага этнасу .

У 1924 г. у Віцебску было арганізована акруговае таварыства краязнаўства, мэтай якога з'яўлялася вывучэнне этнаграфіі, гісторыі, стану прамысловасці і сельскай гаспадаркі краю. Да 1927 г. таварыства выдала шэраг навуковых прац, у тым ліку "Витебский краевой словарь" [10, с. 259–260].

Да гэтага часу ў Беларусі на роднай мове былі надрукаваны грунтоўныя працы па актуальных праблемах гісторыі, грамадска-палітычнай думкі і эканомікі рэспублікі. Такая праца прыносіла станоўчыя вынікі. На пачатак 1930/31 навучальнага года 88% усіх тыпаў агульнаадукацыйных школ з'яўляліся беларускамоўнымі [11, с. 532]. Наладжвалася абавязковае вывучэнне беларускай мовы дзяржаўнымі служачымі. Да 1928 г. на беларускую мову пераведзена справаводства амаль ва ўсіх дзяржаўных і партыйных установах.

Важнай мерай у накірунку да дэмакратызацыі дзяржаўнага жыцця стала пераважнае вылучэнне ў дзяржаўныя і мясцовыя органы ўлады (на кіруючыя пасады) кадраў з карэннага насельніцтва (палітыка "карэнізацыі"). У першую чаргу вылучаліся прадстаўнікі інтэлігенцыі, рабочага класа і сялянства, якія свядома падтрымлівалі палітыку нацыянальнага адраджэння, пры гэтым кіраваліся не асабістымі, а грамадскімі інтарэсамі. У кастрычніку 1927 г. у ліку кіраўнікоў губернскага і павятовага ўзроўню доля беларусаў складала амаль 50%, у гарсаветах – 45%, у сельскіх Саветах – больш за 90%. Значна павялічыўся лік супрацоўнікаў партыйных і дзяржаўных устаноў, якія валодалі роднай мовай. Калі ў 1925 г. беларускай мовай у цэнтральных дзяржаўных установах валодала не больш за 20% працуючых, то у 1927 г. – 80%, у акруговых і раённых – адпаведна 36% і 70% [12, с. 151].

Разам з тым, афармленая дзяржаўная палітыка беларусізацыі, не наносіла шкоды нацыянальным меншасцям: раўнапраўнымі мовамі на Беларусі прызнаваліся руская, польская і яўрэйская.

Улады падтрымлівалі тых пісьменнікаў і паэтаў, якія паслядоўна адстойвалі культуру і мову беларускага народа. Палітыка беларусізацыі садзейнічала развіццю беларускай мастацкай літаратуры і тэатру. Фарміруюцца беларускія літаратурныя аб'яднанні: "Маладняк", "Узвышша", "Полымя". Былі створаны беларускія дзяржаўныя тэатры ў Мінску і Віцебску. Пад уплывам рэвалюцыйных падзей і беларусізацыі ў значнай ступені развіваліся жывапіс і музычнае мастацтва (падрабязна аб гэтым можна будзе прачытаць у наступным раздзеле).

Рэпазіторый ВДУ

Палітыка беларусізацыі закранула і войска. У 1923–1924 гг. праводзілася ваенная рэформа. Камплектаванне войск Чырвонай Арміі пачало весціся па тэрытарыяльным прынцыпе, рэформа прадугледжвала аднаўленне нацыянальных тэрытарыяльных частак і злучэнняў. У Заходняй ваеннай акрузе (з кастрычніка 1926 г. перайменавана ў Беларускую ваенную акругу) першай нацыянальнай стала 2-я Беларуская стралковая дывізія, Потым быў арганізаваны тэрытарыяльны 16-ы Беларускі корпус. Пераменны асабісты склад тэрытарыяльных часцей размяркоўваўся наступным чынам: беларусаў – 93%, яўрэяў 4%, палякаў – 1,5%, іншых – 1,5%. Створана аб'яднаная беларуская вайсковая школа. Яе скончылі сотні камандзіраў воінскіх фарміраванняў, у тым ліку славуты ваеначальнік маршал І. Якубоўскі.

Садзейнічала ўмацаванню палітыкі беларусізацыі і тое, што ўрад рэспублікі надаваў усё больш увагі падрыхтоўцы сваіх вучоных-даследчыкаў па грамадскіх навуках.

Як бачна , беларусізацыя стала вызначальнай рысай усяго грамадскага развіцця БССР другой паловы 20-х гг., якасна змяніла і палітычную, і маральна-псіхалагічную атмасферу ў рэспубліцы. Яна была добра арганізавана і разам з тым, праводзілася як маштабная доўгатэрміновая кампанія. У яе ажыццяўленні ўдзельнічалі дзясяткі тысяч людзей: партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных актывістаў, настаўнікаў, студэнтаў, прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі. Рэалізацыя цэласнай праграмы практычных мер па разгортванню нацыянальнага будаўніцтва садзейнічала кансалідацыі беларусаў як нацыі, гарманізацыі нацыянальных адносін. Беларусізацыя мела пазітыўныя вынікі ў адраджэнні краю і палітычнай стабілізацыі. Гэта, як ужо адзначалася ў папярэднім змесце, выклікала змены ў адносінах да БССР з боку прадстаўнікоў беларускага нацынальнага руху як у самой Беларусі, так і ў эміграцыі. У іх асяроддзі пачала набываць папулярнасць ідэя падтрымкі беларускай дзяржаўнасці ў савецкай форме.

Зразумела, у гэтай складанай справе не ўсё ішло гладка, не абышлося тут і без крайнасцей. Ужо ў тыя часы асобныя людзі адмоўна ўспрымалі працэс беларусізацыі: у некаторых колах беларуская мова лічылася малакультурнай, мужыцкай, годнай толькі на тое, каб ёю карысталіся ў межах гутарковых сялянскіх зносін і не больш таго. Назіралася фарсіраванне тэмпаў, адміністрацыйны ўціск і г.д. Дзе-нідзе пры вылучэнні кіруючых кадраў ледзь не адзіным крытэрыем годнасці кандыдата станавілася веданне беларускай мовы. У канцы 20-х гг. пазіцыя і дзеянні беларускай улады ў справе нацыянальнага адраджэння выклікалі незадавальненне кіраўніцтва УКП(б), што ў далейшым з'явілася падставай да палітычных абвінавачванняў кіраўніцтва рэспублікі ў нацыянал-дэмакратызме (нацдэмаўшчыне).

І ўсё ж, аб'ектыўны падыход да гісторыі патрабуе прызнаць, што ў 20-х гг. КП(б)Б была праведзена велізарная работа па вырашэнні

Рэпазіторый БГУ

нацыянальнага адраджэння. Палітыка, якая праводзілася ў гэты час , была заснавана на добрай глебе. Перадумовы для яе правядзення складваліся стагоддзямі. Этнічная самасвядомасць беларусаў, якая нарадзілася ў выніку славяна-балцкага сінтэзу, набірала моц у час існавання Полацкай дзяржавы, ВКЛ і ў наступныя гады. Гэта праяўлялася ў развіцці роднай мовы, пісьменнасці, філасофскай і сацыяльна-палітычнай думкі, праватворчасці, нацыянальных звычаяў і традыцый. У 1920-х гг. планамерная, мэтанакіраваная дзейнасць палітычных і дзяржаўных структур, грамадскіх арганізацый працягнула працэс трансфармацыі беларусаў па паходжанні, у беларусаў па свядомасці.

**3. Карэнныя змены грамадска-палітычнага жыцця ў канцы 20-х гг. Фарміраванне культу асобы І. Сталіна.** Пры разглядзе ў папярэдніх лекцыях пытанняў распрацоўкі і рэалізацыі палітыкі індустрыялізацыі і калектывізацыі, не раз адзначалася, што пасля Кастрычніка ў кіраўнічым стане краіны час ад часу наглядаліся супярэчнасці пры вызначэнні форм і метадаў сацыялістычнага будаўніцтва. Спрэчкі ў партыйным і дзяржаўным кіраўніцтве адбываліся паміж прыхільнікамі і праціўнікамі стварэння дырэктыўнай каманднай эканомікі. На завяршэнні 20-х гг. разам з пераходам да дырэктыўнай эканомікі, адмаўленнем ад новай эканамічнай палітыкі пераможцамі аказаліся прыхільнікі строга цэнтралізаванай каманднай сістэмы кіравання. З гэтага часу разгарнуўся працэс пераўтварэння палітычнага рэжыму дэмакратычнага цэнтралізму, у рэжым аўтарытарнага кіравання, з наступным пераходам да таталітарызму. У 30 –х гадах (гэта падоўжылася ў 40 гг. і працягвалася да сярэдзіны 50-х гг.) грамадска-палітычнае жыццё ў СССР і яго рэспубліках адпавядала ідэйным поглядам Сталіна. Склаўся збеднены, схематызаваны выгляд сацыялізма, з гіпертрафіяй цэнтралізаванага кіравання, з недаацэнкай разнастайнасці, багацця інтарэсаў людзей, іх актыўнай ролі ў грамадскім жыцці, з яўна выражанымі ўраўняльнымі тэндэнцыямі. Адбываецца паніжэнне ролі і ўдзелу ў справах развіцця краіны дзяржаўных і грамадска-палітычных арганізацый. Гэта датычылася не толькі Саветаў, але і прафсаюзаў і камсамола. Функцыі дзяржаўных інстытутаў і грамадскіх арганізацый Беларусі (як і па ўсёй краіне) заключаліся ў безумоўным выкананні распараджэнняў цэнтральных інстанцый. Саветы, прафсаюзы хоць і пашыралі свой актыў, але істотнага ўплыву на падзеі не мелі.

19 лютага 1937 г., на аснове Канстытуцыі СССР (была прынята 5 снежня 1936 г.) зацверджана новая (трэцяя) Канстытуцыя БССР (яе палажэнні не мелі змяненняў да 1978 г.). Канстытуцыя заканадаўча замацавала перамогу сацыялізму ў краіне, абвясціла сацыялістычны прынцып: “Ад кожнага па яго здольнасцям, кожнаму – па яго працы”. У ёй была абвешчана адмена палітычных абмежаванняў сацыяльнага плана. Усе



Репозиторий ВГУ

грамадзяне, незалежна ад сацыяльнага паходжання і становішча, атрымлівалі палітычныя правы, у тым ліку выбіраць і быць выбранымі. Шматступеньчатыя, няроўныя, адкрытыя выбары замяняліся прамым, роўным, тайным галасаваннем.

26 чэрвеня 1938 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет БССР I-га склікання. Было выбрана 273 дэпутаты, з іх 66 рабочых, 73 калгаснікі, 133 служачыя. 206 дэпутатаў з'яўляліся членамі Камуністычнай партыі. 25–28 ліпеня адбылася 1-я сесія Вярхоўнага Савета БССР. На сесіі быў зацверджаны Прэзідыум Вярхоўнага Савета (старшыня Н.Я. Наталевіч) і СНК БССР (старшыня К.В. Кісялеў) [13, с. 309]. Новаўвядзенні выклікалі сапраўдны палітычны і працоўны ўздым. Аднак да сапраўднай дэмакратыі справы не даходзілі: кандыдаты ў дэпутаты падбіраліся загадзя, іх склад заўсёды планаваўся і кантраляваўся, вылучэнне двух ці больш кандыдатаў на адно месца не прадугледжвалася. Больш таго, Сталін у гэты час вылучыў лозунг аб тым, што па меры будаўніцтва сацыялізма класавая барацьба будзе толькі абвастрацца, што з'явілася тлумачэннем да расправы з іншадумцамі.

У БССР актыўнымі правадырамі маскоўскага (сталінскага) курса быў ЦК КП(б) Б, які ў гэты перыяд узначальвалі 1-я сакратары – Я.Б. Гамарнік, (1928–1929), К.В. Гей (1930–1932), М.Ф. Гікала (1932–1937), В.Ф. Шаранговіч (1937), А.А. Волкаў (1937–1938), П.К. Панамарэнка (з 1938) [12, с. 307]. Пад прыкрыццём сталінскай формулы ў Беларусі, як і ў цэнтры, адбываліся грубыя парушэнні сацыялістычнай законнасці, масавыя палітычныя рэпрэсіі (**repressio** – ад познелац. – падаўленне, карная мера, пакаранне) незгаворлівых апанентаў, "выкрыццё" існых і надуманых праціўнікаў прынятага курса.

Першая хваля палітычных рэпрэсій на Беларусі пракацілася ў 1930–1931 гг. Яна звязана са зменамі погляду ВКП(б) на нацыянальнае пытанне і правядзенне палітыкі НЭПа. З-за адстойвання сваіх ідэй і намераў пацярпела шмат непавінных людзей. Шальмаванню падвяргаліся пісьменнікі і паэты, што не ўслаўлялі "правадыра ўсіх народаў", навукоўцы, якія з вялікай праўдзівасцю адлюстроўвалі падзеі.

Вышукванне шкоднікаў і контррэвалюцыйных элементаў ажыццяўлялася і па партыйнай лініі. У канцы 1933 года ў выніку чысткі партыйных арганізацый з радоў партыі было выключана 6 тыс. камуністаў і 3,7 тыс. кандыдатаў (15,6% і 25,7%). А вось праверка і абмен партыйных дакументаў, што праходзілі ў 1935–1936 гг., далі большыя "вынікі". З радоў Кампартыі Беларусі была выключана палова ўсяго яе саставу. Даволі часта партыя пазбаўлялася ад тых, хто крытыкаваў "ваенна-камуністычную" сістэму, хто гаварыў аб неабходнасці прадастаўлення свабоды слова і стварэнні чалавеку ўмоў для нармальнага асабістага і грамадскага жыцця. У краіне склалася атмасфера ідэалагічнага ўціску, падазронасці, даносаў. Не было літасці і тым, хто ўслых казаў аб захаванні

Рэпазіторый ВДУ

роднай мовы і культуры. Пік рэпрэсій прыйшоўся на 1937–1938 гг. Па афіцыйных дадзеных, у 1935–1940 гг. па палітычных матывах рэпрэсіравана 86168 жыхароў БССР. Нямалую частку з іх складалі члены партыі [13, с. 309]. З 101 сакратара райкама партыі рэпрэсіраванымі аказаліся 99, а ўсяго кампартыя Беларусі страціла больш 40% свайго складу [4, с. 175]. "Ворагі народа" былі выяўлены ў цэнтральных і абласных дзяржаўных арганізацыях. У ход была пушчана версія аб тым, што на Беларусі дзейнічае разгалінаванае антысавецкае падполле, нацыянал-фашысцкая арганізацыя на чале з кіраўніцтвам рэспублікі: сакратаром ЦК КП(б)Б Гікала М.Ф., старшынёй СНК БССР Галадзедам М.М., старшынёй ЦВК БССР Чарвяковым А.Г. Не вытрымалі абвінавачванняў у свой адрас Чарвякоў і Галадзед, яны скончылі жыццё самагубствам.

У сучаснай гістарычнай літаратуры называюцца розныя лічбы рэпрэсіраваных жыхароў Беларусі. Указваецца, што па рэальных падліках толькі па палітычных матывах да адказнасці было прыцягнута больш за 250 тыс. грамадзян. Акрамя таго, у адміністрацыйным парадку – яшчэ 350 тыс. чалавек, а ўсяго ахвяр сталінізму, на думку даследчыкаў, па БССР – 600–700 тыс. чал. [2, с. 158]. Спыніліся палітычныя рэпрэсіі толькі пасля смерці Сталіна. З 1954 года вялася рэабілітацыя іх ахвяр.

Такім чынам, грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, як і ўвогуле ў краіне, у 20-я – 30-я гг. характарызывалася барацьбой дзвюх тэндэнцый і было цесна звязана з сацыяльна – эканамічнымі працэсамі, што адбываліся ў краіне. Адна з іх, што адпавядала ўмовам і мэтам нэпа, была накіравана на пэўную дэмакратызацыю палітычных адносін. Гэта тэндэнцыя назіралася больш чым да сярэдзіны 20-х гадоў. Праяўлялася яна ў пашырэнні кампетэнцыі Саветаў, ажыўленні дзейнасці прафсаюзаў, камсамольскіх структур, іншых грамадскіх арганізацый, дапушчэнні кампрамісу з палітычнымі плынямі і дэмакратычнай часткай грамадства.

З пераходам да дырэктыўнай эканомікі, згортваннем, а затым і адмовай ад нэпа, верх узяла другая тэндэнцыя, якая звязана з ўсталяваннем аўтарытарнага рэжыму. Пачатак гэтаму быў пакладзены ў сярэдзіне 1920-х гадоў, з часу замацавання ў СССР аднапартыйнай сістэмы. Канстытуцыя 1927 г. замацавала манаполію партыі камуністаў на заканадаўчым узроўні. Усе дзяржаўныя і гаспадарчыя органы, згодна з канстытуцыяй, павінны былі выконваць дырэктывы і пастановы УКП(б). У самой кіраўнічай партыі ў 30-я гг. назіраўся звышаўтарытарызм, які перарастаў у жорсткі рэжым асабістай улады І. Сталіна. Дзейнасць органаў дзяржаўнай улады і кіравання на дадзеным этапе адбывалася на падставе дырэктыўных указанняў. Уключэнне шырокіх мас у кіраванне грамадствам і вытворчасцю, што дэкларавана Кастрычнікам, можна прызнаць больш фармальным, чым сутнасным.

Репозиторий ВГУ

Цяжкія страты беларускаму грамадству нанеслі рэпрэсіі 30–40-х і пачатку 50-х гг. Выключэнням з партыі і неабгрунтаваным прысудам да розных мер крымінальнага пакарання па палітычных матывах было прыцягнута шмат зусім невінаватых людзей.

І ўсё ж, нягледзячы на сур'ёзныя дэфармацыі, жорсткасць палітычнага рэжыму, грамадская атмасфера 1930-х гг. была прасякнута пафасам стваральнай працы і патрыятычным настроем. Грамадскія арганізацыі станоўча ўздзейнічалі на працоўны асяродак. Работнікі прадпрыемстваў і ўстаноў добрасумленна выконвалі свае абавязкі, а часам, праяўлялі сапраўдны працоўны гераізм. Вялікае ўражанне на насельніцтва аказвалі хуткія змены ў абліччы рэспублікі. Савецкі народ ганарыўся дасягненнямі ў галіне навукі, адукацыі і культуры. Дасягненні краіны ў вырашэнні маштабных задач звязваліся ў свядомасці народа з новым, свабодным ад эксплуатацыі, савецкім сацыялістычным ладам.

Спасылкі

1. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч 2 / М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі і інш.; Інстытут гісторыі АНБ. – Мн.: Беларусь, 1995. – 560 с.: іл.

2. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапаможнік. У 2 ч. Ч. 2 Люты 1917 г. – 2000 г. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.А. Забродскі і інш.; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. – 464 с.

3. Гісторыя Беларускай ССР. У 5 т. Т. 3. Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудова сацыялізму ў БССР (1917–1937 гг.). – Мн., 1973.

4. Мандрик, И.В. Профсоюзное движение Беларуси: история и современность / И.В. Мандрик. Профсоюзы Витебщины: история, теория, практика // Материалы областной науч.-практ. конф. (9 апреля 2004 г.). – Витебск,УО ФПБ ВФ "МИТСО", 2004. – 236 с.

5. Витебск: Энцикл.справ. / Белорус. Сов. Энцикл.; редкол.: И.П. Шамякин (гл.ред.) и др. – Мн.: Бел СЭ, 1988. – 408 с. ил.

6. Страницы истории Компартии Белоруссии:суждения, аргументы, факты / сост. Ю.П. Смирнов, Н.С. Сташкевич; под ред. Р.П. Платонова. – Мн.: Университетское, 1990. – 446 с.

7. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.У. Мандрык. – Віцебск: УА ФПБ "МІПСА", 2009. – 276 с.

8. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч. [і інш]. рэдкал М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Экаперспектіва, 2007. – 613 с.; іл.

9. Савецкая Беларусія 1924. – 17 ліп..

10. Памяць: Гіст.-дакум.хроніка Віцебска: у 2 кн. Кн. 1 / рэд.кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст.Э.Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2002. – 648 с.: іл.

11. Нацыональный Архив Рэспублики Беларусь (НАРБ). – Фонд 63. – Опись 1. – Дело 627.

12. Кароль А. Беларусізацыя- палітыка нацыянальнага адраджэння / А. Кароль, Крыжовы шлях. – Мн.: "Згода". – 1993. – 239 с.

13. Республика Беларусь: энциклопедия: в 6 т. Т. 1 / редкол.: Г.П. Пашков и др. – Мн.: БелЭн, 2005. – 1040 с.: илл.

Репозиторий ВГУ

## ТЭМА 10. Палітыка дзяржавы па пытаннях развіцця культуры: накірункі, тэндэнцыя, асноўныя вынікі

1. Станаўленне і развіццё ў БССР савецкай сістэмы адукацыі.
2. Здабыткі і страты беларускай навукі.

**1. Станаўленне і развіццё ў БССР савецкай сістэмы адукацыі.** У шматгранным комплексе праблем будаўніцтва сацыялізма важнае месца, на думку бальшавіцкай партыі, павінна было належыць карэннай перабудове сістэмы адукацыі. Галоўнай задачай, якую вызначыла новая ўлада, стала ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці насельніцтва. 16 кастрычніка 1918 г. дэкрэтам УЦВК былі зацверджаны Дэкларацыя і Палажэнне аб адзінай працоўнай школе. Згодна прынятых рашэнняў у краіне замест папярэдняга дзялення школ (каля 30 тыпаў з прыналежнасцю да розных ведамстваў) уводзілася адзіная школа з дзяленнем на дзве ступені: першая ступень – пяць гадоў навучання – для дзяцей 8–13 гадоў і другая ступень – чатыры гады навучання – ад 13 да 17 гадоў.

Пазней, 26 снежня 1919 г. прыняты дэкрэт СНК "Аб ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва РСФСР". Дэкрэт абавязваў усіх грамадзян ад 8 да 50 гадоў навучыцца грамаце на роднай або рускай мове. Гэта, як зафіксавана ў афіцыйных дакументах, была адначасова і палітычная задача, бо непісьменны чалавек стаіць па-за палітыкай. Гарадскія і сельскія Саветы, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі стварылі групы садзейнічання ліквідацыі непісьменнасці для дарослага насельніцтва. У гарадах і вёсках Беларусі пры бібліятэках , чырвоных кутках, клубах, хатах чытальнях, на прадпрыемствах працавалі пункты і школы граматы. У выдавецтве былі выпушчаны тысячы буквароў "Долой неграмотность" (у Беларусі на кожны павет каля 7 тыс.), яшчэ болей – разразных азбук. Для падрыхтоўкі настаўнікаў для савецкай школы на тэрыторыі Беларусі пачалі працу тры настаўніцкія інстытуты (у іх ліку ў Віцебску), якія з 1918/19 навучальнага года былі пераведзены ў статус педагагічных.

У 20–30-я гг. працягвалася карэнная перабудова сістэмы адукацыі. Цэнтральнай задачай нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў краіне стала ўвядзенне ўсеагульнага абавязковага навучання. З моманту другога абвяшчэння рэспублікі (1920 г.) у БССР пакладзены пачатак стварэнню новай адукацыйнай сістэме, уводзілася бясплатнае агульная і палітэхнічная адукацыя, дэкларавалася сувязь школы з палітыкай Камуністычнай партыі, адзіная для ўсіх грамадзян свецская школа, дэмакратызм у арганізацыі навучання. Школа была зарыентавана на 9 год навучання і працоўны характар. Асноўным тыпам школы з 1922 г. павінна была стаць 7-мі гадовая з вытворчым ухілам. 16 лютага 1922 г. Народны камісарыят асветы БССР зацвердзіў гэты тып школы замест дзевяцігодкі. Яна ахоплівала дзяцей ад

Рэпазіторый ВГУ

8 да 15-гадовага ўзросту і падзялялася на два канцэнтры. Першы ўключаў 1–4 групы (класы) і адпавядаў пачатковай школе, другі – 5–7 групы (класы) [1, с. 309–310].

На фабрыках і заводах ствараліся фабрычна-завадскія сямігодкі, на вёсцы-школы сялянскай моладзі. Аднак з-за недахопу памяшканняў, вучэбных дапаможнікаў і настаўнікаў у 1920-я гг. масавай школай ў рэспубліцы заставалася пачатковая чатырохгодка. У 1922 г. на Беларусі працавала каля 6 тыс. школ. Іх наведвала амаль 450 тыс. Навучэнцаў [2, с. 226]. Сярэднія навучальныя ўстановы да сярэдзіны 1920-х гг. адсуднічалі. Іх праграму выконвалі агульнаадукацыйныя курсы і рабочыя факультэты (рабфакі).

З 1926 г. у БССР было ўведзена ўсеагульнае абавязковае пачатковае навучанне. Падрыхтоўчы этап да гэтага пачаўся ў кастрычніку 1923 г. У красавіку 1926 года пастанова ЦВК і СНК БССР “Аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага навучання” паставіла задачу закончыць ажыццяўленне ў рэспубліцы ўсеагульнага навучання дзяцей 8–11-гадовага ўзросту не пазней,чым у 1934/35 навучальным годзе.

З 1926 г. функцыі сярэдняй школы былі ўскладзены на школы 2-й ступені – дзевяцігодкі. Аднаўленне і будаўніцтва новых школ у рэспубліцы ішло пастаянна. У 1928/29 навучальным годзе ў БССР налічваліся 5723 пачатковыя і сярэднія школы, у якіх праходзіла навучанне 79% ад усёй колькасці дзяцей. Паралельна праводзіліся мерапрыемствы па ліквідацыі непісьменнасці для дарослых. Але ў сувязі са спадчынай,якая дасталася ад папярэдніх часоў, у канцы 1920-х гг. 52,6% насельніцтва рэспублікі ва ўзросце ад 9 да 49 гадоў яшчэ заставалася непісьменным [3, с. 158]. У 1930 г. навучаннем было ахоплена каля 300 тысяч чалавек, з іх 277,8 тыс. чалавек у сельскай мясцовасці. З 1926 г. да 1932 г. пункты па ліквідацыі непісьменнасці і школы пісьменнасці закончылі больш за 800 тыс. чалавек.

З 1932 /33 навучальнага года ў БССР была ўведзена абавязковая няпоўная сярэдняя адукацыя (усеагульнае сямігадовае). Да таго ж, у снежні 1932 г. ЦВК і СНК БССР абвясцілі БССР рэспублікай агульнай пісьменнасці [4, с. 398].

З сярэдзіны 1934 г. у межах краіны стала праводзіцца ўніфікацыя школы. Пастанова СНК СССР і ЦК ВКП(б) “Аб структуры пачатковай і сярэдняй школы ў СССР” уводзіла адзіную сістэму агульнаадукацыйнай школы: пачатковая (чатырохгадовая – 1–4 класы); няпоўная сярэдняя (сямігадовая – 1–7 класы); сярэдняя (дзесяцігадовая – 1–10 класы) [5, с. 291].

Побач з агульнаадукацыйнай ў БССР развівалася прафесійна-тэхнічная школа. Яе асноўнымі тыпамі былі прафшкола, прафклас, школа фабрычна-завадскога навучання, вучэбна-практычныя майстэрні, сельскагаспадарчыя школы.

Рэпазіторый ВДУ

У 1931 г. улада паставіла задачу забеспячэння ўсеагульнага сярэдняга навучання ў горадзе і завяршэння арганізацыі ўсеагульнага сямігадовага навучання ў вёсцы. З 1934/35 навучальнага года ўстанаўлівалася адзіная пачатковая вячэрняя школа з трохгадовым тэрмінам навучэння. Яе асаблівасцю было тое, што агульнаадукацыйная навучанне тут сумяшчалася з тэхнічнай або з агразаалагічнай вучобай.

Як сведчаць лічбы, ужо ў 1931/32 навучальным годзе ў БССР задача усеагульнай пачатковай адукацыі была выканана. З другой паловы 1932 г. пачалося поўнае ажыццяўленне ўсеагульнага абавязковага навучання за курс сямігадовай школы. У 1937/38 навучальным годзе кантынгент вучняў няпоўнай сярэдняй і сярэдняй школы вырас да 278454 чалавек. У 1940/41 навучальным годзе на тэрыторыі рэспублікі, згодна перапісу насельніцтва, дзейнічала 12294 школы ўсіх відаў. Тут працавала 56,9 тыс. настаўнікаў, навучалася 1737,1 тыс. чалавек.

Індустрыялізацыя краіны і калектывізацыя сельскай гаспадаркі патрабавалі значнага паляпшэння агульнаадукацыйнай і культурна-тэхнічнай падрыхтоўкі насельніцтва. На першы план у пачатку 30-х гадоў выходзіць праблема ліквідацыі малапісьменнасці працоўных. 4 ліпеня 1932 года Урад рэспублікі зацвердзіў сістэму навучання дарослых. Яе пачатковым звяном сталі ўводныя курсы ў вытворчасці (60–80 акадэмічных гадзін), якія знаёмілі рабочых з тэхніка-эканамічнай і грамадска-палітычнай дзейнасцю прадпрыемства. Былі ўведзены таксама пачатковыя політэхнічныя вытворчыя школы для рабочых і членаў іх сямей (тэрмін навучання 1,5 гады), якія будаваліся на базе ліквідацыйных пунктаў і забяспечвалі падрыхтоўку кадраў па розных прафесіях і іх перакваліфікацыю.

Кадры масавых прафесій для прамысловасці рыхтавалі прафесійныя школы. У 1928/1929 навучальным годзе іх у рэспубліцы было 36 (4436 вучняў). Працаўнікоў для сельскай гаспадаркі рыхтавалі сельскагаспадарчыя школы і вучэбна-практычныя майстэрні. Разам яны ахоплівалі навучаннем даволі невялікую частку моладзі. На 1 студзеня 1926 г. у вучэбна-практычных майстэрнях было усяго 453 вучні. У 1930 г. прафесійныя школы былі ліквідаваны, а на іх базе створаны школы фабрычна-завадскога навучання (ФЗН). Зноў створаныя ФЗН і тыя, што працавалі з пачатку 20-х гг., павялічылі кантынгент навучэнцаў, перайшлі з падпарадкавання Наркамасветы ў ведамства Вышэйшага Савета народнай гаспадаркі, Наркамзема і гаспадарчых аб'яднанняў. У канцы 1931 г. у БССР налічвалася 103 школы ФЗН, дзе навучалася 20,8 тыс. чалавек. У той жа час у краіне дзейнічалі прафесійныя курсы, ажыццяўлялася індывідуальнае і брыгаднае навучанне на прадпрыемствах. Гэтыя формы падрыхтоўкі рабочых кадраў засталіся і ў далейшым. За гады другой пяцігодкі школы ФЗН падрыхтавалі 25 тыс. кваліфікаваных рабочых. У 1940 г. у сістэме прафесійна тэхнічнай адукацыі адбылася перабудова: створана сістэма працоўных рэзерваў.

Рэпазіторый ВДУ

На працягу ўсіх паслярэвалюцыйных гадоў у працы па ўкараненні адукацыі актыўна ўдзельнічалі дзяржаўныя органы, педагагічныя калектывы, калектывы прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, прафесійныя і камсамольскія арганізацыі.

Для задавальнення патрэб у спецыялістах у розных галінах гаспадаркі і невытворчай сферы пашыралася сетка тэхнікумаў (педагагічных, сельскагаспадарчых, індустрыяльна-тэхнічных, эканамічных і г.д.). У 1920 г. былі адкрыты Віцебскі механіка-будаўнічы, у 1921 Мінскі архітэктурна-будаўнічы і Полацкі лясны тэхнікумы, у 1924 г. – Мінскі гідратэхнікум, у 1928 г. – Магілёўскі культурна-асветны, у 1929 г. Аршанскі чыгуначны тэхнікумы**.** У 1928/29 навучальным годзе ў БССР было 32 тэхнікумы, у іх 5,5 тыс. навучэнцаў. У 1930-х гг. у 58 сярэдніх спецыяльных вучэбных установах навучалася 11,2 тыс. чалавек, а ў 1939/40 гг. на Беларусі працавала ўжо 102 сярэднія спецыяльныя вучэбных устаноў, а лік навучэнцаў узрос да 133,6 тыс. чалавек.

Сістэму вышэйшай адукацыі ў Беларусі пасля кастрычніцкай рэвалюцыі прыйшлося ствараць нанова. Ужо ў 1919 г. у Горках пачаў працаваць узноўлены Горы-Горацкі земляробчы інстытут, у 1920 г. – Беларускі політэхнічны (у 1922 г. – пераўтвораны ў інстытут сельскай і лясной гаспадаркі). У 1925 г. адбылося зліццё вышэй названых інстытутаў, на іх базе ўтворана Беларуская дзяржаўная акадэмія сельскай гаспадаркі [6, с. 57].

30 кастрычніка 1921 г. згодна з пастановай ЦВК БССР ад 25.02.1919 г. пасля вялікай падрыхтоўчай работы адбылося афіцыйнае адкрыццё Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Першым рэктарам універсітэта быў абраны У. Пічэта, першым дэканам факультэта грамадскіх навук – У. Ігнатоўскі. Універсітэт з’яўляўся самай буйной навучальнай установай рэспублікі: у першым навучальным годзе ў БДУ функцыянавала тры факультэты – грамадскіх навук, медыцынскі і рабочы (падрыхтоўчы), займалася 1390 студэнтаў; да часу свайго пяцігадовага юбілею тут падрыхтавана 247 педагогаў, 175 урачоў, 118 эканамістаў і 117 юрыстаў [7, с. 45].

Вышэйшыя навучальныя ўстановы з назвай “педагагічныя інстытуты”, якія дзейнічалі ў Віцебску, Магілёве і Мінску, пераўтвораны за 1918–1919 гг. у настаўніцкія інстытуты, затым да 1921 г. яны рэарганізаваны ў інстытуты народнай адукацыі. У канцы 1921 г. быў закрыты Мінскі інстытут народнай адукацыі, а ў 1923–1924 гг. – Віцебскі і Магілёўскі, іх студэнты пераведзены на педагагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У пачатку 20-х гг. у Віцебску працавала адзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута (да 1922 г.), Віцебскі дзяржаўны мастацка-практычны інстытут (у 1923 г. рэарганізаваны ў мастацкі тэхнікум).

Репозиторий ВГУ

У 1924 г. быў адкрыты Віцебскі ветэрынарны інстытут. Пасля першага ўзбуйнення БССР (1924 г.) сетка вузаў рэспублікі значна пашырылася.

Партыйных і савецкіх работнікаў рыхтавалі створаныя для гэтага спецыяльныя школы ў Мінску, Віцебску, Гомелі і Магілёве.

Такім чынам, ў Беларусі ў кароткі тэрмін склалася сістэма вышэйшай адукацыі: у 1925 г. тут працавалі 4 ВНУ, у іх налічвалася 4342 студэнты і 436 выкладчыкаў; у 1932 г. у сістэме вышэйшай школы налічвалася 31 установа, навучалася 10574 студэнтаў, працавала 1388 выкладчыкаў. З 1925/26 навучальнага года пры вузах ствараліся аспірантуры. На завяршэнні 1920-х гг.у сістэме адукацыі было ўведзена завочнае навучанне за курс вышэшай школы - экстарнат.

З 1931 г. пачалася рэарганізацыя вышэшай школы па галіновай прыкмеце. Напрыклад, на базе Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі створана 11 галіновых інстытутаў. Інстытуты перадаваліся ў падпарадкаванне гаспадарчых аб'яднанняў, для якіх яны рыхтавалі спецыялістаў. Такая перабудова прывяла да распылення матэрыяльнай базы. Таму ў 1933 г. ВНУ з вузкай спецыялізацыяй былі аб'яднаны. У 1937 г. быў аб'яўлены набор студэнтаў у Інстытут фізічнай культуры ў Мінску.

У 1939/40 навучальным годзе ў БССР дзейнічала 22 вышэйшыя навульныя установы, дзе навучалася 15,4 тыс. студэнтаў.

На Віцебшчыне ў другой палове 30-х гадоў працавала 4 вышэйшыя навучальныя установы, у іх налічвалася 2500 студэнтаў; 30 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, дзе навучалася каля 7 тыс. навучэнцаў і 1757 школ з больш за 239 тыс. Вучняў [8, с. 202]. Поспехі ў адукацыі, навуцы, падрыхтоўцы кадраў масавых прафесій, што меліся ў гэтыя гады, закладвалі асновы для далейшага паспяховага развіцця рэспублікі.

**2. Здабыткі і страты беларускай навукі.** 20-я гады сталі часам нараджэння беларускай савецкай навукі. Улады імкнуліся стварыць умовы для пашырэння магчымасцяў даследаванняў і падрыхтоўкі беларускай прафесуры. 30 студзеня 1922 г. на базе навукова-тэрміналагічнай камісіі быў заснаваны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Інбелкульт стаў цэнтрам навуковага жыцця рэспублікі. Работа інстытута арганізоўвалася па секцыях. У 1926 г. дзейнічала 5 секцый: лінгвістычная, літаратурна-мастацкая, гісторыка-археалагічная, прыродазнаўчая, сацыяльна-эканамічная. Першым кіраўніком Інбелкульта быў С.М. Некрашэвіч, з 1924 г. – У.М. Ігнатоўскі.

У пачатку 1929 г. Інбелкульт рэарганізаваны ў Беларускую акадэмію навук (з 1936 г. – АН БССР). Стварэнне ўласнай нацыянальнай акадэміі навук мела вялікае значэнне. Пад кіраўніцтвам першага старшыні Акадэміі навук У.М. Ігнатоўскага вучоныя акадэміі плённа займаліся даследаваннямі ў галіне фізіялогіі, геалогіі, хіміі. У 20-я гг. у БССР ствараюцца новыя доследныя станцыі ў галіне сельскай і лясной гаспадаркі.

Рэпазіторый ВГУ

Навукова-даследчая работа праводзілася таксама ў межах вышэйшых навучальных установ. У канцы 1930-х гг. у БССР мелася 40 навукова-даследчых устаноў, дзе працавала больш за 1,5 тыс. навуковых супрацоўнікаў [1, с. 312]. Больш шырокай і трывалай становіцца навукова-матэрыяльная база БДУ.

У гэты ж час адбываецца арганізацыя культурна-асветніцкіх устаноў, якімі ў гарадах становяцца клубы, а ў сельскай мясцовасці – хаты-чытальні. Пры іх ажыццяўлялася папулярызацыя навуковых і тэхнічных ведаў сярод насельніцтва, чытанне газет і кніг, праводзілася палітычная і антырэлігійная прапаганда. З кожным годам у рэспубліцы павялічвалася колькасць бібіліятэк. У 1922 г. адчынілася Дзяржаўная бібліятэка БССР.

У 1921 г. было створана Дзяржаўнае выдавецтва БССР, якое мела свае аддзяленні ва ўсіх значных гарадах рэспублікі. Гэта дазволіла колькасна павялічыць выданне літаратуры і перыядычных выданняў: у 1925 г. у БССР выдавалася 20 газет і 15 часопісаў.

Пад уплывам рэвалюцыйных падзей і беларусізацыі ў значнай ступені развіваліся жывапіс і музычнае мастацтва, літаратура, тэатр, кіно, жывапіс. Адбылося фарміраванне беларускіх літаратурных аб’яднанняў “Маладняк” (1923 г.), “Узвышша” (1925 г.), “Полымя” (1927 г.). Самым дзейсным літаратурным аб’яднаннем з’яўлялася пралетарскае абўяднанне “Маладняк”. У 1925–1926 гг. аб’яднанне мела свае філіялы ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Полацку, Оршы,Слуцку, Смаленску, Маскве, Празе ды інш. гарадах, у ім састаяла 500 чалавек.

На першым этапе кіруючыя колы краіны не ўмешваліся ў творчы працэс, мяркуючы, што пісьменнікі, мастакі, кампазітары, тэатральныя дзеячы самі разбяруцца ў сваіх справах і стануць на бок савецкай ўлады. У літаратурным руху гэтага часу атрымаў распаўсюджанне такі накірунак як “Пралеткульт”. Сваю задачу “Пралеткульт” бачыў у стварэнні асобай пралетарскай культуры, якая, мабыць, уласціва толькі пралетарыяту. Пралетарскія пісьменнікі Я. Колас, Я. Купала, А. Алексндраў, П. Галавач, М. Лынькоў, П. Трус, М. Чарот і інш. віталі адбыўшуюся рэвалюцыю, натхнённа апавявялі нараджэння новага грамадства. У іх творах яскрава праглядаўся аптымізм, дух змагання за светлую будучыню.

Вялікі клопат уладныя структуры праяўлялі аб тэатральным мастацтве. Былі створаны беларускія дзяржаўныя тэатры ў Мінску (1920) і Віцебску (1926). У 30-я гг. адчынены Рускі драматычны тэатр, тэатр юнага гледача ў Мінску.

У галіне музыкальнага мастацтва у гэты перыяд пераважала творчасць музыкальных, харавых, танцавальных самадзейных калектываў. Рэгіянальнымі цэнтрамі музыкальнага жыцця з’яўляліся музыкальныя тэхнікумы ў Мінску, Віцебску, Гомелі.

20-я гады – час нараджэння беларускага кіно. У 1926 г. на экраны выйшаў першы беларускі мастацкі фільм “Лясная быль”. Сярод лепшых



Репозиторий ВГУ

мастацкіх фільмаў 1930-х гг. значыліся карціны У. Корш-Сабліна “Першы ўзвод” (1933), “Залатыя агні” (1935), “Маё Каханне” (1940).

Важным накірункам архітэктуры на гэтым этапе з’яўляўся канструктывізм. Сярод значных збудаванняў: Дом урада (1930–1934), Дом Чырвонай Арміі (1934–1939), тэатр оперы і балета (1935–1937), галоўны корпус АН БССР (1935–1939).

Важная роля ў развіцці беларускай скульптуры належыла скульптурнаму аддзяленню Віцебскага мастацкага тэхнікума. Яго выпускнікі у пачатку 1930-х гг. аформілі інтэр’еры Дома ўрада і іншых значных збудаванняў БССР.

Прааналізаваўшы вышэйсказанае можна адзначыць, што амаль да канца 1920-х гг. ідэалагічны кантроль у сферы навукі і мастацтва, за дзейнасцю навукоўцаў і мастакоў, не меў татальнага характару і дапускаў пэўную інтэлектуальную свабоду. У 30-х гадах і наступных дзесяцігоддзях развіццё беларускай культуры, адукацыі, навукі дэфармуецца. У той час, калі дзясяткі мільёнаў людзей навучыліся пісьменнасці, далучыліся да крыніц культуры, кіраўніцтва краіны ўжо безапеляцыйна вырашала, што з твораў літаратуры і мастацтва карысна народу. Рэпрэсіям падвяргаліся пісьменнікі, паэты, навукоўцы. Вясной і летам 1930 г. было арыштавана 108 дзеячаў навукі і культуры, якія былі ажыццяўлялі палітыку беларусізацыі. Супраць іх была сфабрыкавана паклёпніцкая кампанія аб закансціраванай контррэвалюцыйнай арганізацыі СВБ (Саюз вызвалення Беларусі). У лік рэпрэсіраваных трапілі акадэмікі Беларускай Акадэміі Навук В.Ю Ластоўскі, Я.Ю. Лесік, С.М. Некрашэвіч, прафесар А.А. Смоліч, нарком земляробства Д.Ф. Прышчэпаў, нарком асветы А.В. Баліцкі, пісьменнікі М.І. Гарэцкі, У. Дубоўка, Я. Пушча і інш. Пачаўся вялікі ўціск і абвінавачванні супраць У. Ігнатоўскага. З сярэдзіны 1937 г. да ліпеня 1938 г. следчымі органамі было арыштавана 26 навукоўцаў, 41 выкладчык ВНУ [3, с. 157]. Культурна-асветніцкая праца суправаджалася дыскрымінацыйнай палітыкай у адносінах да ўсіх рэлігійных канфесій. Культавыя рэлігійныя збудаванні зачыняліся і руйнаваліся; ажыццяўляліся рэпрэсіі ў адносінах да служкаў рэлігійнага культу.

Увогуле ж, нягледзячы на ўсе цяжкасці , перажытыя ў 1920–1930-я гг. народам Беларусі, яе творчай інтэлігенцыяй, беларуская культура, у параўнанні з часам Расійскай імперыі, зрабіла за два дзесяцігоддзі вялікі крок наперад, паднялася на новы, больш высокі і якасны ўзровень. У гэты час ў БССР адбывалася хуткае развіццё адукацыі, была ліквідавана, у асноўным, масавая непісьменнасць дарослага насельніцтва, значна павысіўся агульнаадукацыйны і культурны ўзровень народа. 20–30-я гады – час фарміравання новай інтэлігенцыі, станаўлення беларускай нацыянальнай навукі і яе навукова даследчых устаноў, развіцця беларускай літаратуры, тэатральнага і музычнага мастацтва, жывапісу і архітэктуры.



Рэпазіторый ВДУ

Спасылкі

1. Республика Беларусь: энциклопедия: в 6 т. Т. 1 / редкол.: Г.П. Пашков и др. – Мн.: БелЭн, 2005. – 1040 с.: илл.

2. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч. [і інш]. рэдкал М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Экоперспектіва, 2007. – 613 с.; іл.

3. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапаможнік. У 2 ч. Ч. 2 Люты 1917 г. – 2000 г. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.А. Забродскі і інш.; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. – 464 с.

4. НАРБ. – Фонд 4. – Опісь 2. – Д. 84.

5. Народная адукацыя і педагагічная навука ў Беларусі 1917–1945. – Мн.,1993.

6. Василевская Н.В. Формирование производственно-технической интеллегенции БССР. 1921–1941 гг. – Мн., 1986.

7. Белорусский ордена Трудового Красного Знамени университет им В.И. Ленина. – Мн., 1971.

8. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.У. Мандрык. – Віцебск: УА ФПБ "МІПСА", 2009. – 276 с.

## ТЭМА 11. Беларуская эміграцыя, яе памеры і асноўныя накірункі

1. Эканамічныя і палітычныя падставы для эміграцыі. Беларуская дыяспара за мяжой.
2. Адносіны беларускай эміграцыі да Савецкай Беларусі.

**1. Эканамічныя і палітычныя падставы для эміграцыі. Беларуская дыяспара за мяжой.** У параўнанні з суседнімі народамі беларусы пазней уключыліся ў міграцыйны рух, як на абсягах імперыі, так і за яе межы. Працэс міграцыі людзей з тэрыторыі Беларусі адбываўся па розных прычынах, але заўсёды ён адлюстроўваў трагічныя старонкі гісторыі яе народа. Падзелы Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст. і далучэнне беларускіх земель да Расійскай імперыі выклікалі перасяленне беларусаў у цэнтральныя раёны дзяржавы і Сібір. Нацыянальна-вызваленчыя паўстанні 1794, 1830–1831, 1863–1864 гг., спроба аднаўлення Вялікага княства Літоўскага пад час вайны Напалеона з Расіяй абумовілі выезд многіх беларусаў за мяжу.

Як сталая з'ява, эміграцыя беларусаў бярэ пачатак з 80-х гг. XIX ст., а масавы характар гэта з'ява набыла пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг. і тых змен у грамадскім і сацыяльна- эканамічным развіцці , якія яна выклікала. Развіццё капіталізму, расслаенне і абеззямельванне сялянства, аграрная перанаселенасць, збядненне дробных вытворцаў абумовілі масавы выезд сялян за межы сваёй тэрыторыі. У 1896–1912 гг. з Беларусі ў Сібір у пошуках вольнай або больш таннай зямлі перасялілася больш за 700 тыс. чалавек. Пакідалі родны кут галоўным чынам сяляне, г.зн. беларусы, бо веска складалася пераважна з карэннага насельніцтва [1, с. 210]. Тымі ж прычынамі, а таксама попытам на танную рабочую сілу на еўрапейскім і амерыканскім кантынентах быў абумоўлены і выезд сялян за мяжу. Найчасцей ехалі з мэтай зарабіць грошы,каб , вярнуўшыся , купіць кавалак

зямлі, абзавесціся гаспадаркай. Няведанне стану краін, магчымых для перасялення, патрэб працоўнага рынку моцна абцяжарвалі становішча эмігрантаў. Таму ў час масавых перасяленняў на Беларусі ўзнікалі таварыствы апекі над эмігрантамі. У 1912 г. Віленская філія Таварыства апекі надрукавала на беларускай мове памятку з парадамі і беларуска-англійскім размоўнікам. Асноўнымі краінамі для пасялення беларусы выбіралі тыя, якія прываблівалі больш –менш блізкімі, як ім здавалася, прыродна-геаграфічнымі ўмовамі ды ладам жыцця. Кампактнымі групамі беларусы ў даваенны час (да першай сусветнай вайны) сяліліся ў ЗША, Канадзе, Бразіліі і Аргенціне. Большасць даследчыкаў схіляецца да наступнай лічбы: колькасць беларусаў, якія выехалі, налічвала 500–600 тыс. чалавек.

Іміграцыйныя службы краін пасялення рэгістравалі беларусаў як былых грамадзян Расіі па веравызнанні: праваслаўных адносілі да рускіх, католікаў – да палякаў. На гэтым этапе беларусы інтэграваліся ў рускія і польскія калоніі, асіміляваліся хутчэй, чым іншыя народы, але ў сем’ях, кампактных групах захоўвалася пэўная нацыянальная адметнасць. Каб захаваць свае адметныя нацыянальныя рысы, у 1914 г. у штаце Мічыган (ЗША) яны разам з украінцамі заснавалі сваё Таварыства.

Самая высокая эміграцыя з Беларусі ўсе ж была на абсягі Расіі. Згодна першага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі (1897 г.) на яе тэрыторыі пражывала каля 6 млн беларусаў [1, с. 211]. Адчувальны адток беларускага насельніцтва на Усход Расіі адбываецца з 1914 г. Выклікана гэта Першай сусветнай вайной, затым Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыямі 1917 г., нямецкай і польскай акупацыяй. На гэтыя падзеі насельніцтва Беларусі рэагавала акцыяй масавай эміграцыі. У адрозненне ад папярэдніх этапаў, якія былі звязаны з пошукам працы, гэты этап міграцыі быў звязан больш з палітычнымі прычынамі. 1918 – сярэдзіну 1920 гг. можна назваць першай арганізаванай хваляй палітычнай эміграцыі беларусаў за межы краіны, дзе значнае месца займала інтэлігенцыя. У эміграцыю вымушаны былі падацца кіраўнікі дзяржаўных устаноў БНР – члены прэзідыума Рады, урада БНР, а таксама саветнікі і дзеячы накаторых партыйных цэнтраў і праціўнікі бальшавіцкага рэжыму. Па падліках даследчыкаў, у ходзе Кастрычніцкай рэвалюцыі і пасля яе колькасць эмігрантаў гэтай хвалі з Беларусі склала 122 тыс. чалавек [2, с. 133]. Асноўная маса эмігрантаў рушыла на Захад – у Фінляндыю, Прыбалтыку, Германію, Чэхаславакію, Францыю, ЗША. Асобныя выехалі на Усход – у Маньчжурыю, Кітай.

Цяжкае сацыяльна-эканамічнае становішча працоўных заходняй часткі Беларусі, нацыянальны і рэлігійны ўціск прымусілі сотні тысяч беларусаў наогул пакінуць Радзіму. У выніку Рыжскага мірнага дагавору мільёны беларусаў вымушаны былі пражываць за межамі сваей нацыянальнай дзяржавы. З 1921 г. па 1939 г., па падліках замежных і беларускіх даследчыкаў, выехала ад 180 да 250 тыс. беларусаў. Па

Рэпазіторый ВГУ

некаторых звестках каля 350 тыс. з іх пражывалі ў Аргенціне, Бразіліі, Уругваі, Парагваі, Чылі [3, с. 316]. Пераважнаму выезду ў гэтыя краіны спрыяла функцыянаванне ў Баранавічах аргенцінскага консульства.

У той жа час меўся значны адток беларусаў у рэгіёны СССР. Пасля другога ўзбуйнення (1926 г.) па 1938 г. з БССР, згодна з планавым наборам рабочай сілы, выехала 617 тыс. чалавек. Кампактныя асяродкі беларусаў склаліся ў Архангельскай і Мурманскай абласцях, Комі АССР, Сібіры.

Захоп Германіяй Польшчы і далучэнне Заходняй Беларусі да БССР абумовілі актывізацыю палітычнага жыцця беларускай эміграцыі ў заходнееўрапейскіх краінах. Да таго ж яна ў гэты час папоўнілася новай хваляй. У час захопу Германіяй Польшчы ў палоне аказалася 70 тыс. беларусаў, якія ваявалі ў складзе польскага войска. Нямецкія ўлады рабілі захады для выкарыстання беларусаў у сваіх мэтах. З лета 1940 г. у Берліне пачаў дзейнасць Беларускі камітэт самадапамогі. Пазней былі адкрыты яго філіялы ў Варшаве, Праземе, Лодзі, Вене,і інш гарадах. Цесныя сувязі берлінскі цэнтр падтрымліваў з Беларускім цэнтрам у Літве.

Масавая эміграцыя беларускага насельніцтва на мяжы XIX–XX стст. і сталае пражыванне часткі нацыі за межамі сваёй Бацькаўшчыны, абумовілі неабходнасць іх аб’яднання ў дыяспары (слова “дыяспара” паходзіць ад грэчаскага “diaspora”, што азначае рассяленне, пражыванне значнай часткі этнасу па-за межамі этнічнай тэрыторыі). Пры кампактным пражыванні за мяжой беларусы стваралі свае нацыянальныя асяродкі, рэлігійныя, культурныя арганізацыі, навуковыя цэнтры, сродкі інфармацыі.

Да заканчэння вайны з Польшчай і грамадзянскай вайны, у Еўропе дзейнічалі дыпламатычныя прадстаўніцтвы, місіі і консульствы БНР ў Літве, Латвіі, Эстоніі, Турцыі, Германіі і іншых краінах. За мяжу з Савецкай Беларусі выехалі кіраўнікі дзяржаўных устаноў, створаных БНР, члены прэзідыума Рады на чале з П. Крачэўскім, урада БНР (кабінет В. Ластоўскага), а таксама шэраг саветнікаў і дзеячаў некаторых партыйных цэнтраў.

**2. Адносіны беларускай эміграцыі да Савецкай Беларусі.** У першыя гады эміграцыі ўстановы БНР і большасць нацыянальных беларускіх партый адмоўна ставіліся да савецкай улады, што ўсталявалася ў Беларусі. У іх пераважала ідэя нацыянальнай дзяржаўнасці для беларусаў пры аб’яднанні, пад эгідай БНР, Заходняй і Усходняй Беларусі. Гэта ідэя аб “трэцім шляху” Беларусі належыла галоўнай палітычнай сіле беларускай эміграцыі партыі беларускіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Дзейнасць гэтай хвалі эміграцыі з такімі намерамі заставалася найбольш актыўнай да 1924 г.

Спачатку урад БНР выехаў у Латвію, дзе ён імкнуўся кансалідаваць нацыянальны рух у вырашэнні сваёй галоўнай мэты. З боку кіраўніцтва БНР прадпрымаліся неаднаразовыя спробы паставіць на міжнародным узроўні пытанне аб стварэнні незалежнай беларускай дзяржавы [4, с. 59]. Настойліва ставілася гэта пытанне на Парыжскай міжнароднай

Репозиторий ВГУ

канферэнцыі па выпрацоўцы ўмоў міру з Германіяй і яе саюзнікамі ў Першай сусветнай вайне (студзень 1919 г. – студзень 1920 г.). Пазіцыі дэлегацыі БНР атрымалі некаторы водгук у замежнай прэсе , пазнаёмілі свет са станам Беларусі на гэты час. Вядучыя краіны (ЗША. Вялікабрытанія , Францыя, Італія і Японія) нават прызналі дэ-факта альтэрнатыўныя Саветам дзяржаўныя ўтварэнні БНР. Шэраг краін прызналі БНР і юрыдычна, але гэта не прывяло да грунтоўных змен у іх практычных адносінах.

Пасля таго, як у мірным пагадненні, заключаным урадамі Расіі і Польшчы (11 жніўня 1920 г.), было указана, што Латвія павінна спыніць на сваёй тэрыторыі дзейнась урада БНР і ўсіх іншых беларускіх арганізацый, урад БНР і замежнае бюро ЦК партыі беларускіх эсэраў пераехалі ў Літву. Урад БНР выступаў у гэты час супраць падзелу Беларусі паводле Рыжскага дагавора. Быў намер правесці акцыю, накіраваную на зрыў мірных перамоў паміж Расіяй і Польшчай. 20 кастрычніка 1920 г. на канферэнцыі ў Рызе прадстаўнікі беларускіх эсэраў (В. Ластоўскі, Я. Мамонька, К. Душэўскі, А. Галавінскі, А. Валькові̇ч), сацыялістаў-федэралістаў (П. Крачэўскі, В. Захарка,Я. Варонка, К. Езавітаў, Ю. Гадыцкі-Цвірко) і сацыял-дэмакратаў (А. Аўсянік) вырашылі ўтварыць вакол урада В. Ластоўскага аб'яднаны нацыянальны блок. У кастрычніку 1920 г. кіраўніцтва БНР звярнулася да ўрадаў Фінляндыі,Эстоніі, Латвіі, Літвы і Германіі з заклікам падтрымаць незалежнасць Беларусі, а ў снежні гэтага года паслала мемарандум у Лігу нацый з высновамі адносна драпежніцкага прэлімінарнага дагавора (папярэдняя фармальная згода аб спыненні ваенных дзеянняў паміж краінамі, якія ваююць).

Звярталася кіраўніцтва БНР па дапамогу ў барацьбе за прызнанне незалежнасці і непадзельнасці Беларусі да “лепшых сыноў польскай нацыі”. Наступным крокам у гэтым накірунку быў прызыў да “ўсяго культурнага свету” (так гучала ў распаўсюджанай лістоўцы) за непрызнанне падпісанага ў Рызе дагавора.

Для рэалізацыі сваіх установак кіраўнікі БНР не выключалі з парадку дня правядзенне ўзброенага паўстання як на тэрыторыі БССР, так і ў Заходняй Беларусі. Пасля падпісання Рыжскага дагавора ў эміграцыі апынуліся некаторыя вайсковыя фарміраванні БНР, якія знаходзіліся ў Прыбалтыцы (Беларускі пяхотны полк, Беларускі эскадрон, Гродзенскі батальён, 1-я і 2-я беларускія роты пад камандаваннем Ц. Кандратовіча).

Беспрацоўе і малазямелле вымушалі сялян Заходняй Беларусі выязджаць на заробкі ў краіны Заходняй Еўропы і Амерыкі. Па адных звестках з Польшчы ў іншыя краіны выехала 78,1 тыс. беларусаў, па другіх – лік выехаўшых дасягаў 180–240 тыс. Чалавек [5, с. 197].

У канцы верасня 1921 г. пытанне аб кансалідацыі беларускіх нацыянальных сіл замежжа разглядалася на беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі ў Рызе, на якую з'ехаліся 37 прадстаўнікоў

нацыянальных арганізацый і партый. І надалей урад БНР меў намер узняць паўстанне на Беларусі. Улетку 1921 г. быў утвораны Цэнтральны беларускі паўстанцкі камітэт (ЦБПК). Камітэт узначальваў член ЦК партыі беларускіх эсэраў У. Пракулевіч. Але арганізаваць паўстанне не ўдалося. Нешматлікі партызанскі рух у шэрагу раёнаў БССР (у чэрвені 1921 г. ён налічваў каля 3 тыс. чалавек) быў задушаны часткамі асобага прызначэння.

Спроба вырашыць беларускае пытанне (аб прызнанні БНР) працягвалася на Гэнуэзскай канферэнцыі ў красавіку – маі 1922 г.

Найбольшая актыўнасць палітычнай апазіцыі праяўлялася ў Літве, Латвіі, Чэхаславакіі, на тэрыторыі якіх у 20-х гадах былі створаны беларускія арганізацыі і аб’яднанні, выдаваліся газеты і часопісы.

У той жа час у супрацьлегласць дзеянням апазіцыі ўлады БССР праводзілі работу па развіцці руху савецкай арыентацыі сярод беларускай палітычнай эміграцыі, схіленні на свой бок асобных лідэраў, партый і груп. Яны зыходзілі з таго, што магчыма раздрабіць палітычную эміграцыю, аб’яднаць у ёй дэмакратычныя элементы на падставе адраджэння беларускай нацыі ва ўмовах савецкай улады. Вядомыя грамадскія дзеячы БССР А. Чарвякоў, У. Ігнатоўскі, З. Жылуновіч да сярэдзіны 20-х гг. падтрымлівалі сувязі з левымі плынямі эміграцыі, мелі кантакты з яе вядучымі дзеячамі. У сваю чаргу палітэмігранты таксама адсочвалі становішча і працэсы, якія адбываліся на былой радзіме.

Афіцыйная палітыка кіраўніцтва БССР да беларусаў замежжа, іх палітычных і грамадска-культурных арганізацый найбольш поўна была сфармулявана ў тэзісах ЦК КП(б)Б “Белорусское движение за кордоном” ад 16 кастрычніка 1925 г. Яна заключалася ў “развіцці нацыянальнага беларускага руху і пераўтварэнні яго ў рэвалюцыйны рух...” [5, с. 197]. Было прызнана, што палітычная эміграцыя прадстаўляе рэальную небяспеку для развіцця нацыянальнага і рэвалюцыйнага руху. У сувязі з гэтым пастаўлена задача пашыраць у асяроддзі эміграцыі савецкі ўплыў, ні ў якім разе “не дапускаць стварэння якіх бы то ні было беларускіх аб’яднанняў”, так як гэта затармозіць развіццё беларускага руху савецкай арыентацыі. Такая ж палітыка праводзілася і ў адносінах да працоўнай эміграцыі. Так, з улікам прысутнасці значнай колькасці беларусаў у Паўночнай Амерыцы прызнавалася неабходным устанаўленне кантакта і ажыццяўленне свайго кіраўніцтва цераз мясцовую кампартыю і спецыяльна пасланых работнікаў. Такая палітыка, безумоўна, мела пэўныя станоўчыя вынікі. Але галоўнае ўздзеянне на пазіцыі палітычнай эміграцыі аказвала стабілізацыя міжнароднага становішча, а таксама стабілізацыя ўнутранага жыцця ў самой Беларусі. Пачатак увядзення новай эканамічнай палітыкі, першыя поспехі гаспадарчага і нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, рашэнне прэзідыумаў ЦВК СССР і БССР ад 13 ліпеня 1923 г. аб амністыі “паходзячых з працоўнага асяроддзя” удзельнікаў антысавецкіх фарміраванняў 1918–1920 гг., а таксама беларускіх



Репозиторий ВГУ

палітычных і культурных дзеячаў, членаў урадаў БНР і розных палітычных партый (пры ўмове лаяльных адносін да Савецкай улады), прывялі да таго, што значная і ўплывовая частка беларускай палітычнай эміграцыі перайшла да супрацоўніцтва з уладай. Амністыя (Я. Лесіка, А. Смоліча, С. Некрашэвіча, якія не пакідалі межаў Беларусі), палітыка беларусізацыі, распачатая ў 1924 г., поспехі ў гаспадарчым развіцці савецкай Беларусі паспрыяла рашэнню, прынятаму у Берліне на 2-й Беларускай нарадзе (склікана урадам БНР), аб спыненні канфрантацыі з савецкай уладай. Тут было прызнана, што БССР ёсць палітычная рэчаіснасць, з'яўляецца цэнтрам кансалідацыі беларускага народа і адраджэння яго самабытнай культуры. Пасля гэтай нарады амаль увесь эміграцкі урад БНР на чале са сваім старшынёй А. Цвікевічам вярнууся на радзіму. Ім было прадастаўлена права на працаўладкаванне згодна з іх адукацыяй, галоўным чынам ў галіне адукацыі, культуры, навукі [6, с. 152]. З іх імёнамі звязана рэалізацыя палітыкі беларусізацыі. Тыя эмігранты, якія засталіся ў Празе, утварылі эміграцкі цэнтр – Раду БНР. Яе ўзначаліў П. Карчэўскі.

Па ініцыятыве ўрада БНР беларуская эміграцыя пачала ствараць эміграцкія цэнтры і культурныя арганізацыі. У Чэхаславакіі, куды пасля рэарганізацыі ўрада БНР пераехалі прэзідыум Рады і урад, беларуская эміграцыя канцэнтравалася вакол Рады. Тут працавалі Беларускае культурна-асветніцкае таварыства імя Францыска Скарыны, Беларускае таварыства "Сокал", а таксама аб'яднанні беларускіх студэнцкіх арганізацый у Празе, Берліне, Рыме, Мюнхене, Варшаве і інш. Студэнцкае аб'яднанне выдавала свой "Бюллетень" , а Таварыства імя Ф. Скарыны часопіс "Іскры Скарыны". У Рызе і Дзвінску (Даўгаўпілс) былі арганізаваны беларускае культурна-асветніцкае таварыства "Бацькаўшчына", беларускі клуб, курсы беларусазнаўства, выдаваўся часопіс "На чужыне". Пасля 1924 г. з'явіліся беларускія асветніцкія таварыствы "Рунь" і "Беларуская хата". Таварыства беларускіх настаўнікаў адкрыла і ўтрымлівала 4 беларускія прыватныя школы і беларускую прыватую гімназію, выдавала часопіс "Школа і жыццё".

Пасля 1925 г. дзейнасць беларускагай эміграцыі зводзілася, у асноўным, да культурна-асветніцкага напрамку. У 1925–1930 гг. пад рэдакцыяй К. Езавітава выходзіла газета "Голас беларуса". У ЗША пачалі працаваць цэнтры беларускай эміграцыі ў Нью-Ёрку і Чыкага. Пасля пераезду ў ЗША былога прэм'ера ўрада БНР Я. Варонкі тут сталі дзейнічаць арганізацыі Беларускага нацыянальнага камітэта, камітэта дапамогі рабочым і сялянам Заходняй Беларусі, Беларуска-амерыканскага клуба і інш. З кастрычніка 1926 г. у Чыкага пачала выходзіць газета "Беларуская трыбуна" [5, с. 152].

У Францыі арганізаванае жыццё беларускай эміграцыі пачалося з 1926 г., найбольш актыўным яно стала з 1930 г., калі сюды з Прагі пераехалі М. Абрамчык і Л. Рыдлеўскі. З цэнтрам у Парыжы быў

Репозиторий ВГУ

заснаваны "Хаўрус беларускай працоўнай эміграцыі", які меў пяць філіялаў у правінцыях.

У Аргенціне нацыянальна-асветніцкую дзейнасць праводзіў саюз Беларускіх таварystваў, які аб'ядноўваў Беларускую асветніцкую грамаду (1934 г.), Беларускае таварыства "Культура" (1937 г.), Беларускае таварыства "Белавежа"(1938 г.) і бібліятэку Івана Луцкевіча (1937 г.).

Несумненна, што значная міжваенная рэвалюцыйная хваля беларускай эміграцыі сведчыць аб складанасці падзей на радзіме. Ад'езд на пастаяннае жыхарства за мяжу прадстаўнікоў Беларусі з высокім прафесійным узроўнем і нацыянальна-дэмакратычнай свядомасцю адмоўна сказаўся на інтэлектуальным патэнцыяле беларускай нацыі і ўсяго беларускага народа. У 1934 г. амаль усе арганізацыі беларускіх эмігрантаў былі забаронены. У час палітычных рэпрэсій, многія дзеячы, якія вярнуліся з эміграцыі, разам з палітыкамі і творчай інтэлігенцыяй, што выступала за захаванне нацыянальных традыцый і культуры, актыўна прапагандавала правядзенне беларусізацыі, былі арыштаваны.

Змены, якія адбыліся ў краіне ў часы "адлігі" і наступныя гады, аказаліся пазітыўнымі ў адносінах савецкай улады і эмігрантаў. Беларусь стала надаваць увагу пашырэнню сувязей з суайчыннікамі, якія пражывалі ў блізкім і далёкім замежжы. Рада БНР, у якую уваходзяць каля 120 чалавек, існуе па сёняшні дзень, яе узначальвала (звесткі 2016 г.) прэзідэнт Івонка Сурвілла. Аб тым, як складваюцца рознабаковыя адносіны Рэспублікі Беларусь з беларускімі дыяспарамі на сучасным этапе, будзе выкладзена ў адпаведным раздзеле, пазней.

Спасылкі

1.Сяргеева, Г. Беларуская дыяспара / Г.Сяргеева // Крыжовы шлях. – Мн.: "Згода", 1993. – 239 с.

2. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. /А. Вабішчэвіч [і інш]; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Экоперспектіва, 2007. – 613 с.; іл.

3. Республика Беларусь: Энциклопедия: в 6 т. Т. 1 / редкол.: Г.П. Пашков и др. – Мн.: БелЭн, 2005. – 1040 с.: ил л.

4. Замежная Беларусь.Зборнік гісторыі, культуры, і эканомікі / пад рэд. П. Крачэўскага / Кн. 1. Прага. – 1926. – 198 с.

5. Идеологическая деятельность Компартии Белоруссии. Т.1. Сб.док. – Мн., 1990.

6. Гісторыя Беларусі: вучэб. Дапаможнік: у 2 ч. Ч. 2 Люты 1917 г. – 2000 г. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.А. Забродскі і інш.; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С.Марцуля. – 2-е выд., перапрац. і дап. –Мн.: Універсітэцкае, 2000. – 464 с.

## ТЭМА 12. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча заходнебеларускіх зямель (1921–1939 гг.)

1. Палітыка польскіх улад у адносінах да Заходняй Беларусі.
2. Нацыянальна-вызваленчая барацьба насельніцтва Заходняй Беларусі: этапы, вынікі.



Репозиторий ВГУ

**1. Палітыка польскіх улад у адносінах да Заходняй Беларусі.** Як ужо раней адзначалася, згодна з Рыжскім мірным дагаворам (ад 18 сакавіка 1921 г.), да Польшчы адышла 113 тыс. км кв заходнебеларускіх зямель (Гродзенская губерня, усходнія раёны Віленскай і заходнія раёны Мінскай губерняў), якія атрымалі назву Заходняй Беларусі. Іх падзялялі на ваяводствы, паветы і гміны. Польская адміністрацыя была падмацавана густой сеткай паліцэйскіх устаноў – пастарункаў. На гэтай тэрыторыі пражывала амаль 3,4 млн чалавек, ці 12,5% насельніцтва Польшчы. Іх большую частку (70,5%) складалі беларусы [1, с. 314]. Абавязкі, якія ўрад Польшчы ўзяў на сябе, даць беларускаму і украінскаму насельніцтву «усе правы, якія забяспечвалі б свабоднае развіццё культуры, мовы і выкананне рэлігійных абрадаў», на працягу 18 гадоў не выконваліся. Заходняя Беларусь з'яўлялася аграрным прыдаткам прамысловых раёнаў Польшчы, рынкам збыту і крыніцай таннай сыравіны і рабочай сілы. Належнага развіцця прамысловай прадукцыі тут не наглядалася. На долю харчовай, дрэваапрацоўчай прамысловасці прыходзілася 75% прадпрыемстваў і столькі ж рабочых. Пераважалі дробныя прадпрыемствы. З колькасцю 100 і больш чалавек у 1926 г. тут налічвалася ўсяго 19 прадпрыемстваў. Найбольш буйныя: шклозавод "Нёман", запалкавая фабрыка "Прагрэс-вулкан" у Пінску, тытунёвая фабрыка ў Гродна. У 1928 г. на буйных прадпрыемствах было занята 11,6 тыс. чалавек (гэта менш, чым у 1919 г.). З 1926 г. пачаўся прамысловы ўздым, які працягваўся нядоўга. Сусветны эканамічны крызіс 1929–1933 гг. у Заходняй Беларусі праявіўся разбуральна ў галінах апрацоўчай прамысловасці ў Навагрудскім і Палескім ваяводствах (акрамя іх, на заходніх землях было яшчэ 2 ваяводствы – Беластоцкае, Віленскае). Па афіцыйных дадзеных, у Заходняй Беларусі было зачынена 230 прадпрыемстваў, колькасць рабочых у 1932 г. у параўнанні з 1929 г. зменшылася ў 2,5 разы (з 13,4 тыс. да 5,1 тыс. чалавек). Гарбарная, металаапрацоўчая, тэкстыльная і іншыя галіны, якія калісьці адыгрывалі значную ролю ў народнай гаспадарцы, прыйшлі ў заняпад.

Да 1939 г. эканоміка Заходняй Беларусі не ўзнялася вышэй за ўзровень 1913 г. У параўнанні з БССР тут выраблялася прамысловай прадукцыі ў 9 разоў менш, хоць па тэрыторыі і колькасці насельніцтва яны былі амаль роўныя [2, с. 1]. Кепска абстаялі тут справы з будаўніцтвам шляхоў зносін. Калі ў цэнтральных і заходніх ваяводствах шляхоў з цвёрдым пакрыццём прыходзілася да 30 км, то на "крэсах усходніх" – менш 10. З чыгуначным транспартам справы абстаялі не лепш: да 1938 г. было пабудавана 89 км чыгункі (Варапаева–Друя), што складала 6,2% ад усіх шляхоў уведзеных у Польшчы за гэты час. Неспрыяльнымі былі ўмовы для развіцця рамеснай вытворчасці. Рабочыя працавалі па 12–14 гадзін на суткі. Іх заработная плата была ніжэйшая, за плату на ўласна польскай тэрыторыі. Расло беспрацоўе, платны адпачынак не

Рэпазіторый ВДУ

прадугледжваўся. Узровень жыцця простага насельніцтва заставаўся даволі нізкім.

У сельскай гаспадарцы была занята пераважная большасць насельніцтва – больш 80%. Памешчыкі, якіх было менш 1% ад усёй колькасці жыхароў, валодалі амаль паловай усёй зямлі. Больш таго, польскі ўрад пачаў засяляць беларускія землі так званымі асаднікамі – былымі афіцэрамі, унтэрафіцэрамі, якім адводзіліся вялікія зямельныя надзелы і даваліся грашовыя сродкі. Іх уласнасць яшчэ больш умацоўвалася за кошт зямель тых, хто не змог паставіць сваю гаспадарку пасля праведзенай польскім урадам **камасацыі** (землеупарадкаванне). Пад выглядам барацьбы з цераспалосіцай сялян гвалтоўна высялілі на хутары, дзе неабходна было наладжваць гаспадарку амаль нанава. На гэта патрабаваліся вялікія сродкі, якіх беднякі і серадня́кі не мелі. Былі тут сяляне, якія мелі дастаткова моцныя гаспадаркі. Па ўраджайнасці жыта і пшаніцы Віленскае, Беластоцкае, Навагрудскае і Палескае ваяводствы мелі паказчыкі амаль роўныя французскім. Сярэднегадавы надой малака на адну карову ў гаспадарках з зямельнай плошчай менш 50 га вагаўся ў межах 2 тыс. кг [3, с. 4]. Жывёлагадоўчая накіраванасць сельскай гаспадаркі дазваляла развіваць вытворчасць масла і сыру, таму пашыралася колькасць маслабойняў. Калі ўлічыць прымітыўнасць тэхнікі апрацоўкі зямлі, амаль поўную адсутнасць штучных угнаенняў, нізкія цэны на сельскагаспадарчую прадукцыю, то можна зразумець, якіх намаганняў патрабавала забеспячэнне такіх рубяжоў.

Пераход зямлі да асаднікаў і багатых гаспадароў, слабая дапамога польскай дзяржавы вяскоўцам прыводзілі да распаду сялянскіх гаспадарак. Праводзілася таксама **парцэляцыя** – продаж часткі дзяржаўнай і памешчыцкай зямлі сялянам дробнымі кавалкамі па завышаных коштах. Ліквідавана права сялян на сумеснае з памешчыкамі карыстанне сервітутамі (выганамі, выпасамі, сенажацямі) і іншымі ўгоддзямі. Апынуўшыся ў цяжкім, гаротным становішчы, большасць сялян вымушана была наймацца да багацеяў у якасці рабочых або эмігрыраваць у ЗША, Канаду, Лацінскую Амерыку, Заходнюю Еўропу. У тыя гады з Польшчы ў іншыя краіны выехала, як ужо ўказвалася раней, каля 240 тыс. беларусаў.

Цяжкае сацыяльнае і эканамічнае становішча дапаўнялася паліцэйскім тэрорам. Па ўсёй тэрыторыі “усходніх крэсаў” лютавалі карныя экспедыцыі, якія называліся пацыфікацыяй (падаўленне карнымі метадамі паўстання, народнага хвалявання). Жыхарам вёсак забаранялася запальваць вечарам святло, збірацца групамі, хадзіць у іншыя вёскі. За парушэнне ўладных установак учыняліся масавыя экзекуцыі, разбураліся хаты сялян, знішчалася сялянская маёмасць.

Ажыццяўлялася таксама паланізацыя насельніцтва. Беларусы былі пазбаўлены магчымасці навучацца на роднай мове. Адкрытыя ў папярэднія гады 78 беларускіх школ, 4 гімназіі, настаўніцкія семінарыі, якія з’яўляліся



Рэпазіторый ВДУ

асноўнай базай падрыхтоўкі педагогаў для гэтых школ, да канца 30-х гг. былі ліквідаваны. Спробы адкрыць адукацыйныя установы і ажыццяўляць навучанне на беларускай мове станавіліся абарачваліся для іх арганізатараў трагедыяй. Так, просьба настаўніка Браслаўскага павета Ф.Д. Манцэвіча аб адкрыцці беларускай школы, з якой ён звярнуўся да ўладаў, закончылася высылкай настаўніка з вёскі. У вёсцы Барсукі (Докшыцкі павет) настаўніца Е.В. Качан адкрыла ў сваім доме школу з навучаннем дзяцей на беларускай і рускай мовах. Праз некалькі месяцаў у вёску прыехалі жандары і разагналі школу, у якой, на іх погляд, навучанне вялося на "хамскай мове" [2, с. 3]. Такія захады з боку польскіх улад не адзінкавыя і не выпадковыя. З 514 беларускіх школ, якія дзейнічалі да 1921 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі, у 1923 г. засталося толькі 32. Школьная рэформа пачатку 1930-х гг. яшчэ больш абмежавала доступ мясцовай моладзі да сярэдняй і вышэйшай адукацыі. Сярод студэнтаў Віленскага ўніверсітэта Ст. Баторыя беларусы складалі ў самыя лепшыя гады да 2,9% [1, с. 317].

Зачыняліся клубы, бібліятэкі, хаты-чытальні, беларускія культурна-асветніцкія арганізацыі, спыняліся выданні беларускіх газет і часопісаў, забаранялася ўжыванне беларускай мовы ў дзяржаўных установах і органах мясцовага самакіравання. Невыпадкова, што колькасць непісьменных сярод беларусаў складала амаль палову [4, с. 211].

Адной з праяў нацыянальнага прыгнечання была рэлігійная нецярпімасць польскіх улад да праваслаўнага беларускага насельніцтва. З500 існаваўшых у Заходняй Беларусі праваслаўных цэркваў больш за 300 былі пераўтвораны ў каталіцкія касцёлы.

**2. Нацыянальна-вызваленчая барацьба насельніцтва Заходняй Беларусі: этапы, вынікі.** Устанавіўшы у 1926 г. сваю дыктатуру ў Польшчы, Ю. Пілсудскі абвясціў рэжым **«санацыі»** («аздараўлення»). У сваёй палітычнай частцы "санацыя" зводзілася да жорсткага падаўлення ўсіх форм дэмакратычнага руху. Гэта прывяло да абвастрэння сацыяльных адносін, і да актывізацыі дзейнасці апазіцыйных палітычных сіл, і нарастання нацыянальна-вызваленчага руху ў заходніх раёнах Беларусі. Барацьба супраць прыгнёту ў 20-я гады набыла партызанскі характар. Асабліва ўпартай яна была ў Гродзенскім, Брэсцкім, Ваўкавыскім, Навагрудскім, Пінскім, Слонімскім і Косаўскім паветах. Партызаны спальвалі маёнткі памешчыкаў, сядзібы асаднікаў, рабілі налёты на паліцэйскія ўчасткі і ўрадавыя ўстановы. На чале руху стаялі камуністы – члены перайшоўшых на нелегальнае становішча арганізацый КП(б)Б, Камуністычнай рабочай партыі Польшчы (КРПП), Камуністычнай партыі Літвы (КПЛ).

Удзельнічалі ў нацыянальна-вызваленчым руху і прадстаўнікі беларускага нацыянальна-дэмакратычнага лагера. Аб гэтым сведчаць выбары ў польскі сейм у 1922 г. Па выніках выбараў у сейме стварылася



Рэпазіторый ВДУ

беларуская нацыянальная фракцыя, у склад якой увайшло 11 паслоў (дэпутатаў), у тым ліку Б.А. Тарашкевіч, С.А. Рак-Міхайлоўскі, П.В. Мятла, А. Станкевіч і інш. Фракцыя прадстаўляла практычна ўсе тагачасныя беларускія палітычныя партыі. Пачынаўся якасна новы этап у развіцці нацыянальна-вызваленчага руху – этап з выкарыстаннем парламенцкай формы барацьбы.

У кастрычніку 1923 г. у Вільні нелегальна адбылася V-я Устаноўчая канферэнцыя прадстаўнікоў усіх існаваўшых у Заходняй Беларусі партыйных камітэтаў камуністаў. Яна прыняла рашэнне аб стварэнні Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) як аўтаномнай у складзе Камуністычнай партыі Польшчы (КПП) і выбрала яе ЦК. У канцы 1923 г. у рады КПЗБ улілася Беларуская рэвалюцыйная арганізацыя (БРА). Яе кіраўнікі І.К. Лагіновіч, А.У. Канчэўскі і А.Р. Капуцкі ўвайшлі ў склад ЦК КПЗБ.

Намаганнямі партыі ў 1924 г. быў створаны камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ). Пад ўплывам КПЗБ знаходзілася дэпутацкая фракцыя «Змаганне» і іншыя палітычныя арганізацыі. Адначасова пашыралася культурна-асветніцкая дзейнасць, якую развівалі ў першую чаргу Беларуская хрысціянская дэмакратыя (БХД), група А. Луцкевіча – Р. Астроўскага і Віленскі Беларускі нацыянальны камітэт, а таксама розныя навуковыя, дабрачынныя, гаспадарчыя, асветніцкія арганізацыі і таварыствы, якія дзейнічалі пад іх кіраўніцтвам.

Такім чынам, у сярэдзіне 20-х гадоў у нацыянальна-вызваленчым руху, які ў гэты час набыў шырокі размах у Заходняй частцы Беларусі, яскрава выкрышталізаваліся два напрамкі: **рэвалюцыйна-вызваленчы і нацыянальна-дэмакратычны.**

У 1925 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі склалася сітуацыя, якая магла прывесці да ўзброенага паўстання. У гэтых умовах польскі ўрад увёў сюды вялікую колькасць рэгулярных войск. Суадносіны сіл рэзка змяніліся. Камуністы, каб прадухіліць велізарныя ахвяры, заклікалі працоўных перайсці да іншых форм барацьбы, але і ў далейшым вялі лінію на разгортванне партызанскага руху і змену палітычнай улады. Пад арганізацыйным уплывам КПЗБ у маі 1926 г. канчаткова аформілася, як масавая палітычная арганізацыя, **Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ)** на чале з вядомым беларускім вучоным, рэвалюцыянерам, грамадскім дзеячам Б.А. Тарашкевічам. Праграма Грамады ўключала такія патрабаванні, як самавызначэнне Заходняй Беларусі, стварэнне рабоча-сялянскага ўрада, перадача зямлі сялянам без выкупу, знішчэнне сістэмы асадніцтва. Разам з камуністамі дзеячы Грамады агітавалі сялян і рабочых на актыўную палітычную барацьбу, вялі шырокую кампанію за вызваленне палітзняволеных. Гэта ўзнімала новую хвалю барацьбы. Урад Пілсудскага кінуў у турму некалькі соцень актывістаў БСРГ, ад чаго шмат гурткоў Грамады перасталі існаваць. Гэта было цяжкім ударам па нацыянальна-вызваленчаму руху і выклікала

Рэпазіторый ВГУ

масавыя дэманстрацыі і мітынгі пратэстаў. Грамада пакінула глыбокі след у свядомасці сялян і рабочых. Прагрэсіўныя традыцыі БСРГ прадоўжылі **беларускі сялянска-работніцкі дэпутацкі клуб «Змаганне»** і іншыя арганізацыі.

Нягледзячы на жорсткі тэрор да КПЗБ з боку ўлад, яе аўтарытэт у масах захоўваўся. Камуністы аказалі ўсямерную дапамогу масавай дэмакратычнай культурна-асветніцкай арганізацыі – Таварыству беларускай школы (ТБШ), якое аб’яднала больш за 14 тыс. членаў і ўзначальвалася такімі дзеячамі, як Б.А. Тарашкевіч, І.С. Дварчанін, П.С. Пестрак і інш. Невыпадкова, што на выбарах у сейм у сакавіку 1928 г. за камуністаў, што выступалі пад назвай «Рабоча-сялянскае адзінства», было пададзена звыш 328 тыс. галасоў, гэта складала 26% ад усіх прыняўшых удзел у выбарах у Заходняй Беларусі.

З канца 20-х гадоў, з наступленнем сусветнага эканамічнага крызісу, нездавальняючае становішча працоўных мас Заходняй Беларусі, пагоршылася яшчэ больш. У сувязі з гэтым назіралася ўзмацненне сялянскага і рабочага руху. Усяго за 1931–1933 гг. адбылося больш за 460 выступленняў сялян, у якіх удзельнічалі 140–150 тыс. чалавек. У жніўні 1933 г. са зброяй супраць рэжыму выступілі сяляне Кобрынскага павета. Яркім прыкладам гэтай барацьбы стала выступленне ў 1935 г. нарачанскіх рыбакоў. Дырэкцыя дзяржаўных лясоў, ва ўпраўленне якой было перададзена возера Нарач, забараніла свабодную лоўлю рыбы. Тры тысячы сялян прыазёрных вёсак, абураныя забаронай, захапілі рыбныя участкі. Ім аказалі дапамогу рыбакі, якія працавалі ў дырэкцыі па найме. Вясной 1935 г. у забастоўцы сялян-беднякоў, якія жылі на берагах Нарачы, прынялі ўдзел каля 5 тыс. чалавек з 40 навакольных вёсак. Дзякуючы настойлівасці забастоўшчыкаў улады вымушаны былі пайсці на ўступкі.

Рэпрэсіі з боку польскіх улад да відных дзеячаў нацыянальна-вызваленчага руху, канфрантацыя паміж рэвалюцыйна-вызваленчым і нацыянальна-дэмакратычным напрамкамі руху прывялі ў пачатку 30-х гадоў да некаторага спаду барацьбы і яе стыхійнага працягу. У гэты час забастоўкі прайшлі на прамысловых прадпрыемствах Беластока, Вільні Брэста, Гродна, Пінска, Слоніма. Больш як чатыры зімовыя месяцы 1932–1933 гг. баставала 7 тыс. рабочых і сялян, якія працавалі ў Белавежскай пушчы. Востры характар набылі падзеі на Брэстчыне. Тут над сялянамі паліцыя ўчыніла крывавую пацыфікацыю (уціхамірванне). Дзевяць найбольш актыўных удзельнікаў сялянскіх выступленняў былі аддадзены ваенна-палявому суду. Дзеянні паліцыі і суда ў Кобрыне выклікалі абурэнне рабочых і сялян Польшчы. У Варшаве, Беластоку, Вільні, Брэсце адбыліся масавыя палітычныя дэманстрацыі і забастоўкі пратэсту. Улады вымушаны былі адмовіцца ад вынясення смяротнага прысуду абвінавачаным.

Прынятая ў 1935 годзе ў Польшчы канстытуцыя, яшчэ больш абмяжоўвала дэмакратычныя правы і вольнасці. Тысяча рэвалюцыйна настроеных выхадцаў з рабочага класа, сялянства і перадавой інтэлігенцыі былі кінуты ў турмы. У гэтых умовах барацьба канцэнтруецца вакол стварэння адзінага дэмакратычнага антыфашысцкага народнага фронту. КПЗБ і іншыя партыі вылучаюць шэраг надзённых патрабаванняў: адмену існуючай канстытуцыі, канфіскацыю памешчыцкіх зямель, раўнапраўе нацыянальнасцей і самавызначэнне Заходняй Беларусі, разрыў саюзніцкіх адносін з Германіяй і інш. Большая частка выступленняў рабочых праходзіць пад знакам адзінага народнага фронту. Аб росце яго сіл пераканаўча сведчылі падзеі, звязаныя з расстрэлам рабочых дэманстрацый у Кракаве і Львове вясной 1936 г. У падтрымку польскага пралетарыяту забаставалі рабочыя Гродна і Брэста. У Брэсце быў створаны камітэт дапамогі, які збіраў сродкі для сем'яў ахвяр расстрэлу. Барацьба працягвалася аж да верасня 1939г.

Працоўныя Савецкай Беларусі, якія ў большасці сваёй верылі, што будуюць новы справядлівы грамадскі лад, са спачуваннем адносіліся да сваіх суайчыннікаў у Заходняй Беларусі, выказвалі салідарнасць у іх барацьбе за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне і аб'яднанне ў адзіную сям'ю. Па ўсёй БССР праводзіліся палітычныя акцыі ў падтрымку заходнебеларускага насельніцтва. У Мінску пастаянна дзейнічала бюро дапамогі камуністам і ўсім змагарам Заходняй Беларусі. Істотную падтрымку змагарам аказвалі і за межамі БССР. У абарону правоў заходніх беларусаў выступалі працоўныя Масквы, Ленінграда, Кіева і іншых гарадоў. Яны гатовы былі даць гасцінны прытулак усім тым, каго праследавалі польскія ўлады, дапамагалі палітэмігрантам уключыцца ў мясцовае жыццё, увайсці ў працоўны калектыў, атрымаць адукацыю. Салідарнасць насельніцтва БССР з беларусамі Польшчы асабліва праявілася ў першай палавіне 30-х гадоў, калі па ініцыятыве бальшавікоў многія прадпрыемствы і ўстановы рэспублікі выступалі з патрабаваннямі да польскіх улад спыніць тэрор у Заходняй Беларусі. З заклікам далучыцца да голасу пратэсту яны звярталіся да пралетарыяту Англіі, Германіі, Францыі. У дапамогу насельніцтва ў Заходняй Беларусі збіраліся грашовыя сродкі.

У авангардзе рэвалюцыйна-вызваленчага руху працоўных Заходняй Беларусі ішла КПЗБ. Да 1933 г. яна налічвала 4 тыс. членаў. Апрача гэтага, каля 3 тыс. камуністаў знаходзіліся ў турмах. У Беластоку і Вільні, Гродне і Брэсце партыя выдавала газету «Чырвоны сцяг» і часопіс «Бальшавік». На працягу ўсёй сваёй дзейнасці яна працавала разам з Камуністычнай партыяй Польшчы. Польскія камуністы аказвалі КПЗБ дапамогу вопытнымі кадрамі і літаратурай, падтрымлівалі вызваленчы рух заходнебеларускіх працоўных, іх імкненне да ўз'яднання з працоўнымі Савецкай Беларусі. Са свайго боку КПЗБ з'яўлялася ініцыятарам кампаніі

Репозиторий ВГУ

салідарнасці ў Заходняй Беларусі з барацьбой польскіх рабочых і сялян. Яна рашуча выступала супраць антысавецкай знешняй палітыкі польскіх кіруючых колаў, у абарону СССР. На чале кіраўніцтва КПЗБ стаялі такія выпрабаваныя змагары, як І.К. Лагіновіч (П. Корчык), С. Бужынскі, А.А. Альшэўскі, А.С. Славінскі і інш. У яе радах атрымалі выхаванне кіраўнікі рэвалюцыйнай моладзі В.З. Харужая, М.М. Дворнікаў, С.В. Прытыцкі, В.З. Царук, В.З. Корж і інш. Сярод іх выраслі вядомыя беларускія пісьменнікі М. Танк (Я.І. Скурко), П.С. Пестрак, В.П. Таўлай, М. Васілёк [5, с. 188].

У сярэдзіне 30-х гадоў, калі набіраў абароты махавік сталінскіх рэпрэсій, шмат партыйных актывістаў было несправядліва абвінавачана ў здрадніцтве і падвергнута суровым пакаранням. У 1936–1937 гг. былі арыштаваны, выкліканыя ў СССР, кіруючыя работнікі КПЗБ: І.К. Лагіновіч, М.С. Майскі, М.П. Маслоўскі, А.С. Славінскі, В.З. Харужая, шэраг іншых камуністаў. Большасць з іх загінула ў турмах або лагерах. Гэта быў удар па нацыянальна-вызваленчаму руху ў Заходняй Беларусі, у выніку чаго ён аслаб і не мог павесці за сабой працоўных у барацьбе за ўз’яднанне з БССР. Беспадстаўнасць гэтага акта была прызнана ўжо ў 1939 г., калі Сакратарыят Выканаўчага камітэта Камуністычнага Інтэрнацыяналу (ІККІ) прыняў рашэнне аб узнаўленні КПП і ў яе складзе КПЗБ і КПЗУ [5, с. 191]. Аднак пастанова засталася нявыкананай.

Спасылкі

1. Республика Беларусь: Энциклопедия: в 6 т. Т.1 / редкол.: Г.П. Пашков и др. – Мінск: БелЭн, 2005. – 1040 с.: илл.

2. Аб 50-годдзі ўз’яднання Заходняй Беларусі з Беларускай ССР / даклад М.І. Дземянцея // Віцебскі рабочы. – 1989. – 14 ліст. – С. 1.

3. Мандрык, І.У. Запаветная мара / І.В. Мандрык // Віцебскі рабочы. – 1989. – 14 лістапада. – С. 3.

4. Мандрык, І.У. Гісторы Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.У. Мандрык. – Віцебск: УА ФПБ “МІПСА”, 2009. – 276 с.

5. Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты / сост. Ю.П. Смирнов, Н.С. Сташкевич; под ред. Р.П. Платонова. – Мн.: Университетское, 1990. – 446 с.

## ТЭМА 13. Сусветнае становішча напярэдадні і на пачатку Другой сусветнай вайны

1. Перадваенны крызіс , пачатак Другой сусветнай вайны.
2. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

**1. Перадваенны крызіс, пачатак Другой сусветнай вайны.** Міжнародныя абставіны ў 1933–1937 гг. характарызуюцца крайнім абвастрэннем супярэчнасцей. Зноў жа, як і перад Першай сусветнай вайной, назіраюцца цяжкія вынікі сусветнага эканамічнага крызісу.



Репозиторий ВГУ

Эканоміка найбольш буйных краін адкінута назад на некалькі дзесяцігоддзяў. Прамысловая вытворчасць ЗША у канцы 1932 г. складала 50% ад аб'ёму 1929 г. Англія па выплаўцы чыгуну была адкінута да ўзроўню 1848–1864 гг. Рабочы клас спазнае голад, іншыя бедствы, вядзе барацьбу за паляпшэнне ўмоў жыцця. Расце ўплыў сацыялістычных і камуністычных партый, якія абяцаюць палепшыць стан працоўных. У той жа Германіі ў 1932 г. Камуністычная партыя сабрала на выбарах у Рэйхстаг прыкладна 6 млн галасоў. У адказ на левы радыкалізм у краінах бярэцца курс на поўнае знішчэнне інстытутаў буржуазнай дэмакратыі. Устанаўліваюцца рэжымы адкрытай дыктатуры, найбольш рэакцыйных колаў буйнога фінансавага капіталу, якія абапіраюцца на нацысцкія партыі. Фашызм супраць пастаўляе сябе не толькі камунізму, але і парламенцкай дэмакратыі. Фашысты выступаюць за парадак, дысцыпліну і задушэнне ўсякага голасу пратэсту.

У ліку першых паддаюцца нацыяналістычнай прапагандзе італьянцы. Праграмы стварэння новых рабочых месц і іншыя сацыяльныя мерапрыемствы забяспечылі лідэру італьянскіх фашыстаў Б. Мусаліні шырокую народную падтрымку. У 1922 г. ён прыходзіць да ўлады ў гэтай краіне. Італьянскі фашызм паслужыў узорам для падобных рухаў у іншых еўрапейскіх краінах. Дыктатары прыходзяць да ўлады ў Балгарыі, Югаславіі, Аўстраліі, Польшчы, Партугаліі, Румыніі, Венгрыі. У 1936 г. генерал Б.Франка ў выніку мецяжу звяргае рэспубліканскі ўрад у Іспаніі і пры падтрымцы італьянцаў і немцаў атрымлівае перамогу.

У найбольш завершанай форме тэрарыстычная дыктатура манаполій знайшла сваё выражэнне ў германскім фашызме. Карыстаючыся агульным эканамічным хаосам, а таксама ўмела выкарыстоўваючы настальгію шматлікіх немцаў, А. Гітлер і яго нацыянал-сацыялістычная партыя заваёўваюць усё больш галасоў на выбарах.

У студзені 1933 г. прэзідэнт Веймарскай рэспублікі Пауль фон Гіндэнбург назначыў Гітлера рэйхсканцлерам. У Германіі ўсталёўваецца рэжым нацысцкай дыктатуры. Пад уздзеяннем нацысцкай прапаганды ў студзені 1935 г. 90% жыхароў Саарскай вобласці выказаліся за далучэнне да Германіі. Праз два месяцы Гітлер аб'явіў аб узнаўленні ўсеагульнай воінскай павіннасці, што супярэчыла Версальскаму мірнаму дагавору. У сакавіку 1936 г. Германія выступіла супраць Лакарнскіх дагавораў і ўвяла войскі ў Рэйнскую зону, якая была дэмілітарызавана ў 1918 г.

У выніку змовы А. Гітлера з Б. Мусаліні, Н. Чэмберленам і Э. Даладзье ў Мюнхене ў верасні 1939 г. было вырашана пытанне Чэхаславацкіх Судзет, якія адыходзілі да Германіі, а ў сакавіку нямецкія войскі ўступілі ў Прагу [1, с. 332]. Дэмакратычныя краіны, у прыватнасці Англія і Францыя, аказаліся няздольнымі змагацца са з'яўленнем усё новых дыктатур. Фашысцкія рухі развіваюцца, у барацьбу з імі ўступаюць камуністычныя партыі, якія ўваходзяць у Камінтэрн. Еўропа апынулася

напярэдадні Другой сусветнай вайны. Палітыка і ідэалогія фашызму адлюстроўвалі імкненне імперыялістычнага капіталу Германіі да сусветнага панавання. У аснову палітыкі германскага фашызму была пакладзена тэорыя “жыццёвай прасторы”. Яе сутнасць: “цяжкае становішча нямецкіх працоўных выклікана празмернай шчыльнасцю насельніцтва ў Германіі, недастатковай яе тэрыторыяй. І таму адзіным сродкам паляпшэння жыцця народа ёсць пашырэнне “жыццёвай прасторы”. Гэта заклік да захопу чужых зямель. Такім чынам, захоп новых тэрыторый для насельніцтва Германіі як бы меў усеагульную карысць.

Японскі імперыялізм, які ўступіў на шлях навукова-тэхнічнай рэвалюцыі са спазненнем, па тэмпах развіцця да гэтага часу пакінуў сваіх канкурэнтаў далёка ззаду. Рэзка ўзрасла яго агрэсіўнасць.Прыкладна такое ж становішча і ў Італіі. Тры маладыя “драпежнікі” імкнуцца да перадзелу свету за кошт Англіі, ЗША, Францыі, СССР і іншых краін.

Да 1937 года грунтоўна склаўся блок агрэсіўных дзяржаў – так званая “Вось” – Берлін – Рым – Токіа. Германія, Італія і Японія выйшлі з Лігі нацый. Да вясны 1941 г. Германія і Італія захапілі 11 дзяржаў Еўропы з насельніцтвам 142 млн чалавек. СССР выступаў у гэты час за калектыўную бяспеку, стварэнне адзінага фронту супраць агрэсіі. У 1935 г. падпісаны дагавор аб узаемнай дапамозе з Францыяй і Чэхаславакіяй. Але стварыць сістэму калектыўнай бяспекі ў Еўропе не ўдалося. Перагаворы паміж СССР, Англіяй і Францыяй зайшлі ў тупік. Кіруючыя колы Англіі і Францыі не змаглі заняць дакладную пазіцыю і праявіць гатоўнасць да кампрамісаў перад пагрозай фашызму. Яны узялі курс на “умиротворение агресора”. Яго сэнс заключаўся ў тым, каб цаной уступак накіраваць агрэсію Германіі на Усход і аслабіць яе націск на Захадзе. Далейшае ўзрастанне напружанасці міжнароднага становішча, перспектыва палітычнай ізаляцыі і магчымай вайны на два фронты стала вымушаным крокам заключэння СССР з Германіяй 23 жніўня 1939 г. пакта аб ненападзенні. Пасля чаго фашысцкая Германія перастала асцерагацца ўзброенага адказу на свае агрэсіўныя дзеянні з боку СССР.

Што тычыцца Беларусі то тут напярэдадні вайны пражывала прыкладна 10,5 млн чалавек. Тэрыторыя 225,7 тыс. км кв была разбіта на 10 абласцей [1, с. 342]. Большасць насельніцтва падзяляла курс бальшавікоў на будаўніцтва сацыялізму і падтрымлівала афіцыйную ўнутраную дзяржаўную і міжнародную палітыку. Апошнія перадваенныя гады праходзілі ў напружанай працы грамадзян рэспублікі за ажыццяўленне планаў трэцяй пяцігодкі. У сувязі з ускладненнем міжнароднага становішча ў чэрвені 1940 г. быў зацверджаны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР “Аб пераходзе на 8-гадзінны рабочы дзень (з 7-гадзіннага) і 7-дзённы тыдзень і аб забароне самавольнага ўходу рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў”. Рабочы час кожнага працоўнага павялічваўся ў месяц у сярэднім на 33 гадзіны.



Рэпазіторый ВДУ

Устанаўлівалася больш жорсткая адказнасць за выпуск недабраякаснай прадукцыі, крымінальная адказнасць за дробныя крадзяжы, парушэнні ўнутранага распарадку на працы. Ва ўмовах нарастаючай ваеннай небяспекі працоўныя краіны бездакорна прынялі гэтыя рашэнні. На заводах, фабрыках, установах, калгасах і саўгасах прымаліся павышаныя абавязацельствы. Прадпрыемствы прамысловасці і транспарту выконвалі дзяржаўныя планы, дабіваліся высокіх канчатковых вынікаў. Узрасла актыўнасць сялянства: сярэдняя выпрацоўка працадзён на аднаго працаздольнага калгасніка да пачатку 1941 г., у параўнанні з 1937 г., паднялася на 30% [2, с. 50]. Суадносіны працы калгаснікаў у грамадскай і асабістай гаспадарцы памянялася на карысць грамадскай.

Вайна не дазволіла беларускаму народу завяршыць выкананне плана трэцяй пяцігодкі. Аднак папярэднія дадзеныя аб росце эканомікі да сярэдзіны 1941 г. сведчуць аб тым, што ў асноўным народнагаспадарчыя задачы пяцігодкі вырашаліся паспяхова.

**2. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.** У верасні 1939 г. знешнепалітычнае становішча Польшчы рэзка змянілася. Гібельнай для яе стала адмова Лондана і Парыжа ад практычнай рэалізацыі дагавора 1938 г. аб узаемадапамозе з Варшавай у выпадку агрэсіі з захаду. Але, на думку гіторыкаў і ваеннай эліты, канчаткова лёс Польшчы вырашыў заключаны 23 жніўня 1939 г. паміж СССР і Германіяй пакт аб ненападзе, які быў дапоўнены сакрэтнымі пратаколамі. Згодна з пратаколамі, тэрыторыя Польшчы і шэрагу іншых краін падзялялася на сферы ўплыву СССР і Германіі. Устанаўлівалася, што мяжа гэтых сфер павінна праходзіць па лініі рэк Нарэў, Буг, Вісла, Сан.

Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна прызнаваліся сферай інтарэсаў СССР. Пакт ад 23 жніўня 1939 г. развязаў рукі Германіі на Усходзе. 1 верасня 1939 г. гітлераўская Германія напала на Польшчу, распачаўшы тым самым Другую сусветную вайну. Маючы велізарную ваенную перавагу ў жывой сіле і тэхніцы, фашысцкія войскі хутка рухаліся ў напрамку да граніцы СССР. Германіяй была акупіравана амаль уся тэрыторыя Польшчы, яе войскі падступілі да межаў Заходняй Беларусі і нават занялі некаторыя яе населеныя пункты, у тым ліку і Брэст (затым ў адпаведнасці з раней дасягнутай дамоўленасцю з Германіяй аб дэмаркацыйнай лініі нямецкія войскі пакінулі Брэст).

Пасля таго, як урад Польшчы эмігрыраваў у Румынію, польскаму паслу ў Маскве была ўручана нота ўрада СССР, дзе гаварылася аб тым, што Галоўнаму камандаванню Чырвонай Арміі аддадзены загад перайсці савецка-польскую мяжу, узяць пад сваю абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі [3, с. 1]. Гэта рашэнне з адабрэннем было сустрэта савецкімі людзьмі. У час уступлення Чырвонай Арміі да бальшых баёў справа не даходзіла. Большасць

Рэпазіторый ВДУ

беларускіх палітыкаў, а больш усяго народныя масы гарадоў і вёсак Заходняй Беларусі, радасна і з надзеяй сустракалі Чырвоную Армію [4, с. 2–3]. У шэрагу месц яшчэ да прыходу савецкіх войск імі раззбройваліся паліцыя і асаднікі. У гарадах узніклі часовыя ўпраўленні, у склад якіх увайшлі і прадстаўнікі Чырвонай Арміі. Яны бралі ў свае рукі кіраўніцтва усім палітычным, гаспадарчым і культурным жыццём у занятых раёнах, разгортвалі шырокую кампанію ў падтрымку Савецкай улады. У вёсках з'явіліся сялянскія камітэты, якія прыступілі да размеркавання памешчыцкіх зямель і інвентару сярод сельскага насельніцтва. Для ўстанаўлення і падтрымання рэвалюцыйнага парадку ў гарадах і мястэчках арганізоўвалася рабочая гвардыя, якая стала апорай новай улады. Падобныя органы стваралiся ў сельскай мясцовасці – «сялянская» міліцыя. Амаль паўсюдна ставіліся трыумфальныя аркі ў гонар вызваліцеляў. Прычына такіх паводзінаў з боку насельніцтва нам вядома з папярэдняга матэрыялу: беларускае насльніцтва за 1921–1939 гг. адчула на сабе паліцэйскія рэпрэсіі, эканамічны, нацыянальны і рэлігійны прыгнёт. Адразу пасля вызвалення праводзілася вызваленне з турмаў камуністаў і дзеячаў шматлікіх беларускіх палітычных і грамадскіх арганізацый.

Да 25 верасня савецкія войскі поўнасцю занялі Заходнюю Беларусь. Па дамоўленасці з Германіяй яны спыніліся каля лініі Гродна–Ялаўка–Няміраў–Брэст і далей на поўдзень. Гэта мяжа і была замацавана Дагаворам аб дружбе і граніцы ад 28 верасня 1939 г. паміж СССР і Германіяй. Пасля заняцця Чырвонай Арміяй Заходняй Беларусі тут пачалося ўстанаўленне савецкага ладу. На шматлікіх мітынгах і сходах насельніцтва праводзіліся рашэнні аб стварэнні органаў Савецкай улады і ўз'яднанні Заходняй Беларусі з БССР. Паўсюдна ствараліся партыйныя камітэты. На кіруючыя пасады прызначаліся камуністы з Усходу. Згодна даследванняў польскага гісторыка Я.Мірановіча, ад часу далучэння і на працягу 1940 г. з Усходу прыехала 4500 партыйных функцыянераў, 6200 камсамольцаў. Апроч гэтага, каб арганізаваць грамадскае жыццё паводле мадэлі, што існавала ў БССР, у заходнія вобласці прыехала шмат настаўнікаў, спецыялістаў савецкай адміністрацыі, гаспадаркі і культуры. Агулам, да кастрычніка 1940 г. у Заходнюю Беларусь дэлегіравана 31 тыс. цывільных работнікаў [5, с. 112]. У кастрычніку 1940 г. ЦК КПБ даў згоду на прызначэнне на кіруючыя пасады ў дзяржаўны апарат людзей з мясцовых жыхароў. У выніку да 21 чэрвеня 1941г. на работу ў аблвыканкамы, райвыканкамы і сельскія саветы прыйшло больш за 18 тыс. чалавек, у іх ліку 10245 палякаў, 4451 беларус, 3045 яўрэяў і 329 расійцаў. Значна высокая лічба палякаў вызначана іх лепшай адукаванасцю, што яшчэ раз падкрэслівае прыгнечанне беларусаў "за польскім часам". Савецкая ўлада, як бачна, прымяняла прынцып роўнасці нацый, але прынцыпова не брала на кіруючыя пасады людзей, якія раней працавалі ў польскай адміністрацыі.

22 кастрычніка 1939 г. прайшлі выбары ў Народны сход, які павінен быў у заканадаўчым парадку вырашыць пытанне аб уладзе. У выніку ва ўстаноўчы орган Заходняй Беларусі ўвайшлі прадстаўнікі працоўных слаёў насельніцтва ўсіх нацыянальнасцей. Народны сход Заходняй Беларусі адбыўся 28–30 кастрычніка 1939 г. у Беластоку. Згодна з дакладам С.В. Прытыцкага, была прынята дэкларацыя аб устанаўленні ў Заходняй Беларусі Савецкай улады. Сход вынес таксама рэзалюцыю аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў склад БССР, аб канфіскацыі памешчыцкіх зямель, аб нацыяналізацыі банкаў і буйной прамысловасці. Дэлегаты звярнуліся ў Вярхоўны Савет СССР з просьбай аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад Савецкага Саюза і ўз'яднанні яе з БССР.

Нечарговая V сесія Вярхоўнага Савета СССР 2 лістапада 1939 г. прыняла Закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза ССР і ўз’яднанні яе з БССР. Нечарговая III сесія Вярхоўнага Савета БССР вітала рашэнне Вярхоўнага Савета СССР і прыняла Заходнюю Беларусь у склад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі [6, с. 2]. У выніку тэрыторыя рэспублікі павялічылася са 125,5 тыс. кв. км. да 225,7 тыс., насельніцтва вырасла прыкладна ў два разы і ў канцы 1940 г. склала больш за 10 млн чалавек. На тэрыторыі былой Заходняй Беларусі было ліквідавана ранейшае адміністрацыйнае дзяленне і створана пяць абласцей – Баранавіцкая, Брэсцкая, Вілейская, Пінская і Беластоцкая.

16 лістапада 1939 г. паміж урадамі СССР і Германіі было заключана пагадненне аб перасяленні, у прыватнасці, асоб беларускай нацыянальнасці з польскіх тэрыторый, акупіраваных трэцім рэйхам, на беларускія землі, што адышлі да СССР.

У заходніх абласцях Беларусі разгарнуліся сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. Перш за ўсе пачалося размеркаванне памешчыцкіх зямель. Павялічвалася плошча дробных сялянскіх гаспадарак, быў адкрыты вольны доступ да лясоў. Выразна палепшылася матэрыяльнае становішча вясковага насельніцтва. Адбылося гэта за кошт змяншэння павіннасцяў і зніжэння цэнаў на прамысловыя тавары. Вялікая колькасць войска, якая канцэнтравалася тут, выклікала падвышаны попыт на харчовыя прадукты і гэтым самым стварыла сялянам магчымасць дадатковага заробку.

Згодна з пяцігадовым планам праводзілася тэхнічная рэканструкцыя старых і закладка новых прамысловых прадпрыемстваў. Заметна павялічыўся аб’ём прадукцыі мясцовай прамысловасці. За сем месяцаў першага года існавання савецкай улады быў адноўлены Днепра-Бугскі канал працягласцю ў 201 км, тады як Польшча не здолела зрабіць гэта на працягу 20 гадоў. Да сярэдзіны 1941 г. у 2 разы вырасла выпрацоўка электраэнергіі, у 2,5 разы – абутку. Было ліквідавана беспрацоўе. 30 тыс. сялянскіх двароў былі «аб’яднаны» ў калгасы. Але палітыка



Рэпазіторый ВГУ

калектывізацыі тут праводзілася асцярожна, шляхам абмежавання праз падатковую сістэму.

У снежні 1939 г. СНК БССР прыняў пастанову “Аб мерах арганізацыі асветы ў Заходніх абласцях Беларускай рэспублікі”, якая дазволіла ствараць школы з такой мовай выкладання, якая б адпавядала нацыянальнаму складу дадзенай тэрыторыі і спадзяванням насельніцтва. Узрасла колькасць агульнаадукацыйных школ: у 1939 навучальным годзе тут працавала 5633 школы, з іх на беларускай мове – 4268, польскай – 923, расійскай – 173, ідыш – 150, літоўскай – 61, украінскай – 49 [7, с. 359–362].

Тое, што савецкая ўлада на гэтым этапе дала права на нацыянальнае развіццё асветы, бачна з таго, што ў Беластоцкай вобласці, дзе палякаў была большасць, на польскай мове працавала 58,7% школ, на беларускай толькі 33,8%, на ідыш – 4,5%, расійскай – 1,7%. Асвета у памеры 7 класаў была абавязковай і бясплатнай. Для забеспячэння школ і народнай гаспадаркі кадрамі было адкрыта 12 тэхнікумаў, 4 інстытуты. Адкрыта 5 драматычных тэатраў, 100 кінатэатраў. За 1939–1941 гг. колькасць кінатэатраў павялічалася ў 3 разы, працавалі перасовачныя кінаустаноўкі. Рухомы вобраз на сцэне большасць сялян убачылі ўпершыню. У кожнай вялікай вёсцы працавалі гурткі мастацкай самадзейнасці, хоры, музыкальныя, танцавальныя калектывы. Выхаваўчую і адукацыйную ролю выконвалі літаратура і друк – у кожным раёне стала выдавацца газета.

Факт уключэння Заходняй Беларусі ў склад БССР яшчэ недастаткова ацэнены гістарычнай навукай. Безумоўна толькі тое, што ў тых канкрэтных умовах як знешняга, так і ўнутранага характару, ён меў усё ж такі станоўчае значэнне для беларускага народа. На этапе 1921–1939 гг. беларусы зведалі трагізм падзеленасці нацыянальнай тэрыторыі – на Савецкую і Заходнюю Беларусь. У Польшчы на практыцы ажыццяўляліся найгоршыя і самыя брутальныя метады асіміляцыі славянскіх меншасцяў. Беларусаў лічылі людзьмі ніжэйшай катэгорыі , адсталым, прымітыўным народам, які трэба перавесці ў палякаў. На працягу ўсяго часу працоўныя Заходняй Беларусі вялі барацьбу з усталяваным рэжымам. Пасля ўваходжання на тэрыторыю Заходняй Беларусі Чырвонай Арміі тут вядзецца ўстанаўленне савецкага ладу, прымаюцца заканадаўчыя акты аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад Саюза ССР і ўз'яднанні з БССР. Палітыка ўлады да новых зямель і іх насельніцтва нічым ні адрознівалася ад той, што склалася ў БССР у папярэднія савецкія часы.

Спасылкі

1. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): вучэб. дап. / В.І. Галубовіч [і інш.]; 2-е выд., выпр. пад рэд. В.І. Галубовіча, Ю.М. Бохана. – Мінск: Сучасная школа, 2007. – 472 с.

2. История Коммунистической партии Советского Союза: в 6 т. гл. ред.: П. Поспелов (пред.) [и др.], Т. 5. Кн. 1. Коммунистическая партия накануне и в годы Великой Отечественной войны, в период упрочения и развития социалистического общества (1938–1958 гг.). Книга первая (1938–1945 гг.). – М., Политиздат, 1970. – 723 с. с илл.



Репозиторий ВГУ

3. Советская Белоруссия. – 1939. – 18 сент.
4. Мандрык, І.У. Запаветная мара / І.У. Мандрык // Віцебскі рабочы. – 1989. – 14 ліст.
5. Мірановіч, Я. Найноўшая гісторыя Беларусі / Я. Мірановіч; навук. рэд. А. Краўцэвіч. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2003. – 243 с: іл.
6. Аб 50-годдзі ўз'яднання Заходняй Беларусі з Беларускай ССР / даклад М.І. Дземянцея // Віцебскі рабочы. – 1989. – 14 ліст. – С. 2.
7. Народное образование в БССР. 1928–1941, сб. док. и материалов. – Т. 2. – Мн., 1980.

## Тэма 14. Нападзенне фашысцкай Германіі на СССР. Крах гітлераўскай стратэгіі "бліцкрыга"

1. Абарончая беларуская аперацыя.
2. Мабілізацыя сіл і сродкаў краіны для барацьбы з фашысцкай агрэсіяй.
3. Прычыны няўдач Чырвонай Арміі летам–восенню 1941 г.
4. Крах гітлераўскай стратэгіі «бліцкрыга» і маланкавай вайны супраць СССР.

**1. Абарончая беларуская аперацыя.** Абарончая беларуская аперацыя бярэ пачатак з першага дня вайны 22 чэрвеня 1941 г. і працягваецца па 9 ліпеня 1941 г. Згодна з планам вайны супраць СССР, выкладзенага ў сакрэтнай дырэктыве № 21, варыянт "Барбароса", (падпісан Гітлерам 18 снежня 1940 г.), каля 40 нямецкіх дывізій групы арміі "Цэнтр" з раніцы 22 чэрвеня вялі наступленне на дывізіі першага эшалона Чырвонай Арміі. Тэрыторыя Беларусі, як і тэрыторыя іншых памежных раёнаў СССР, стала арэнай жорсткіх баявых дзеянняў. Сілы праціўніка па колькасці ў 1,5 разы пераўзыходзілі войска СССР (у жывой сіле).

Гераічна змагаліся з ворагам пагранічнікі, лётчыкі, прадстаўнікі ўсіх родаў войск. Паміралі, але не пакідалі баявыя пазіцыі воіны пагранічных застаў, якімі камандавалі афіцэры М.К. Ішкоў, А.М. Кіжаватаў, І.Г. Ціханаў [1, с. 389]. 22 чэрвеня 1941 г. на паўночным захадзе ад Гродна 3-я пагранзастава пад камандаваннем начальніка заставы лейтэнанта В.М. Усава 10 гадзін адбівала атакі пераўзыходзячых сіл праціўніка, каля вёскі Галавенчыцы байцы 1-й пагранзаставы на чале з малодшым лейтэнантам А.М. Сівачовым 11 гадзін вялі няроўны бой, каля вёскі Драгунь 5 варожых атак адбілі пагранічнікі 4-й заставы на чале з лейтэнантам Ф.П. Кірычэнка. Амаль усе пагранічнікі названых застаў загінулі ў няроўным баі з захопнікамі. Панеслі значныя страты і акупанты.

На працягу першага дня вайны ў паветраных баях было збіта больш за 100 нямецкіх самалётаў. Лётчык Д.В. Кокараў, каб не даць ворагу скінуць бомбы на мірны горад, пайшоў на паветраны таран. Такі ж геройскі ўчынак здзейснілі лётчыкі П.С. Рабцаў, А.С. Данілаў, С.М. Гудзімаў.

Репозиторий ВГУ

Усяму свету вядома гераічная абарона Брэсцкай крэпасці. У поўным акружэнні, без вады і ежы, пры вострай нястачы боепрыпасаў і медыкаментаў гарнізон крэпасці больш месяца змагаўся з ворагам. Абаранялі цытадэль над Бугам прадстаўнікі больш 30 нацыянальнасцяў СССР. Аб мужнасці салдат і афіцэраў сведчаць надпісы, якія захаваліся на сценах крэпасці: «Нас было трое, нам было цяжка, але мы не палі духам і паміраем як героі», «Паміраю, але не здаюся! Бывай, Радзіма!». Абаронцаў крэпасці ўзначальвалі камандзіры і палітработнікі: у тым ліку маёр П.М. Гаўрылаў, капітан І.М. Зубачоў, палкавы камісар Я.М. Фамін, капітан У.У. Шаблоўскі, палітрукі П.П. Кашкароў, С.С. Скрыпнік, сяржант Т.Г. Грабянюк і інш, у асобных выпадках – радавыя байцы. Яны здолелі згуртаваць сілы абаронцаў і стварыць з іх баявыя групы і атрады. За бессмяротны подзвіг, які здзейснілі абаронцы Брэсцкай крэпасці, ёй было прысвоена ганаровае званне «Крэпасць-герой».

Цяжкія баі савецкія войскі вялі ў раёне Гродна, Ваўкавыска, Кобрына, Пружан. Становішча для Чырвонай Арміі ў першыя дні ўскладнялася вялікай стратай самалётаў. Бомбавым ударам падвергліся 26 аэрадромаў, дзе базіраваліся навейшыя тыпы самалётаў. У першы дзень вайны Ваенна-паветраныя Сілы СССР страцілі 1200 баявых самалётаў, з іх 738 баявых машын , што непасрэдна дыслацыраваліся ў Заходняй ваеннай акрузе (38% ад усяго ліку). У цяжкіх умовах значнай перавагі ворага ў паветры савецкія лётчыкі здзейснілі гераічныя ўчынкі. Экіпаж бамбардзіроўшчыка пад камандаваннем капітана М.Ф. Гастэлы накіраваў свой падбіты самалёт у калону нямецкіх танкаў і аўтамашын ( усяго ў гады вайны савецкія лётчыкі правялі каля 100 таранаў па наземных цэлях). Масавы гераізм воінаў Чырвонай Арміі не застаўся без урадавай адзнакі. Згодна з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, першымі званне Героя Савецкага Саюза атрымалі лётчыкі-знішчальнікі С.І. Здараўцаў, М.П. Жукаў, П.Т. Харытонаў [2, с. 150].

Напружаныя баі ў канцы чэрвеня 1941 г. разгарнуліся на подступах да беларускай сталіцы. Нягледзячы на мужнасць і гераізм савецкіх салдат і афіцэраў, 28 чэрвеня 1941 г. нямецка-фашысцкія войскі ўвайшлі ў Мінск. У акружэнні ворага апынуліся больш за 300 тыс. салдат і камандзіраў, шмат баявой тэхнікі, зброі, вайсковай маёмасці. Толькі частка воінаў змагла прабіцца з акружэння, а частка засталася ў лясах і потым перайшла да партызанскай барацьбы. Людскія страты войск Заходняга фронту (рашэнне аб пераўтварэнні асобнай Заходняй ваеннай акругі ў Заходні фронт прынята ў першы дзень вайны) і Пінскай ваеннай флатыліі склалі 418 тыс. чал [3, с. 80].

У складанай ваенна-стратэгічнай сітуацыі ў ліпені 1941 г. войскі Заходняга фронту ажыццявілі шэраг контрудараў. 6 ліпеня адбыўся адзін з найбуйнейшых у пачатковым перыядзе вайны танкавых баёў, у якім з абодвух бакоў ўдзельнічала больш за 1500 машын. Войскі 20-й арміі пад

Рэпазіторый ВДУ

камандаваннем генерала П.А. Курачкіна нанеслі контрудар у напрамку Сянно–Лепель. Вораг панёс вялікія страты, быў адкінуты на 30–40 км. Але з рычыны нездавальняючага ўзроўню яго арганізацыі і слабага прыкрыцця з паветра ён поспеху не меў, часткі Чырвонай арміі вымушаны былі адступіць у раён Оршы [4, с. 40].

Пасля замены кіраўніка Заходняга фронту (быў змешчаны Д. Паўлаў, з 1 ліпеня 1941 г. камандуючым прызначаны С.К. Цімашэнка) прымаліся захады, каб спыніць наступленне фашыстаў, але стварыць суцэльнага фронту абароны не ўдалося. Пад вечар 9 ліпеня танкавыя і матарызаваныя дывізіі 4-й арміі праціўніка падышлі да рубяжа Заходняй Дзвіны і Дняпра на ўсім фронце ад Полацкага ўмацаванага раёна да Жлобіна. Слаба абсталяваныя стыкі войск Чырвонай Арміі ліквідаваць у гэты час не ўяўлялася магчымым. З-за гэтага праціўніку ўдалося 9 ліпеня прарваць абарону 20 і 22 армій, а 11 ліпеня – авалодаць Віцебскам.

Затрымліванне войскаў Чырвонай Арміі ад своечасовых адыходаў на больш зручныя рубяжы прывяло да іх акружэння. Больш за 10 дывізій Заходняга фронту трапілі ў цяжкае становішча.

Выключна напружанымі былі баі на рубяжы Дняпра. 13 ліпеня войскі 63-га корпуса пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Л.Р. Пятроўскага фарсіравалі Днепр, вызвалілі Жлобін і Рагачоў і пачалі развіваць наступление на Бабруйск. 14 ліпеня 1941 г. пад Оршай пад камандаваннем капітана І.А. Флёрава магутны, ашаламляльны ўдар па ворагу ўпершыню нанёс дывізіён-батарэя рэактыўных установак, названых пазней "Кацюшамі".

22 ліпеня пачаўся 12-дзённы рэйд па тылах ворага кавалерыйскай групы генерала А.І. Гарадавікова. Былі вызвалены Глуск, Старыя Дарогі, нанесены раптоўны ўдар па Асіповічах. 30 ліпеня быў вызвалены Крычаў. Аднак, не падтрыманыя агульным наступленнем контрудары, у далейшым поспеху не мелі.

На працягу 23 дзён стрымлівалі савецкія войскі націск ворага пад Магілёвам. Непасрэдна абарона горада была ўскладзена на 172-ю стралковую дывізію пад камандаваннем генерал-маёра М.Ц. Раманава. Салдаты і афіцэры мужна змагаліся з браніраванымі полчышчамі танкавай групы Гудэрыяна. Разам з воінамі горад абаранялі атрады народнага апалчэння. Толькі пасля таго як Магілёў быў акружаны фашыстамі, яго абаронцы прарвалі варожае кальцо і адыйшлі на ўсход

Больш за месяц ішлі баі за Гомель. Разам з воінамі супраць ворага змагаўся гомельскі полк народнага апалчэння. 19 жніўня 1941 г., прарваўшы абарону ў раёне Добруша, гітлераўцы ўварваліся ў Гомель, 22 жніўня яны акупіравалі апошні абласны цэнтр БССР Мозыр, 4 верасня – апошні раённы цэнтр г.п. Лельчыцы. Уся тэрыторыя Беларусі апынулася пад нямецка-фашысцкай акупацыяй [3, с. 81]. Абвінавачванне за сітуацыю на Заходнім фронце было ўскладзена на камандаванне і камандзіраў яго



Репозиторий ВГУ

воінскіх злучэнняў. Камандуючага фронтам Д. Паўлава, начальніка штаба В. Клімаўскіх, начальніка сувязі А. Грыгор'ева, камандуючага 4-й арміяй А. Карабкова і іншых ваеннаначальнікаў згодна з прыгаворам Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 22 ліпеня 1941 г. расстралялі.

Кіраўніцтву Германіі і яе ваеннаначальнікам мроілася хуткая перамога. Ужо 3 ліпеня 1941 г. Ф. Гальдар у дзённіку запісаў: «Не будет преувеличением, если я скажу, что поход против России был выигран в течение 14 дней» [5, с. 38]. Ваеннае кіраўніцтва замежных краін таксама не верыла ў станоўчы вынік вайны для СССР. Амерыканскі гісторык Шуман пісаў: "...Заходнія ваенные эксперты ... лічылі, што ў СССР няма шанцаў каб пазбегнуць поўнага разгрому ад фашысцкай Германіі на працягу шасці тыдняў (генерал Маршалл), ці максімум трох месяцаў (англійскі генеральны штаб) [6, с. 280]. Безумоўна, сітуацыя для СССР складавалася крытычная, але з заявай аб перамозе вораг паспяшаўся, а нашы саюзнікі памыліліся.

Падзеі на франтах на першапачатковым этапе вайны, сапраўды, развіваліся не на карысць Чырвонай Арміі. Няўстойлівай аказалася абарона на Паўднёва-Заходнім і на Паўночна-Заходнім франтах. 9 ліпеня 1941 г. салдаты варожай групы армій «Поўнач» узялі Пскоў. Абазначылася небяспека іх прарыву да Лугі, а далей да Ленінграда. У сярэдзіне верасня 1941 г. немцы выйшлі да Фінскага заліва. 15 верасня ў акружэнні апынуліся савецкія войскі Паўднёва-Заходняга фронту. Тым не менш вораг не змог знішчыць асноўны патэнцыял Чырвонай Арміі. У жорсткіх баях на тэрыторыі Беларусі, у раёне Смаленска і ў міжрэччы Дняпра і Бярэзіны савецкія войскі сарвалі стратэгічны план "маланкавай вайны" гітлераўскага камандавання. У такіх умовах група армій «Цэнтр» не змагла выйсці на стратэгічную прастору, каб рухацца на Маскву. 30 ліпеня 1941 г. Гітлер аддаў загад групе армій «Цэнтр» перайсці да абароны. Яго рух на Маскву быў затрыманы на 3 месяцы) [7, с. 332].

**2. Мабілізацыя сіл і сродкаў краіны для барацьбы з фашысцкай агрэсіяй.** Для непасрэднага кіраўніцтва ўзброенай барацьбой на франтах 23 чэрвеня 1941 г. у Маскве было прынята рашэнне аб стварэнні Стаўкі Галоўнага Камандавання, якая пазней пераўтворана ў стаўку Вярхоўнага Галоўнакамандвання пад старшынствам Сталіна. Сталін быў прызначаны наркомам абароны і Вярхоўным Галоўнакамандуючым Узброенымі сіламі СССР.

Канкрэтнай праграмай мабілізацыі сіл і сродкаў краіны на барацьбу з ворагам з'яўлялася дырэктыва СНК СССР і ЦК ВКП(б) партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей ад 29 чэрвеня 1941 г. Савецкі ўрад і ЦК партыі заклікалі "перабудаваць усю работу на ваенны лад, арганізаваць усебаковую дапамогу фронту, павялічыць вытворчасць

зброі, боепрыпасаў, танкаў, самалётаў, пачаць партызанскую барацьбу ў тыле ворага” [8, с. 299].

3 ліпеня 1941 г. у прамове па радыё І. Сталін акрэсліў мерапрыемствы па мабілізацыі сіл і сродкаў краіны для барацьбы з ворагам. У аснову аператыўнай перабудовы дзейнасці партыі, органаў дзяржаўнай улады і кіравання быў пакладзены прынцып максімальнай цэнтралізацыі палітычнага, гаспадарчага і ваеннага кіраўніцтва. 30 чэрвеня 1941 г. ствараецца Дзяржаўны Камітэт Абароны (ДКА) у складзе: І. Сталін (старшыня), В. Молатаў – (намеснік старшыні), К. Варашылаў, Г. Маленкоў, Л. Берыя. Пазней у яго склад былі ўведзены М. Булганін, М. Вазнясенскі, Л. Кагановіч і А. Мікаян. Камітэт валодаў надзвычай вялікай уладай: вырашаў ваенна-стратэгічныя пытанні; прызначаў і здымаў з пасад вышэйшае камандаванне; займаўся падрыхтоўкай ваенных рэзерваў для дзеючай арміі; наладжваў работу прамысловасці, транспарта, сельскай гаспадаркі, забеспячэнне насельніцтва і арміі; займаўся падрыхтоўкай працоўных рэзерваў і размеркаваннем рабочай сілы па вытворчых аб’ектах.

Для аператыўнага кіраўніцтва ваеннай гаспадаркай былі пашыраны правы народных камісарыятаў СССР, саюзных рэспублік, зноў створаны наркаматы танкавай і мінамётнай прамысловасці. Перавод народнай гаспадаркі на ваенныя рэйкі пачаўся з перагляду эканамічных планаў. 30 чэрвеня 1941 г. ЦК УКП(б) і СНК СССР зацвердзілі мабілізацыйны народнагаспадарчы план на трэці квартал 1941 г., які прадугледжваў павелічэнне вытворчасці ваеннай тэхнікі на 26%. У сярэдзіне жніўня быў зацверджаны ваенна-гаспадарчы план на IV квартал 1941 г. і на 1942 г. па раёнах Паволжжа, Урала, Заходняй Сібіры, Казахстана і Сярэдняй Азіі, які адыграў важную ролю ў стварэнні ваенна-прамысловай базы ва ўсходніх раёнах краіны і ў поўнай перабудове народнай гаспадаркі на ваенны лад.

Наступнай састаўной часткай праграмы пераўтварэння краіны ў адзіны баявы лагер з’яўлялася мабілізацыя, разгортванне і павышэнне боегатоўнасці Савецкіх Узброеных Сіл. У кароткі тэрмін патрэбна было разгарнуць шматмільённую армію і зрабіць яе баяздольнай. За першыя 8 дзён вайны ў армію было прызвана 5,3 млн чал. Мабілізацыя праходзіла ў абставінах пытрыятычнага ўздыму. Масавым была падача заяў аб добраахвотным уступленні ў рады Чырвонай Арміі. Да 1 снежня 1941 г. дзеючая армія папоўнілася 291 дывізіяй і 94 брыгадамі.

Формай масавага патрыятычнага руху савецкага народа ў гады вайны сталі знішчальныя батальёны. Ужо 24 чэрвеня 1941 г. СНК СССР прымае пастанову аб стварэнні на добраахвотных пачатках у прыфрантавой паласе знішчальных батальёнаў для барацьбы з дыверсійнымі і дэсантнымі групамі праціўніка. Да канца ліпеня ў СССР было арганізавана 1755 такіх батальёнаў агульнай колькасцю звыш 328 тыс. чал. Усяго за гады вайны ў іх знаходзілася каля 400 тыс. чал.

Репозиторий ВГУ

На Беларусі фарміраванне знішчальных батальёнаў пачалося ў выніку аб'яднання рабочых атрадаў і груп самаабароны, створаных у першыя гадзіны вайны мясцовымі партыйнымі органамі. Да 15 ліпеня 1941 г. у рэспубліцы было створана 78 знішчальных батальёнаў (больш за 13 тыс. чал.) і 300 груп самаабароны (27 тыс. чал.). Знішчальныя батальёны змагаліся з дыверсантамі і паветраным дэсантам ворага, рабілі на дарогах завалы, «воўчыя ямы», ліквідавалі вынікі налётаў варожай авіяцыі, ратавалі матэрыяльныя і культурныя каштоўнасці, праводзілі палітработу сярод насельніцтва, удзельнічалі ў абарончых баях, знішчалі групы праціўніка, якія прарваліся ў савецкі тыл, з'яўляліся папаўненнем Чырвонай Арміі.

Адной з форм масавага патрыятычнага руху савецкага народа, яго непасрэднага ўдзелу ў вайне супраць германскіх захопнікаў было народнае апалчэнне. У кароткі час у апалчэнне запісалася каля 1 млн чалавек. Было створана каля 60 дывізій народнага апалчэння, з якіх 37 у той ці іншы час удзельнічалі ў баях. Безумоўна, апалчэнне з'яўлялася адлюстраваннем натрыятычнага ўздыму насельніцтва. У той жа час дрэнна ўзброеныя і не навучаныя, апалчэнцкія дывізіі ў баях неслі вялікія страты. Істотны ўрон наносіўся і народнай гаспадарцы, паколькі ад вытворчасці адрывалася вялізная колькасць рабочых рук. Невыпадкова, што па меры зніжэння напружання на франтах кіраўніцтва краіны ўсё радзей звярталася да набору апалчэння.

Для авалодання ваеннай справай у краіне была складзена сістэма ўсенавуча. Навучанне праходзілі ўсе мужчыны ва ўзросце ад 16 да 50 гадоў, у першую чаргу дапрызыўнікі і ваеннаабавязаныя запасу, уводзілася ваенная і фізкультурная падрыхтоўка вучняў 8–10 класаў сярэдняй школы. З 29 млн. чал., прызваных за гады вайны ў Чырвоную Армію, праз наладжаную сістэму ўсенавуча прайшлі больш за 7 млн.чалавек.

Вядзенне вайны патрабавала ўзмацнення партыйна- палітычнага ўплыву ў дзеючай арміі. У гэтай сувязі 27 і 29 чэрвеня 1941 г. у ЦК УКП(б) прыняты рашэнні аб мабілізацыі камуністаў і камсамольцаў на фронт у якасці палітбайцоў. Кожны абкам і крайкам УКП(б) павінен быў у трохдзённы тэрмін мабілізаваць ад 500 да 5 тыс. камуністаў і накіраваць іх у распараджэнне наркамата абароны. Толькі ў першы год вайны за 6 месяцаў партыя накіравала ва Узброеныя Сілы не менш за 1 млн камуністаў і каля 2 млн камсамольцаў [2, с. 172]. Каб аблегчыць прыём у партыю воінаў, якія вызначыліся ў баях, ЦК УКП(б) дазволіў паступаючым прадстаўляць рэкамендацыі трох членаў партыі не з 3-гадовым, а з гадавым партыйным стажам. У снежні 1941 г. ЦК УКП(б) пастанавіў прымаць у члены партыі ваеннаслужачых, якія вызначыліся ў баях, па заканчэнні трохмесячнага кандыдацкага стажу. Усяго ў партыю на фронце ўступіла больш за 5 млн чалавек.



Рэпазіторый ВГУ

З першых дзён вайны намаганні палітыка-выхаваўчай работы былі сканцэнтраваны на рашэнні трох галоўных задач: выхаванне непрымірымай нянавісці да захопнікаў; цвёрдай упэўненасці ў непазбежнасці перамогі; гатоўнасці ісці на любыя ахвяры і страты дзеля разгрома ворага. Рабілася пастаяннае і аператыўнае інфармаванне насельніцтва аб падзеях на фронце і ў тыле. Створана Савецкае Інфармацыйнае Бюро, звесткі якога перадаваліся па радыё 5 разоў у дзень, былі павялічаны тыражы цэнтральных газет.

Праграма ператварэння краіны ў адзіны баявы лагер уключала ў сябе разгортванне партызанскага руху і стварэнне партыйна-камсамольскага падполля на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі. Паколькі гэтае пытанне з'яўляецца ў найбольшай ступені актуальна для нашай рэспублікі, яно будзе разгледжана праз асобную тэму.

Важнае значэнне ў выкананні задач па стварэнні магутнай гаспадаркі мела перамяшчэнне прамысловага абсталявання і людзей з прыфрантавых абласцей на усход краіны. Для рашэння задач эвакуацыі вытворчых сіл з прыфрантавых раёнаў на ўсход краіны быў створаны Савет па эвакуацыі пры СНК СССР у складзе Н.М. Шверніка (старшыня), А.М. Касыгіна, А.І. Мікаяна. У Беларусі згодна з рашэннем ЦК КП(б)Б і Саўнаркома БССР 25.06.1941 г. была арганізавана Цэнтральная эвакуацвйная камісія пры СНК БССР (кіраўнік – старшыня СНК БССР І.С. Былінскі), якая ўзначаліла работу па Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і Палескай абласцях. Усяго з тэрыторыі Беларусі ва ўсходнія раёны краіны было адпраўлена абсталяванне і кадры 124 буйных прамысловых прадпрыемстваў, 14 прамысловых арцеляў і каля 1,5 млн жыхароў. Раёнамі размяшчэння беларускай прамысловасці сталі Паволжжа (47 заводаў і фабрык), Урал (35), сярэдняя паласа РСФСР (28), Заходняя Сібір (8) і інш. У чэрвені–жніўні на усход вывезена больш 190 дзіцячых установ (каля 16 тыс. дзяцей). У абласных і раённых цэнтрах рэспублікі было арганізавана 24 эвакапункты, дзе насельніцтва магло атрымаць прадукты харчавання, адзенне,медыкаменты [9, с. 641].

Унадзвычай крайне нездавальняючых абставінах праводзілася эвакуацыя прадпрыемстваў і ўстаноў ў Віцебскай вобласці. За шэсць дзён (эвакуацыя пачалася толькі 03.07.1941 г.) на Усход была адпраўлена максімальна магчымая ў тых ўмовах колькасць сродкаў вытвочасці і людзей. Уся гэтая праца праводзілася пад кіраўніцтвам партыйных камітэтаў. Вялікі асабісты ўклад у гэтую справу ўнёс член партыі, начальнік аддзела руху Віцебскага аддзялення М.А. Макараў [10, с. 70].

З Віцебска, спачатку ў Ялец, а затым ў Арэнбург у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны была эвакуіравана група рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і абсталяванне завода імя Кірава. Завод імя Камінтэрна быў эвакуіраваны ў Саратаў. На новыя базы ва ўсходнія раёны СССР перамясціліся гарбарны завод імя М.А. Еўсцігнеева, фабрыкі –

Рэпазіторый ВДУ

ільнопрадзільная "Дзвіна", панчошна-трыкатажная імя "КІМ", швейная "Сцяг індустрыялізацыі", Аршанскі ільнокамбінат і інш. На новым месцы эвакуіраваныя прадпрыемствы паспяхова справіліся з усімі цяжкасцямі перабазіравання і ў сціснутыя тэрміны наладзілі вытворчасць. Не распаліся пры эвакуацыі прафсаюзныя арганізацыі заводаў і фабрык, яны працягвалі выконваць уласцівыя для сябе функцыі. Ушчыльную займаліся падборам для працаўнікоў кватэрнага фонду, наладжвалі гарачае харчаванне ў сталовых, арганізоўвалі канцэрты і паказ кінафільмаў.

У калектывах прадпрыемстваў разгарнулася спаборніцтва за павелічэнне выпуску прадукцыі для патрэб фронту, адшуканне дадатковых рэзерваў росту прадукцыйнасці працы. 350 рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў фабрыкі "КІМ" па прыбыцці ў г. Ульянаўск уключыліся ў спаборніцтва пад дэвізам "Усё для фронту! Усё для перамогі!" Як успамінаў галоўны дыспетчар фабрыкі В. Дворкін: "Умовы жыцця былі цяжкімі, харчаванне дрэнным, працавалі ў тры змены, а то і больш. Самі нарыхтоўвалі дровы для фабрыкі, вазілі іх на сабе за многія кіламетры. Калі не было электрычнасці, круцілі станкі ўручную ... А пасля змены, як правіла, даводзілася ісці яшчэ і на будаўніцтва ўмацаванняў, процітанкавых заслонаў, расчыстку снегу і г.д. Аднак, мы ведалі, што ад нас ... краіна чакае дапамогі і мы не шкадавалі для гэтага ні сіл, ні здароўя" [11, с. 552].

Знаходзячыся ў Куйбышаўскай вобласці, выдатна спраўляліся з вытворчымі заданнямі (выконвалі норму на 250–300%) работніцы Віцебскай валяльна- лямцавай фабрыкі. Такое стаўленне да працы было характэрна для рабочых і служачых усіх эвакуіраваных на Усход прадпрыемстваў. Абавязак служыць Айчыне быў пастаўлены імі вышэй за асабістыя патрэбы.

Чыгуначнікі Віцебскага аддзялення акрамя перавозкі грузаў і насельніцтва на Усход, справіліся з задачай выратавання ўласнай маёмасці. Перамясцілі значную колькасць паравозаў, вагонаў, іншыя матэрыяльныя каштоўнасці на Усход, што дазволіла ім пасля прыбыцця на новыя месцы актыўна ўключыцца ў вытворчы працэс.

Перавод эканомікі краіны на ваенныя рэйкі адбываўся таксама за кошт увядзення надзвычайных мер. Мабілізаваным лічылася ўсё працаздольнае гарадское насельніцтва – мужчыны ва ўзросце ад 16 да 55 гадоў і жанчыны ва ўзросце ад 15 да 45 гадоў. Для работнікаў усіх прадпрыемстваў і ўстаноў прадугледжваўся 12 гадзінны рабочы дзень, строгая адказнасць за невыкананне нормы выпрацоўкі, забаранялася самавольнае пакіданне прадпрыемстваў без дазволу адміністрацыі, адмяняліся адпачынкі, выхадныя і святочныя дні. Да канца 1941 г. у краіне была ўведзена картачная сістэма забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання. Насельніцтва, звязанае з сельскай гаспадаркай, на дзяржаўнае забеспячэнне прадуктамі харчавання не ставілася. Гарантаваныя нормы

Рэпазіторый ВДУ

забеспячэння хлебам, устанаўліваліся толькі для сельскай інтэлігенцыі, эвакуіраваных, работнікаў савецкага і партыйнага звяна, інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Асноўнай крыніцай харчавання для сялянскай сям'і стаў прысядзібны ўчастак, у большасці калгасаў прадукты за працадні не выдаваліся. Напрацягу 1942 г. была ўведзена картачная сістэма забеспячэння прамысловымі таварамі насельніцтва ўсіх гарадоў і рабочых пасёлкаў.

Дзякуючы намаганням дзяржавы, рабочага класа і інжынерна-тэхнічных работнікаў да снежня 1941 г. у тылавыя раёны краіны з заходніх абласцей было эвакуіравана звыш 10 млн чал., вывезена і наладжана работа 1523 прамысловых прадпрыемстваў. Вырашана ў гэты час задача не толькі стабілізацыі працы прадпрыемстваў, але і агульнага росту прамысловай вытворчасці ўсёй тылавой прамысловасці. Калі ў першай палове 1941 г. вытворчасць танкаў складала 1800 адзінак, то ў другой палове гэтага ж года – 4700. Да канца 1942 г. у краіне створэнна ваенная гаспадарка, якая забяспечвала армію самым сучасным узбраеннем і баявой тэхнікай. Яскравае пацверджанне гэтаму – у 1942 г. прадпрыемствы выпусцілі 25 тыс. танкаў.

Сур'ёзным чынам перабудавалася работа ўсіх відаў транспарту і перш-наперш чыгуначнага. Чыгуначны і водны віды транспарту былі ваенізаваны. На транспарце пачаў дзейнічаць ваенны дысцыплінарны статут. На ўсіх чыгунках быў устаноўлены строгі графік першачарговых і спецыяльных ваенных маршрутаў. У маі 1942 г. у паравозным дэпо імя Ільіча Заходняй чыгункі з машыністаў, памочнікаў, старшых і галоўных кандуктараў, вагонных майстроў Заходняй і Беларускай чыгункі была сфарміравана паравозная калона № 3 асобага рэзерву Народнага камісарыята шляхоў зносін. Узначаліць калону даручылі чыгуначніку з Віцебска Макараву Мікалаю Акімавічу, які праявіў свае станоўчыя якасці пад час эвакуацыі дзяржаўнай маёмасці і насельніцтва.

У жніўні 1942 г. паравозны парк калоны № 3 быў накіраваны ў раён Сталінграда, дзе вадзіў воінскія эшалоны і грузавыя цягнікі. Толькі за жнівень–верасень 1942 г. пад варожымі бамбёжкамі калона правяла 510 паяздоў, 232 разы была падвергнута бамбардзіроўкам з паветра і 9 разоў – артылерыйскім налётам. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 5 лістапада 1943 г. за асобыя заслугі ў забеспячэнні перавозак для фронта і народнай гаспадаркі і выдатныя дасягненні ў аднаўленні чыгуначнай гаспадаркі ва ўмовах ваеннага часу Макараву М.А. было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы (з 1946 г. М.А. Макараў стане начальнікам Віцебскага аддзялення) [12, с. 86]. Такой жа высокай узнагародай былі адзначаны беларускія чыгуначнікі А.М. Чухнюк, А.В. Глебаў, І.П. Першукевіч, А.А. Янкоўскі [13, с. 322].

Цяжкія задачы ў час вайны давялося вырашаць работнікам сельскай гаспадаркі. У выніку часовай акупацыі фашысцкімі захопнікамі шэрагу раёнаў еўрапейскай часткі краіны, дзе да вайны пражывала больш за

Рэпазіторый ВГУ

80 млн чал., СССР пазбавіўся 47% усіх пасяўных плошчаў, 38% валавой прадукцыі збожжа, 84% цукру, 38% агульнага пагалоўя буйной рагатай жывёлы і 60% пагалоўя свіней. Увесь цяжар нялёгкай працы лёг на плечы жанчын і падлеткаў, для аказання дапамогі вёсцы шырока выкарыстоўвалася гарадское насельніцтва. Прымаліся меры па далейшаму пад'ёму збожжавай гаспадаркі ў калгасах і саўгасах усходніх абласцей СССР.

Такім чынам, перабудова народнай гаспадаркі СССР на ваенны лад завяршылася да сярэдзіны 1942 г. Заснаваная на планавых прынцыпах, эканоміка СССР здолела ў параўнальна кароткі тэрмін падпарадкаваць увесь свой патэнцыял патрэбам абароны.

Ва ўмовах ваенных няўдач баяздольнасць Чырвонай Арміі ўмацоўвалася як за кошт ідэалагічных, так і надзвычайных мер. У ліпені 1941 г. у Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскім Флоце ўводзіўся інстытут ваенных камісараў, які дзейнічаў ва ўсіх палках і дывізіях. У ротах, батарэях і эскадронах дзейнічаў інстытут палітрукоў. Разам з камандзірамі камісары і палітрукі неслі поўную адказнасць за выкананне вайсковай часткай баявой задачы. Надзвычайнай мерай стаў загад № 270 выдадзены Стаўкай ад 16 жніўня 1941 г., згодна з якім зрываючых у час боя знакі разпазнавання і здаваўшыхся ў палон лічылі злоснымі дэзерцірамі. Дэзерціраў расстрэльвалі на месцы. Гэта рабілі створаныя ў ліпені 1941 г. асобыя аддзелы НКУС. У верасні 1941 г. у кожнай стралковай дывізіі ўводзіліся загараджальныя атрады колькасцю да батальёна. У крайніх выпадках ім дазвалялася прымяняць зброю супраць «одержимых паникой военнослужащих». Адказнасць, згодна з загадам, павінны былі несці і сем'і воінаў парушыўшых прысягу. Яны падлягалі арышту. У красавіку 1943 г., абавязкі па ўмацаванні баяздольнасці ў дзеючай арміі былі перададзены арганізаванаму ў складзе наркамата абароны СССР Упраўленню контрразведкі "СМЕРШ".

**3. Прычыны няўдач Чырвонай Арміі летам і восенню 1941 г.** Яшчэ і ў XXI ст. шмат спрэчак выклікае пытанне непадрыхтаванасці СССР да вайны ў 1941 г. Шукаючы прычыны такога становішча, большасць навукоўцаў і ваенных кіраўнікоў, якія абапіраюцца на ўсю сукупнасць фактаў, сапраўдныя прычынна-выніковыя сувязі, зходзяцца ў думках, якія можна абагульніць так: слабасць Чырвонай Арміі і крытычнасць становішча краіны напачатку вайны абумоўлены шэрагам аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў. Да аб'ектыўных фактараў адносяць больш высокі эканамічны стан Германіі, а таксама яе перавагу ў асабіста ваенным аспекце. Да ліку суб'ектыўных – пралікі стратэгічнага і тактычнага плана, дапушчаныя палітычным і ваенным кіраўніцтвам СССР [14, с. 223].

Перад нападзеннем на СССР ваенна-эканамічны патэнцыял і людскія рэсурсы Германіі, яе васалаў і захопленых краін у некалькі разоў перавышалі гэтыя паказчыкі Савецкага Саюза. Германія прыкладна ўдвая



Репозиторий ВГУ

пераўзыходзіла нашу краіну па вытворчасці электраэнергіі, вугалю, чыгуну, сталі. У чатыры разы – па выпуску аўтамабіляў. Эканоміка фашысцкай Нямеччыны была даўно ўжо пераведзена на ваенныя рэйкі, завяршылі да гэтага часу такі перавод і яе саюзнікі. Акрамя таго, на службу агрэсіі былі пастаўлены ўсе рэсурсы заваяванай Еўропы.

Перад нападзеннем на СССР істотныя перавагі Нямеччына мела і ў асабіста ваенных адносінах: цалкам адмабілізаваная і разгорнутая 5,5 млн кадравая нямецка-фашысцкая армія нападу валодала 2-гадовым вопытам ваенных дзеянняў, мела добра наладжаную работу штабоў, адпрацаванае амаль па гадзінах узаемадзеянне пяхоты, артылерыі, танкаў і авіяцыі, мела дасканалае па тым часе ўзбраенне і баявую тэхніку, была амаль поўнасцю матарызавана, чаму ў значнай ступені садзейнічала трафейная тэхніка і ўзбраенні, захопленыя ў акупаваных краінах Еўропы. Адначасова з Германіяй супраць СССР выступі Італія, Венгрыя, Румынія, Фінляндыя [2, с. 142–144].

Хаця па колькасці танкаў і самалётаў мы пераўзыходзілі Германію (у СССР да чэрвеня 1941 г. было 7,6 тыс. танкаў і 17 тыс. самалётаў, у Германіі – 6 тыс. танкаў і 10 тыс. самалётаў), аднак іх большую частку складалі машыны старых канструкцый, з выпрацаваным рэсурсам, якія патрабавалі рамонта ці спісання. Карэннае тэхнічнае пераўзбраенне арміі і флоту СССР намячалася ў 3-й пяцігодцы. Планавалася ў 1940 г. страціць з бюджэта краіны на абарону каля 30%. Патрабаваўся час, але яго, як бачна, не хапіла. Часці і злучэнні Чырвонай Арміі, якія дыслацыраваліся ў прыграніччы, былі аснашчаны пераважна састарэлымі ўзорамі ўзбраення і тэхнікі. У Заходняй ваеннай акрузе налічвалася толькі 37–70% штатаў ваеннага часу. З шасці механізаваных карпусоў толькі адзін меў амаль поўную матэрыяльную частку. Асновай танкавага корпусу і авіяцыі гэтай ваеннай акругі былі машыны састарэлых марак. З 8 танкавых дывізій Асобай Заходняй ваеннай акругі, якая 22 чэрвеня 1941 г. была пераўтворана ў Заходні фронт, дзве былі ўкамплектаваны прыкладна на 50%, чатыры – менш чым на 50%, дзве – амаль не мелі танкаў. Нізкай была забяспечанасць транспартам, сучасным узбраеннем. У той час як войскі праціўніка былі аснашчаны аўтаматычным узбраеннем, пісталеты, кулямёты, самазарадныя вінтоўкі і карабіны сталі паступаць у стралковыя часці Чырвонай Арміі толькі ў 1941 г.

Асноўным нашым танкам быў БТ-7, які па броні і па ўзбраенні ўступаў нямецкім Т-3, Т-4. Да восені 1941 г. прамысловасць выпусціла ўсяго 1225 “трыццацічацвёрак” і 639 КВ. Толькі разгортвалася вытворчасць новых самалётаў: за першую палову 1941 г. было выпушчана крыху больш за 2,6 тыс. самалётаў, што павінны былі замяніць устарэлыя канструкцыі. Недастаткова было зенітных і супрацьтанкавых сродкаў. Не было завершана будаўніцтва ўмацаваных раёнаў на новай мяжы пасля верасня 1939 г. Значныя ваенныя сілы (40 дывізій) Савецкі Саюз быў



Репозиторий ВГУ

вымушаны трымаць на Далёкім Усходзе і ў Закаўказзі (супраць пагрозы з боку Турцыі) [3, с. 85–86].

Побач з аб'ектыўнымі прычынамі няўдач Чырвонай Арміі існавалі і суб'ектыўныя. Назавём некаторыя з іх. **Па-першае,** няўдачы злучэнняў Чырвонай Арміі тлумачацца, тым, што, яны былі вераломна атакаваны і вымушаны былі ўступаць у бой без патрэбнага стратэгічнага разгортвання. Нягледзячы на тое, што ў перадваенныя гады мелі месца факты частых, адкрыта правакацыйных пералётаў нямецкімі самалётамі нашых граніц, перамяшчэнне на тэрыторыю СССР дыверсійных і разведвальных груп, масавае высяленне палякаў з прыгранічных раёнаў, якія служылі неабвержаным доказам таго, што да нападзення ворага застаюцца ўжо не тыдні, а дні і нават гадзіны, тым не менш правільных у тых умовах рашэнняў палітычнае кіраўніцтва краіны не прымала. Спецыялісты наркамата абароны не змаглі своечасова вызначыць накірунак галоўнага ўдару Германіі па СССР на пачатку вайны**.** Палкі і дывізіі не былі прыведзены ў стан ваеннага часу, не былі цалкам укамплектаваны, мелі абмежаваныя матэрыяльныя і транспартныя сродкі і сродкі сувязі [3, с. 86–87].

**Па-другое**, ход прыгранічных бітваў паказаў, што нашы войскі на ўсіх узроўнях – ад Стаўкі Галоўнага Камандавання да камсастава тактычнага звяна не былі падрыхтаваны да вядзення сучаснай вайны з масавым выкарыстаннем артылерыі, танкаў, авіяцыі, часта дзейнічалі без паветранай і артылерыйскай падтрымкі. Авалодваць навыкамі вядзення сучаснай вайны Чырвонай Арміі прыйшлося ў ходзе бітваў з вялікімі стратамі ў жывой сіле і тэхніцы. Толькі **ў** 1940 г. пачалі ствараць механізаваныя карпусы, але да пачатку вайны іх фарміраванне не здолелі завяршыць. Не было завершана таксама фарміраванне авіяцыйных злучэнняў і папаўненне іх навейшай тэхнікай.

Перад пагрозай вайны наркамату абароны са спазненнем па часе ўдалося дабіцца ад Сталіна дазволу часткова прызваць у армію паўмільёна запасных і перадыслакаваць у заходнія ваенныя акругі дадаткова чатыры арміі. Не было дазволу на прывядзенне ў баявую гатоўнасць войск прыгранічных акруг. Пры парушэнні германскімі самалётамі паветранай прасторы СССР (толькі за першую палову 1941 г. было зарэгістравана 324 парушэнні) катэгарычна забаранялася іх збіваць. Лічылася, што гэта ўсхвалюе Гітлера і справакуе немцаў на ўзброенае сутыкненне. За дзесяць дзён да фашысцкага нападзення ўсім камандуючым прыгранічнымі акругамі было загадана «во избежание могущих быть провокаций запретить полёты нашей авиации в 10-километровой пограничной полосе». Толькі ў ноч на 22 чэрвеня 1941 г. пад ціскам новых звестак І. Сталін дазволіў наркамату абароны даць у акругі дырэктыву аб магчымым нечаканым нападзенні немцаў 22–23 чэрвеня і аб прывядзенні ўсіх частак у поўную баявую гатоўнасць. Аднак у войскі дырэктыва паступіла з вялікім спазненнем, фактычна пасля з'яўлення ворага на савецкай тэрыторыі [3, с. 88–89].



Репозиторий ВГУ

**Па-трэцяе,** няўдачы Чырвонай Арміі былі абумоўлены памылковасцю савецкай ваеннай дактрыны. У савецкага камандавання адсутнічаў надзейны план стратэгічнай абароны, армія рыхтавалася да вядзення вайны ва ўмовах наступлення. У адпаведнасці з савецкай ваеннай дактрынай агрэсар павінен быць абяскроўлены і затрыманы на граніцы ў выніку кароткатэрміновых, непрацяглых прыгранічных баёў. Затым вайна пераносіцца на тэрыторыю агрэсара, Чырвоная Армія наступае, знішчае ворага ў яго логаве і дабіваецца перамогі [3, с. 89].

**Па-чацвертае**, у Чырвонай Арміі на першапачатковым этапе вайны, як адзначаюць эксперты, меўся вялікі недахоп кадравага прафесійнага каманднага складу. У камандзіраў, якія ўзначальвалі Стаўку, наркамат абароны і генштаб, камандзіраў палкоў, батальёнаў і начальнікаў штабоў палкоў адсутнічалі неабходныя ваенныя веды і баявы вопыт. Толькі каля 15% каманднага складу валодалі вопытам вядзення ваенных дзеянняў, атрыманага ў 1938–1940 гг., а таксама ў Кітаі і Іспаніі. 70% начальніцкага складу Чырвонай Арміі на пачатку вайны мелі вопыт службы на пасадзе ад 1 да 6 месяцаў, 50% камандзіраў батальёнаў і 68% камандзіраў рот былі выпускнікамі 6-месячных курсаў, яны не скончылі нават ваеннага вучылішча. Вялікія страты ваеннаму ведамству краіны былі нанесены сталінскімі рэпрэсіямі. У перадваенныя гады армія і флот "страцілі" больш за 40 тыс. камандзіраў і палітработнікаў. Толькі за 1938–1940 гг. былі заменены ўсе камандзіры ваенных акругаў, кожныя 9 з 10 іх намеснікаў [14, с. 224].

Вопыт да тых камандзіраў, што замянілі рэпрэсіраваных, прыходзіў у час баёў і даваўся часцей дарагой цаной. Рэпрэсіі падарвалі дух салдат, наглядалася падзенне дысцыпліны, шмат камандзіраў адчувалі сябе разгубленнымі. Не было неабходнага вопыту і ў Стаўкі. Яе загады любымі сродкамі ўтрымліваць рубяжы нават ва ўмовах глыбокага флангавага абходу праціўніка, часта прыводзіла да вядзення бітваў ва ўмовах акружэння, вялікіх страт у жывой сіле і тэхніцы [3, с. 14–15].

**Па-пятае,** вострай праблемай была ўкамплектаванасць арміі малодшымі афіцэрскімі кадрамі – ад малодшага лейтэнанта да капітана ўключна. Гэта было выклікана павелічэннем Узброеных Сіл СССР з 1,9 млн чал. у 1939 г. да 5 млн чал. у пачатку 1941 г. У сувязі з рэзкім павелічэннем арміі, патрабавалася яшчэ 550 тыс. афіцэраў на пасады камандзіраў узводаў, рот і батальёнаў. Як сцвярджаюць эксперты, савецкая армія мела лепшага ў свеце салдата, які прадэманстраваў свае найлепшыя якасці ў маскоўскай бітве і ў наступныя гады, але ў пачатку вайны, па віне перш-наперш военачальнікаў і камандзіраў розных узроўняў ён быў вымушаны адступаць [3, с. 91].

**Шостая прычына** няўдач заключаецца ў велізарных стратах жывой сілы, узбраенняў і тэхнікі ў першыя тыдні і месяцы вайны. Усяго па дадзеных нашых архіўных служб у палон трапіла каля 4 млн чалавек (па дадзеных вермахта – 5,7 млн савецкіх ваеннаслужачых аказаліся ў палоне). Былі страчаны таксама шматлікія склады з баявой тэхнікай, боепрыпасамі,



Репозиторий ВГУ

стралковай зброяй, вайсковым абсталяваннем, склады гаруча-змазачных матэрыялаў, што ствараліся паблізу тэатраў магчымых ваенных дзеянняў, як таго патрабавала савецкая ваенная дактрына. Аднавіць страчанае ў кароткі тэрмін было немагчыма) [3, с. 92].

**Была і такая прычына:** адсутнасць належнай інфармацыі аб германскім фашызме, аб яго планах па устанаўленні «новага парадку» ў Еўропе і імкненні да заваяванняў на Усходзе. У савецкім друку з сярэдзіны жніўня 1939 г. і да пачатку Вялікай Айчыннай вайны фактычна забаранялася антыфашысцкая прапаганда і нават негатыўныя выказванні ў адрас Германіі і яго лідараў. Больш таго, за тыдзень да пачатку вайны 14 чэрвеня 1941 г., безумоўна, са згоды Сталіна, ТАСС зрабіла заяву, у якой версія аб нападзе Германіі на СССР аб'яўлялася правакацыйнай. Усё гэта прытупляла пачуццё пільнасці савецкага народа і не садзейнічала яго мабілізацыйнай гатоўнасці, напярэдадні і ў пачатку вайны [3, с. 92–93; 11, с. 224–225].

**4. Крах гітлераўскай стратэгіі "бліцкрыга" і маланкавай вайны супраць СССР.** Пасля таго як Чырвонай Арміі ўдалося скаваць варожыя групоўкі пад Кіевам і навязаць ім жорсткія баі ў раёне Смаленска, наступ на Маскву прыпыніўся, нямецкая камандаванне накіравала сваю моц на захоп Ленінграда. Але змяненні на фронце далі падставу Гітлеру выдаць 6 верасня 1941 г. (новую) дырэктыву аб наступленні на Маскву. Галоўная стаўка ў ёй рабілася на танкавыя злучэнні і авіяцыю, асаблівая ўвага звярталася на скрытнасць падрыхтоўкі аперацыі. Спачатку прадугледжвалася разграміць савецкія войскі ў раёнах Вязьмы і Бранска, затым, знішчаючы адыходзячыя на Маскву злучэнні Заходняга фронту, авалодаць сталіцай СССР.

Генеральнае наступленне на Маскву пачалося 30 верасня 1941 г. (аперацыя "Тайфун"). Танкавыя варожыя арміі абрушыліся на левае крыло Бранскага фронту, а 2 кастрычніка асноўныя сілы немцаў перайшлі ў наступ на пазіцыі войск Заходняга фронту. Па дадзеных айчынных гісторыкаў, у акружэнне папала 7 (з 15) палявых упраўленняў арміямі, 64 (з 95) дывізіі, 11 (з 13) танкавых брыгад, 50 (з 64) артпалкоў. Да сваіх з акружэння ўдалося прабіцца 34 савецкім дывізіям і 13 артпалкам. Над сталіцай СССР навісла смяротная пагроза [3, с. 93]. 13–18 кастрычніка 1941 г. немцы акупіравалі Мажайск, Малаяраславец і Тарусу, узнікла пагроза выхада іх да Масквы. З раніцы 17 кастрычніка на бліжніх подступах да сталіцы стала займаць абарону народнае апалчэнне. Сюды ж былі накіраваны знішчальныя батальёны, якія да гэтага неслі патруліраванне горада. Прадпрыемствы Масквы перайшлі на працу ў тры змены. На будаўніцтва абарончых збудаванняў і супрацьтанкавых ірвоў выйшла больш за 500 тыс. масквічоў, 24 тыс. жыхароў сталіцы ўступілі ў войскі Маскоўскай супрацьпаветранай абароны. На вуліцах горада былі

Рэпазітарый ВДУ

ўстаноўлены надалбы, супрацьтанкавыя і супрацьпяхотныя «яжы», барыкады, вялікая колькасць агнявых кропак.

19 кастрычніка 1941 г. ДКА аб'явіў Маскву на асадным становішчы. Частка цэнтральных урадавых і партыйных устаноў эвакуіравалася ў Куйбышаў (зараз Самара). У сталіцы заставаліся Палітбюро ЦК ВКП(б), СНК СССР, ДКА і Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання. Да канца кастрычніка 1941 г. вораг быў спынены. Першае "генеральнае" наступленне нямецка-фашысцкіх войск на Маскву скончылася няўдачай. У гэтай сітуацыі 6 лістапада 1941 г. у падземнай зале станцыі метро «Плошча Маякоўскага» адбылося ўрачыстае пасяджэнне Маскоўскага Савета, на якім з дакладам аб 25-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі выступіў І.В. Сталін. На наступны дзень, 7 лістапада, на Чырвонай плошчы адбыўся традыцыйны парад савецкіх войск. І.В. Сталін звярнуўся да яго ўдзельнікаў з наступнымі словамі: "...На вас смотрит весь мир, как на силу, способную уничтожить грабительские полчища немецких захватчиков. На вас смотрят порабощенные народы Европы, подпавшие под иго немецких захватчиков, как на своих освободителей. Великая освободительная миссия выпала на вашу долю. Будьте же достойными этой миссии! Война, которую вы ведёте, есть война освободительная, война справедливая. Пусть вдохновляет вас в этой войне мужественный образ наших великих предков – Александра Невского, Димитрия Донского, Кузьмы Минина, Димитрия Пожарского, Александра Суворова, Михаила Кутузова! Пусть осенит вас победоносное знамя великого Ленина!» [15, с. 37–38]. Войскі, якія ўдзельнічалі ў парадзе, з Чырвонай плошчы накіроўваліся ў бой.

15–16 лістапада 1941 г. пачалося другое «генеральнае» наступленне нямецка-фашысцкіх войск на Маскву. Да пачатку снежня 1941 г. вораг падыйшоў на 25–30 км. да сталіцы. Аднак, упершыню за ўсю вайну ў канцы лістапада – пачатку снежня 1941 г., нягледзячы на выкарыстанне амаль усіх сваіх рэзерваў, вораг не змог прарваць абарону савецкіх войск. Сканцэнтраваўшы буйныя сілы на блізкіх подступах да сталіцы, Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандавання прыняла рашэнне аб пераходзе савецкіх войск у контрнаступленне. Яго пачалі **5–6 снежня 1941 г.** войскі Заходняга, Калінінскага і Паўднёва-Заходняга франтоў агульнай працягласцю ў 800 км. Знішчаючы ворага, савецкія войскі да 23 лютага 1942 г. адкінулі ворага на захад на 350–400 км, вызваліўшы ад іх цалкам Маскоўскую і Тульскую вобласці, шэраг раёнаў Калінінскай вобласці. Контрнаступленне савецкіх войск, якое пачалося пад Масквой, перарасло ў агульнае наступленне па ўсяму фронту. Яно працягвалася да красавіка 1942 г. Прыкладам арганізаванасці і стойкасці ў баях з фашыстамі пад Масквой былі члены ВКП(б). На маскоўскім полі боя загінула 936,6 тыс. чал., у тым ліку 400 тыс. Камуністаў [16, с. 12].



Рэпазіторый ВДУ

Разгром нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой і паспяховае наступленне Чырвонай Арміі зімой 1941–1942 гг. мелі ваенна- палітычнае і міжнароднае значэнне. **Па-першае,** перамога Чырвонай Арміі пад Масквой вызначыла крах гітлераўскай стратэгіі «бліцкрыга», маланкавай вайны супраць СССР. Надзеі кіраўніцтва фашысцкай Германіі на магчымасць дабіцца ў вайне супраць СССР хуткай перамогі і закончыць яе да восені 1941 г. цалкам праваліліся. Цяпер гітлераўская Германія вымушана была разлічваць на цяжкую і доўгую вайну [3, с. 96].

**Па-другое,** разгром нямецка-фашысцкіх войск зімой 1941–1942 гг. канчаткова развеяў міф аб «непераможнасці» гітлераўскай арміі, моцна падарваў яе маральны дух і баяздольнасць. У войсках вермахта ўпершыню сталі з'яўляцца панічныя настроі, зніжацца дысцыпліна, а ў кіраўніцтве Германіі – рознагалоссе ў ацэнцы прычын паражэння пад Масквой і ў пытаннях далейшага вядзення вайны супраць СССР. Пазней гітлераўскія генералы назавуць бітву пад Масквой "катастрофай" і "пачаткам трагедыі на Усходзе". Разгром германскага вермахта пад Масквой быў першым буйным паражэннем "непераможнай арміі" у Другой сусветнай вайне і вырашальнай ваенна-палітычнай падзеяй першага перыяду Вялікай Айчыннай вайны [3, с. 96–97].

**Па-трэцяе,** перамога савецкіх войск пад Масквой натхніла народы міра на ўзмацненне вызваленчай барацьбы і партызанскага руху ў прыгнечаных германскім фашызмам і японскім мілітарызмам краінах Еўропы і Азіі, на актывізацыю руху Супраціўлення. Да восені 1942 г. былі створаны Нацыянальна-вызваленчы фронт у Грэцыі, Адзіны народна-вызваленчы фронт у Югаславіі, Нацыянальна-вызваленчы фронт у Албаніі, Фронт незалежнасці ў Бельгіі, Нацыянальны фронт у Францыі. У Югаславіі і Грэцыі ў 1941–1942 гг. былі створаны народна-вызваленчыя арміі на чале з камуністамі. Рух супраціўлення паслабляў тыл гітлераўскай Германіі, зніжаў магчымасць поўнага выкарыстання эканамічнага патэнцыяла прыгнечаных краін, прымушаў фашыстаў выдзяляць пэўныя сілы на ахову транспартных камунікацый і барацьбу з партызанамі [3, с. 97].

**Па-чацвёртае,** перамога савецкіх войск пад Масквой падзейнічала на ўрады Японіі і Турцыі, якія чакалі зручнага моманту для нападу на СССР. Гэтая перамога садзейнічала значнай змене сітуацыі на іншых тэатрах вайны, палегчыла, у прыватнасці, становішча Англіі на Міжземным моры і ў Афрыцы, зняла пагрозу нападу фашыстаў на Англію [3, с. 97]. І, нарэшце, – самае важнае значэнне пераможнай бітвы пад Масквой заключаецца ў тым, што Савецкі Саюз, па сутнасці, сам на сам прыпыніў магутную ваенную машыну Трэцяга рэйха. Гэтая перамога рашучым чынам падзейнічала на фарміраванне ўнікальнага палітычнага дасягнення Другой сусветнай вайны: з гэтага часу пачаўся паскораны працэс стварэння антыгітлераўскай кааліцыі. Свой уклад у пад'ём эканомікі краіны ўносілі працоўныя калектывы перамешчаныя на Усход з БССР



Репозиторий ВГУ

Спасылкі

1. Новік, Я.К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў па 2010 г.: вучэб. дапам. / Я.К. Новік, І.Л. Качалаў, Н.Я. Новік; пад рэд Я.К. Новіка. – 3-е выд., папр. – Мінск: Выш. школа, 2011. – 512 с.

2. История Коммунистической партии Советского Союза: в 6 т. / гл. ред.: П. Поспелов (пред.) [и др.], Т.5. кн.1. Коммунистическая партия накануне и в годы Великой Отечественной войны, в период упрочения и развития социалистического общества (1938–1958 гг.). Книга первая (1938–1945 гг.). – М., Политиздат, 1970. – 723 с. с илл.

3. Новік, Я.К., Новік, Н.Я. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны). Курс лекцый. Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. – 2006. – 185 с.

4. История Великой Отечественной войны Советского Союза. 1941–1945 гг.: в 6 т. Т. 2. – М.,1961.

5. Halder. Kriegstagebuch.Bd. III, Stuttgart, 1964.

6. F.L. Suhman. Russia since 1917. N. Y., 1957.

7. Республика Беларусь: энциклопедия: в 6 т. Т. 1 / редкол.: Г.П. Пашков и др. – Мн.: БелЭн, 2005. – 1040 с.: илл.

8. КПСС в Вооруженных Силах Советского Союза.Документы 1917–1968. – М., 1969. – 455 с.

9. Республика Беларусь: энциклопедия: в 6 т. Т. 7 / редкол.: Г.П. Пашков и др. – Мн.: БелЭн імя П.Броўкі, 2008. – 744 с.: илл.

10. Мандрик, И.В. Очерки истории профсоюзов Витебщины. – Витебск: Витебская областная типография, 2015. – 504 с. : ил.

11. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5.Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч. [і інш]. Рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Экоперспектіва, 2007. – 613 с.; іл.

12. Мандрик, И.В. Вклад белорусских железнодорожников в победу советского народа над фашистской Германией / И.В. Мандрик // Труд Профсоюзы Общество. – № 2. – 2005. – С. 86–90.

13. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч 2 / М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.В. Вышынскі і інш.; Інстытут гісторыі АНБ. – Мн.: Беларусь, 1995. – 560 с.: іл.

14. Мандрык І.В. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі). – Віцебск: ВФ УА ФПБ МІПСА, 2009. – С. 232–242.

15. И. Сталин. О Великой Отечественной войне Советского Союза, изд.5. – М., 1947.

16. Мандрик, И.В. Важнейшие слагаемые Победы советского народа в Великой Отечественной войне / И.В. Мандрик // Ученые записки УО «ВГУ им. П.М. Машерова»: сборник научных трудов. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2012. – Т. 13. – С. 5–16.

## ТЭМА 15. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі

1. Ваенна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні акупацыйных улад на захопленых тэрыторыях.
2. Беларускі калабарацыянізм.

**1. Ваенна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні на захопленых тэрыторыях.** Згодна з распрацаваным планам "Ост" на акупіраваных тэрыторыях СССР хутка ўсталёўваецца германскі "новы парадак" – нацысцкая сістэма ваенных, палітычных, ідэалагічных і эканамічных мер у адносінах да мясцовага насельніцтва. Для рэалізацыі

Рэпазіторый ВГУ

плана ў рэйху было створана асобнае міністэрства па пытаннях усходніх тэрыторый на чале з А. Розенбергам.

У Беларусі пад нацысцкую акупацыю трапіла ўся яе тэрыторыя, каля 7 млн насельніцтва (12,7% ад колькасці жыхароў, якія анынуліся на захопленай тэрыторыі СССР) [1, с. 100].

Мэта акупацыйнага рэжыму на Беларусі адпавядала агульнаму падыходу да занятых тэрыторый – татальная эканамічная эксплуатацыя, паступовая каланізацыя, германізацыя, высяленне і ў значнай ступені знішчэнне карэннага насельніцтва. Ідэалагічнай асновай такой палітыкі акупантаў была тэорыя аб “расавай выключнасці нямецкай нацыі” ў параўнанні з іншымі народамі. Яна сцвярджала неабходнасць пашырэння “жыццёвай прасторы” для немцаў, іх “правы” на сусветнае панаванне. У адпаведнасці з распрацаваным нацыстамі ў адносінах да насельніцтва захопленых тэрыторый планам у Беларусі прадугледжвалася 75% насельніцтва знішчыць ці выселіць за Урал, 25% анямечыць і прымусіць працаваць на немцаў-каланізатараў.

У першыя дні захопу тэрыторыі БССР фашысты знішчылі дзяржаўнасць беларускага народа і нават тэрытарыяльную цэласнасць рэспублікі. Яе тэрыторыя была падзелена на 5 частак: тэрыторыя Віцебскай, Магілёўскай, амаль усёй Гомельскай, усходнія раёны Пінскай і некалькі раёнаў Палескай абласцей былі аднесены да вобласці армейскага тылу групы армій “Цэнтр”. Улада на гэтай тэрыторыі знаходзілася ў руках камандавання ваенных і паліцэйскіх органаў. Вышэйшым органам на гэтай тэрыторыі быў штаб тылу групы армій “Цэнтр”. Паўднёвыя раёны Палескай, Пінскай і Брэсцкай абласцей з абласнымі цэнтрамі Мазыр, Пінск, Брэст былі далучаны да рэйхскамісарыята “Украіна”, мяжа якога праходзіла прыкладна за 20 км на поўнач ад чыгункі Брэст–Гомель. Беластоцкую, паўночныя раёны Брэсцкай, частку раёнаў Баранавіцкай абласцей гітлераўцы ўключылі ў склад Усходняй Прусіі. Паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці былі далучаны да Генеральнай акругі Літва.

У склад уласна Беларусі, ці, як яе акупанты называлі**,** Генеральнай акругі Беларусь (ГАБ), было ўключана 68 раёнаў з агульнай колькасцю 192 сельскіх і 9 гарадскіх раёнаў, якія ўваходзілі ў склад БССР напярэдадні вайны. Агульная плошча ГАБ складала прыкладна чацвёртую частку тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3,1 млн чал. (на 04.12.1941 г.), і была ўключана ў склад рэйхскамісарыята “Остланд” з рэзідэнцыяй у Рызе [2, с. 544–545]. Генеральная акруга Беларусь падзялялася на 10 акруг (гебітаў): Баранавіцкую, Барысаўскую, Вілейскую, Ганцавіцкую, Глыбоцкую, Лідскую, Мінскую, Слонімскую, Слуцкую, Навагрудскую. Мінск з’яўляўся цэнтрам Генеральнай акругі Беларусь і выдзяляўся ў асобную акругу. Вышэйшым выканаўчым органам тут з’яўляўся Генеральны камісарыят Беларусі, які ўзначальваў Вільгельм Кубэ, а з верасня 1943 г. – групэнфюрэр войск СС Курт фон Готберг. Генеральнаму

камісарыяту падпарадкоўваліся гебітскамісарыяты, штатскамісарыяты (гарады), артскамісарыяты (раёны). У воласцях прызначаліся валасныя старшыні, а ў вёсках – старасты. Іх работу кантралявалі прадстаўнікі акупацыйных улад.

Узброенай апорай створанага рэжыму з'яўляліся акупацыйныя войскі вермахта – ахоўныя дывізіі. Яны забяспечвалі ахову камунікацый і ваенных аб’ектаў, лагераў ваеннапалонных, вялі барацьбу супраць партызан і насельніцтва. Для падтрымкі акупацыйнага рэжыму быў створаны значны паліцэйскі апарат. Ён ствараўся з мясцовых жыхароў людзей, якія перайшлі на бок немцаў. Пры гэтым пастаянны недахоп паліцэйскіх на Беларусі акупацыйныя ўлады кампенсавалі ўкраінскімі, літоўскімі і латышскімі паліцэйскімі батальёнамі. Каб утрымліваць пад кантролем тэрыторыю захопленай Беларусі, акупанты вымушаны былі трымаць тут ваенна-паліцэйскія сілы, без уліку франтавых часцей, колькасцю да 160 тыс. чал. [3, с. 401].

На працягу ўсяго перыяду акупацыі фашысты планамерна ажыццяўлялі палітыку генацыду – знішчэнне цэлых груп насельніцтва па тых ці іншых матывах: з-за прыналежнасці да савецкіх актывістаў, камуністаў, яўрэяў і г.д. Пры гэтым акупацыйныя ўлады выкарыстоўвалі сістэму мер: заложніцтва, аблавы, турмы, лагеры смерці, карныя аперацыі і інш. Акупанты стварылі на тэрыторыі Беларусі сістэму турмаў і канцэнтрацыйных лагераў. На акупіраванай тэрыторыі дзейнічалі больш за 260 лагераў смерці, іх філіялаў і аддзяленняў: для ваеннапалонных, для цывільнага насельніцтва, жаночыя , перасыльныя , штрафныя лагеры СС, гета.

Адзін з першых лагераў смерці быў створаны ў в. Дразды каля Мінска, дзе ў ліпені–верасні 1941 г, утрымліваліся ваеннапалонныя і цывільныя асобы ва ўзросце ад 15 да 60 гадоў. Самым буйным не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй захопленай савецкай зямлі з’яўляўся Трасцянецкі лагер смерці. Тут было знішчана больш за 206 тыс.чалавек. Буйнейшым гарадскім лагерам смерці было мінскае гета, створанае гітлераўцамі 19 ліпеня 1941 г. Лагер быў абнесены высокай агароджай з калючым дротам. Выходзіць з гета яўрэі маглі толькі на працу ці па спецыяльным дазволе. На спіне і грудзях яны павінны былі насіць жоўтыя зоркі. За парушэнне правілу ім пагражаў расстрэл. На насельніцтва гета фашысты накладалі кантрыбуцыі, зборам якіх займаўся яўрэйскі камітэт і яўрэйская паліцыя. У гады акупацыі ў мінскім гета сістэматычна паўтараліся пагромы. У выніку тут было знішчана каля 100 тыс чал. Усяго ў Беларусі існавала больш за 100 яўрэйскіх гета, у якія фашысты сагналі сотні тысяч яўрэяў – жыхароў рэспублікі і іншых краін.

Сродкам рэалізацыі планаў па знішчэнні насельніцтва былі карныя аперацыі – тэрарыстычныя акцыі ваеннага, палітычнага і эканамічнага характару. За гады акупацыі фашысты правялі больш за 140 карных аперацый, у ходзе якіх былі спалены 5454 населеныя пункты разам з усімі

ці часткай жыхароў. Трагічны лёс Хатыні падзялілі 627 беларускіх вёсак [4, с. 488].

Палітыка генацыду – масавага знішчэння населеных пунктаў разам з жыхарамі стала паўсядзённай практыкай гітлераўскіх захопнікаў. Пра гэта сведчаць выяўленыя адразу пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі месцы пахаванняў. Прадуманыя і планамерныя расправы з дзецьмі, падлеткамі , жанчынамі і старымі фашысцкія каты праводзілі паўсюдна. Напрыклад, у Гарадоцкім раёне Віцебскай вобласці з ліпеня 1941 г. па 24 снежня 1943 г. было знішчана больш за 6 тыс. мірных жыхароў, у тым ліку растраляна 4884 чал., павешана 32, спалена 168, сагнана ў рабства 947 чалавек. У лютым 1943 г. фашысты сагналі ў вёсцы Халуі Вярэчанскага сельсавета ў адну хату і спалілі 70 мірных жыхароў з навакольных вёсак. У жніўні таго ж года на ўскраіне Гарадка фашысты стварылі гета для яўрэйскага насельніцтва раёна. Пасля, на працягу двух месяцаў, вязняў (іх там знаходзілася каля 2 тысяч) групамі дастаўлялі ва ўрочышча Вараб’ёвы горы, дзе дарослых растрэльвалі, а дзяцей закопвалі жывымі. Жыхарка Леўчанка Е.Я. бачыла, як акупанты 6 студзеня 1943 г. на вачах людзей двум партызанам адсеклі ногі і рукі, пасля трупы вывезлі да будынка тэхнікума і пакінулі на марозе для запалохвання насельніцтва. Прымянялі фашысты ў Гарадоцкім раёне спосаб расправы з людзьмі, які яны выкарысталі яшчэ пад Масквой на камсамолцы З. Касмадзям’янскай – абліванне чалавека вадой на марозе [5, с. 62].

Адной з праяў акупацыйнай палітыкі быў вываз насельніцтва на прымусовыя работы ў Германію, пазбавіўшы іх не толькі імя, але і нацыянальнасці. На акупіраваных тэрыторыях вялася актыўная кампанія па прапагандзе нямецкага ладу жыцця і закліку на добраахвотную працу ў Германіі. Абяцалі добрыя ўмовы працы, высокую заработную плату, сацыяльную абарону. Аднак тыя, хто выехаў у Германію (у рэйху такіх людзей называлі «остарбайтэрамі») у пачатку 1942 г., сутыкнуліся з неверагодна цяжкімі ўмовамі працы і побыту. Харчаванне “ўсходніх рабочых” было значна горшым за харчаванне рабочых іншых еўрапейскіх краін, заработная плата – малая, людзей дрэнна забяспечвалі рабочым адзеннем, за правіннасці накладваліся штрафы, ўжываліся цялесныя пакаранні.

Колькасць беларусаў, якія жадалі добраахвотна выехаць на работу ў Германію, была нязначнай. У гэтых умовах акупанты з другой паловы 1942 г. пачалі прымусовы вываз рабочых. Мясцовым біржам было даручана весці ўлік працаздольнага насельніцтва, устаўлівалася штомесячная квота пастаўкі “остарбайтэраў”. Людзей вывозілі ў таварных вагонах, некалькі дзён яны не атрымлівалі харчавання і вады. Захопам насельніцтва займаліся армейскія часткі, жандармерыя, атрады СС і СД, паліцыя. Камісія па зборы працоўнай сілы арганізоўвала прагляд новага фільма, збіраючы такім чынам людзей, потым іх акружалі і ўсіх працаздольных забіралі для адпраўкі ў Германію. Людзям не давалі нават



Рэпазіторый ВДУ

развітацца з блізкімі. Былі выпадкі, калі войскі вермахта і паліцыі акружалі вёскі і забіралі ўсё насельніцтва. Пры аказанні супраціўлення расстрэльвалі. Нават дзяцей фашысты прымушалі выконваць непасільную фізічную працу, марылі голадам, змяшчалі ў канцэнтрацыйныя лагеры, вывозілі на катаржныя работы ў Германію, у іх бралі кроў для параненых гітлераўскіх салдат.

За час акупацыі з Беларусі ў Германію было вывезена 380 тыс. чал., у тым ліку больш за 24 тыс. дзяцей. Згодна запіскі сакратара Віцебскага абкама партыі І.А. Стулава на імя сакратара ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнка, па падліках камісій па расследаванні злачынстваў, прычыненых нямецка-фашысцкімі акупантамі, толькі з раёнаў Віцебскай вобласці, вызваленых у час асенне-зімовага наступлення Чырвонай Арміі 1943–1944 гг., растраляна, вывезена ў Германію 121333 чалавек [6, с. 15].

Эканамічная палітыка акупантаў насіла каланізатарскі характар. З планаў фашыстаў вынікала, што выключнае значэнне для далейшага вядзення вайны будзе мець неадкладная і поўная эксплуатацыя захопленых абласцей у інтарэсах ваеннай эканомікі Германіі. Дзеля грабяжу і падрыву гаспадарчага патэнцыялу Беларусі існаваў спецыяльны штаб “Ольдэнбург”, які каардынаваў збор прадукцыі. Усе захопленыя матэрыяльныя і людскія рэсурсы аб’яўляліся ўласнасцю рэйха. У Германію вывозілася каштоўнае абсталяванне з прадпрыемстваў, прадукты харчавання, лес. На Беларусі было высечана больш за 100 тыс. гектараў лесу. У рэйх адправілі 90% станочнага і тэхнічнага абсталявання, больш за 9 тыс. трактароў, каля 20 тыс. аўтамашын [7, с. 91]. Насельніцтва гарадоў рабавалі рознымі падаткамі і паборамі. Харчовыя і прамысловыя тавары вывозіліся ў Германію.

У інтарэсах Германіі акупацыйныя ўлады арганізоўвалі на тэрыторыі Беларусі работу часткі прадпрыемстваў прамысловасці, транспарту і гандлю. Часткова тут была ўзноўлена праца на больш чым 800 прамысловых прадпрыемствах [2, с. 545]. У першую чаргу наладжвалася дзейнасць прадпрыемстваў, якія працавалі на патрэбы германскага вермахта. Рабочыя і служачыя падвяргаліся жорсткай эксплуатацыі. Працоўны дзень складаў у сярэднім 12 гадзін.

Акупацыйныя улады катэгарычна забаранілі продаж на рынках буйной рагатай жывёлы, коней. На рынку пераважаў натуральны тавараабмен: прадукты сельскай гаспадаркі абменьваліся на прамысловыя тавары. Цэны на ўсе тавары былі надзвычай высокімі.

У заняпадзе знаходзілася камунальная гаспадарка гарадоў і сістэма аховы здароўя. Медыцынскую дапамогу аказвалі толькі за высокую плату. Таму ў акупіраваных гарадах была вялікая смяротнасць. Людзей ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў прымушалі працаваць на будоўлі абарончых аб'ектаў, мастоў, дарог. Памеры аплаты не задавальнялі нават элементарныя патрэбы людзей. Аграрная палітыка акупантаў грунтавалася на тым,

Репозиторий ВГУ

што для эксплуатацыі сялянства магчыма было выкарыстоўваць папярэднія формы ўладкавання на вёсцы. Усю калгасную маёмасць аб’явілі ўласнасцю Германіі. Улады не распускалі праўленні калгасаў, пакідалі іх старшынь і брыгадзіраў. Пад кантролем “сельскагаспадарчых фюрэраў” знаходзілася выкананне заданняў па абавязковым пастаўкам у Германію зерня, мяса, яйкаў і іншых прадуктаў харчавання, а таксама сена, лёнуі г.д. З беларусаў спагналі і вывезлі больш за 1,6 млн тон збожжа, каля 430 тыс. тон мукі, значную колькасць сабранай бульбы і гароднiны. У ваенную эканоміку Нямеччыны было ўцягнута 399374 чал., вывезеных з Беларусі за гады вайны на прымусовыя работы ў Германію [2, с. 545].

Эканамічны прыгнёт беларускага насельніцтва суправаджаўся духоўным. Фашысты знішчалі ці вывозілі ў Германію культурную і гістарычную спадчыну беларускага народа. Так, з будынкаў Акадэміі навук і Белдзяржвыдавецтва былі выкінуты як смецце і знішчаны шматлікія каштоўныя рукапісы беларускіх пісьменнікаў і вучоных. Многія рэдкія кнігі (у тым ліку збор старадрукаваных выданняў Ф. Скарыны, першае выданне Статута ВКЛ), карціны знакамітых мастакоў, калекцыі славутых слуцкіх паясоў былі вывезены ў Германію.

У школах, якія дзейнічалі на акупіраванай тэрыторыі, вучэбны працэс меў яскравую прагерманскую накіраванасць і нацыянал-сацыялістычную сутнасць. У кожным класе абавязкова вывешваўся партрэт Гітлера, настаўнік, уваходзячы ў клас, вітаў вучняў узнятай правай рукой з воклічам “Хайль Гітлер”. Вучні павінны былі ў такой жа форме адказваць настаўніку. Перад пачаткам урокаў праводзіліся гутаркі пра біяграфію Гітлера і яго паплечнікаў, аб жыцці народа ў «Новай Еўропе», перамогах войск вермахта. На ўроках прыроды вучні засвойвалі такія тэмы, як «Паняцце аб расах», «Характарыстыка рас», «Арыйская раса як вышэйшая культурная і цывілізаваная раса чалавецтва». На ўроках гісторыі вучні абавязаны былі засвойваць тэмы: «Беларусь і Германія», «Жыццё Адольфа Гітлера». У Мінску друкаваўся орган генеральнага камісарыята Беларусі «Урадавы веснік» на нямецкай і беларускай мовах. Вяліся перадачы радыё, дзейнічалі тэатры, кіно, дзе сцвярджалася ідэя аб цывілізацыйнай місіі нямецкага пахода на Усход [1, с. 107].

Такой у агульных рысах была сітуацыя ў перыяд германскай акупацыі. З восені 1942 г., асабліва пасля разгрому пад Сталінградам, сярод нямецкага ваеннага камандавання, выказвался думка пра неабходнасць памякчэння акупацыйнай палітыкі. Памяншэнне жорсткасці ў адносінах да мясцовага насельніцтва павінна было заваяваць яго сімпатыі да немцаў і паралізаваць волю да супраціўлення. Былі зроблены пэўныя ўступкі ў культурна-асветніцкай, адміністрацыйнай, ваеннай галінах. У пачатку 1943 г. Кубэ нават загаварыў пра захаваную на працягу тысячагадовай гісторыі так званую «нардычную кроў» у беларусаў. Аднак сутнасць акупацыйнага рэжыму ад гэтага не змянілася. Пры ўсіх намаган-



Рэпазіторый ВДУ

нях фашыстам не ўдалося зламіць волю беларускага народа да супраціўлення. У экстрэмальных умовах у гады Вялікай Айчыннай вайны беларусы прайшлі выпрабаванне з высокай годнасцю.

**2. Беларускі калабарацыянізм.** У шэрагу акупіраваных краін у гады Другой сусветнай вайны знаходзіліся людзі, якія супрацоўнічалі з фашыстамі. У гістарыяграфіі яны атрымалі назву калабарацыяністы. Няўдачы вермахта на савецка-германскім фронце, нарастаючая барацьба ў тыле акупантаў вымушалі германскія ўлады шукаць падтрымку сярод мясцовага насельніцтва. Не была выключэннем і Беларусь. Акупанты імкнуліся ствараць розныя структуры грамадзянскай улады і вайскова-паліцэйскія фарміраванні, прыцягваючы ў іх пэўныя колы мясцовых жыхароў. У кастрычніку 1941 г. у Мінску з асоб, што супрацоўнічалі з акупантамі, па загаду гаўляйтэра В. Кубэ была створана так званая Беларуская народная самапомач (БНС) [2, с. 546]. На чале яе стаў кіраўнік пражскага філіяла Беларускага камітэта самапомачы І. Ермачэнка. Склад кіраўніцтва БНС, а таксама праграму яе дзейнасці зацвердзіў той жа гаўляйтэр – В. Кубэ. У праграме БНС галоўнай мэтай значылася «памагацъ пацярпелым беларусам ад ваенных дзеянняў, бальшавіцкага і польскага праследавання, памагаць адбудаваць зруйнаваны чужынцамі беларускі край». Пры кіраўніцтве БНС быў створаны Цэнтральны савет (Цэнтраль), у склад якога ўваходзілі 10 чалавек. Членаў савета прызначаў і адхіляў В. Кубэ. Кіраўнікі гэтай арганізацыі марылі пераўтварыць яе ў орган беларускага дзяржаўнага кіравання. З гэтай мэтай яны настойвалі на стварэнні беларускіх узброеных ваенных атрадаў для барацьбы з партызанамі і на фронце, арганізацыі пры акупацыйных органах аддзелаў з ліку беларусаў і г.д. Аднак нямецкая палітыка не прадугледжвала стварэння на акупіраваных тэрыторыях самастойных нацыянальных дзяржаўных мясцовых структур, таму цэнтральны савет у рэальнасці ўяўляў структуру, цалкам падпарадкаваную акупантам.

29 чэрвеня 1942 г. В. Кубэ сваім распаражэннем надаў Ермачэнку званне дарадчыка і Мужа даверу беларускага народа. Адначасова ён дазволіў стварыць галоўную раду БНС у складзе 12 чалавек. Пры ёй утвараліся 13 ведамасных аддзелаў: адміністрацыйны, палітычны, вайсковы, школьны, аховы здароўя і інш. з адпаведнымі падраздзяленнямі ў акругах. Фактычна быў створаны апарат, які б змог дапамагаць акупантам падтрымліваць жорсткі рэжым для беларусаў.

Асаблівая ўвага надавалася корпусу Беларускай самааховы (БСА). Камандуючым БСА быў прызначаны той жа І. Ермачэнка. Ён і створаны ім штаб распачалі актыўную дзейнасць па стварэнні БСА, паколькі бачылі ў ёй праўобраз будучага беларускага войска. Планавалася стварыць у кожным раёне роты БСА. Былі арганізаваны курсы на перападрыхтоўцы афіцэраў-беларусаў, праводзілася актыўная прапагандысцкая кампанія ў



Рэпазіторый ВДУ

акругах. З беларусаў добраахвотна ў БСА амаль ніхто не пайшоў. Камплектавалася яна шляхам прымусу, аблаў. Створаныя ў хуткім часе, фарміраванні БСА падвяргаліся ўзмоцненай ідэалагічнай апрацоўцы і ваеннаму ўздзеянню з боку партызан і польскай Арміі Краёвай, якія рабілі ўсё магчымае, каб сарваць гэтае мерапрыемства. Да таго ж немцы не спяшаліся ўзбройваць гэтыя фарміраванні, у выніку яны лёгка разганяліся партызанамі. Восенню 1942 г. цікавасць акупантаў да гэтага мерапрыемства стала слабець. Замест БСА яны вырашылі ствараць беларускія паліцэйскія батальёны на чале са сваімі прадстаўнікамі. Вясной 1943 г. гітлераўцы адмовіліся ад беларускай самааховы.

7 чэрвеня 1943 г. было аб'яўлена аб стварэнні з прадстаўнікоў беларускай грамадскасці дарадчага органа – Беларускага даверанага бюро, ці «Рады даверу». У склад бюро (Рады) ўвайшлі па аднаму прадстаўніку з акруг, якія вызначаліся акруговымі камісарамі, а таксама шэсць чалавек ад цэнтра. На працягу 1943 г. «Рада даверу» збіралася 2 разы (23 і 28 жніўня 1943 г.). Асноўным пытаннем, якое абмяркоўвалася на пасяджэннях, стала пытанне аб формах і метадах барацьбы з партызанамі. Члены рады выказалі свае меркаванні і параілі акупантам узмацніць агентурную разведку ўнутры партызанскіх злучэнняў, стварыць таксама ілжэпартызанскія атрады.

Пасля таго, як 21 верасня 1943 г. у Мінску падпольшчыкамі быў знішчаны В. Кубэ, яго пераемнікам на пасадзе генеральнага камісара стаў генерал-лейтэнант паліцыі і СС групэнфюрэр фон Готберг. Готберг і яго падначаленыя пачалі інтэнсіўна шукаць сродкі для барацьбы з антыгерманскім рухам. У верасні–лістападзе 1943 г. акупацыйныя ўлады, прымяняючы метад прымусовых мабілізацый, распачалі фарміраванне беларускіх паліцэйскіх батальёнаў. Да канца 1943 г. былі сфарміраваны тры такія батальёны.

Акрамя прымусовых мабілізацый, акупантамі ствараліся т.зв. "абарончыя вёскі". Туды пазней пасяліліся і сем'і паліцэйскіх, эвакуіраваных жыхароў усходніх абласцей СССР, у тым ліку казакоў, што служылі ў германскай арміі. Узброеныя жыхары гэтых паселішч павінны былі супрацьстаяць партызанам і падпольшчыкам. Больш шырокія памеры гэта акцыя мела на тэрыторыі заходніх раёнаў Беларусі. Аднак у Беларусі паўсюдна не існавала неабходных умоў для ажыццяўлення гэтай задумы. Часам мясцовыя жыхары вёсак разбягаліся, як толькі заўважалі нямецкія войскі, якім было даручана стварыць «абарончую вёску».

У 1943 г., пад уплывам перамог Чырвонай Арміі, прапагандысцкай дзейнасці партызан і падпольшчыкаў, актывізаваўся пераход на бок партызан ваеннаслужачых са створаных акупантамі розных вайсковых дапаможных фарміраванняў і паліцыі. У лютым 1943 г. да віцебскіх партызан перайшла большая частка байцоў 825-га волжска-татарскага батальёна, легіёна «Ідэль – Урал», які быў створаны з ліку ваеннапалонных

Рэпазіторый ВГУ

татар, башкіраў і іншых прадстаўнікоў народаў Паволжжа. 16 жніўня 1943 г. на бок партызан перайшла т. зв. 1-я руская нацыянальная бригада СС палкоўніка У.У. Гіль-Радыёнава, агульнай колькасцю каля 2 тыс. чал. і стала называцца 1-й Антыфашысцкай брыгадай. Свой пераход байцы гэтай брыгады адзначылі разгромам нямецка-фашысцкіх гарнізонаў у Докшыцах і Крулеўшчызне.

Актыўную работу акупанты і іх памагатыя праводзілі сярод моладзі Беларусі. 22 чэрвеня 1943 г. В. Кубэ аб’явіў аб дазволе стварыць антысавецкую арганізацыю моладзі па тыпе гітлерюгенда, якая атрымала назву «Саюза беларускай моладзі» (СБМ). Мэтай пры стварэнні СБМ было аб'яднанне беларускай моладзі, выхаванне ў ёй нацыянальнай свядомасці, гатоўнасці змагацца за Беларусь, якая будзе «адноўлена» з дапамогай Германіі. Уступіць у саюз мог любы беларус ад 10 да 20 гадоў, які даваў пісьмовыя доказы аб арыйскім паходжанні і жаданні служыць фашызму. Шэфам-кіраўніком штаба СБМ быў прызначаны беларус з незакончанай вышэйшай адукацыяй, настаўнік М. Ганько. У 1941 г. ён добраахвотна здаўся ў палон немцам. Пасля заканчэння школы прапагандыстаў працаваў у генеральным камісарыяце Беларусі. Тройчы ўзнагароджаны нямецкімі медалямі. Намеснікам Ганько была прызначана беларуска, урач Н. Абрамава. Працавала яна ў аддзеле аховы здароўя Генеральнага камісарыята Беларусі, двойчы ўзнагароджвалася нямецкімі медалямі.

Акупацыйныя ўлады рабілі ўсё магчымае, каб уцягнуць моладзь у сферу германскіх інтарэсаў. У чэрвені 1943 г. былі адкрыты школы па падрыхтоўцы кіруючых кадраў СБМ у Мінску, Альберціне, Драздах, а з лютага 1944 г. – у Фларыянаве. У Мінску, пры галоўным штабе, рыхтаваліся вышэйшыя кіраўнікі СБМ. За час дзейнасці школ СБМ было падрыхтавана звыш 1300 кіраўнікоў саюза. Гэта дазволіла стварыць сетку арганізацый, якія аб’ядноўвалі каля 12,5 тыс. юнакоў і дзяўчат. Тут моладзь падвяргалася ідэалагічнай апрацоўцы.

З канца 1943 г. у СБМ пачалася актыўная вярбоўка ў дапаможныя вайсковыя фарміраванні і атрады СС. М. Ганько выдаў сакрэтны загад аб мабілізацыі ў роту СС юнакоў 1922–1927 гг. нараджэння. Акруговыя кіраўнікі абавязваліся да 10 студзеня 1944 г. скончыць падбор кандыдатаў. Пачынаючы з вясны 1944 г., акупанты разгарнулі адкрытую прымусовую вярбоўку 15–20-гадовых юнакоў у ваенна-дапаможныя фарміраванні Германіі. Радыё, газеты, шматлікія каляровыя лістоўкі заклікалі моладзь вербавацца на службу ў германскую армію.

У снежні 1943 г. акупацыйныя ўлады абвясцілі аб стварэнні Беларускай цэнтральнай рады (БЦР). Гэта была толькі бачнасць беларускага нацыянальнага ўрада. Захопнікі разглядалі яе як сродак мабілізацыі сіл беларускага народа для барацьбы супраць партызан, больш поўнага выкарыстання эканомікі Беларусі ў сваіх інтарэсах. Беларускія калабарацыянісцкія сілы разлічвалі выкарыстаць дадзеную сітуацыю для



Репозиторий ВГУ

ажыццяўлення сваёй даўняй мары – стварэння беларускай дзяржаўнасці пад германскім пратэктаратам. У склад БЦР уваходзілі 14 чалавек. Прэзідэнтам БЦР стаў былы слуцкі памешчык Р. Астроўскі. У гады грамадзянскай вайны – дзянікінскі афіцэр, з 1922 г. тайны агент польскай дыфензівы ў Вільні. За 200 тыс. злотых у 1925 г. Астроўскі выдаў палякам членаў Беларускай сялянска-рабочай грамады, куды ён уступіў па заданні польскай контрразведкі. За атрыманыя грошы купіў маёнтак на Віленшчыне. З гэтага часу ён пачаў супрацоўнічаць з нямецкай разведкай. У 1941 г. з мабільнымі групамі СС вярнуўся на Беларусь. Быў бургамістрам Арла, Бранска, Смаленска, Магілёва. Усюды Р. Астроўскі вербаваў пасобнікаў, кіраваў знішчэннем яўрэйскага насельніцтва.

Для бачнасці, што беларусы ўключаны ў кіраванне краем, пры БЦР былі створаны 13 аддзелаў – фінансавы, культуры, сельскай і лясной гаспадаркі, прафесійных спраў, рэлігіі і судовых спраў, вайсковы і інш. Гэта акцыя ўяўляла сабой вымушаны, хоць і добра прадуманы крок, які быў спланаваны ў нетрах берлінскіх спецслужбаў яшчэ ў канцы 1942 г. Між тым, гітлераўцы не спяшаліся дзяліць уладу з гэтымі фарміраваннямі. Фармальна акупанты перадавалі БЦР пад сваім кантролем толькі кіраўніцтва школьнай справай, культурай, сацыяльнай апекай і вайсковымі пытаннямі.

Асабліва актыўную дзейнасць лідэры БЦР разгарнулі па стварэнні Беларускай краёвай абароны (БКА), паколькі бачылі ў ёй будучае нацыянальнае беларускае войска. На чале БКА быў пастаўлены маёр войскаў СС Ф. Кушаль. Калабарацыяністы дамагліся ад немцаў дазволу на правядзенне прымусовай мабілізацыі, якая пачалася ў сакавіку 1944 г., ёй падлягалі ўсе мужчыны 1908–1924 г. нараджэння. За няяўку на зборны пункт у адзначаны тэрмін пагражала смяротная кара. Мабілізацыя ў БКА была шырока выкарыстана для набору рабочай сілы ў Германію, фізічнай расправы з мірным насельніцтвам. Да канца сакавіка 1944 г. было гвалтоўна мабілізавана прыкладна 24–25 тыс. чал.

Пад уплывам агітацыі патрыётаў адбывалася масавае дэзерцірства з БКА і пераход яе членаў са зброяй у руках да партызан. У час вызвалення Беларусі частка актыўных байцоў БКА, якія падзялялі палітыку захопнікаў, адступіла разам з немцамі на тэрыторыю Германіі.

27 чэрвеня 1944 г., калі Чырвоная Армія ўжо падыходзіла да Мінска, у гарадскім тэатры было праведзена апошняе афіцыйнае мерапрыемства БЦР – сход бургамістраў, начальнікаў паліцыі, членаў БЦР і іншых «дэлегатаў» беларускага народа, якія назвалі сябе ІІ Усебеларускім кангрэсам. Кангрэс абраў Р. Астроўскага прэзідэнтам, абвясціў сябе «паўнапраўным і найвышэйшым прадстаўніком беларускага народа». Ён выказаў непрызнанне БССР як формы беларускай дзяржаўнасці, абʼявіў неправамоцнымі ўсе польска-савецкія пагадненні, што датычыліся Беларусі.



Репозиторий ВГУ

Не закончыўшы работу, кангрэсмены збеглі ў Кенігсберг, а затым у Берлін. З дазволу гітлераўцаў яны там праводзілі антысавецкую работу сярод беларускай эміграцыі і гвалтоўна вывезеных на працу ў Германію беларусаў з мэтай стварэння беларускай арміі. Амаль усе яны пасля вайны апынуліся ў ЗША [8, с. 307].

Як бачна, каб забяспечыць апору на акупаваных тэрыторыях сярод мясцовага насельніцтва, фашысты стараліся метадамі гвалту, запалохвання, гебелеўскай прапаганды стварыць арганізацыі з беларускага насельніцтва, якія б знаходзіліся ў поўнай ад іх залежнасці. Толькі нязначная частка маладушных, незадаволеных сваім лёсам жыхароў Беларусі паддаліся абяцанням акупантаў, сталі на шлях здрады сваёй Радзіме, аказаліся ў сваёй краіне калабарацыяністамі. Увогуле ж, што неабходна адзначыць асобна,у пераважнай большасці беларусаў немагчымасць здрады была закладзена на генетычным узроўні. У часы акупацыі ў насельніцтва Беларусі выявілася рэдкасная еднасць духу, іх памкненні і дзеянні былі накіраваны на тое, каб як мага хутчэй пазбавіцца ад нямецка-фашысцкай няволі. Аб гэтым будзе ісці аповед у наступных лекцыях.


Спасылкі

1. Новік,Я.К., Новік, Н.Я. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны). Курс лекцый. Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі.-2006.-185с.

2.Республика Беларусь: Энциклопедия В 6 т. Т.5 /Редкол..: Г.П.Пашков и др. –Мн.: БелЭн, 2008.-752 с.: илл.

3. Новік, Я.К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў па 2010г.: вучэб. дапам. /Я.К.Новік, І.Л.Качалаў, Н.Я.Новік; пад рэд Я.К.Новіка.-3-е выд.,папр..-Мінск: Выш.школа.,2011.-512с.

4.Гісторыя Беларусі. У 6т. Т.5.Беларусь у 1917 -1945 гг. /А. Вабішчэвіч. [і інш]. рэдкал М.Касцюк (гал. рэд.) і інш. Мінск : Экаперспектіва, 2007. -613 с.; іл.

5. Витебщина освобожденная: октябрь 1943-декабрь 1945: док. и материалы / сост.: Н.В.Воронова[и др.].-Витебск: Витеб. обл. тип., 2009.-584с,[24] с ил.-(Серия «Память Витебщины»)

6. НАРБ.Ф.4-п. - Оп. 29. - Д.807. –С.1-24.

7.Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1993. Т.1

8.Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Ч2 /М.П.Касцюк, І.М.Ігнаценка, У.І.Вышынскі і інш.; Інстытут гісторыі АНБ.-Мн.: Беларусь,1995.-560с.:Іл.


## ТЭМА 16. Барацьба беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў

1. Нелегальныя партыйныя цэнтры, масавы падпольны рух.
2. Партызанская барацьба на акупаванай тэрыторыі.
3. Дзейнасць ваенных фарміраванняў Арміі Краёвай і Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў.

Репозиторий ВГУ

**1. Нелегальныя партыйныя цэнтры, масавы падпольны рух.** За гады Савецкай улады жыццём цэлага пакалення, намаганнямі людзей, нават наперакор штучна створаным цяжкасцям, на Беларусі дасягнуты пэўныя поспехі ў павелічэнні аб'ёмаў прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі, ліквідавана масавая непісьменнасць, адбылося павелічэнне жыццёвага ўзроўню, медыцынскага абслугоўвання і інш. Пад уплывам змяненняў рэчаіснасці, зразумела, і ідэалагічнай дзейнасці ўлад, большасць насельніцтва была на баку існуючай улады, лічыла сябе гаспадарамі краіны і ўдзельнікамі вялікіх падзей. Негатыўныя з'явы і ўсялякія неўладкаванасці адносіліся да часовых. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ў гарадах і населеных пунктах Беларусі разгарнулася барацьба супраць эканамічных, палітычных і ваенных планаў акупантаў.

Гэтая барацьба ажыццяўлялася ў трох асноўных формах: узброеныя дзеянні партызан; дзейнасць падпольных груп і арганізацый; масавае супраціўленне насельніцтва, якое не ўваходзіла ў склад партызанскіх фарміраванняў і падпольных арганізацый. Напад Германіі на СССР працоўныя Беларусі сустрэлі з абурэннем. Натуральным для большасці беларускага народа стала імкненне бачыць сваю краіну свабоднай і бараніць яе ад чужынцаў. З першага дня вайны ў гарадах і пасёлках ствараецца партыйнае і камсамольскае падполле, складваецца арганізаваны і, што галоўнае, найбольш адчувальны для вермахта і паліцэйскіх сіл, масавы партызанскі рух. 30 чэрвеня 1941 г. ЦККП(б) Белаусі прыняў дырэктыву № 1 "Аб пераходзе на падпольную работу партыйных арганізацый раёнаў, занятых ворагам", а 1 ліпеня ён жа дапоўніў яе змест – дырэктывай № 2 "Па разгортванню партызанскай вайны ў тыле ворага" [1, с. 53–55].

Усведамляючы ролю палітычнага і сацыяльна-эканамічнага фактару ў распачатай вайне, партыйныя камітэты Беларусі яшчэ напярэдадні акупацыі правялі пэўную работу па фарміраванню заканспіраваных падпольных партыйных і камсамольскіх груп, арганізацыі іх явак і відаў сувязі паміж імі. У сціслыя тэрміны была праведзена работа па ўтварэнню партыйна-камсамольскага падполля. Да поўнай акупацыі рэспублікі ў многіх раёнах былі арганізацыйна аформлены раённыя падпольныя парторганы (райкамы, тройкі) на чале з сакратарамі або членамі былых парторганаў. У чатырох абласцях – Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай і Пінскай – заставаліся абласныя парторганы. Згодна з задумкай партыйнага кіраўніцтва, пакінутыя ў тыле ворага камуністы і камсамольцы павінны былі стаць тым палітычным ядром, вакол якога належала згуртавацца ўсім свядомым і патрыятычна натхнёным сілам, каб стварыць невыносныя для акупантаў умовы існавання. Першым у Беларусі, ужо ў ліпені 1941 г., перайшоў на нелегальнае становішча Мінскі абласны партыйны цэнтр. Яго ўзначалілі сакратары абкама В.І. Казлоў (кіраўнік), І.А. Бельскі, А.Ф. Брагін, І.Д. Варвашэня, І.Л. Сацункевіч. Уплыў цэнтра распаўсюджваўся і на частку раёнаў



Рэпазіторый ВДУ

Палескай вобласці. У канцы лістапада – пачатку снежня па ініцыятыве камуністаў быў створаны Мінскі гарадскі камітэт партыі ў складзе І.П. Казінец (сакратар), К.Д. Грыгор'еў, С.І. Заяц (Зайцаў), Г.М. Сямёнаў, В.С. Жудро.

У ліпені на акупіраванай тэрыторыі да працы прыступіла Пінская абласная партыйная тройка: сакратары абкама П.Г. Шапавалаў, Н.К. Зайцаў і член абкама А.Я. Кляшчоў.

У Віцебскай вобласці ў пачатку ліпеня абкам партыі правёў нараду сакратароў райкамаў і гаркамаў, дзе былі абмеркаваны неадкладныя задачы, якія паўсталі перад рэспублікай. Для падпольнай работы было рэкамендавана больш за 60 камуністаў, у тым ліку сакратары Чыгуначнага райкама партыі Б.К. Сямёнаў, І.Г. Грыгор'еў, камуністы чыгуначнікі М.А. Купалаў, М.У. Любчанка, І.І. Голдаевіч, сакратар камсамольскай арганізацыі аблвыканкама А.Е. Белахвосцікаў, шэраг студэнтаў – членаў УКП(б)Б – педагагічнага інстытута. У 16 раёнах вобласці былі ўкамплектаваны партыйныя цэнтры (тройкі), створаны 72 пярвічныя падпольныя партыйныя арганізацыі [2, с. 27].

У жніўні пад кіраўніцтвам сакратароў абкама І.П. Кожара, А.А. Куцака, членаў абкама Я.І. Барыкіна і А.Д. Рудака разгарнуў дзейнасць Гомельскі партыйны цэнтр. Партыйныя (раённые) тройкі былі створаны амаль ва ўсіх раёнах Віцебскай, Мінскай, Палескай, Гомельскай, Пінскай, Магілёўскай абласцей. На заканчэнні 1941 г. ў рэспубліцы прыступілі да дзейнасці 3 абласныя, 2 гарадскія і 25 раённых падпольных партыйных органаў. Усяго тут было створана каля 90 раённых партыйных троек, мноства нелегальных партыйных арганізацый і груп [3, с. 256, 262].

На пачатковым этапе вайны партыйнае падполле фарміравалася, галоўным чынам, ва ўсходніх абласцях. У складаных умовах першапачатковага этапу вайны не ўсе з іх змаглі захаваць сябе ў арганізацыйных адносінах, частка распалася. Але затым амаль усе яны былі адноўлены і арганізацыйна ўмацаваны. Так, на пачатку 1943 г. на Віцебшчыне функцыянавала 10 падпольных райкамаў КП(б): Лепельскі, Ушацкі, Сіроцінскі, Чашніцкі, Аршанскі і Ветрынскі. Яны аб'ядноўвалі 117 пярвічных арганізацый, 207 тэрытарыяльных партыйных арганізацый і 36 партыйна-кандыдацкіх груп [4, с. 15]. Цэнтрам народнага супраціўлення ў сучасных межах вобласці быў падпольны абкам, пад яго кіраўніцтвам дзейнічалі гаркам і 31 райкам партыі [5, с. 13].

Падпольшчыкі здзяйснялі шматлікія дыверсіі на прадпрыемствах, баявыя аперацыі па знішчэнні жывой сілы і баявой тэхнікі акупантаў, вялі агітацыйную работу сярод насельніцтва, разведку. У Мінску ўжо ў другой палове 1941 г. падпольшчыкі ўзрывалі склады са зброяй і ваеннай маёмасцю, цэхі і майстэрні па рамонце баявой тэхнікі, вырабу харчавання, знішчалі варожую адміністрацыю, салдат і афіцэраў. У снежні 1941 г., у час напружаных баёў пад Масквой, яны ажыццявілі паспяховую

Рэпазіторый ВГУ

дыверсію на чыгуначным вузле. У выніку замест 90–100 эшалонаў у суткі адсюль на фронт адпраўлялася толькі 5–6.

Кіраўніцтва акупацыйнай адміністрацыі рэгулярна атрымлівала звесткі аб актыўнай дыверсійна-баявой дзейнасці падпольшчыкаў Брэста, Гродна, Мазыра, Віцебска, іншых гарадоў Беларусі. На Аршанскім чыгуначным вузле эфектыўна дзейнічала група К.С. Заслонава. У снежні 1941 г. брыкетна-вугальнымі мінамі яна вывела са строю некалькі дзясяткаў паравозаў: частка з іх была ўзарвана і замарожана на станцыі, іншыя ўзарваліся на шляху да фронту [5, с. 157–158].

Падпольшчыкі сабатавалі розныя мерапрыемствы захопнікаў. Метады іх дзейнасці былі самымі рознымі: утойванне сваіх прафесій, псаванне абсталявання і інструменту, нясвоечасовы выхад на працу, хаванне сабранага ўраджаю, сельскагаспадарчага інвентару і г.д. Акты сабатажу наносілі значныя страты ворагу. У акупіраваным Магілёве дзейнічала група медыкаў-падпольшчыкаў. У яе склад уваходзілі ўрачы У.П. Кузняцоў, А.І. Паршын, Ф.І. Пашанін (усе загінулі), сярэдні і малодшы медперсанал. Знішчыўшы сапраўдныя медыцынскія карткі і сфабрыкаваўшы новыя, яны здолелі паспяхова адправіць за горад сотні байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, а таксама цывільных асоб.

Пасля перамогі пад Масквой падпольная барацьба ў гарадах і населеных пунктах Беларусі пашыралася і паглыблялася. Не абыходзілася і без цяжкіх страт. У сакавіку-красавіку 1942 г. акупацыйным уладам удалося нанесці сур'ёзны ўдар па мінскім падполлі**.** Тады за турэмныя краты трапіла больш за 400 чал., у тым ліку члены падпольнага ГК КП(б)Б С.І. Заяц (Зайцаў), І.П. Казінец, Г.М. Сямёнаў. 7 мая гэтага ж года яны, у ліку 28 іншых патрыётаў, былі павешаны. У гэты ж дзень быў расстраляны яшчэ 251 чал.

Нягледзячы на цяжкія страты, мінскае падполле знайшло сілы не толькі выстаяць, але і зноў узняцца на барацьбу. Члены падпольнага гаркама партыі і актывісты, што пазбеглі арышту, у маі 1942 г. правялі нараду. Яны прааналізавалі прычыны правалу, абагульнілі дзесяцімесячны вопыт барацьбы, вызначылі меры па далейшым разгортванні падполля. У гаркаме былі створаны аддзелы: разведкі, агітацыі і прапаганды, ваенны, арганізацыі дыверсій; сфарміраваны пяць падпольных райкамаў партыі, шэраг падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый на прадпрыемствах і ва ўстановах. Падпольшчыкі выпускалі газету «Звязда», лістоўкі, мелі сувязь з падполлем іншых гарадоў і населеных пунктаў Беларусі. Але ў верасні-кастрычніку 1942 г. мінскае падполле атрымала новы цяжкі ўдар. У ноч на 26 верасня пачаліся арышты яго ўдзельнікаў. У засценкі СД трапілі сотні змагароў. Большасць арыштаваных загінула. Сярод іх – сакратар падпольнага гаркама І.К. Кавалёў, члены камітэта Д.А. Караткевіч, В.К. Нікіфараў, К.І. Хмялеўскі, сакратары райкамаў Н.Я. Герасіменка (з сям'ёй), М.К. Каржанеўскі, І.І. Матусевіч, М.А. Шугаеў, кіраўнікі

Репозиторий ВГУ

падпольных арганізацый і груп, актыўныя падпольшчыкі Л.Я. Адзінцоў, М.А. Багданаў, Е.М. Баранаў і інш. Удар, нанесены акупантамі мінскаму падполлю восенню 1942 г., быў вельмі цяжкім, але і ён не прымусіў патрыётаў скарыцца. Сведчаннем таму былі расклееныя 21 кастрычніка 1942 г. больш чым у 300 месцах горада лістоўкі з заклікам яшчэ мацней біць акупантаў [6, с. 501].

Гітлераўскія спецслужбы выкарыстоўвалі розныя сродкі, каб разграміць падполле. З гэтай мэтай была распрацавана версія па дыскрэдытацыі яго кіраўніцтва, у першую чаргу сакратара І.К. Кавалёва. На жаль, гэтай фальшыўцы гітлераўскіх спецслужб паверылі ў ЦК КП(б)Б, і на доўгія гады над мінскім падполлем вісела чорная хмара недаверу, якая толькі нядаўна атрымала аб’ектыўную адзнаку.

Мінскае падполле і пасля другога правалу працягвала сваю дзейнасць. У горадзе практычна не было ніводнага прадпрыемства ці ўстановы, дзе б ні дзейнічалі патрыёты. Дзясяткі дыверсійных груп былі створаны на Мінскім чыгуначным вузле. У другой палове 1943 г. тут было праведзена больш за 50 дыверсій. Па ўдакладненых дадзеных, у складзе мінскага падполля самаахвярна змагалася звыш 9 тыс. чал., прадстаўнікі 25 нацыянальнасцей , больш тысячы камуністаў і звыш 2 тыс. камсамольцаў, а таксама антыфашысты замежных краін. Падчас акупацыі ў Мінску было праведзена звыш 1500 дыверсій. Тут нашлі сваю пагібель многія высокапастаўленыя асобы, у тым ліку генеральны камісар Беларусі В. Кубэ.

У Віцебску і яго прыгарадзе ў 1941–1942 гг. было створана 56 падпольных груп, якія мелі канспіраціўныя кватэры. Каардынацыю падпольных груп з кастрычніка 1942 г. тут ажыццяўляла В.З. Харужая. З гэтай мэтай яна была накіравана сюды Беларускім штабам партызанскага руху. Яна стварыла кіруючы цэнтр, куды паступала ўся інфармацыя амаль з усіх канцоў горада і з найбольш важных аб’ектаў ворага. Харужая, як вопытны і ўмелы канспіратар, накіроўвала дзейнасць усяго падполля, давала заданні, вучыла канспірацыі маладых удзельнікаў падполля. Каштоўная інфармацыя з Віцебска паступала ў ЦК партыі Беларусі, у штаб арміі, штаб фронту. 13 лістапада 1942 г. фашысты па даносе здрадніцы Г.В. Васільевай схапілі і 4 снежня пасля доўгіх допытаў, В. Харужая разам з падпольшчыкамі С. Панковай, Д. Суранавай, К. Балдачовай, М. Вараб’ёвай, В. Вараб’ёвым і М. Вараб’ёвым была растраляна на тэрыторыі былога 5-га чыгуначнага палка [6а, с. 476]. Пасмяротна В.З. Харужай прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У Гомелі актыўную барацьбу з ворагам вялі падпольныя групы на чыгуначным вузле, паравоза-вагонарамонтным заводзе, леса камбінаце, гарадской электрастанцыі, іншых прадпрыемствах горада – усяго больш за 400 чал.

Ні на адзін дзень не спынялася антыфашысцкая барацьба ў акупіраваным Магілёве**.** Вясною 1942 г. каля 40 груп (больш за 400 чал.)

Репозиторий ВГУ

аб'ядналіся ў падпольную арганізацыю «Камітэт садзейнічання Чырвонай Арміі», якую ўзначальваў мясцовы настаўнік К.Ю. Мэтэ. Камітэт каардынаваў дзейнасць групы чыгуначнікаў, настаўнікаў, рабочых хлебазавода, аўтарамонтнага завода, фабрыкі штучнага шоўку, работнікаў абласной бальніцы, былых ваеннаслужачых і іншых. Дзякуючы пільнасці, надзейнай канспірацыі і ўдалай структуры арганізацыі магілёўскаму падполлю доўгі час удавалася пазбягаць масавых правалаў і арыштаў.

Асабліва актыўна дзейнічалі падпольшчыкі на чыгуначным транспарце. На тэрыторыі Беларусі фактычна не было ніводнай больш-менш значнай станцыі, дзе б ні змагаліся патрыёты. Шырокую вядомасць набылі баявыя подзвігі обальскіх падпольшчыкаў. Падпольная камсамольская арганізацыя «Юныя мсціўцы» на чыгуначнай станцыі Обаль Віцебскай вобласці была створана вясной 1942 г. Узначальвала яе былая работніца віцебскай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» камсамолка Ефрасіння Зянькова. У склад гэтай арганізацыі ўваходзіла каля 40 чал. Усяго маладыя падпольшчыкі зрабілі 21 дыверсію: спалілі льнозавод, пілараму, электрастанцыю, некалькі мастоў, здабывалі і перадавалі партызанам зброю, медыкаменты, карысныя разведдадзеныя, распаўсюджвалі лістоўкі, зводкі Савінфармбюро і інш. Варожыя разведслужбы вышукалі патрыётаў. Былі арыштаваныя і закатаваныя да смерці Н.А. Азоліна, М.П. Аляксеева, Н.М. Давыдава, У.І. і Я.Я. Езавітавы, маці Ефрасінні Зяньковай – Марфа Аляксандраўна, З.М. Партнова, Ф.Ф. Слышанкова і іншыя [8, с. 222]. Пасля вайны Ефрасінні Зяньковай і Зінаідзе Партновай было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Смела і рашуча дзейнічалі падпольшчыкі на чыгуначным вузле Асіповічы. У ноч на 30 ліпеня 1943 г. яны здзейснілі адну з самых буйных дыверсій Другой сусветнай вайны. Камсамолец Фёдар Крыловіч працаваў на чыгуначнай станцыі ў начную змену і падлажыў дзве магнітныя міны пад эшалон з гаручым, які павінен быў адысці ў бок Гомеля. Але здарылася нечаканае. Партызаны пашкодзілі чыгунку, і эшалон быў пераведзены ў т. зв. Магілёўскі парк, дзе ў гэты час знаходзілася яшчэ тры эшалоны з вогненебяспечнымі грузамі. Праз некаторы час раздаліся выбухі: гіганцкі вогненны слуп падняўся над станцыяй. Пажар перакінуўся на іншыя эшалоны, нагружаныя ваеннай тэхнікай, боепрыпасамі і авіябомбамі. Амаль 10 гадзін не маглі ліквідаваць пажар, які суправаджаўся выбухамі авіябомб, снарадаў і мін. У выніку аперацыі былі поўнасцю знішчаны 4 эшалоны, у тым ліку адзін з танкамі «тыгр», 31 цыстэрна з гаручым, 63 вагоны са снарадамі, авіябомбамі, мінамі [6, с. 503].

Добра бачна, што з пастаўленай задачай партыйныя і камсамольскія работнікі, радавыя камуністы і камсамольцы справіліся даволі паспяхова. Мужную барацьбу на акупіраванай тэрыторыі Беларусі вялі звыш **70 тыс.** падпольшчыкаў. Большую частку беларускіх патрыётаў складалі юнакі і дзяўчаты. Моладзь да 26-гадовага ўзросту складала звыш 54% беларускіх



Репозиторий ВГУ

партызан. Прадстаўнікі ўсіх сацыяльных слаёў удзельнічалі ў барацьбе з акупантамі. Асабліва актыўна выступалі настаўнікі і навучэнцы. Падпольныя арганізацыі панеслі велізарныя страты. Напрыклад, з 1500 падпольшчыкаў Віцебска загінуў кожны трэці.

У Заходніх абласцях Беларусі таксама дзейнічалі антыфашысцкія арганізацыі. Яны ствараліся па ініцыятыве камуністаў, былых актывістаў КПЗБ, камсамольцаў, іншых патрыётаў. У маі 1942 г. быў створаны «Акруговы беларускі антыфашысцкі камітэт Баранавіцкай вобласці». Камітэт правёў значную работу па стварэнні новых і актывізацыі дзейнасці існуючых груп і арганізацый. Восенню 1942 г. пад кіраўніцтвам гэтага камітэта барацьбу з акупантамі вялі больш за 260 падпольшчыкаў. Прыкладна такая ж сітуацыя была і ў іншых абласцях.

Народны рух супраць нямецка –фашысцкіх захопнікаў пастаянна множыўся і пашыраўся. Падпольныя арганізацыі ўзнікалі ў гарадах і вёсках. Беларусы не скарыліся ворагу**.** З першых дзён вайны фарміраваўся масавы падпольны рух. Пачалі дзейнічаць партыйнае, камсамольскае падполле, у якое ўключыліся рабочыя, студэнты, навучэнцы тэхнікумаў і школ, пенсіянеры.

**2. Дзейнасць узброеных партызанскіх сіл супраць акупантаў.** Да ўзброенай партызанскай барацьбы на Беларусі адразу далучыліся кіраўнікі партыйных камітэтаў, члены кампартыі, многія вайскоўцы, што трапілі ў акружэнне ў пачатку вайны альбо вырваліся з варожага палону. У ліку першых партызанскіх фарміраванняў быў Пінскі партызанскі атрад пад камандаваннем загадчыка аддзела Пінскага абкама КПБ В.З. Каржа. Атрад налічваў каля 60 чал. На тэрыторыі Кастрычніцкага раёна Палескай вобласці (абласны цэнтр г. Мазыр) актыўна дзейнічаў атрад «Чырвоны Кастрычнік». Яго кіраўнікі Ц.П. Бумажкоў і Ф.І. Паўлоўскі 6 жніўня 1941 г. сталі першымі партызанамі – Героямі Савецкага Саюза.

На Віцебшчыне шырокая партызанская зона ўтварылася ў Суражскім рэгіёне. 5 ліпеня 1941 г. дырэктара Пудацкай кардоннай фабрыкі, праслаўленага партызанскага камандзіра часоў грамадзянскай вайны Міная Піліпавіча Шмырова запрасілі ў Суражскі райкам партыі. Прапанову аб арганізацыі партызанскага руху ён прыняў як партыйнае даручэнне і разам з сакратаром партыйнай арганізацыі Р.У. Шкрэдам і тэхнарукам П.Н. Голубевым стварыў дзеяздольную партызанскую групу [4, с. 29]. Да 25 ліпеня ў атрадзе налічвалася 60 чалавек. У гэты ж дзень партызаны Суражскай зоны адкрылі баявы рахунак. У баявой аперацыі было знішчана 30 гітлераўцаў. Затым баявыя дзеянні ішлі па ўзрастаючай: у верасні 1941 г. быў разгромлены нямецкі гарнізон у Суражы. Насельніцтва усяляк дапамагала М.П. Шмырову. Слава бацькі Міная хутка расла. На бальшаку Сураж–Усвяты немцы самі ўстанавілі плакаты з надпісам: “Партызанская зона”. Яны

Репозиторий ВГУ

аб’явілі вялікае ўзнагароджанне таму, хто выдасць М.П. Шмырова

У якасці заложнікаў фашысты захапілі яго чацвярых малалетніх дзяцей.

Нават у складаных умовах 1941 г., калі Чырвоная Армія адступіла з тэрыторыі Беларусі, адсутнасці сувязі з цэнтральнымі кіруючымі органамі, недахопам зброі і боепрыпасаў, медыкаментаў, значных страт ў шэрагах барацьбітоў, каля 200 атрадаў і груп працягвалі барацьбу з ворагам. За 1941г. партыйныя камітэты накіравалі для арганізацыі партызанскай барацьбы ў тыле ворага больш за 7 тыс. камуністаў, камсамольцаў, беспартыйных патрыётаў [2, с. 262].

Разгром немцаў над Масквой узняў маральны настрой патрыётаў. У 1942 г. пачаўся новы ўздым партызанскай барацьбы. Шырокія памеры набыў партызанскі рух зімой 1941–1942 гг. на паўночным усходзе Віцебскай вобласці, калі ў выніку паспяховага наступлення Чырвонай Арміі фронт наблізіўся да граніц Беларусі. Былі створаны так званыя Віцебскія (Суражскія) вароты – 40-кіламетровы разрыў паміж флангамі груп нямецкіх армій “Поўнач” і “Цэнтр”. Праз «вароты», якія знаходзіліся паміж Веліжам і Усвятамі (існавалі з лютага па верасень 1942 г.) з Вялікай зямлі ў тыл ворага накіроўваліся арганізатарскія і дыверсійныя групы, зброя, боепрыпасы, медыкаменты. Партызанскія атрады, што дзейнічалі на тэрыторыі Віцебскай вобласці, якая з пачатку 1942 г. з’яўлялася прыфрантавой, падтрымлівалі трывалую сувязь з Віцебскім абкомам і ЦК КП(б)Б, што дзейнічалі за лініяй фронту, а таксама з ваеннымі саветамі 3-й і 4-й ударных армій.

У канцы лютага 1942 г. з атрадам Шмырова аб’яднаўся атрад С.Т. Воранава. Для больш паспяховага ўзаемадзеяння ствараюцца партызанскія брыгады. Першай партызанскай брыгадай была брыгада, створаная на базе атрада Шмырова.

У маі 1942 г. у Маскве быў створаны Цэнтральны штаб партызанскага руху (ЦШПР) на чале з П. Панамарэнкам**.** Першы сакратар ЦК КП(б)Б Панамарэнка не раз выступаў з прапановай стварэння кіруючага органа партызанскага руху. У той час, калі наркам унутраных спраў Л. Берыя лічыў неабходным ствараць групы дыверсантаў-падрыўнікоў, П. Панамарэнка з’яўляўся прыхільнікам пункту гледжання аб разгортванні ўсенароднай барацьбы. Гэты погляд стаў дамінуючым. Прадстаўнікі НКУС і ваенныя былі падпарадкаваны кіраўніцтву ЦШПР. 9 верасня 1942 г. быў створаны Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР) – рэспубліканскі орган ваеннага кіраўніцтва партызанскім рухам на Беларусі, які дзейнічаў да лістапада 1944 г. Начальнікам штаба з’яўляўся П.З. Калінін. Цэнтралізацыя партызанскага руху дазволіла выкарыстоўваць партызан у стратэгічных мэтах.



Репозиторий ВГУ

Значны ўздым партызанскага руху ў Беларусі прыпаў на вясну–лета 1942 г.: расла колькасць атрадаў і груп, якія аб'ядноўваліся ў брыгады. Значна палепшылася ўзбраенне «лясных» байцоў. Удасканальвалася структура партызанскіх сіл. Яны ўсё больш набывалі вайсковую пабудову. Брыгады ў асноўным складаліся з атрадаў, якія ў сваю чаргу дзяліліся на ўзводы, аддзяленні. У некаторых брыгадах і палках існавалі таксама батальёны, у атрадах – роты. Апрача таго, існавалі партызанскія палкі і ваенна-аператыўныя групы. Узрастала майстэрства камандных кадраў і штабоў усіх узроўняў, наладжваліся сувязі з мясцовым насельніцтвам.

Напрыклад, Клічаўскае партызанскае злучэнне было самай буйной групоўкай партызанскіх сіл у Магілёўскай вобласці. У падпарадкаванні яго аператыўнага цэнтра ў пачатку верасня 1942 г. знаходзілася 17 партызанскіх атрадаў, якія налічвалі ў сваім складзе каля 3 тыс. чал. Амаль такім жа шляхам ішло аб'яднанне партызанскіх атрадаў і ў іншых месцах Беларусі. Тэндэнцыя да ўтварэння розных спалучэнняў партызанскіх сіл і стварэння штабоў для каардынацыі іх баявых дзеянняў назіраецца ў гэты час паўсюдна. Пры гэтым атрады, якія ўваходзілі ў партызанскія аб'яднанні, не страцілі сваёй самастойнасці. Да жніўня 1942 г. колькасць партызан павялічылася больш чым на 23 тыс. чал., а да пачатку 1943 г. перавысіла лічбу 56 тыс. [4, с. 228]. Колькасны рост партызанскага руху адбываўся ў асноўным за кошт мясцовай моладзі, якая не мела неабходнай ваеннай падрыхтоўкі. У сувязі з гэтым востра паўстала пытанне ваеннага абучэння. У савецкім тыле былі адкрыты школы і пункты па падрыхтоўцы камандных кадраў, арганізатараў партыйнага і камсамольскага падполля, інструктараў, падрыўнікоў, радыстаў, разведчыкаў і іншых спецыялістаў. З ростам партызанскіх сіл памнажалася і іх баявая актыўнасць. Ад ворага вызваляліся цэлыя раёны, дзе ўлада пераходзіла да партызан і адноўленых органаў савецкай улады. Яны атрымалі назву партызанскія зоны**.** Брыгада імя К.І. Варашылава пад камандаваннем П.П. Капусты вызваліла ад акупантаў многія населеныя пункты Капыльскага і Уздзенскага раёнаў агульнай плошчай 1100 км. кв. Брыгады «За Радзіму» і 1-я Мінская выгналі захопнікаў з часткі тэрыторыі Чэрвеньскага, Рудзенскага і Пухавіцкага раёнаў, узялі пад свой кантроль да 350 км. кв. агульнай плошчы. Пад непасрэдным уплывам партызан знаходзілася больш за 6200 км. кв. Значна пашырылася Любанска-Акцябрская зона, дзе было вызвалена ад акупантаў 418 населеных пунктаў. У шэрагу раёнаў Магілёўскай вобласці звыш 70 нямецкіх гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў, у тым ліку ў райцэнтры Клічаў, былі разгромлены партызанамі.

Важнае значэнне ў барацьбе з акупантамі мелі ўдары партызан па камунікацыях праціўніка, у першую чаргу па чыгунцы, мастах і буйных вузлах. Летам 1942 г., калі Чырвоная Армія вяла цяжкія абарончыя баі ля Сталінграда, ЦШПР звярнуўся да партызан Беларусі з заклікам дабівацца поўнага знішчэння вайсковых эшалонаў на іх шляху да фронту. Партызаны

Беларусі адказалі на гэты заклік шэрагам буйных аперацый, у тым ліку і на камунікацыях праціўніка.

У пачатку жніўня 1942 г. дыверсійная група брыгады «За Савецкую Беларусь» (дзейнічала ў Віцебскай вобласці) узарвала чатырохпралётны мост праз раку Дрысу на магістралі Полацк-Даўгаўпілс. Рух па ім быў адноўлены толькі праз 16 сутак.

25 жніўня партызаны атрада імя М.Ц. Шыша Пінскай вобласці разграмілі гарнізон у Бастыні на чыгунцы Баранавічы–Лунінец. У канцы жніўня партызанскія атрады пад кіраўніцтвам С.Г. Жуніна, Д.А. Кулікова, Г.С. Мысніка зрабілі ўдалы налёт на станцыю Слаўнае на лініі Мінск–Орша. Яны разбілі варожы гарнізон, спалілі будынак станцыі, склады з ваеннай маёмасцю і прадуктамі, разбурылі шляхі, падарвалі дзве вадакачкі і воданапорную вежу. Удала была праведзена аперацыя «Рэха на Палессі», калі быў узарваны мост цераз р. Пціч. Аперацыю ажыццявіла Мінскае партызанскае злучэнне пад камандаваннем Р. Мачульскага.

Асабліва актыўныя баі і дыверсіі партызан разгарнуліся напярэдадні і ў час контрнаступлення Чырвонай Арміі пад Курскам. Паказчыкам ромту майстэрства партызан і іх штабоў з'яўлялася правядзенне ў адзін і той жа тэрмін у межах усёй акупіраванай тэрыторыі Беларусі буйнамаштабнай аперацыі, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай «Рэйкавая вайна». У ёй удзельнічалі фактычна ўсе партызанскія злучэнні рэспублікі. Яна ставіла за мэту зрыў ваенных перавозак праціўніка на Усходні фронт і максімальнае садзейнічанне наступленню Чырвонай Арміі. На Беларусі ў 1943–1944 гг. аперацыя «Рэйкавая вайна» ажыццяўлялася ў тры этапы.

Першы этап пачаўся ў ноч з 3 на 4 жніўня 1943 г. і працягваўся да сярэдзіны верасня 1943 г.; другі – з 9 верасня 1943 г. да пачатку лістапада 1943 г. (ён атрымаў назву «Канцэрт»); трэці этап пачаўся ў ноч на 20 чэрвеня 1944 г.

За час 1 і 2-га этапаў «Рэйкавай вайны» партызаны ўзарвалі звыш 200 тыс. рэйкаў. Былі разбураны чыгуначныя лініі Цімкавічы–Асіповічы–Бабруйск–Старушкі, Жлобін–Калінкавічы. На многіх чыгуначных магістралях рух быў прыпынены ад 4 да 15 сутак, а ўчасткі Магілёў–Крычаў, Полацк–Дзвінск, Магілёў–Жлобін, Баранавічы–Лунінец не працавалі яшчэ больш працяглы тэрмін. Партызаны пускалі пад адхон эшалоны, узрывалі масты, вадакачкі, чыгуначныя станцыі.

У год карэннага пералому ў Другой сусветнай вайне шэрагі партызан Беларусі павялічыліся больш чым на 170 тыс. чал. і налічвалі ў канцы 1943 г. каля 212 тыс. байцоў. Неабходна мець на ўвазе, што ў баях з ворагам на працягу 1941–1943 гг. загінула звыш 33 тыс. партызан [9, с. 123]. Значна ўзмацніліся сілы партызан у заходніх абласцях рэспублікі, калі сюды з усходніх абласцей Беларусі ў 1943 г. былі перадыслацыраваны 9 партызанскіх брыгад, 10 атрадаў і 15 арганізатарскіх груп.

Репозиторий ВГУ

Партызаны Беларусі ўнеслі важкі ўклад у разгром акупантаў. На усёй тэрыторыі БССР узброеную барацьбу вялі 1255 партызанскіх атрадаў, якія аб’ядналі 374 тыс. чалавек, людзей 70 нацый і народнасцей. У канцы 1943 г. каля 60% тэрыторыі знаходзілася пад кантролем партызан, існавалі 20 буйных партызанскіх зон, якія з’яўляліся сапраўднымі фарпостамі савецкай улады ў тыле ворага [9, с. 133].

У сучасных межах Віцебскай вобласці дзейнічалі прыкладна 6 партызанскіх брыгад, 2 палкі, 30 асобных і спецыяльных партызанскіх атрадаў. Іх узначальвалі вядомыя кіраўнікі партызанскага руху – П.М. Машэраў, А.Ф. Данукалаў, Ф.Ф. Дуброўскі, І.К. Захараў, М.С. Пруднікаў. Тут дзейнічала 5 партызанскіх зон (Суражская, Расонская, Полацкая, Ушацкая, Сенненская). У ходзе амаль што трохгадовай барацьбы партызан і падпольшчыкаў толькі на Віцебшчыне Нямеччына страціла 113 тыс. салдат і афіцэраў (у БССР патрыёты знішчылі паўмільёна фашыстаў і паліцэйскіх), пад адхон было пушчана 1147 эшалонаў, знішчаны 151 танк, збіта 77 самалётаў ворага [10, с. 228].

Аднак, як адзначаюць гісторыкі, партызанскі рух не быў пазбаўлены некаторых адмоўных рыс. Здараліся выпадкі недобрасумленных адносін партызан да мясцовага насельніцтва. Сярод каманднага і радавога саставу мелі месца амаральныя паводзіны, марадзёрства, дэзерцірства, парушэнні партызанскіх абавязкаў. Партыйныя камітэты, камандаванне партызанскімі фарміраваннямі вяло жорсткую барацьбу з такімі праявамі. За гады вайны, згодна з рашэннямі партызанскіх судоў, за цяжкія ўчынкі было расстраляна 2345 чал. Варта заўважыць, што тайная палявая паліцыя сумесна з органамі германскай разведкі і контрразведкі – абверам і службай бяспекі (СД) засылала значную колькасць сваіх агентаў у партызанскія атрады і падпольныя арганізацыі. Яны ажыццяўлялі дыверсіі і правакацыі, дыскрэдытуючы патрыятычны рух. Згодна з агентурнымі дадзенымі, 30 лістапада 1943 г. у Мінск было накіравана 300 добра падрыхтаваных у Германіі дыверсантаў. З іх 150 чал. павінна было быць заслана ў атрады Мінскай вобласці, астатнія – у іншыя раёны рэспублікі. З мэтай дыскрэдытацыі дзейнасці партызан, на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь ствараліся добра ўзброеныя і спецыяльна абучаныя невялікія знішчальныя атрады. Маскіруючыся пад партызан, яны рабавалі, палілі, гвалтавалі, забівалі мясцовых жыхароў, нападалі на невялікія групы партызан [11, с. 258–268].

Узаемаадносіны савецкіх партызан і мясцовага насельніцтва ў абсалютнай большасці былі надзвычай высакароднымі. Насельніцтва аказвала дапамогу партызанам, забяспечвала іх харчаваннем, вяло разведку, рабіла лясныя завалы на дарогах, давала прытулак раненым і хворым. Шмат людзей жыло ў партызанскіх зонах пад аховай партызан. Народныя мсціўцы дапамагалі сялянам ахоўваць, сеяць і збіраць ураджай. Партызанскія медыцынскія работнікі лячылі хворых, змагаліся з

Репозиторий ВГУ

эпідэміямі. У партызанскіх зонах адкрываліся і працавалі дзясяткі школ. На тэрыторыі зон дзейнічала вялікая колькасць гаспадарчых прадпрыемстваў, якія працавалі на патрэбы партызан і мясцовага насельніцтва. Партызанскія зоны з'яўляліся арганізацыйна-прапагандысцкімі цэнтрамі. Тут выпускалася 170 падпольных газет, працавала 168 радыёстанцый, праводзіліся гутаркі і лекцыі, дэманстраваліся кінафільмы, урачыста адзначаліся святы. Як бачна, у часы вайны партызанская барацьба знаходзілася ў полі зроку і вялася пад непасрэдным кіраўніцтвам законспіраваных падпольных партыйных структур.

У сучаснай гістарычнай літаратуры барацьба беларускага народа супраць акупантаў часам груба фальсіфікуецца. Некаторые гісторыкі даходзяць да сцвярджэння, быццам бы партызанскі рух фарміраваўся з выкарыстаннем тэрору, прымусу. Не адмаўляючы асобных фактаў прымусу і пакрыўджанасці партызанамі асобных людзей (такія эпізоды калі – нікалі адбываліся), можна з упэўненасцю сцвярджаць, што сіла партызанскага руху была ў яго сувязі з народам. Партызанскія атрады фарміраваліся на аснове патрыятычных пачуццяў насельніцтва, а ўвогуле партызанскі рух у БССР стаў сапраўднай нацыянальнай справай беларусаў: больш за 80% удзельнікаў партызанскіх атрадаў і злучэнняў складалі асобы беларускай нацыянальнасці. У партызанскім руху ўдзельнічала 7175 настаўнікаў і 34342 навучэнцы, з якіх каля 5 тыс. з'яўляліся піянерамі. Партызаны ваявалі з фашыстамі і іх памагатымі, якіх за свае дзеянні ў час вайны насельніцтва называла бандытамі. За гераізм і мужнасць 140 тыс. беларускіх партызан і падпольшчыкаў былі узнагароджаны ордэдамі і медалямі, 88 чалавек атрымалі званне Героя Савецкага Саюза [9, с. 133].

Аб'ектыўна-слушнымі застаюцца словы тых беларускіх гісторыкаў, якія пішуць аб шырокім усенародным удзеле беларускага народа ў барацьбе супраць германскіх захопнікаў, што з'явілася адным з рашаючых фактараў перамогі Савецкага Саюза ў вайне з гітлераўскай Германіяй і яе саюзнікамі.

**3. Дзейнасць ваенных фарміраванняў Арміі Краёвай і Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў.** У гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі дзейнічала польская Армія Краёва (АК – акаўцы). Армія Краёва – падпольнае ваеннае фарміраванне, створанае ў лютым 1942 г. на базе «Саюза ўзброенай барацьбы» па загаду польскага кіраўніцтва ў Лондане. Каля 14 тыс. чал. Арміі Краёвай знаходзіліся ў раёне гарадоў Ліда, Навагрудак, Ваўкавыск, Ашмяны, Жалудок, Шчучын, Валожын, Гродна, Брэст і г.д.

Галоўнай задачай фарміравання з'яўлялася барацьба за аднаўленне Польскай дзяржавы ў межах да 1 верасня 1939 г. Цэнтр камандавання Арміяй Краёвай знаходзіўся ў Варшаве. Ён падпарадкоўваўся ўраду

Репозиторий ВГУ

У. Сікорскага ў Лондане. Работу Арміі Краёвай у заходніх абласцях Беларусі накіроўвалі віленскі, баранавіцкі, брэсцкі, беластоцкі, лідскі, навагрудскі каменданты акруг. Строга захоўвалася канспірацыя. Ксяндзы прымалі ў байцоў прысягу. Галоўнымі камендантамі (камандуючымі) Арміі Краёвай былі генералы С. Равецкі (да 30 чэрвеня 1943 г.), Т. Камароўскі (да падаўлення "Варшаўскага паўстання", 1944 г.), Л. Акуліцкі (памёр 24 снежня 1946 г. у маскоўскай турме Бутырка).

Армія Краёва прытрымлівалася лозунга «двух ворагаў» і вяла барацьбу на два франты – супраць немцаў і супраць бальшавікоў. Дзейнічала правіла акаўцаў: «Стаяць са зброяй ля нагі!», г.зн. не выступаць супраць гітлераўцаў, а чакаць: няхай гітлераўцы і бальшавікі знішчаюць адзін аднаго, а мы потым самі прымусім іх да пакоры і падначалення. У той час, калі гітлераўцы пачнуць адступаць, а Чырвоная Армія яшчэ не падыдзе, меркавалася разгарнуць узброеныя сілы як веер (план і насіў назву «Веер»), захапіць уладу ў населеных пунктах Заходняй Беларусі і сустрэць савецкія воінскія часткі, як сустракаюць гаспадары гасцей

У асобных выпадках акаўцы ваявалі з савецкімі партызанамі і насельніцтвам. У Навагрудскай акрузе з восені 1943 г. і да лета 1944 г. яны правялі 81 аперацыю супраць беларускіх партызан. Не дасягнуўшы поспехаў у барацьбе з партызанамі , акаўцы жорстка распраўляліся з мірнымі жыхарамі, рабавалі і палілі цэлыя вёскі. У вёсцы Лукашы Заслаўскага раёна яны жыўцом спалілі 26 чалавек. Легіянеры Стаўбцоўскага злучэння Арміі Краёвай забілі 6000 партызан і мірных жыхароў Беларусі [9, с. 138]. Разам з тым Армія Краёва змагалася і з нямецкімі акупантамі. На іх рахунку ўзарваныя эшалоны праціўніка, знішчаныя фашысцкія салдаты і афіцэры. У той жа Навагрудскай акрузе ў 1942–1944 гг. атрады Арміі Краёвай правялі 102 баі з гітлераўцамі. Мясцовае насельніцтва заходніх абласцей Беларусі савецкіх партызан называла «чырвонымі», удзельнікаў Арміі Краёвай «белымі», або легіянерамі, польскіх партызан, якія падпарадкоўваліся камандаванню Войска Польскага і Чырвонай Арміі, – «зялёнымі» партызанамі. Адкрытай барацьбы з савецкімі партызанамі ў 1941 – пачатку 1943 г. польскія ваенныя фарміраванні не вялі, іншы раз па-сяброўску адносіліся да беларускіх партызан, ратавалі палонных, параненых, але, як бачна, былі і шматлікія сутычкі.

Пасля вызвалення Беларусі акаўцы спрабавалі супрацьстаяць устаноўкам савецкай улады. Як адзначае прафесар Я. Новік, адзіным спосабам існавання акаўцаў, ад завяршэння вайны і да сярэдзіны 1950-х гг, быў прымітыўны бандытызм, густа афарбаваны нянавісцю да савецкай улады [9, с. 139].

Месца і роля Арміі Краёвай у сучаснай навуковай літаратуры разглядаюцца па-рознаму. Частка польскіх вучоных антысаветызм і ваенныя аперацыі акаўцаў супраць савецкіх партызан тлумачуць тым, што

Репозиторий ВГУ

іх на гэта справакавалі Сталін і беларускія партызаны. Пры гэтым такія гісторыкі робяць спасылку на неправамернасць заключанага 23 жніўня 1939 г. дагавору паміж Молатавым і Рыбентропам. Ёсць айчынныя гісторыкі, публіцысты, палітыкі, якія падзяляюць падобны падыход і выказваюцца за прызнанне ўдзельнікаў Арміі Краёвай ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Але большасць гісторыкаў, прыводзячы прыклады рабаўніцтва і жорсткага абыходжання акаўцаў з насельніцтвам, называюць дзеянні Арміі Краёвай недальнабачнымі, разбойнымі і здраніцкімі.

На поўдні Беларусі ў 1942–1943 гг. дзейнічалі ваенныя фарміраванні-Арганізацыі ўкраінскіх нацыяналістаў (АУН). Арганізацыя гэта ўзнікла як палітычная рэакцыя на прыгнёт украінскага насельніцтва Польшчай яшчэ ў 1929 г. Яе стварыў палкоўнік пятлюраўскай арміі Канавалец, пасля яго арганізацыю ўзначаліў палкоўнік Мельнік, а маладое крыло – Бандэра. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны АУН заключыла палітычнае пагадненне аб сумесных дзеяннях супраць СССР з гітлераўскай ваеннай разведкай. Германія выдзеліла аўнаўцам 2,5 млн рэйхсмарак (не лічачы зброі, шпіёнскай і ваеннай амуніцыі). 22 чэрвеня 1941 г. два легіёны аўнаўцаў (больш за 400 чал.) разам з дывізіямі вермахта перайшлі дзяржаўную мяжу СССР. Як не раз паўтараў Бандэра: “Наша ўлада павінна быць страшнай”. Яна такой і была. Па падліках вучоных, толькі ў першыя дні акупацыі ў заходніх абласцях Украіны аўнаўцы замардавалі 40 тыс. мірных жыхароў.

30 чэрвеня 1941 г. у Львове яны абвясцілі незалежную Саборную Украіну. З гэтай нагоды створаны імі ўрад паслаў прывітанне Гітлеру. Але Гітлер, як заваёўнік, не думаў аб стварэнні на акупаваных тэрыторыях самастойных дзяржаў. Ён загадаў распусціць урад Стацко, арыштаваць ініцыятараў яго арганізацыі. Былі праведзены масавыя арышты і нават расстрэлы аўнаўцаў, пасля чаго многія з іх узяліся за зброю для барацьбы з акупантамі. Адным з падраздзяленняў АУН з’яўлялася арганізацыя бульбаўцаў (па мянушцы кіраўніка арганізацыі Бараўца). Бульбаўцы таксама прэтэндавалі на ролю барацьбітоў за самастойную Украіну. Да сярэдзіны 1943 г. фарміраванні бандэраўцаў і бульбаўцаў актыўных баявых дзеянняў супраць савецкіх партызан не вялі, у асобных выпадках у лясах Брэстчыны і Піншчыны сядзелі побач каля аднаго вогнішча, дапамагалі інфармацыяй, вызвалялі вязняў з нямецкіх турмаў. Аднак летам 1943 г. яны змянілі сваю пазіцыю: у адносінах да гітлераўцаў занялі тактыку пасіўнай абароны, да савецкіх партызан - барацьба. У 1944 г. АУН стварыла шэраг новых узброеных фарміраванняў, аб’яднаных ва ўкраінскую паўстанцкую армію (УПА). На пераломе 1944–1945 гг. УПА складала да 150 тыс. (па іншых ацэнках да 500 тыс.) байцоў і ўдзельнікаў падполля. Яны вялі ўзброеную барацьбу супраць салдат і афіцэраў Чырвонай Арміі, праводзілі тэрарыстычныя акты, забойствы партыйных, савецкіх і гаспадарчых кіраўнікоў, грамадскіх актывістаў. Іх дзеянні былі

Рэпазіторый ВГУ

скіраваны на стварэнне незалежнай украінскай дзяржавы, у склад якой павінны былі ўвайсці таксама землі паўднёвай Беларусі. Рух бандэраўцаў , як і акаўцаў, працягваўся аж да пачатку 50-х гг. пакуль яны не былі вылаўлены савецкімі сілавымі структурамі і аддадзены пад суд. Існавалі на тэрыторыі Беларусі таксама невялікія антыфашысцкія групы беларускага нацыянальнага руху, але яны не мелі значнага ўплыву.

Спасылкі

1. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944). Документы и материалы. Т. 1. – Минск, 1967.

2. Дорофеенко, Н.В. Витебская областная партийная организация в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – 1945гг.) / Н.В. Дорофеенко // Тезисы докладов научно-теоретической конференции на тему«История Витебской областной партийной организации: традиции и преемственность», Витебск, 16 окт. 1987 г. – 65 с.

3. История Коммунистической партии Советского Союза: в 6 т. / гл. ред.: П. Поспелов (пред.) [и др.], Т.5. кн.1. Коммунистическая партия накануне и в годы Великой Отечественной войны, в период упрочения и развития социалистического общества (1938–1958 гг.). Книга первая (1938–1945 гг.). – М., Политиздат, 1970. – 723 с. с илл.

4. Витебщина освобожденная: октябрь 1943 – декабрь 1945: док. и материалы / сост.: Н.В. Воронова [и др.]. – Витебск: Витеб. Обл. Тип., 2009. – 584 с. [24] с ил. – (Серия «Память Витебщины».

5. Мандрик, И.В. Важнейшие слагаемые Победы советского народа в Великой Отечественной войне / И.В. Мандрик // Ученые записки УО «ВГУ им. П.М.Машерова»: сб. науч. тр. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2012. – Т. 13. – С. 5–16.

6. Мандрик, И.В. Отпор врагу. Мужество и самоотверженность железнодорожников Беларуси в годы Великой Отечественной войны / И.В. Мандрик // Материалы Междунар. научн. конф. «Вторая Мировая война и послевоенное устройство мира. (27–28.09.2010). – Брест: БрГТУ, 2010. – С. 155–161.

6а. Памяць: Гіст.-дакум.хроніка Віцебска: у 2 кн. Кн. 1 / рэд.кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш.; маст.Э.Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2002. – 648 с.: іл.

7. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5.Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш]; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Экоперспектіва, 2007. – 613 с.; іл.

8. Гісторыя Беларусі: ХХ ст.: вучэб. дапам. для 10–11-х кл. сярэд. шк. / М.В. Біч, У.Н. Сідарцоў, В.М. Фамін; пад рэд. У.Н. Сідарцова. – Мн.: Нар.асвета, 1992. – 336 с.

9. Новік, Я.К., Новік, Н.Я. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): курс лекцый / Беларус. дзярж. ун-т інфарматыкі і радыёэлектронікі. – 2006. – 185 с.

10. Мандрык І.В. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі). – Віцебск: ВФ УА ФПБ МІПСА, 2009. – 276 с.

11. Иоффе, И.Г. Абвер, полиция безопасности и СД, тайная полевая полиция, отдел “Иностранные армии –Восток” в западных областях СССР. Стратегия и тактика. 1939–1945 гг. / Э.Г. Иоффе. – Минск: Харвест, 2007. – 384 с.:16 л.

## ТЭМА 17. Вызваленне Беларусі. Завяршэнне Вялікай Айчыннай вайны

1. Першы этап вызвалення тэрыторыі рэспублікі ад акупантаў.

2. Поўнае вызваленне тэрыторыі ад фашысцкай акупацыі. Завяршэнне вайны.

3. Асноўныя фактары перамогі савецкага народа.



Репозиторий ВГУ

**1. Першы этап вызвалення тэрыторыі рэспублікі ад акупантаў.** Пасля разгрому нямецкіх войск пад Курскам восенню 1943 г., пачалося выгнанне акупантаў з тэрыторыі БССР. Па часе яно доўжылася амаль год, з верасня 1943 г. да ліпеня 1944 г. На першым этапе (восень–зіма 1944 г.) войскі Заходняга і Калінінскага франтоў падчас Смаленскай наступальнай аперацыі (7 жніўня–2 кастрычніка 1945 г.) выйшлі да межаў Беларусі на магілёўскім і віцебскім напрамку. Адначасова войскі Цэнтральнага фронту ва ўзаемадзеянні з войскамі Бранскага фронту падчас правядзення Чарнігаўска–Прыпяцкай аперацыі (26 жніўня–30 верасня 1943 г.) выйшлі да Дняпра, Прыпяці і Сожа, захапілі тут плацдарм і стварылі спрыяльныя ўмовы для вызвалення паўднёва – усходніх раёнаў Беларусі. 22 верасня 1943 г. войскі Цэнтральнага фронту вызвалілі першы раенны цэнтр рэспублікі – г. Камарын Палескай вобласці. 27 верасня быў вызвалены райцэнтр Церахаўка Гомельскай вобласці. У гэты ж час войскі Бранскага фронту выйшлі да ракі Сож і 26 верасня вызвалілі раённы цэнтр Хоцімск Магілёўскай вобласці. Да канца верасня 1943 г. гітлераўцы былі выбіты з Клімавіч, Касцюковіч, Крычава; Чырвоная Армія выйшла на подступы да Віцебска, Рагачова, Магілёва.

У лістападзе 1943 г. быў вызвалены буйны прамысловы і культурны цэнтр рэспублікі – г. Гомель, а таксама абласны цэнтр Мозыр. Усяго ў час восеньска-зімовага 1943/44 гг. наступлення Чырвоная Армія вызваліла часткова або цалкам 40 раёнаў і 2 абласныя цэнтры (асобныя аўтары пішуць аб вызваленні да гэтага часу толькі 36 раёнаў) [1, с. 266].

Поспеху Чырвонай Арміі ў настуленні спрыялі ў значнай ступені актыўныя дзеянні беларускіх партызан. Яны 19 верасня 1943 г. пачалі другі этап "рэйкавай вайны" пад умоўнай назвай "Канцэрт", які працягваўся да пачатку лістапада 1943 г. Партызаны падарвалі больш за 90 тыс. рэек, 72 чыгуначныя масты, знішчылі больш за 400 км тэлефонна – тэлеграфнай лініі сувязі, падарвалі звыш 1 тыс. эшалонаў) [2, с. 533].

Згодна з планамі Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага мелася на мэце ажыццявіць на гэтым жа этапе разгром нямецкай групоўкі армій "Цэнтр" і вызваліць усю тэрыторыю БССР. У гэтых мэтах 2 кастрычніка 1943 г. войскі Калінінскага фронту пачалі наступленне ў раёне Невеля, прарвалі абарону праціўніка і прасунуліся на тэрыторыю Віцебскай вобласці. 6–8 кастрычніка, штурмуючы кожны дом і кожную агнявую кропку, воіны 84-га стралковага корпуса генерала С. Князькова вызвалілі горад і чыгуначную станцыю Лёзна. Наступны ўдар быў скіраваны на Віцебск. Але не маючы перавагі перад праціўнікам у жывой сіле і тэхнічным забеспячэнні, фізічная стомленасць чырвонаармейцаў, нягледзячы на высокі патрыятычны ўздым воінаў, не дазволіла авалодаць Віцебскам, як планавалася, да 10 кастрычніка 1943 г.

На працягу лістапада 1943 г.савецкія часткі і злучэнні атрымалі папаўненне і прыступілі да Гарадоцкай аперацыі. У выніку яе правядзення

Репозиторий ВГУ

(13–31 снежня 1943 г.) было вызвалена 1220 населеных пунктаў, знішчана больш за 65 тыс. салдат і афіцэраў, захоплена ў палон 3300 гітлераўцаў. Значныя страты падчас гэтай аперацыі панесла Чырвоная Армія: яны склалі 168902 чалавекі, у тым ліку 43551 – безваротныя [3, с. 226]. Адначасова з дзеяннямі на віцебскім, аршанскім і магілёўскім напрамках , Чырвоная Армія разгарнула наступленне на гомельска-бабруйскім напрамку. Наступленне на гэтым кірунку пачалося 15 кастрычніка. 16 кастрычніка быў вызвалены гарадскі пасёлак Лоеў. Затым, пасля кароткай падрыхтоўкі, савецкія часткі пачалі Гомельска-Рэчыцкую аперацыю. Вынікі аперацыі былі ўнушальнымі. Было вызвалена каля 300 населеных пунктаў, у тым ліку Прапойск (Слаўгарад), Карма ,Журавічы, а 26 лістапада 1943 г. – Гомель.

З 8 па 20 студзеня 1944 г. Беларускі фронт правёў яшчэ адну вельмі значную аперацыю – Мазырска-Калінкавіцкую. Падчас яе правядзення разгромлена вялікая групоўка фашыстаў, вызвалены другі абласны цэнтр – Мазыр і важны чыгуначны вузел Калінкавічы. Апошняй значнай аперацыяй першага этапа вызвалення Беларусі была Рагачоўская. Праведзена яна 21–25 лютага 1944 г. Савецкія войскі фарсіравалі Днепр, перарэзалі чыгунку Магілёў–Жлобін і 24 лютага вызвалілі Рагачоў. Такім чынам, да лета 1944 г. Чырвоная Армія вызваліла тры чвэрці акупаванай тэрыторыі СССР, у тым ліку "ачысціла" ад нямецкіх войскаў прыкладна 20% тэрыторыі БССР.

На тэрыторыі Віцебскай вобласці на 15 красавіка 1944 г. (гэты час адносіцца да першага этапа вызвалення Беларусі) цалкам былі вызвалены Суражскі, Мехаўскі, Гарадокскі раён. У Дубровенскім, Лёзненскім, Расонскім, Полацкім, Сіроцінскім і Віцебскім раёнах да лета 1944 г. Чырвоная Армія вызваліла толькі асобныя сельсаветы. Так, у Дубровенскім – з 19 сельскіх саветаў вызвалена 10, у Лёзненскім з 20 – 15, у Расонскім з 16 – 6. У Полацкім з 19 – 3, у Сіроцінскім з 15 – 4, у Віцебскім вызваленымі да гэтага часу аказаліся толькі 3 сельсаветы [4, с. 1–20]. Адметнай асаблівасцю першага этапу па вызваленні рэспублікі быў шырокі ўдзел у баявых аперацыях партызанскіх фарміраванняў, За перыяд з лістапада 1943 г. па красавік 1944 г. з рэгулярнымі часткамі злучылася 35 партызанскіх брыгад і 15 асобых атрадаў з агульнай колькасцю 50 тыс. чалавек, палова з іх была накіравана ў дзеючую армію. Значная частка ўлілася ў падпольныя і партызанскія структуры, асобныя – ў працэс аднаўлення народнай гаспадаркі на вызваленых тэрыторыях.

**2. Поўнае вызваленне тэрыторыі ад фашысцкай акупацыі. Завяршэнне вайны.** Поўнае вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адбываецца на другім этапе ў 1944 г., у час Беларускай наступальнай аперацыі, якая ўвайшла ў гісторыю пад кодавай назвай "Баграціён". Аперацыя пад такой назвай праведзена Чырвонай Арміяй



Репозиторий ВГУ

23 чэрвеня – 29 жніўня 1944 г. Пры падрыхтоўцы і правядзенні аперацыі перад савецкай арміяй ставілася задача разграміць германскую групоўку армій “Цэнтр”, вызваліць усю тэрыторыю Беларусі, пакласці пачатак вызваленню Літвы і Польшчы. На пачатку аперацыі фронт на Беларусі праходзіў на ўсход ад Полацка (возера Нешчарда), Віцебска, Оршы, Магілёва, Жлобіна і далей да Ковеля. Лінія даўжынёй 1100 км утварала так званы “беларускі выступ” (балкон). Планавалася ў час аперацыі прарваць абарону праціўніка на 6 участках Віцебскага, Аршанскага, Магілёўскага і Бабруйскага напрамкаў, расчляніць яго войскі і разбіць. Зрабіць гэта было нялёгка: на тэрыторыі Беларусі вораг стварыў глыбокаэшаланіраваную (250–270 км) абарону з умоўнай назвай “Фатэрлянд”, якая абапіралася на развітую сістэму палявых умацаванняў і прыродныя рубяжы (высокія заходнія берагі рэк, забалочанасць і г.д.). Для ажыццяўлення аперацыі “Баграціён” савецкае ваеннае камандаванне вылучыла велізарныя сілы: 2,4 млн чалавек (Германія мела 1,2 млн салдат). Шматразовая перавага Чырвонай Арміі наглядалася ў колькасці танкаў і самалётаў. Асаблівае значэнне пры гэтым надавалася Віцебскаму і Бабруйскаму напрамкам.

Раніцай 23 чэрвеня пасля магутнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі 1-ы Прыбалтыйскі (камандуючы І.Х. Баграмян), 2-гі Беларускі (Г.В. Захараў), 3-ці Беларускі (І.Д. Чарняхоўскі) франты перайшлі ў наступленне на Віцебскім, Аршанскім, Магілёўскім напрамках. 24 чэрвеня пачалі наступленне войскі 1-га Беларускага фронту на Бабруйскім напрамку. Віцебская група нямецкіх войск была да 27 чэрвеня акружана і разбіта. Віцебск вызвалены 26 чэрвеня. 108 жыхароў сустрэлі армію вызваліцеляў [5, с. 72].

3 ліпеня 1944 г. быў вызвалены Мінск. На ўсход ад Мінска савецкія войскі акружылі 105-тысячную групоўку немцаў. На гэтым рубяжы завяршыўся першы этап Беларускай аперацыі. У выніку галоўныя сілы арміі “Цэнтр” былі разбіты, з’явіліся магчымасці імклівага наступлення на Захад.

На другім этапе аперацыі (з 5 ліпеня па 29 жніўня) былі ажыццёўлены наступленні на Віленскім, Беластоцкім, Любліна-Брэсцкім, Шаўляйскім напрамку. З вызваленнем 28 ліпеня Брэста выгнанне нямецка-фашысцкіх захопнікаў з тэрыторыі Беларусі закончылася. Да 29 жніўня савецкія войскі вызвалілі большую частку Літвы, частку Латвіі, усходнія раёны Польшчы і падышлі да граніц Германіі. Разгром нямецка-фашысцкіх войск у Беларусі ўвайшоў у гісторыю як адна з найважнейшых бітваў Вялікай Айчыннай вайны. Паражэнне гітлераўцаў на Беларусі ў 1944 г. многія гісторыкі ацэньваюць як катастрофу вермахта, а некаторыя і як канчатковае паражэнне Германіі.

Сапраўды, бітва за Беларусь стала адной з найбуйнейшых катастроф Германіі. Толькі ў ходзе аперацыі “Багратыён” было разбіта 28 дывізій групы “Цэнтр” з 38. Страты фашыстаў склалі больш за 380 тыс. чал. Савецкія войскі падышлі да мяжы Усходняй Прусіі, што стварыла добрыя

Рэпазіторый ВДУ

ўмовы для далейшага наступлення і параможнага завяршэння Другой сусветнай вайны.

Працяг вайны супраць нямецка-фашысцкіх войск ажыццяўляўся і за межамі тэрыторыі СССР. Чырвоная Армія граміла фашысцкія орды на польскай, чэхаславацкай, венгерскай, румынскай, балгарскай тэрыторыях.

Рашаючае значэнне для разгрому нямецка-фашысцкай Германіі мела Берлінская аперацыя (16 красавіка – 8 мая 1945 г.). 8 мая прадстаўнікі звергнутай Германіі падпісалі акт аб безагаворачнай капітуляцыі. У гонар параможнага завяршэння Вялікай Айчыннай вайны супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў дзень 9 мая 1945 г. быў аб’яўлены Днём усенародных урачыстасцей – святам Перамогі.

**3. Асноўныя фактары Перамогі савецкага народа.** У барацьбе супраць фашысцкага блока ў гады Другой сусветнай вайны прымалі ўдзел народы многіх краін, іх намаганні і стойкасць бяспрэчны. Разам з тым аб'ектыўны падыход да гістарычных фактаў 1941–1945 гг. сведчыць аб рашаючай ролі Чырвонай Арміі ў вызваленні народаў Еўропы і Азіі ад фашысцкага рабства, у выратаванні сусветнай цывілізацыі. Чырвоная Армія разбіла галоўныя сілы ваеннай машыны агрэсараў. З 13,6 млн чалавек, што страціла гітлераўская Германія за час Другой сусветнай вайны, 10 млн знайшлі сабе магілу на ўсходнім фронце. Страты нямецка-фашысціх войск на савецка-германскім фронце былі ў 4 разы большыя, чым на заходнееўрапейскім і міжземнаморскім тэатрах ваенных дзеянняў [6, с. 35].

Асноўнымі фактарамі, што забяспечылі СССР перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, з’яўляюцца адзінства савецкага грамадства і патрыятызм народаў усіх рэспублік вялікай краіны. Вайна супраць акупантаў насіла ўсенародны характар. Людзі, што насялялі СССР, з’ядналіся перад агульнай для ўсіх бядой, розумам і сэрцам адчулі, што ў гэтым іх адзіны паратунак. Гэта акалічнасць і стала першай і самай важнай перадумовай немінучага паражэння Германіі. Былі, канечне, у краіне, у тым ліку і ў Беларусі, людзі пакрыўджаныя, маладушныя, якія знаходзіліся на баку ворага – калабарацыяністы (людзі, якія пайшлі на супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі). Сумленная ж частка насельніцтва пакінула ўсе крыўды ўбаку, стала на абарону свайго дома, сваёй краіны. За гераізм і мужнасць, праяўленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, звыш 300 тыс. воінаў – беларусаў і ўраджэнцаў рэспублікі былі ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі, 441-му з іх прысуджана званне Героя Савецкага Саюза, 65 змагароў сталі поўнымі кавалерамі ордэна Славы) [7, с. 319].

Не спраўдзіліся надзеі фашысцкіх стратэгаў на нацыянальны разлад у СССР. Гістарычны факт: у час вайны наша краіна не ведала нацыянальных спрэчак, усенародная бяда зблізіла ўсіх. Бежанцы і эвакуіраваныя знаходзілі прытулак за тысячы кіламетраў. Агульную зямлю-Радзіму абаранялі прадстаўнікі ўсіх нацый і народнасцей.

Рэпазіторый ВГУ

Рашаючым фактарам перамогі стала арганізатарская дзейнасць КПБ – КПСС. Кіруючая партыя вялікай краіны ў час вайны была сапраўдным авангардам [8, с. 80]. Ніколі партыя так поўна не выступала менавіта ў гэтай якасці, як у гады Вялікай Айчыннай вайны. Мільёны яе членаў сумленна і самааддана выконвалі свой доўг перад народам, знаходзіліся ў цэнтры ратнага і працоўнага жыцця. У разведцы, у баю, паўсюдна, дзе была найбольшая небяспека, камуністы сваім прыкладам падымалі баявы дух, натхнялі байцоў на гераічныя ўчынкі.

З годнасцю выканаў свой абавязак перад Радзімай і ўсім чалавецтвам беларускі народ. Гераічныя ўчынкі ўраджэнцаў Беларусі на фронце, партызанская барацьба, падпольны рух, масавае супраціўленне акупантам мірнага насельніцтва Беларусі ператварыліся ў адзін з рашаючых фактараў разгрому фашыстаў. У барацьбе супраць фашызму загінуў кожны трэці жыхар рэспублікі.

Спасылкі

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. Дапаможнік: у 2 ч. Ч. 2 Люты 1917 г. – 2000 г. / Я.К. Новік, Г.С. Марцуль, Э.А. Забродскі і інш.; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Універсітэцкае, 2000. – 464 с.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч. [і інш]. рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Экоперспектіва, 2007. – 613 с.; іл.

3. Гриф секретности снят: потери Вооруженных Сил СССР в войнах, боевых действиях, военных конфликтах. – М., 1993.

4. НАРБ. – Ф. 4 п. – Оп. 29. – Д. 807.

5. Мандрик, И.В. Очерки истории профсоюзов Витебщины / И.В. Мандрик. – Витебск: Витебская областная типография, 2015. – 504 с.: ил.

6. История Второй Мировой войны 1939–1945: в 12 т. Т. 12. Итоги и уроки Второй Мировой войны. Воениздат. – М., 1982. – 495 с.

7. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. Ч. 2. / М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі [і інш.]; Ін-т гісторыі АНБ. – Мінск: Беларусь, 1995. – 560 с.: іл.

8. Мандрик, И.В. Правящая партия в условиях военного времени / материалы междунар. науч.-практ. конф., Витебск, 24 апр. 2014 г.; Витеб. гос. ун-т; редкол.: А.И. Жук, А.А. Коваленя (отв.ред.) [и др.]. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2014. – 374 с.

Репозиторий ВГУ

ДАДАТАК 1

# ПЫТАННІ ДЛЯ СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАЎ

## Семінар 1. Абвяшчэнне БССР, яе першая Канстытуцыя (люты 1919 г.)

1. Роля Беларускага нацыянальнага камісарыята ў стварэнні ССРБ.
2. Супярэчнасці ў працэсе станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці.
3. Утварэнне КП(б) Беларусі.

**Рэферат.** Пазіцыя аблвыканкамзаха і Паўночна-Заходняга абласнога камітэта па беларускім пытанні.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** Брэсцкі мірны дагавор, Устаўныя граматы Выканаўчага камітэта Рады Усебеларускага з’езда, Беларуская Народная Рэспубліка, Народны Сакратарыят БНР, Рада БНР, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў, Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў, Расійская Савецкая Федэратыўная Сацыялістычная Рэспубліка, Заходняя вобласць (Заходняя камуна), “ваенны камунізм”, харчовыя атрады, камбеды, Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі, Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, ІУсебеларускі з’езд Саветаў, Канстытуцыя БССР 1919 г., Літоўска-Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка.

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэмы.** 1. Вызначце погляды і дзеянні розных палітычных сіл па пытаннях рэвалюцыі, вайны і нацыянальнай дзяржаўнасці пасля Лютаўскай рэвалюцыі. 2. Дзе, у якіх структурах знаходзіўся ў Беларусі апорны пункт сацыялістычнай рэвалюцыі? 3. Калі і якім чынам была абвешчана Беларуская Народная Рэспубліка і утворана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка? 4. Раскажыце, на якіх умовах падпісаны Брэсцкі мір.

Літаратура

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. Дапам: у 2 ч. Ч. 2.; пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 61–71.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэд.кал. М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экоперспектива, 2007. – С. 105–115.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык // Віцебск: УА ФПБ “МІПСА” ВФ, 2009. – С. 175–178.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. Ч. 2. / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 40–58.

5. Спіс дадатковай літаратуры па тэме трэба глядзець у канцы тэксту метадычных указанняў па авалоданні зместам вывучаемага раздзела, а таксама і той, што рэкамендуецца асабіста прафесарам.

Репозиторий ВГУ

**Семінар 2. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў 1921–1927 гг.**

1. Абумоўленасць утварэння адзінай савецкай дзяржавы. Удзел БССР у стварэнні СССР.

2. Рэалізацыя ідэі нацыянальнага аб'яднання. Узбуйненне БССР.

3. Адміністратыўна-тэрытарыяльная рэформа, нацыянальныя раёны і саветы Беларусі.

4. Канстытуцыя БССР 1927 года.

**Рэфераты 1.** Дэлегацыя БССР на І з'ездзе Саветаў Саюза СССР: склад, прапановы аб суадносінах рэспублік пад час супольнага жыцця.

**2.** Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў БССР на этапе 20-х гг. ХХ ст.: складанасці, вынікі.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** дзяржава, заканадаўчыя органы ўлады, інтэграцыя, кааліцыя, канстытуцыя, канфедэрацыя, нацыя, нейтральная дзяржава, пакт, прававая дзяржава, ратыфікацыя, рэспубліка, суверэнітэт, унітарная дзяржава, унія, федэралізм, федэрацыя.

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння.** 1. Якія меркаванні меліся ў кіраўнікоў БССР па пытанню аб'яднання з РСФСР? 2. Пакажыце ролю IV Усебеларускага з'езду саветаў (14–18.12.1922 г.) у працэсе аб'яднання БССР з іншымі рэспублікамі. 3. Растлумачце прычыны супярэчлівасці працэсу нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва БССР ў 20-я гг. 4. Пацвердзіце неабходнасць і справядлівасць рашэнняў па ўзбуйненні тэрыторыі БССР, якое адбылося ў 1924 і 1926 гг. 5. Адшукайце і пакажыце станоўчыя фактары, якія садзейнічалі эканамічнаму, сацыяльнаму і культурнаму развіццю БССР пры ўваходжанні ў СССР. 6. Прааналізуйце і пакажыце этапы адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1924–1938 гг.

Літаратура


1. Гісторыя Беларусі: вучэб. Дапам: у 2 ч. Ч. 2.; пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 140–144.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэд.кал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектива, 2007. – С. 179–195.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык // Віцебск: УА ФПБ "МІПСА" ВФ, 2009. – С. 186–193.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. Ч. 2. / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 59–62.

5. Спіс дадатковай літаратуры па тэме трэба глядзець у канцы тэксту метадычных указанняў па авалоданні зместам вывучаемага раздзела, а таксама і той, што рэкамендуецца асабіста прафесарам.


Рэпазіторый ВГУ

**Семінар 3. Ажыццяўленне індустрыялізацыі ў БССР. Пераход да пяцігадовых планаў, іх канчатковыя вынікі**

1. Прамысловасць Беларусі ўаднаўленчым перыядзе. 2. Перадумовы індустрыялізацыі ў СССР і БССР. 3. Асаблівасці і цяжкасці ажыццяўлення індустрыялізацыі ў рэспубліцы. 4. Першыя пяцігадовыя планы, іх выкананне. 5.Вынікі індустрыялізацыі ў БССР, яе значэнне.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** гаспадарчы разлік, індустрыялізацыя, інтэнсіўныя фактары развіцця эканомікі, мадэрнізацыя, манаполія ў вытворчасці, НЭП, падзел працы, прадукцыйнасць працы, прамысловаць легкая, цяжкая прамысловаць, экстэнсіўны шлях, экстэнсіўныя фактары развіцця эканомікі.

**Рэферат:** Развіццё новых галін вытворчасці на Беларусі (з прыкладамі мясцовага развіцця на Віцебшчыне).

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэмы**

1. Растлумачце сутнасць НЭПа і пакажыце асаблівасці яе ўкаранення на Беларусі. 2. Растлумачце паняцці "прамысловая рэвалюцыя" і "індустрыялізацыя". 3. Калі быў узят курс на індустрыялізацыю краіны? Чым гэта было выклікана? 4. У чым заключаліся асаблівасці індустрыялізацыі БССР? 5. Дзе і калі быў прыняты першы план развіцця народнай гаспадаркі БССР? Якія задачы ў галіне прамысловасці ён ставіў і як быў выкананы? 6. Назавіце асноўныя крыніцы капіталаўкладанняў у ажыццяўленне індустрыялізацыі БССР? 7. Як вырашаліся ў час індустрыялізацыі праблемы падрыхтоўкі рабочых інжынерна-тэхнічных кадраў? 8. Назавіце найбуйнейшыя новабудоўлі першай і другой пяцігодак. 9. Якімі былі вынікі двух пяцігодак у цэлым? Якія негатыўныя з'явы мелі месца ў ходзе іх выканання? 10. Якую ролю ў выкананні заданняў першых пяцігодак адыграла сацыялістычнае спаборніцтва і ў прыватнасці стаханаўскі рух? 11. Якія маральныя стымулы прымяняліся для павышэння актыўнасці працаўнікоў, як яны ўплывалі на прадукцыйнасць працы? 12. Як змены ў прамысловасці рэспублікі за гады першых пяцігодак паўплывалі на становішча рабочага класа і сялянства?

Літаратура

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. Дапам: у 2 ч. Ч. 2.; пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 117–127.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэд.кал. М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экоперспектива, 2007. – С. 267–275.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык // Віцебск: УА ФПБ "МІПСА" ВФ, 2009. – С. 190–194.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. Ч. 2 / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 183–200.

5. Спіс дадатковай літаратуры па тэме трэба глядзець у канцы тэксту метадычных указанняў па авалоданні зместам вывучаемага раздзела, а таксама і той, што рэкамендуецца асабіста прафесарам.



Репозиторий ВГУ

## Семінар 4. Палітыка камуністычнай партыі на вёсцы ў 20–30-я гг.

1. Перадумовы кааперыравання аднаасобных сялянскіх гаспадарак. Развіццё сельскай гаспадаркі ва ўмовах нэпа.

2. Ажыцяўленне суцэльнай калектывізацыі: шляхі, тэмпы, сродкі, метады.

3. МТС, іх значэнне ў сельскагаспадарчай вытворчасці.

4. Вынікі і значэнне калектывізацыі ў БССР.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** абшчына, валока, валюнтарызм, запрыгоньванне, кааперацыя, камуна, сельскагаспадарчая арцель, ТОЗ, калектывізацыя, меліярацыя, нацыяналізацыя зямлі.

**Рэферат:** Раскулачванне, прымусовыя высылкі, рэпрэсіі (пажадана на матэрыялах з гісторыі Віцебшчыны).

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння.** 1. Растлумачце палітыку партыі бальшавікоў па аграрных пытаннях пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. 2. Пакажыце сутнасць Дэкрэта аб вольным выбары формы землекарыстання. 3. Назавіце формы кааператыўнага руху на вёсцы ў Беларусі ў першай палове і сярэдзіне 20-х гадоў. 4. Растлумачце прычыны крызісу хлебанарыхтовак, забароны гандлю сельгаспрадуктамі. 5. Назавіце тэрміны правядзення суцэльнай калектывізацыі на Беларусі. 6. Прааналізуйце, як развіваўся кааператыўны рух у беларускай вёсцы ў 1921–1927 гг. 7. Пакажыце станоўчы ўплыў НЭПа на развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі. 8. Якія альтэрнатывы, на ваш погляд, былі ў гэты час да надзвычайных мераў пры вырашэнні аграрнай палітыкі ў дзяржаве. 9. Прааналізуйце дзейнасць Д.Ф. Прышчэпава і яго паплечнікаў у падыходах да правядзення аграрнай палітыкі ў Беларусі.

Літаратура

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. Ч. 2.; пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 128–139.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэд.кал. М.Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экоперспектива, 2007. – С. 276–284.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык // Віцебск: УА ФПБ “МІПСА” ВФ, 2009. – С. 195–199.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. Ч. 2. / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 183–213.

5. Спіс дадатковай літаратуры па тэме трэба глядзець у канцы тэксту метадычных указанняў па авалоданні зместам вывучаемага раздзела, а таксама і той, што рэкамендуецца асабіста прафесарам.

Репозиторий ВГУ

**Семінар 5. Грамадска-палітычнае жыццё ў 20–30-я гг**.

1. Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі: шляхі да адзінаўладдзя.

2. Становішча Саветаў і грамадскіх арганізацый, характар іх дзейнасці.

3. Прафесійныя саюзы,іх функцыі ў савецкай дзяржаве.

4. Утварэнне камсамола, яго адносіны з іншымі маладзёвымі арганізацыям.

5. Нарастанне камандна-адміністрацыйнага стылю кіраўніцтва ў грамадскім жыцці.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** аднапартыйная сістэма, аўтарытарны палітычны рэжым, валюнтарызм, выканаўчыя органы ўлады, дыктатура, дэмакратызацыя, ідэалогія, палітычная партыя, таталітарны палітычны рэжым, шматпартыйная палітычная сістэма.

**Рэферат:** Змены грамадска-палітычнага жыцця ў канцы 20-х гг. Умацаванне таталітарнай тэндэнцыі ў палітыцы Кампартыі.

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэмы.**

1. Пакажыце дзейнасць тых дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, якія складалі грамадска-палітычную сістэму ў СССР. Якая роля тут адводзілася партыі? 2. У якіх пытаннях развіцця краіны ў 20-я гг. вяліся дыскусіі, чым яны заканчваліся? 3. Растлумачце, які сэнс укладваецца ў паняцце “рэжым асабістай улады Сталіна”. 4. Чаму і па якіх прычынах, на ваш погляд, у СССР сфарміравалася камандна-адміністрацыйная сістэма? 5. Што такое нацыянал-дэмакратызм, нацыянал-ухілізм? Каго з беларускіх дзеячаў абвінавацілі ў гэтых ухілах? 6. Растлумачце, чаму ў краіне разгортваўся махавік рэпрэсій.

**Літаратура**


1. Гісторыя Беларусі: Вучэб. дапам. У 2-х ч. Ч.2. Пад. рэд. Я.К.Новіка, Г.С.Марцуля. – Мн., 2000. – С.140-153.

2. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т.5. Беларусь у 1917-1945 гг. / А.Вабішчэвіч [і інш.]; Рэд.калегія. М.Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. - Мінск.: Экоперспектива, 2007. – С.179- 207 .

3. Мандрык, І. У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І. У. Мандрык // Віцебск: УА ФПБ “МІПСА” ВФ, 2009. – С.202-204.

4.Трещенок, Я.И. История Беларуси: учебное пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования. В 2 ч. Ч.2. / Я.И.Трещенок, А.А.Воробьев, Н.М.Пурышева, М.И.Матюшевская; под ред. Я.И.Трещенка. –Могилев: МГУ им.А.А.Кулешова, 2005. – С.64 -93.

5.Спіс дадатковай літаратуры па тэме трэба глядзець у канцы тэксту метадычных указанняў па авалоданні зместам вывучаемага раздзела, а таксама і той, што рэкамендуецца асабіста прафесарам.


Репозиторий ВГУ

**Семінар 6. Культурна-нацыянальныя пераўтварэнні ў сярэдзіне 20–30-х гг. XX ст.**

1. Развіццё асветы і навукі.

2. Літаратура, тэатр, музычнае і выяўленчае мастацтва.

**Рэферат:** Стан адукацыі і навукі ў Віцебскай акрузе (1921–1940 гг.).

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** адраджэнне, беларусізацыя, культура, лібералізм, мецэнат, плюралізм, рэвалюцыя культурная, рэлігія, цывілізацыя.

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэмы.** 1. Дайце адзнаку дзеянням савецкай улады па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці дарослага насельніцтва. 2. Пакажыце ўстановы і арганізацыі, якія прынялі ўдзел у ліквідацыі непісьменнасці, вынікі іх намаганняў. 3. Калі ў БССР было ўведзена ўсеагульнае абявязковае навучанне дзяцей 8–11-гадовага ўзросту? Як выконвалася такая ўстаноўка? 4. У якім годзе было прынята рашэнне аб ажыццяўленні ўсеагульнага абавязковага навучання за курс 7-гадовай школы? Тое ж за курс усеагульнага сярэдняга навучання ў горадзе і завяршэнне 7-гадовага ў вёсцы. 5. Пакажыце дынаміку развіцця сеткі школ, сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў у рэспубліцы, іх рэарганізацыю. 6. Прааналізуйце сістэму падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых у галіне прамысловасці і кадраў масавых прафесій для сельскай гаспадаркі. 7. Вызначце і пакажыце асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў 20-я гады. 8. Пакажыце працэс стварэння ў Беларусі адзінай пісьменніцкай арганізацыі, творчыя дасягненні беларускай літаратуры. 8. Растлумачце ідэалагічную сутнасць кампаній па абвінавачванні і правядзенні рэпрэсій сярод беларускіх пісьменнікаў і навукоўцаў.

**Літаратура**

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. Ч. 2.; пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 158–185.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэд.кал. М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектива, 2007. – С. 210–248.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык // Віцебск: УА ФПБ "МІПСА" ВФ, 2009. – С. 200–207.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. Ч. 2. / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 99–147.

5. Спіс дадатковай літаратуры па тэме трэба глядзець у канцы тэксту метадычных указанняў па авалоданні зместам вывучаемага раздзела, а таксама і той, што рэкамендуецца асабіста прафесарам.

Рэпазіторый ВДУ

**Семінар 7. Стан прамысловасці, сельскай гаспадаркі, асветы і культуры на беларускіх землях у складзе Польшчы**

1. Стан прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў Заходняй Беларусі.
2. Палітычныя, нацыянальныя і сацыяльныя працэсы на заходніх землях Беларусі.
3. Стан асветы і культуры, узровень жыцця народа.
4. Рэвалюцыйна-вызваленчы і нацыянальна-дэмакратычны рух.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** анэксія, асадніцтва, асіміляцыя, аўтаномія, дысідэнты, касцёл, камасацыя, маёмасны цэнз, паншчына, парцэляцыя, рэквізіцыя, талерантнасць рэлігійная, талерантнасць палітычная, канфесія, пацыфікацыя, санацыя, “санітарны кардон”, нацыянальна-вызваленчы рух, рэвалюцыйна-вызваленчы рух, нацыянальна-дэмакратычны рух.

**Рэферат:** Заходнія раёны Віцебшчыны ў складзе Польшчы: нацыянальны і сацыяльны прыгнёт насельніцтва.

**1. Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэмы.** 1. Ахарактарызуйце эканамічнае і палітычнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. 2. Растлумачце сутнасць паняцця “рэжым санацыі”. 3. Пакажыце асноўныя этапы ў развіцці рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. 4. Ахарактарызуйце час стварэння КПЗБ, яе ролю ў гісторыі рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. 5. Раскажыце аб ставарэнні і дзейнасці Камуністычнага Саюза Моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ), назавіце яе кіраўнікоў. 6. Пакажыце ролю ў рэвалюцыйным і нацыянальна-вызваленчым руху Заходняй Беларусі Беларускай Сялянска-рабочай Грамады (БСРГ), Таварыства беларускай школы (ТБШ), рабоча-сялянскага пасольскага клуба “Змаганне”. 7. Раскажыце пра найбольш вядомых кіраўнікоў КПЗБ, КСМЗБ, БСРГ, ТБШ, рабоча-сялянскага пасольскага клуба “Змаганне”, іншых беларускіх палітычных партый і культурна-асветніцкіх арганізацый. Пакажыце, чаму і па якой прычыне была распушчана КПЗБ, як гэта паўплывала на развіццё рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі.

**Літаратура**

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. Ч. 2.; пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 196–212.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А Вабішчэвіч [і інш.]; рэд.кал. М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экоперспектива, 2007. – С. 352–379.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык // Віцебск: УА ФПБ “МІПСА” ВФ, 2009. – С. 210–219.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. Ч. 2. / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 183–214.

5. Спіс дадатковай літаратуры па тэме трэба глядзець у канцы тэксту метадычных указанняў па авалоданні зместам вывучаемага раздзела, а таксама і той, што рэкамендуецца асабіста прафесарам.

Рэпазіторый ВДУ

## Семінар 8. Уклад беларускага народа ў Вялікую Перамогу

1. Дзейнасць партыйных і савецкіх органаў БССР па ўмацаванні абароназдольнасці краіны. Эвакуацыя прадпрыемстваў і насельніцтва Беларусі.

2. Партызанскі, падпольны рух, масавае супраціўленне насельніцтва Беларусі акупантам.

3. Найважнейшыя фактарыы перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

**Вядучыя (апорныя) паняцці:** фашызм, шавінізм, мабілізацыя, партызанскі рух, падпольны рух, гераізм, патрыятызм.

**Рэферат:** Заваяванне сусветнага панавання – стратэгічны план кіраўніцтва Германіі сярэдзіны 30 – першай паловы 40-х гг.

**Пытанні для самакантролю і самастойнага вывучэння тэмы.**

1. Пакажыце палітычную абстаноўку Беларусі напярэдадні вайны. 2. Назавіце мерапрыемствы ўрада БССР па ўмацаванню абароназдольнасці краіны. 3. Назавіце асноўныя формы барацьбы беларускага народа супраць акупантаў. 4. Назавіце ўмовы зараджэння партызанскага і падпольнага руху. 5. Прывядзіце прыклады дзейнасці першых падпольных арганізацый, партызанскіх груп і атрадаў. 6. Ахарактарызуйце структуру і арганізацыйныя формы кіравання партызанскімі фарміраваннямі. 7. Пералічыце асноўныя формы і метады арганізацыйнай, дыверсійна-баявой, масава-палітычнай работы падпольных арганізацый і атрадаў. Раскрыйце іх на канкрэтных прыкладах. 8. Ахарактарызуйце ўзаемаадносіны мясцовага насельніцтва і партызан. 9. Пакажыце асаблівасці партызанскага руху і падпольнай барацьбы ў заходніх абласцях Беларусі. 10. Ацаніце ўклад партызан і падпольшчыкаў у перамогу над ворагам. 11. Дайце ацэнку абывацелям і здраднікам, якія супрацоўнічалі з акупантамі. 12. Адзначце ўклад беларускага народа ў барацьбу супраць фашызму ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 13. Вызначце фактары, якія забяспечылі савецкаму народу перамогу над фашысцкай Германіяй.

### Літаратура

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам.: у 2 ч. Ч. 2.; пад. рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн., 2000. – С. 273–279.

2. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А.Вабішчэвіч [і інш.]; рэд.кал. М. Касцюк (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экоперспектива, 2007 – С. 541–558.

3. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык // Віцебск: УА ФПБ “МІПСА” ВФ, 2009. – С. 222–231.

4. Трещенок, Я.И. История Беларуси: учеб. пособие для студентов учреждений, обеспечивающих получение высшего образования: в 2 ч. Ч. 2. / Я.И. Трещенок, А.А. Воробьев, Н.М. Пурышева, М.И. Матюшевская; под ред. Я.И. Трещенка. – Могилев: МГУ им. А.А. Кулешова, 2005. – С. 218–258.

5. Спіс дадатковай літаратуры па тэме трэба глядзець у канцы тэксту метадычных указанняў па авалоданні зместам вывучаемага раздзела, а таксама і той, што рэкамендуецца асабіста прафесарам.

Репозиторий ВГУ

ДАДАТАК 2

# АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

1. Падрыхтоўка рэфератаў студэнтамі па выбранай тэме (на працягу семестра).

2. Кансультацыі пад час падрыхтоўкі рэфератаў (на працягу семестра па вызначаным графіку).

3. Напісанне кантрольнай работы па тэме: "Асноўныя задачы новай эканамічнай палітыкі і іх рэалізацыя на Беларусі" (красавік).

4. Напісанне кантрольнай работы па тэме:"Ажыццяўленне суцэльнай калектывізацыі ў БССР: шляхі,тэмпы,сродкі, метады" (май).

5. Напісанне эсэ на тэму вызначаную прафесарам(на працягу семестра).

6. Засваенне студэнтамі апорных (вядучых) паняццяў (кантроль за якасцю засваення ажыццяўляецца прафесарам на працягу семестра на практычных занятках і калоквіумах).

7. Выкананне навукова-даследчых работ (згодна з асабістымі схільнасцямі студэнтаў). Тэматыка выбраных кірункаў даследавання вызначаецца на другім тыдні семестра).

8. Удзел студэнтаў у навуковых канферэнцыях, якія праводзяцца на факультэце, ВНУ (май–ліпень ).

9. Правядзенне калоквіумаў (красавік–чэрвень).

10. Індывідуальнае суразмоўства па пройдзеным матэрыяле, адпрацоўка нізкіх адзнак, прапушчаных лекцый і семінарскіх заняткаў (згодна з абставінамі на працягу семестра).

11. Тэсціраванне па модулях (май, чэрвень).

*На працягу семестра ў план самастойнай работы могуць быць унесены нязначныя змены.

Репозиторий ВГУ

ДАДАТАК 3

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ДА ЭКЗАМЕНА (ЗАЛІКА)

1. Эканамічнае і палітычнае становішча на беларускіх землях на рубяжы 1920/1921 гг. Адказ ад палітыкі “ваеннага камунізму”.
2. Пошукі шляхоў выхаду з гаспадарчай разрухі. Прыняцце і ўвядзенне новай эканамічнай палітыкі (НЭП). Мэты, сутнасць НЭПа, яе асаблівасці на Беларусі.
3. Прамысловае будаўніцтва ва ўмовах НЭПа.
4. Стан сельскай гаспадаркі Беларусі ў аднаўленчым перыядзе. Кааператыўны рух.
5. Пагадненні БССР з РСФСР і іншымі рэспублікамі ў часы вайны. Удзел БССР у стварэнні СССР.
6. Узбуйненне БССР у 1924 і 1926 гг. Адміністратыўна-тэрытарыяльныя рэформы 20-х гг. Другая Канстытуцыя БССР (1927 г.).
7. Сістэма савецкай ўлады і грамадска- палітычныя арганізацыі ў 1920-я гг.
8. Кампартыя Беларусі ў 1920-я гг. Утварэнне аднапартыйнай сістэмы.
9. Нацыянальная палітыка ў 1920-я гг. праблемы нацыянальных меншасцяў, улік іх інтарэсаў і ўмоў развіцця.
10. Палітыка беларусізацыі: яе тэарэтычная распрацоўка, супярэчнасці і цяжкасці ў яе правядзенні.
11. Станаўленне і развіццё ў Беларусі савецкай сістэмы адукацыі ў 1920-я гг. Барацьба з непісьменнасцю.
12. Навука і краязнаўства ў БССР у 1920-я гг.
13. Развіццё беларускай савецкай літаратуры ў 1920-я гг.
14. Тэатральнае і музычнае мастацтва ў 1920-я гг. Станаўленне беларускага кіно.
15. Архітэктура і жывапіс ў 1920-я гг.
16. Індустрыялізацыя: сутнасць, характар, яе асаблівасці ў БССР, шляхі ажыццяўлення. Пераход да пяцігадовага планавання развіцця народнай гаспадаркі і культуры.
17. Эканамічныя паказчыкі першай і другой пяцігодак у прамысловасці.
18. Сельская гаспадарка ў канцы 1920–1930 гг. Курс на суцэльную калектывізацыю. Шляхі, тэмпы, формы, метады, вынікі.
19. Грамадска-палітычнае жыццё ў 1930-х гг. Канстытуцыя БССР 1937 г.
20. Тэндэнцыі ўмацавання адміністрацыйна-каманднай дзяржаўна-палітычнай сістэмы.



Репозиторий ВГУ

21. Асноўныя тэндэнцыі культурнага жыцця БССР у 1930-я гг.: узмацненне ідэалагічнага ўціску. Барацьба з іншадумствам.

22. Стан развіцця адукацыі ў 1930-я гг. Агульнаадукацыйная, сярэдне-спецыяльная і вышэйшая школа.

23. Фарміраванне і станаўленне навуковых устаноў рэспублікі. Дасягненні беларускіх вучоных.

24. Асноўныя накірункі развіцця беларускай савецкай літаратуры ў 1930-я гг.

25. Тэатральнае, музычнае мастацтва і кіно 1930-х гг.

26. Архітэктура, выяўленчае і іншыя формы мастацтва Беларусі ў 1930-я гг.

27. Заходнебеларускія землі ў складдзе Польшчы: тэрыторыя, насельніцтва, адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, органы кіравання.

28. Прамысловасць Заходняй Беларусі: характар яе развіцця, галіновая структура і сацыяльнае становішча рабочых. Рабочы, забастовачны рух на тэрыторыі Беларусі.

29. Аграрнае пытанне і зямельная рэформа ў Заходняй Беларусі. Сельскагаспадарчая вытворчасць.

30. Палітычнае жыццё Заходняй Беларусі. Дзейнасць палітычных партый і грамадскіх арганізацый. Узброеная і парламенцкая формы барацьбы.

31. Нацыянальна-культурны і рэлігійны прыгнет беларускага насельніцтва ў Польшчы ў 1921–1939 гг.

32. Класавая дыферэнцыяцыя ў вёсцы Заходняй Беларусі. Сялянскі рух

33. Уз’яднанне беларускага народа у складзе БССР. Сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях рэспублікі.

34. Эканамічнае і сацыяльна-палітычнае развіццё БССР в умовах ўзрастаючай ваенай небяспекі (1938–1941 гг.).

35. Міжнароднае становішча на пярэдадні і ў пачатку II Сусветнай вайны. Фарміраванне фашысцкага блоку.

36. Мэты фашысцкай Германіі пры нападзенні на СССР. Прыгранічныя баі ў Беларусі. Абарона Брэсцкай крэпасці.

37. Дзейнасць партыйных і савецкіх органаў па мабілізацыі сіл і сродкаў для барацьбы з агрэсарам.

38. Абарончыя баі на Беларусі ў ліпені-жніўні 1941 г. Прычыны няўдач Чырвонай Арміі летам-восенню 1941 г.

39. Дзейнасць першых партызанскіх атрадаў, дыверсійных груп і падпольных арганізацый у 1941 г. – пачатку 1942 г. “Віцебскія вароты”.

40. Ваенна-эканамічныя і палітычныя мерапрыемствы акупацыйных улад на захопленай тэрыторы Беларусі. Палітыка генацыду.

Репозиторий ВГУ

41. Партызанская і падпольная барацьба ў Беларусі ў 1942–1944 гг. Дапамога савецкага тыла і мясцовага насельніцтва партызанам і падпольшчыкам.

42. Асаблівасці антыфашысцкай барацьбы ў Заходніх абласцях Беларусі. Калабарацыянізм на Беларусі.

43. Вызваленне часткі тэрыторіі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943 – пачатку 1944 г. Пачатак аднаўленчых работ.

44. Выгнанне германскіх захопнікаў з тэрыторыі Беларусі. Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён".

45. Сацыяльна-эканамічнае, культурнае і духоўнае жыццё савецкага народа ў час Вялікай Айчыннай вайны.

46. Уклад беларускага народа ў разгром нацыскай Германіі і мілітарысцкай Японіі.

47. Міжнароднае значэнне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Репозиторий ВГУ

ДАДАТАК 4

# ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ

**1. НЭП пачаўся ў:**
o 1920 г.;
• 1921 г.;
o 1922 г.;
o 1923 г.
**2. НЭП пачаўся з:**
o грашовай рэформы;
• замены харчразвёрсткі харчпадаткам;
o стварэння Саўнаргаса;
o ліквідацыі ўраўняльнай зарплаты ў прамысловасці.
**3. Наркомам земляробства БССР у 1920-я гг. быў:**
o А. Чарвякоў;
o У. Ігнатоўскі;
• Д. Прышчэпаў;
o Ф. Шантыр.
**4. Сельскагаспадарчы калектыў, удзельнікі якога аб'ядноўвалі толькі асноўныя сродкі вытворчасці – зямлю, рабочую жывёлу, інвентар:**
o фальварак;
o ТАЗ;
• арцель;
o хутар.
**5. Большасць кіраўніцтва РКП(б) разглядала НЭП як часовае адступленне ў эканоміцы, таму што:**
o у выніку правядзення НЭПа не вельмі эфектыўна аднаўлялася прамысловасць;
• НЭП супярэчыў сацыялістычнай тэорыі пераходу ад капіталізму да сацыялізму;
o НЭП тармазіў развіццё палітыкі беларусізацыі;
o НЭП прывёў да крызісу ў сельскай гаспадарцы Беларусі.
**6. Першае і другое ўзбуйненне БССР адбылося ў:**
o 1922 і 1924гг.;
o 1924 і 1925гг.;
• 1924 і 1926гг.;
o 1926 і 1928гг.
**7. II Усебеларуская канферэнцыя, на якой было прынята рашэнне аб самароспуску Рады і ўрада БНР, адбылася ў:**
• 1925г.;
o 1926г.;
o 1927г;
o 1928г.
**8. Саюз Савецкіх Сацыялістычных рэспублік быў утвораны:**
o 30 снежня 1921г.;
• 30 снежня 1922г.;
o 30 снежня 1923г.;
o 30 снежня 1924г.
**9. 30 снежня 1922г. у Маскве адкрыўся:**
o Х з'езд РКП(б);
o III Усерасійскі з'езд Саветаў;
• I Усесаюзны з'езд Саветаў;
o I з'езд КПСС.

Репозиторий ВГУ

**10. Важнейшы напрамак нацыянальнай палітыкі бальшавікоў на Беларусі ў 20-я гады XX ст.:**

• беларусізацыя;
o дэмакратызацыя;
o калектывізацыя;
o індустрыялізацыя.

**11. Беларусізацыя як дзяржаўная палітыка пачалася ў:**

• 1924г.;
o 1926г.;
o 1920г.;
o 1922г.

**12. У 1926 г. выйшаў на экран першы беларускі мастацкі фільм Юрыя Тарыча:**

o “Кастусь Каліноўскі”;
o “Ленін і Беларусь”;
• “Лясная быль”;
o “Дрыгва”.

**13. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт быў адкрыт ў:**

**o** 1920г.;
• 1921г.;
o 1922г.;
o 1923г.

**14. Вядучай навуковай установай, створанай на Беларусі ў 1922 г. быў(ла):**

• Інбелкульт;
o Акадэмія навук;
o БДТ;
o БДУ.

**15. Інбелкульт быў рэарганізаваны ў Акадэмію Навук БССР у:**

o 1925г.;
o 1927г.;
o 1928г.;
• 1929г.

**16. Карэнізацыя – гэта:**

• вылучэнне на кіруючыя пасады прадстаўнікоў карэннага насельніцтва Беларусі;
o аднаўленне сельскай гаспадаркі прадстаўнікамі карэннага насельніцтва Беларусі;
o развіццё мясцовай індустрыі БССР;
o фарміраванне карэннага беларускага пралетарыяту як аплоту камунізма на Беларусі.

**17. Палітадзелы пры МТС створаны ў:**

o 1915г.;
o 1931г.;
• 1933г.;
o 1936г.

**18. Да прадпрыемстваў цэнзавай прамысловасці адносіліся:**

o дробныя прадпрыемствы, заснаваныя на ручной працы;
• буйныя і сярэднія прадпрыемствы з механічнымі рухавікамі і без іх;
o усе нацыяналізаваныя прадпрыемствы;
o прадпрыемствы, якія апрацоўваюць сельскагаспадарчую прадукцыю.

**19. Вызначце правільную паслядоўнасць:**

прыняцце Канстытуцыі ССРБ
3
абвяшчэнне КП(б)Б
2
утварэнне Заходняй вобласці
1
скасаванне ЛітБел
4



Репозиторий ВГУ

**20. Падзея, якая адбылася ў адзін год з падпісаннем Рыжскага міру:**
o першае ўзбуйненне БССР;
o другое ўзбуйненне БССР;
• увядзенне НЭПа;
o увядзенне чырвонца.
**21. Першая электрастанцыя, якая пабудавана ў Беларусі:**
o Лукомская ДРЭС;
• БелДРЭС каля Орша;
o Бярозаўская ДРЭС;
o Васілевіцкая ДРЭС.
**22. Тэрмін, які сведчыць аб увядзенні НЭПа:**
o харчразвёрстка;
o натуральная гаспадарка;
o дзяржаўнае размеркаванне прадуктаў па картачках;
* свабода гандлю.
**23. Федэрацыя – гэта:**
• форма тэрытарыяльнага ўладкавання, пры якой асобныя дзяржаўныя ўтварэнні аб'ядноўваюцца ў адну саюзную дзяржаву;
o форма дзяржавы, у якой асобныя яе часткі не маюць самастойнасці;
o форма палітычнага аб'яднання дзяржаў пры поўным захаванні іх самастойнасці;
o форма дзяржаўнага ўладкавання.
**24. Элемент палітыкі "ваеннага камунізму":**
• харчовы падатак;
o савецкі чырвонец;
o сельскагаспадарчая кааперацыя;
o натуральны абмен.
**25. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**
харчразверстка
"ваенны камунізм"
падзел Беларусі
Рыжскі мір
узбуйненні БССР
Канстытуцыя БССР 1927г.
харчпадатак
НЭП
**26. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**
аўтамнамізацыя
І.В. Сталін
- электріфікацыя
- БелДРЭС
- кааперацыя

эканамічнае супрацоўніцтва
федэрацыя
У.І. Ленін
**42. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
узбуйненне БССР
4
стварэнне СССР
3
заключэнне дагавораб ваенна-палітычным саюзе савецкіх рэспублік
2
абвяшчэнне ССРБ
1
**43. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
увядзенне палітыкі "ваеннага камунізму"
1

Репозиторий ВГУ

распрацоўка плана ГОЭЛРО
2
увядзенне савецкага чырвонца
4
замена харчразверсткі харчпадаткам
3

**44. Дзяржаўнымі мовамі ў БССР у час беларусізацыі былі абвешчаны:**

o беларуская;
o беларуская і руская;
o беларуская, руская і яўрэйская;
• беларуская, руская, яўрэйская і польская.

**45. Горад, у якім быў адкрыт БДТ-2:**

• Віцебск;
o Гродна;
o Магілёў;
o Баранавічы.

**46. Беларускі гісторык і грамадскі дзеяч, народны камісар асветы БССР, старшыня Інбелкульта, першы прэзідэнт Беларускай акадэміі навук:**

o У. Пічэта;
o М. Доўнар-Запольскі;
o А. Баліцкі;
• У. Ігнатоўскі.

**47. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**

БДТ-1
Е. Міровіч
“На ростанях”
Я. Колас
“Міколка-паравоз”
М. Лынькоў
БДТ-3
У. Галубок

**48. Прыярытэтная роля на транспарце ў 20-х – 30-х гг. належыла:**

o гужавому;
o аўтамабільнаму;
o рачному;
• чыгуначнаму.

**49. Стаханаўскі рух – гэта:**

o будаўніцтва нафтахімічных прадпрыемстваў;
o установка на прадпрыемствах новага абсталявання;
o уладкаванне працоўных дысцыплін;
• развіццё творчай і працоўнай актыўнасці грамадства.

**50. Прадстаўнікоў беларускага нацыянальнага руху ў канцы 1920-х – 1930-х гады бальшавікі называлі:**

o фашысты;
o сіяністы;
• нацыянал-дэмакраты;
o партакраты.

**51. Асноўнае мерапрыемства, якое праводзіла таварыства “Далоў непісьменнасць!”:**

o арганізацыя барацьбы з “нацыянал-дэмакратызмам;
• стварэнне пунктаў лікбеза;
o кантроль за мерапрыемствамі ў галіне народнай асветы;
o выданне газет і часопісаў на беларускай мове.

**52. Горад, у чкім была створана кінастудыя “Савецкая Беларусь”:**

o Масква;
• Ленінград;

Репозиторий ВГУ

o Мінск;
o Віцебск.
**53. Першы з’езд пісьменнікаў Беларусі адбываўся ў:**
o 1931 г.;
• 1934 г.;
o 1935 г.;
o 1936 г.
**54. Праўленне Саюза пісьменнікаў пасля яго I з’езда ўзначаліў:**
• М. Клімковіч;
o С. Астрэйка;
o М. Лужанін;
o Л. Калюга.
**55. Аўтарам драмы “Партызаны” з’яўляецца:**
o З. Бядуля;
o Э. Самуйленак;
• К. Крапіва;
o П. Глебка.
**56. Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета адкрыўся ў:**
o 1932 г.;
• 1933 г.;
o 1935 г.;
o 1937 г.
**57. Справа, якая была сфарміравана органамі ДПУ БССР у адносінах да “нацыянал-дэмакратаў”:**
o “Партыя беларускіх сацыялістаў”;
o “Аб’яднаная дэмакратычная партыя”;
o “Яўрэйскі саюз”;
• “Саюз вызвалення Беларусі”.
**58. Аўтарам паэм “Новая зямля”, “Сымон-музыка” з’яўляецца:**
o К. Крапіва;
• Я. Колас;
o Я. Купала;
o П. Галавач.
**59. Вядомым творам Цішкі Гартнага з’яўляецца:**
• “Сокі цаліны”;
o “Босыя на вогнішчы”;
o “Безназоўнае”;
o “З сказаў буры і віхораў”.
**60. Кіраўніком БДТ-1 з’яўляўся:**
o Ю. Тарыч;
• Е. Міровіч;
o В. Волкаў;
o М. Філіповіч.
**61. Рэформа беларускага правапісу была праведзена ў:**
o 1926 г.;
o 1929 г.;
• 1933 г.;
o 1935 г.
**62. Роля кіраўніка “антысавецкай арганізацыі” “Саюз вызвалення Беларусі”(СВБ), быццам бы выкрытай органамі ДПК БССР, спачатку адводзілася:**
• Янку Купале;
o Якубу Коласу;
o Цішкі Гартнаму;
o Антону Баліцкаму.



Репозиторий ВГУ

**63. Абвінавачванні “ворагам народа” у час сталінскіх рэпрэсій выносілі:**
o Акруговыя суды;
o Пракуратура;
• Пазасудовыя органы – “двойкі” і “тройкі”;
o Вярхоўны Суд.
**64. Па Канстытуцыі БССР 1937 года вышэйшым органам улады з’яўляўся:**
o Усебеларускі з’езд Саветаў;
• Вярхоўны Савет;
o СНК БССР;
o ЦВК БССР.
**65. Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне БССР, адпаведна якому ўтвараліся вобласці, было здзейснена ў:**
o 1936 г.;
• 1938 г.;
o 1939 г.;
o 1940 г.
**66. Беларускім вандроўным тэатрам кіраваў:**
o Е. Міровіч;
• У. Галубок;
o К. Крапіва;
o Г. Глебаў.
**67.Гады першай пяцігодкі развіцця народнай гаспадаркі савецкай краіны:**
• 1928–1932 гг.;
o 1932–1936 гг.;
o 1925–1929 гг.;
o 1936–1940 гг.
**68. Курс на правядзенне калектывізацыі сельскай гаспадаркі быў узяты:**
• 1927 г.;
o 1928 г.;
o 1929 г.;
o 1930 г.
**69. Пасланцы рабочага класа, якія дапамагалі мясцовым уладам праводзіць калектывізацыю:**
o трыццацітысячнікі;
o дваццацітысячнікі;
• дваццаціпяцітысячнікі;
o трыццаціпяцітысячнікі.
**70. Выбары дэпутатаў у Саветы ў канцы 1920-х – 30-х гг. праводзіліся:**
o на аснове альтэрнатывы (2 і больш пратэндэнтаў);
• на безальтэрнатыўнай аснове;
o шляхам каптацыі;
o на аснове самавулучэння.
**71. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**
А. Туранкоў
“Кветка шчасця”
А. Багатыроў
“Упушчах Палесся”
Ю. Тарыч
“Лясная быль”
М. Чарот
“Свінапас”
**72. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
рэформа беларускага правапісу
4

Репозиторий ВГУ

адкрыццё БДУ
1
стварэнне першай беларускай кінастужкі
3
адкрыццё Інбелкульта
2

**73. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
зараджэнне беларусазнаўства
1
пачатак беларусізацыі
2
адкрыццё Беларускай акадэміі навук
3
“нацдэмаўшчына”
4

**74. Галіна прамысловасці, развіццё якой з’яўлялася асаблівасцю правядзення індустрыялізацыі ў БССР:**
o цяжкая;
• лёгкая;
o хімічная;
o энергетычная.

**75.Т эрмін, які сведчыць аб правядзенні калектывізацыі сельскай гаспадаркі:**
o перапрацоўка сельскагаспадарчай сыравіны;
o кааперацыя;
• раскулачванне;
o стаханаўскі рух.

**76. Афіцыйным сведчаннем развіцця дэмакратычных працэсаў у БССР стала:**
o прыпыненне палітыкі беларусізацыі;
• прыняцце Канстытуцыі БССР 1937г.;
o цэнтралізацыя кіравання краіны;
o справа “СВБ”.

**77. Выраз “выбар без выбару” азначае:**
o адсутнасць выбараў увогуле;
o абмежаванне права савецкіх грамадзян на ўдзел у выбарах;
• безальтэрнатыўны парадак выбараў;
o існаванне шматпартыйнасці.

**78. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**
Кансервны завод па выпуску сгушчанага малака
Рагачоў
Цэментавы завод
Крычаў
Кандытарская фабрыка “Спартак”
Гомель
Кандытарская фабрыка “Камунарка”
Мінск

**79. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
праведзенне суцэльнай калектывізацыі
3
вывад аб пабудове матэрыяльна-тэхнічнай базы сацыялізму ў СССР
4
пачатак правядзення індустрыялізацыі
2
распрацоўка плана ГОЭЛРО
1

Репозиторий ВГУ

**80. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
пачатак паскоранага і прымусовага стварэння ў БССР калгасаў
2
прыняцце ў БССР Канстытуцыі “перамогшага сацыялізму”
4
пачатак другой пяцігодкі
3
увядзенне НЭП

**81. Тэрыторыя Заходняй Беларусі знаходзілася ў складзе Польшчы з:**
o 1917 г.;
• 1921 г.;
o 1919 г.;
o 1939 г.

**82. Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ) была заснавана ў:**
o 1921 г.;
• 1923 г.;
o 1925 г.;
o 1927 г.

**83. Аб’яднанне камсамольскіх арганізацый Заходняй Беларусі ў Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ) адбылося ў:**
o 1922 г;
o 1923 г.;
• 1924 г.;
o 1927 г.

**84. Дыктатарскі рэжым, устаноўлены ў Польшчы Ю.Пілсудскім ў 1926г., атрымаў назву:**
o пацыфікацыі;
o камасацыі;
o парцэляцыі;
• санацыі.

**85. Курс нацыянальнай палітыкі польскага ўрада ў Заходняй Беларусі можа вызначыць як:**
• асіміляцыю;
o беларусізацыю;
o карэнізацыю;
o дэмакратызацыю.

**86. Заходнебеларускі паэт, аўтар кніг “Журавінавы цвет”, “Пад мачтай”, “На этапах”:**
o Я. Драздовіч;
o П. Сергіевіч;
• М. Танк;
o Я. Купала.

**87. Заходнебеларускі мастак, які ў другой палове 1920-х гг. стварыў вялікія графічныя серыі старадаўніх помнікаў Беларусі і Літвы – гэта:**
• Я. Драздовіч;
o М. Танк;
o П. Пестрак;
o В. Волкаў.

**88. Па Канстытуцыі БССР 1927г. вышэйшым органам улады з’яўляўся:**
• Усебеларускі з’езд Саветаў;
o ЦВК БССР;
o Вярхоўны Савет;
o СНК БССР.

Репозиторий ВГУ

**89. Сітуацыя ў эканоміцы, калі цэны на прамысловыя тавары былі значна вышэйшымі, чым на сельскагаспадарчыя прадукты:**

o інфляцыя;

• “нажніцы цэн”

o дэвальвацыя;

o “рэвалюцыя цэн”.

**91. Асаблівасцю індустрыялізацыі ў БССР было пераважнае развіццё:**

o цяжкай прамысловасці;

• лёгкай прамысловасці;

o здабываючай прамысловасі;

o вытворчасці ваеннай прадукцыі.

**92. У гады першай пяцігодкі было пабудавана прадпрыемства:**

o Мінскі радыёзавод;

o завод ЭВМ у Мінску;

• фабрыка “КІМ” у Віцебску;

o Завод аўтаматычных ліній ў Баранавічах.

**93. Б. Тарашкевіч узначальваў:**

o КПЗБ;

o БДХ;

• БСРГ;

o БПС-Р.

**94. У Заходняй Беларусі ў 1920г. продаж часткі памешчыцкай зямлі дробнымі ўчасткамі – гэта:**

• парцэляцыя;

o хутарызацыя;

o камасацыя;

o санацыя.

**95. Накірунак зямельнай рэформы ў 1920-х гг. у Польшчы, ліквідацыя цераспалосіцы і высяленне на хутар – гэта:**

o парцэляцыя;

• камасацыя;

o санацыя;

o карэнізацыя.

**96.Кіраўнік і актыўны дзеяч ТБШ і БСРГ:**

• Б. Тарашкевіч;

o А. Славінскі;

o С. Прытыцкі;

o І. Лагіновіч.

**97.Дзеяч, які належыў да рэвалюцыйна-вызваленчага напрамку нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі:**

o Б. Тарашкевіч;

• С. Прытыцкі;

o В. Ластоўскі;

o С. Рак-Міхайлоўскі.

**98.Падзея, якая сведчыць аб барацьбе працоўных Заходняй Беларусі за свае правы:**

• косаўскі расстрэл;

o увядзенне асадніцтва;

o высяленне сялян за хутары;

o передача зямлі сялянам без выкупу.

**99. Тэрмін, які характарызуе палітыку польскіх улад у Заходняй Беларусі:**

o уз’яднанне;

• санацыя;

o калектывізацыя;

o пакт Рыбентропа-Молатава.



Репозиторий ВГУ

**100. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**
асаднікі
белыя польскія афіцэры
культурна-асветніцкая арганізацыя
ТБШ
масавая палітычная арганізацыя
БСРГ
пакт аб ненападзенні
пакт Рыбентропа-Молатава
**101. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
рашэнне Вярхоўнага Савета БССР аб прыняцці Заходняй Беларусі ў склад БССР
4
падпісанне акта Рыбентропа-Молатава
1
паход войскаў Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь
3
пачатак Другой сусветнай вайны
2
**102. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
роспуск КПЗБ
3
Рыжскі мір
1
канчатковае афармленне БСРГ
2
скліканне Народнага сходу Заходняй Беларусі
4
**103. Савецкія войскі ўступілі ў Заходнюю Беларусь:**
o 23 жніўня 1939 г.;
o 1 верасня 1939 г.;
o 28 жніўня 1939 г.;
• 17 верасня 1939 г.
**104. Народны сход Заходняй Беларусі прыняў рашэнне аб:**
• устанаўленні Савецкай улады і ўваходжанні ў склад БССР;
o утварэнні самастойнай дэмакратычнай рэспублікі;
o далучэнні да Літвы;
o аўтаноміі ў складзе Польшчы.
**105. Пакт аб ненападзе паміж Германіяй і ССР быў падпісаны:**
• 23 жніўня 1939 г.;
o 28 верасня 1939 г.;
o 28 жніўня 1939 г.;
o 1 верасня 1939 г.
**106. Кодавая назва плана вайны Германіі супраць СССР:**
• "Барбароса";
o "Оверлорд";
o "Тайфун"
o "Фатэрланд"
**107. Школа працоўных рэзерваў бярэ пачатак у:**
o 1939г.;
• 1940г.;
o 1941г.;
o 1945г.
**108. Вызначце назву плана нямецкіх фашыстаў па знішэнню народаў Савецкага Саюза і каланізацыі яго тэрыторыі:**
o "Барбароса";

Репозиторий ВГУ

• “Ост”;
o “Вайс”;
o “Гімлер”.

**109. Другая сусветная вайна пачалася 1 верасня 1939г. з:**
o бамбардыровак нямецкай авіяцыяй Англіі;
• нападу Германіі на Польшчу;
o нападу Германіі на СССР;
o нападу СССР на Фінляндыю.

**110. Бліцкрыг – гэта:**
o сістэма мерапрыемстваў, якая праводзілася для ізаляцыі тэрыторыі дзяржавы;
o сістэма мерапрыемстваў, якая праводзілася на акупаванай тэрыторыі;
o тактыка і стратэгія каланіяльнай вайны;
• тэорыя хуткага вядзення вайны з дасягненнем перамогі ў найкарацейшы тэрмін.

**111. Беларускі горад, абарона якога працягвалася 23 дні – гэта:**
o Орша;
o Гомель;
• Магілёў;
o Мінск.

**112. Свой першы залп “кацюшы” далі пад:**
o Віцебскам;
o Мінскам;
• Оршай;
o Бабруйскам.

**113. Назва плана “маланкавай вайны” Германіі супраць СССР паходзіць ад імя:**
o немецкага генерала;
o канцлера Прусіі;
• германскага караля;
o прускага імператара.

**114. Камандзір стралковай дывізіі, якая стала першай гвардзейскай дывізіяй у Чырвонай арміі:**
o Е.Раманаў;
o А.Пятроўскі;
• С. Куцэпаў;
o І.Русіянаў.

**115. Ідэйная аснова “новага парадку”, устаноўленага нямецка-фашысцкімі захопнікамі на акупіраваных тэрыторыях:**
o план “маланкавай вайны”;
• расавая тэорыя;
o гета;
o план выпаленай зямлі.

**116. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**
план “Барбароса”
план “маланкавай вайны”
пакт Рыбентропа-Молатава
пакт аб ненападзенні
гета
месца масавага пражывання яўрэйскага насельніцтва
план “Ост”
план фізічнага знішчэння насельніцтва

**117. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**
І. Флёраў
Орша
П. Гаўрылаў
Брэсцкая крэпасць
М. Гастэла



Репозиторий ВГУ

Радашковічы
Б. Коўзан
Гомель
**118. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
падпісанне пакта Рыбентропа-Молатава
1
пачатак Другой сусветнай вайны
2
захоп германскімі войскамі Мінска
4
пачатак Вялікай Айчыннай вайны
3
**119. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
Хатынская трагедыя
3
пачатак абароны брэсцкай крэпасці
1
ІІ Усебеларускі з’езд
4
абарона Магілёва
2
**120. Гадавіна вызвалення БССР ад нямецка-фашыстскіх захопнікаў, у сувязі з якой г.Мінску было прысвоена ганаровае званне “Горад-герой”:**
o 10-годдзе;
• 30-годдзе;
o 20-годдзе;
o 40-годдзе.
**121. Гістарычны дзеяч, напярэдадні вайны настаўнік, арганізатар падполля, камандзір партызанскага атрада, а потым камісар партызанскай брыгады, сакратар падпольнага абласнога камітэта камсамола, у пасляваенны час (1965–1980 гг.) партыйны кіраўнік у БССР:**
o К. Мазураў;
• П. Машэраў;
o М. Патолічаў;
o М. Гусараў.
**122. Кодавая назва Беларускай наступальнай аперацыі:**
o “Тайфун”;
o “Цэнтр”;
o “Фатэрлянд”;
• “Баграціён”.
**123. Савецкі летчык, ураджэнец Беларусі, які ў час Курскай бітвы збіў у адным баі 9 самалётаў ворага:**
o М. Гастэла;
o Б. Коўзан;
• А. Гаравец;
o А. Маслаў.
**124. Санінструктар, якая вынесла з поля бою больш за 120 цяжкапараненных воінаў; узнагароджана зоркай Героя Савецкага Саюза і медалем Флорэнс Найтынгейл:**
o А. Мазанік;
o М. Акцябрская;
• З. Тусналобава-Марчанка;
o Т. Барамзіна.
**125. Горад, у якім адным з кіраўнікоў партыйнага падполля ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі была В. Харужая:**
o Мінск;
o Брэст;



Репозиторий ВГУ

o Магілёў;
• Віцебск.
**126. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**
М. і І. Цубы
Палессе
М. Казей
Мінская вобласць
В. Корж
Пінскі раён
М. Шмыроў
Суражскі раён
**127. Правільна суаднясіце элементы двух мностваў:**
І. Баграмян
1-ы Прыбалтыйскі фронт
К. Ракасоўскі
2-і Беларускі фронт
Г. Захараў
1-ы Беларускі фронт
І. Чарняхоўскі
3-і Беларускі фронт
**128. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
пачатак Беларускай наступальнай аперацыі
4
арганізацыя партызанскага атрада на чале з М.Шмыровым
1
пачатак "рэйкавай вайны"
3
утварэнне БШПР
2
**129. Вызначце правільную паслядоўнасць:**
Стварэнне Арміі Краёвай
3
Абарона Брэсцкай крэпасці польскім гарнізонам
2
Пакт Рыбентропа-Молатава
1
Удзел дывізіі імя Т.Касцюшкі ў вызваленні БССР
4
**130. Генеральны камісар Беларусі да верасня 1943 г.:**
o А. Готберг;
o К. Клаўзевіц;
• В. фон Кубе;
o К. Людэндорф.
**131. Тыя, хто супрацоўнічаў з нямецкімі акупацыйнымі ўладамі ў час Другой сусветнай вайны – гэта:**
o акупанты;
• калабаранты;
o інсургенты;
o канфедэранты.
**132. Стваральнікам першага партызанскага атрада на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны быў:**
o К.С.Заслонаў;
• В.З.Корж;
o М.Ф.Шмыроў;
o П.М. Машэраў.



Репозиторий ВГУ

**133. Першымі з беларускіх партызан, якім было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, з'яўляліся:**

o В. Корж і М. Шмыроў;
• Ц. Бумажкоў і Ф. Паўлоўскі;
o С. Прытыцкі і В. Харужая;
o К. Заслонаў і П. Машэраў.

**134. "Рэйкава вайна" пад умоўнай назвай "Канцэрт" мела месца ў:**

o 1941 г.;
o 1942 г.;
• 1943 г.;
o 1944 г.

**135. Першы абласны цэнтр Беларусі, вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў – гэта:**

o Віцебск;
• Гомель;
o Магілёў;
o Гродна.

**136. Вызначце дату вызвалення ад нямецкіх акупантаў г. Мінска:**

o 21 сакавіка 1943 г.;
o 23 сакавіка 1944 г.;
o 26 чэрвеня 1944 г.;
• 3 ліпеня 1944 г.

**137. Вызваленне Віцебска ад акупантаў адбылося ў:**

o 1942 г.;
o 1943 г.;
• 1944 г.;
o 1945 г.

**138. У час Вялікай Айчыннай вайны падпольная ваенная арганізацыя, якая падпарадкоўвалася польскаму эміграцыйнаму ўраду ў Лондане – гэта:**

o Армія Людова;
o АУН
• Армія Краёва;
o Армія Польска.

**139. Апошні абласны цэнтр Беларусі быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў:**

o 26 чэрвеня 1944 г.;
o 3 ліпеня 1944 г.;
• 28 ліпеня 1944 г.;
o 7 жніўня 1944 г.

**140. Вёска Хатынь была спалена разам з жыхарамі ў:**

o 1941 г.;
o 1942 г.;
• 1943 г.;
o 1944 г.

**141.Адзін са стваральнікаў Расонскага партыйна-камсамольскага падполля, камандзір партызанскага атрада, у даваенны час настаўнік фізікі і матэматыкі:**

o В. Корж;
o М. Шмыроў;
o П. Мазураў;
• П. Машэраў.

**142. "Суражскія вароты" былі ўтвораны:**

o 1941 г.;
o 1943 г.;
• 1942 г.;
0 1944 г.



Репозиторий ВГУ

# ЗМЕСТ

**I. Тлумачальная запіска** ………………………………………………………………….. 3

**II. Метадычныя ўказанні па авалоданні зместам вывучаемых тэм** ………… 6

Тэма 1. Палітычныя перадумовы стварэння на Беларусі савецкай Дзяржаўнасці ……………………………………………………………………………….. 6

Тэма 2. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні на савецкай частцы тэрыторыі Беларусі ў 1918–1920 гг. ………………………………………………… 17

Тэма 3. Акупацыя польскімі войскамі тэрыторыі Беларусі ………………….. 25

Тэма 4. Супраціўленне беларускага народа польскім акупантам …………… 29

Тэма 5. Пошукі шляхоў выхаду з крызісу ў мірных абставінах …………….. 32

Тэма 6. Аднаўленчы перыяд у прамысловасці, яго вынікі ………................... 42

Тэма 7. Прамысловасць БССР у гады першых савецкіх пяцігодак …............ 48

Тэма 8. Палітыка дзяржавы па сялянскім пытанні …………………….... 61

Тэма 9. Асноўныя тэндэнцыі ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі …… 70

Тэма 10. Палітыка дзяржавы па пытаннях развіцця культуры: накірункі, тэндэнцыя, асноўныя вынікі ……………………………………………………….. 83

Тэма 11. Беларуская эміграцыя, яе памеры і асноўныя накірункі ………….. 90

Тэма 12. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча заходнебеларускіх зямель (1921–1939 гг.) ……………………………………….. 96

Тэма 13. Сусветнае становішча напярэдадні і на пачатку Другой сусветнай вайны ………………………………………………………………………………… 103

Тэма 14. Нападзенне фашысцкай Германіі на СССР. Крах гітлераўскай стратэгіі “бліцкрыга” …………………………………………………………… 110

Тэма 15. Акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ……………………… 126

Тэма 16. Барацьба беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў ……………………………………………........................................... 136

Тэма 17. Вызваленне Беларусі. Завяршэнне Вялікай Айчыннай вайны ……. 150

**Дадатак 1. Пытанні для семінарскіх заняткаў** ………………………………… 156

Семінар 1. Абвяшчэнне БССР, яе першая Канстытуцыя (люты 1919 г.) ....... 156

Семінар 2. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў 1921–1927 гг. ……........ 157

Семінар 3. Ажыццяўленне індустрыялізацыі ў БССР. Пераход да пяцігадовых планаў, іх канчатковыя вынікі ……………………...................... 158

Семінар 4. Палітыка камуністычнай партыі на вёсцы ў 20–30-я гг. ............. 159

Семінар 5. Грамадска-палітычнае жыццё ў 20–30-я гг. …………..................... 160

Семінар 6. Культурна-нацыянальныя пераўтварэнні ў сярэдзіне 20–30-х гг. XX ст. ……………………………………………………………………………... 161

Семінар 7. Стан прамысловасці, сельскай гаспадаркі, асветы і культуры на беларускіх землях у складзе Польшчы ……………………........................ 162

Семінар 8. Уклад беларускага народа ў Вялікую Перамогу ............................ 163

**Дадатак 2.** Арганізацыя самастойнай працы студэнтаў …………………….. 164

**Дадатак 3.** Кантрольныя пытанні да экзамена (заліка) ............................................ 165

**Дадатак 4.** Тэставыя заданні ..................................................................................... 168

Рэпазіторый ВДУ

Вучэбнае выданне

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ 1-02 01 01 ГІСТОРЫЯ І ГРАМАДАЗНАЎЧЫЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне

Складальнік

**МАНДРЫК** Іван Уладзіміравіч

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*

Камп'ютарны дызайн *Л.Р. Жыгунова*

Падпісана ў друк .2018. Фармат 60x84 1/16. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 10,64. Ул.-выд. арк. 11,88. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 от 31.03.2014 г.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.

Репозиторий ВГУ